Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра беларускай і замежнай філалогіі

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_____ А.М. Пісарэнка
“24” 01 2025 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_____ Ю. М. Галкоўская
“28” 01 2025 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ **“БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)”**

для ўсіх спецыяльнасцей
агульнай вышэйшай адукацыі ўніверсітэта

Складальнікі:
А. М. Пісарэнка, прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
В. В. Шунейка, старшы выкладчык кафедры рускай мовы як замежнай ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта “28” 01 2025 г.
пратакол № 5

Складальнікі:
А.М.Пісарэнка, прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт
В. В. Шунейка, старшы выкладчык кафедры рускай мовы як замежнай ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Рэцэнзенты:
кафедра беларускай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт»;

А. А. Жэлуновіч, загадчык кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:
Кафедрай беларускай і замежнай філалогіі (пратакол ад 27.12.2024 г № 5);

Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (пратакол ад 28.01.2025 г № 5.)

ЗМЕСТ

1.	ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА	4
2.	ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ	6
2.1	Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны	6
2.2	Агульная характарыстыка стыляў	7
2.3	Моўныя нормы ў сістэме тэрміналогіі	46
2.4	Камунікатыўныя якасці маўлення	83
3.	ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ	91
3.1	Практыкум	92
4.	РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ	277
4.1	Пытанні для самакантролю	277
4.2	Тэставыя заданні для самакантролю	279
4.3	Прамежкавы кантроль ведаў	295
4.4	Пытанні для заліку	296
4.6	Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці	298
4.7	Дыягностыка кампетэнцый студэнта	301
5.	ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ	302
5.1	Вучэбная праграма	302
5.2	Змест вучэбнага матэрыялу	307
5.3	Вучэбна-мэтадычная карта для дзённай формы навучання	313
5.4	Вучэбна-мэтадычная карта для завочнай формы навучання	314
5.5	Літаратура асноўная і дадатковая	315
5.6	Асноўныя паняцці і тэрміны	322
5.7	Тэксты для перакладу	325

І. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” чытаецца на ўсіх факультэтах БДУКМ з улікам спецыялізацыі студэнтаў і арыентуе на паглыбленне тэарэтычных ведаў, а таксама на ўважлівае стаўленне да мовы як сродку зносін (акцэнтуецца ўвага на нарматыўных, камунікатыўных і эстэтычных аспектах) у адпаведнасці з прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў у вышэйшай навучальнай установе, прызнаннем беларускай мовы як аднаго са складнікаў нацыянальнай культуры.

Мэта ЭВМК: сістэматызаваць і паглыбіць веды студэнтаў у галіне арфаэпіі, марфалогіі і правапісу, лексікалогіі і лексікаграфіі, функцыянальнай стылістыкі і культуры маўлення; сфарміраваць навыкі і ўменні ў розных відах маўленчай дзейнасці, навучыць прыёмам самастойнай работы з моўным і маўленчым матэрыялам у штодзённай, вучэбна-навуковай і будучай прафесійнай дзейнасці.

Асноўныя задачы ЭВМК:

– паглыбіць і замацаваць тэарэтычныя веды па ўсіх раздзелах мовазнаўства;

– развіць моўна-эстэтычны густ студэнтаў;

– выпрацаваць у студэнтаў патрабавальнасць да чысціні і правільнасці маўлення ў сацыякультурнай і вучэбна-навуковай сферах дзейнасці;

– узбагаціць прафесійны слоўнікавы запас будучых спецыялістаў;

– навучыць карыстацца рознымі лексікаграфічнымі даведнікамі, у прыватнасці, галіновымі тэрміналагічнымі слоўнікамі;

– развіць моўную (вусную і пісьмовую) кампетэнцыю студэнтаў у вучэбна-прафесійнай, вучэбна-навуковай і сацыякультурнай сферах дзейнасці;

– навучыць кваліфікавана карыстацца сродкамі афіцыйна-справавога і навуковага стылю;

– садзейнічаць асэнсаванаму засваенню ўсіх літаратурных моўных нормаў і прычын іх парушэння ў тэкстах розных стыляў;

– сфарміраваць навыкі перакладу і літаратурнага рэдагавання тэкстаў;

– выхаваць цікавасць і павагу да мастацкага слова як часткі духоўнай культуры беларускага народа, інтэлектуальнай спадчыны.

ЭВМК складаецца з тлумачальнай запіскі, тэарэтычнага раздзела, практычнага раздзела, раздзела кантролю ведаў і дапаможнага раздзела.

У **тлумачальнай запісцы** адлюстроўваюцца мэта і задачы вучэбнага выдання, асаблівасці структурыравання і падачы вучэбнага матэрыялу, рэкамендацыі па арганізацыі работы з ЭВМК.

У **тэарэтычным раздзеле** ЭВМК падаецца спіс падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, слоўнікаў і табліц, якія дапамогуць узнавіць і сістэматызаваць веды па курсе.

Практычны раздзел ЭВМК утрымлівае практыкаванні і тэставыя заданні для больш глыбокага і дэталёвага засваення тэарэтычнага матэрыялу.

Раздзел кантролю ведаў складаецца з пераліку пытанняў для самакантролю, пытанняў да заліку, заданняў для кантралюемай самастойнай работы, тэставых заданняў для сістэматызацыі ведаў па курсе і падрыхтоўкі да заліку, крытэрыяў ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў.

Выпрацоўка ўменняў і навыкаў практычнага валодання беларускай мовай і спецыяльнай тэрміналогіяй патрабуе прадуманай сістэмы навучальных і кантрольных практыкаванняў. У сувязі з гэтым ЭВМК утрымлівае **дапаможны раздзел,** у які ўваходзяць вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне, вучэбна-метадычныя карты для студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання, спіс асноўнай і дадатковай літаратуры, асноўныя паняцці і тэрміны.

Састаўным элементам прафесійна арыентаванага навучання з’яўляецца самастойная праца, якая ўключае разнастайныя віды пазааўдыторнай работы студэнта (практыкаванні лексіка-граматычнага і семантыка-стылістычнага характару, вусныя і пісьмовыя жанрава-стылістычныя заданні, пераклады тэкстаў па спецыяльнасці з рускай мовы на беларускую, маналагічныя тэматычна абумоўленыя выступленні, дыялогі-дыскусіі на вызначаную групай тэму і інш.). Для ацэнкі самастойнай працы праводзіцца аўдыторны і індывідуальны кантроль з боку выкладчыка.

Курс “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” выкладаецца на працягу аднаго семестра. Для дыягностыкі кампетэнцыі, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах выкарыстоўваюцца тэсты, рознаўзроўневыя пісьмовыя і творчыя заданні. Форма кантролю – залік.

ІІ. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ВМК

Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”

Літаратура

Асноўная

1. *Багамолава, А. М.* Стылістыка і культура беларускага маўлення / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мінск : РІВШ, 2023. – 392 с.

Дадатковая

1. *Абабурка, М.В.* Культура беларускай мовы / М.В.Абабурка. – Мн.: Вышэйш. шк., 1994. – С. 15-27
2. *Іўчанкаў, В.* Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В. Іўчанкаў. – Мінск: БДУ, 2003. – 257 с.
3. *Каўрус, А.А.* Дакумент па-беларуску: Справаводства. Бухгалтэрыя. Рыначная эканоміка / А.А.Каўрус. – Мн.: Нар. асвета, 1994. – 207 с.
4. *Пісарэнка, А. М.* Філалагічны аналіз мастацкага тэксту : вучэб. дапам. / А. М. Пісарэнка. – Мінск : Нар. асвета, 2017. – 175 с.
5. *Пісарэнка, А.М.* Функцыянальная стылістыка беларускай мовы. – А.М.Пісарэнка. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 12-86.
6. *Рахманин, Л. В.* Стилистика деловой речи и редактирование служебных документов : учеб. пособие / Л. В. Рахманин, Издательство: М. : ФЛИНТА : Наука, 2012. – 256 с.
7. *Романова, Н.Н.* Стилистика и стили: учеб. пособие; словарь / Н.Н. Романова, А.В. Филиппов. – М.: Флинта: МПСИ, 2006. – 416 с.
8. *Станкевіч, А. А*. Рыторыка: вучэбны дапаможнік / А. А. Станкевіч. . – Мн.: РІВШ, 2010. – 316 с.
9. *Цікоцкі, М.Я.* Стылістыка беларускай мовы: вучэб. дапам. для фак. журналістыкі / М.Я. Цікоцкі. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 294 с.
10. *Юрэвіч, А.К.* Стылістыка беларускай мовы: вучэб. дапам. / А.К. Юрэвіч. – Мн.: Выш. шк., 1992. – 288 с.

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СТЫЛЯЎ

Функцыянальныя стылі – гэта грамадска ўсвядомленыя, унутрана аб'яднаныя разнавіднасці мовы, якія абслугоўваюць працэс камунікацыі ў пэўнай сферы і дыктуюць выбар моўных сродкаў. Пры размежаванні стыляў улічваюцца як моўныя, так і нямоўныя (экстралінгвістычныя) фактары. Да апошніх адносяцца**:**

1) сфера зносін (навуковая, вытворчая, культурная, палітычная, бытавая і інш.);

2) форма зносін (пісьмовая і вусная, маналагічная і дыялагічная);

3) змест інфармацыі;

4) мэта выказвання (паведамленне, канстатацыя, прапанова, загад, просьба, эстэтычнае ўздзеянне);

5) умовы зносін.

У стылістыцы беларускай мовы традыцыйна вылучаюць пяць стыляў: **чатыры *кніжныя*** (афіцыйна-справавы, навуковы, публіцыстычны, мастацкі) і ***гутарковы,*** або ***размоўны.*** Усім кніжным стылям уласцівы наступныя рысы: падрыхтаванасць, абдуманасць, паслядоўнасць, лагічнасць выкладу матэрыялу, ужыванне тэрміналагічнай і абстрактнай лексікі, апавядальная інтанацыя, складаны сінтаксіс. Для гутарковага стылю характэрны экспромтнасць, неафіцыйнасць, эмацыянальнасць, спрошчаны сінтаксіс, выкарыстанне нелітаратурнай лексікі, жэстаў, мімікі, рухаў. Некаторыя даследчыкі, акрамя пяці агульнапрынятых, вылучаюць шосты функцыянальны стыль – ***канфесійны,*** што звязана з павелічэннем колькасці рэлігійнай літаратуры на беларускай мове, а таксама з тым, што набажэнства ў многіх храмах вядзецца па-беларуску.

Сучасны этап развіцця грамадства характарызуецца ўзаемапранікненнем стыляў, іх узаемаўплывам. Перасячэнне, сінтэз роз- ных стылістычных пластоў выяўляецца як у пісьмовых тэкстах, так і ў асобных выказваннях. Прычына такой з'явы – павышэнне ўзроўню адукацыі, актыўнасць сродкаў масавай інфармацыі, змена сацыяльнай структуры грамадства.

У межах кожнага функцыянальнага стылю можна вылучыць больш дробныя разнавіднасці мовы – падстылі.

Падстыль – разнавіднасць пэўнага стылю, якая характарызуецца сукупнасцю, адборам і сістэмна-моўнай арганізацыяй сродкаў, уласцівай толькі пэўнаму тыпу тэкстаў. Так, у афіцыйна- справавым стылі ў залежнасці ад сферы выкарыстання тэкстаў вылучаюць канцылярскі, заканадаўчы і дыпламатычны падстылі, у навуковым – акадэмічны, вучэбна-навуковы і навукова-папулярны, у публіцыстычным – газетна-

публіцыстычны, радыё- і тэлежурналісцкі, аратарскі. Трэба адзначыць, што пры вызначэнні падстыляў пад увагу бяруцца не асноўныя стылеўтваральныя фактары, а дадатковыя.

Усе стылі і падстылі беларускай мовы рэалізуюцца ў пэўных жанрах.

Жанр – від тэксту, які вылучаецца ў межах таго ці іншага стылю ці падстылю, характарызуецца своеасаблівай кампазіцыйнай арганізацыяй матэрыялу і моўных сродкаў. Так, афіцыйна-справавы стыль прадстаўлены такімі жанрамі, як заява, аб'ява, распіска, пагадненне, характарыстыка, аўтабіяграфія, справаздача, указ, пастанова і інш.; навуковы – манаграфія, дысертацыя, аўтарэферат, даклад, падручнік, вучэбны дапаможнік, лекцыя, курсавая і дыпломная работа, рэферат, артыкул; публіцыстычны – інтэрв'ю, інфармацыя, хроніка, агляд, эсэ, рэпартаж, нарыс, фельетон, памфлет, карэспандэнцыя і інш.

АФІЦЫЙНА-СПРАВАВЫ СТЫЛЬ

Афіцыйна-справавы стыль абслугоўвае адміністрацыйную і прававую дзейнасць: ім карыстаюцца пры зносінах у дзяржаўных установах, судзе, падчас дзелавых і дыпламатычных перамоў. Гэты стыль рэалізуецца ў тэкстах законаў, указаў, загадаў, кодэксаў, актаў, пастаноў, справаздач, пратаколаў, міжнародных пагадненняў і інш. Сярод усіх функцыянальных стыляў ён вылучаецца сваёй стабільнасцю, замкнёнасцю, аб'ектыўнасцю, дакументальнасцю, стандартызаванасцю. Высокая ступень стандартызацыі дасягаецца агульнапрынятай, устойлівай формай падачы матэрыялу (дастаткова ўзгадаць, як афармляюцца заява, распіска, пратакол і іншыя справавыя паперы). Пры гэтым шырока выкарыстоўваюцца гатовыя бланкі, што спрыяе дасягненню дакладнасці, паслядоўнасці, лаканізму выкладзенага матэрыялу. Адсутнасць двухсэнсоўнасці з'яўляецца вынікам ужывання дат, прозвішчаў, імёнаў, лічбаў, назваў населеных пунктаў і г. д. Афіцыйна-справавым тэкстам уласцівы характар сцвярджэння, канстатацыі ці прадпісання. У залежнасці ад сферы выкарыстання размяжоўваюць наступныя **падстылі афіцыйна-справавога стылю:**

1) адміністрацыйна-канцылярскі (канцылярскі, уласна афіцыйна-справавы) – рэалізуецца ў распараджэннях, загадах, справаздачах, заявах, аб'явах, даверанасцях, аўтабіяграфіях, характарыстыках, распісках, пратаколах, адміністрацыйных актах і інш.;

2) дыпламатычны – прадстаўлены ў тэкстах міжнародных дагавораў і пагадненняў, камюніке, нот, мемарандумаў і інш.;

3) заканадаўчы (юрыдычны, уласна заканадаўчы) – выкарыстоўваецца ў тэкстах законаў, указаў, пастаноў, канстытуцый, грамадзянскіх і крымінальных актаў і г. д.

Жанры афіцыйна-справавога стылю:

Аб'ява – жанр-паведамленне, у ім даводзіцца інфармацыя да ўсеагульнага ведама.

Акт – дакумент, складзены некалькімі асобамі для пацвярджэння ўстаноўленых фактаў ці падзей: апісваюцца прычына, падзея, факт, на аснове якіх складаецца акт, робяцца вывады, заключэнне.

Даведка – дакумент, які ўтрымлівае запатрабаваную інфармацыю ці пацвярджэнне тых ці іншых фактаў (падзей).

Дагавор (у тым ліку працоўны дагавор/кантракт) – дакумент, які фіксуе пагадненне бакоў (юрыдычных ці фізічных асоб, устаноў, прадпрыемстваў і г. д.) аб выкананні канкрэтных абавязкаў ці сумеснай дзейнасці.

Даручэнне (даверанасць) – дакумент, які дае паўнамоцтвы прад'яўніку на выкананне адпаведных дзеянняў ад імя даручальніка (арганізацыі ці фізічнай асобы).

Загад – распараджэнне кіраўніка, галоўны распарадчы службовы дакумент паўсядзённага кіравання, які ўтрымлівае нормы, абавязковыя для выканання падначаленымі.

Заява – службовы дакумент, прызначаны для давядзення да ведама службовай асобы (вышэйшай па службовай пасадзе) інфармацыі вузкай накіраванасці (заявы могуць складацца ад імя адной асобы ці калектыву).

Камюніке – афіцыйнае паведамленне (пераважна па пытаннях міжнароднага значэння).

Канстытуцыя – звод асноўных законаў дзяржавы, які вызначае асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, сістэму дзяржаўных органаў, правы і абавязкі грамадзян.

Мемарандум – дыпламатычны дакумент, у якім выказваюцца погляды ўрада/дзяржавы на якое-небудзь пытанне, уручаецца асабіста прадстаўніку іншай дзяржавы.

Нота – афіцыйны, дыпламатычны зварот адной дзяржавы да другой з падтрымкай/асуджэннем яе палітыкі.

Пратакол – дакумент з запісам усяго, што адбывалася на пасяджэнні, сходзе і інш./акт аб парушэнні грамадскага парадку/ адзін з відаў міжнародных пагадненняў.

Рашэнне – прававы акт, які прымаецца калегіяльнымі і распарадчымі органамі ўстаноў, прадпрыемстваў, фірм з мэтай дазволу вырашэння найбольш важных пытанняў іх дзейнасці.

Справаздача – дакумент-паведамленне аб праведзенай працы,

адрасаваны арганізацыі ці кіраўніку.

Моўныя асаблівасці афіцыйна-справавога стылю знаходзяцца ў прамой залежнасці ад жанру і зместу дакумента. Яны абумоўлены задачамі стылю і яго патрабаваннямі – паказаць волю заканадаўцы, прадпісаць паводзіны, данесці што-небудзь да ведама каго-небудзь.

Большасці тэкстаў афіцыйна-справавога стылю ўласцівы **лексічныя асаблівасці:**

1) выкарыстанне стандартных моўных штампаў – устойлівых зваротаў з функцыянальна-стылістычнай афарбоўкай, якія паўтараюцца пры апісанні аднолькавых ці падобных сітуацый, надаючы мове катэгарычнасць, недвухсэнсоўнасць, афіцыйнасць. Да такіх штампаў адносяцца, напрыклад, выразы прыцягнуць *да адказнасці, перадаць у адпаведныя інстанцыі, ставіць у віну, выконваць абавязкі, давесці да ведама, узяць пад кантроль, супрацьпраўныя дзеянні, узяць пад варту, за справаздачны перыяд, прыняць да ўвагі, аказаць супраціўленне, ускласці адказнасць*;

2) ужыванне своеасаблівай афіцыйна-справавой тэрміналогіі з ярка выяўленай функцыянальна-стылістычнай афарбоўкай: *інвентарызацыя, эксгумацыя, канфіскацыя, юрысдыкцыя, апеляцыя, ануляваць, растрата, дэкларацыя, санкцыя, іск, ніжэйпадпісаны і інш.;*

3) выкарыстанне назваў асоб па родзе дзейнасці, пасадзе, прымеце дзеяння: *сведка, арыштаваны, кватэранаймальнік, спаганяльнік, усынаўляльнік, спадчыннік, пацярпелы, пацыент, ісцец, падаткаплацельшчык, кліент, гандляр, прадпрымальнік, абвінаваўца.* Асоб жаночага полу ў афіцыйна-справавых дакументах прынята называць назоўнікамі мужчынскага роду*: дацэнт* Іванова*, дырэктар* Кавалёва*, прадпрымальнік* Кузняцова*, пакупнік* Сіўцова*, абанент* Міхайлава*;*

4) шырокая распаўсюджанасць абстрактнай лексікі: *насельніцтва, кадры, становішча, баланс, санкцыя, іск;*

5) высокая частотнасць складанаскарочаных слоў, якія ў большасці выпадкаў з’яўляюцца назвамі арганізацый і ўстаноў: *ЖЭУ № 9, ЖБК № 229, УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», студсавет*, *прафкам;*

6) адсутнасць эмацыянальна-экспрэсіўна афарбаванай лексікі (усе словы ўжываюцца ў прамым значэнні), а таксама пазалітаратурных сродкаў (дыялектных, жаргонных, прастамоўных, лаянкавых слоў і выразаў);

7) выкарыстанне слоў з процілеглым значэннем: *ісцец – адказчык, абавязкі – правы, крэдытор – даўжнік, давернік – павераны.*

Сярод **марфалагічных рыс** афіцыйна-справавога стылю адзначым наступныя:

1) іменны характар мовы, абумоўлены ўжываннем вялікай колькасці назоўнікаў. Характэрна таксама, што адзін і той жа назоўнік паўтараецца ў суседніх сказах і не замяняецца займеннікам (нагадаем, што ў мастацкім і размоўным стылях такое паўтарэнне з'яўляецца стылістычнай памылкай, таму не дапускаецца). У афіцыйна-справавым стылі такія паўторы неабходныя, бо дазваляюць пазбегнуць незразумеласці, двухсэнсоўнасці;

2) шырокае ўжыванне аддзеяслоўных назоўнікаў з фіналямі ***-нне, -ццё, -асць, -цыя***, у тым ліку з прыстаўкамі ***неда-, без-(бяз-), не-, пера-*: *павелічэнне, непрызнанне, парушэнне, фінансаванне, затрыманне, звальненне, пагадненне, развіццё, непарушнасць, канфіскацыя, недагляд, недавыкананне, бяздзеянне, неаказанне, неправыкананне;*

3) наяўнасць назоўнікаў – назваў асоб з *суфіксамі* ***-чык, -шчык, -ік(-ык), -нік:*** *адказчык, распарадчык, заказчык, скупшчык, давернік, усынаўляльнік, даўжнік, карыстальнік, пакупнік;*

4) выкарыстанне замест дзеясловаў словазлучэнняў «дзеяслоў + назоўнік»: напрыклад, замест дзеяслова *прапанаваць* ужываецца словазлучэнне *выказаць прапановы*, замест *наехаць – здзейсніць наезд*, замест *удзельнічаць – прымаць удзел*, замест *супраціўляцца – аказваць супраціўленне*, замест *уздзейнічаць – аказваць уздзеянне*, замест *кіраваць – ажыццяўляць кіраўніцтва*. Характэрна, што назоўнік у такіх словазлучэннях і дзеяслоў, замест якога ўжыта гэтае словазлучэнне, з'яўляюцца аднакаранёвымі.

5) лічэбнікі пішуцца лічбамі. Выключэннем з'яўляюцца рахункі, даверанасці, распіскі, акты і іншыя дакументы, дзе ў дужках падаецца слоўнае дубляванне лічбы, напрыклад: *Я, Кірылаў Анатоль Сяргеевіч, выкладчык кафедры вылічальнай тэхнікі, атрымаў ад загадчыка лабараторыі вылічальнай тэхнікі 30 (трыццаць) мікракалькулятараў МК-80 для правядзення прак- тычных заняткаў са студэнтамі* (Вытрымка з распіскі);

6) безасабовы характар афіцыйна-справавых папер, адсутнасць дзеясловаў і займеннікаў 1-й і 2-й асобы, распаўсюджанасць дзеясловаў у неазначальнай форме, пры якіх ужываюцца словы *павінна, неабходна, мець права, забараняецца, варта, трэба, абавязаны, тэрмінова і інш. (забараняецца знаходзіцца, неабходна забяспечыць, абавязаны папярэдзіць, тэрмінова выканаць, трэба ўскласці).* Напрыклад: *Кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, адзінаасобна ці сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію ці не спавядаць ніякай, выражаць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць*

у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам (Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь);

7) ужыванне дзеясловаў у форме цяперашняга часу (дакументы з такімі дзеясловамі таксама маюць прадпісальны характар): *Студэнты дапускаюцца да экзаменацыйнай сесіі пры ўмове здачы ўсіх залікаў, прадугледжаных навучальным планам на дадзены семестр* (Вышэйшая школа: пастановы, загады, інструкцыі);

8) частотнасць дзеясловаў залежнага стану (*вядзецца, удасканальваецца, спаганяецца, ахоўваецца, арганізуецца, паляпшаецца, павышаецца, забяспечваецца*), што надае выказванню характар пастаянства, абавязковасці выканання дзеяння: *Копія пастановы на працягу трох дзён уручаецца або высылаецца асобе, у адносінах да якой яна вынесена* (Адміністрацыйны кодэкс); *Мерапрыемствы па забеспячэнні захаванасці помнікаў гісторыі і культуры пры правядзенні будаўнічых, меліярацыйных, дарожных і іншых работ арганізуюцца і каардынуюцца* (Закон Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры);

9) шырокае выкарыстанне дзеепрыметных і дзеепрыслоўных словазлучэнняў; большая, чым у іншых стылях, ужывальнасць субстантываваных прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, у тым ліку незалежнага стану з ***-уч-(-юч-), -ач-(-яч-)*** і залежнага стану на ***-ем-, -ім-,*** якія служаць назвамі асоб: *падсудны, паднаглядны, абвінавачаны, падначалены, арыштаваны, затрыманы, стар- шынствуючы, апякаемы, абвінавачваемы*;

10) ужыванне састаўных адыменных прыназоўнікаў*: у сувязі з распараджэннем, у адпаведнасці з дасягнутым пагадненнем, згодна з планам забудовы мікрараёна, з мэтай паляпшэння экалагічнага становішча*;

11) частае выкарыстанне адмоўнай часціцы ***не*** пры дзеясловах, што надае ім адценне катэгарычнасці, прымусовасці: *Не церпіць адкладу вырашэнне праблемы забеспячэння якаснай пітной вадой жыхароў раёна Ціраспаль* (З распараджэння); *Апеляцыя да вынікаў выканання тэста па прычыне парушэння абітурыентам парадку запаўнення бланка адказаў не разглядаецца* (З інструкцыі).

Сінтаксіс афіцыйна-справавых тэкстаў характарызуецца ўскладненасцю, што прадыктавана катэгарычнасцю, патрабавальнасцю мовы, абавязковасцю выканання дзеяння адрасатам. Апісанне ж умоў, часу, прычын дзеяння патрабуе поўнага і дакладнага выражэння.

Сярод ***сінтаксічных асаблівасцей*** афіцыйна-справавога стылю вылучаюцца наступныя:

1) істотная перавага складаных сказаў над простымі, асабліва складаназалежных з даданай часткай умовы: *Суддзя не мае права прыняць*

заяву аб устанаўленні бацькоўства, калі ў запісе аб нараджэнні дзіцяці бацькам названа пэўная асоба (Каментарыі да Кодэкса аб шлюбе і сям'і Рэспублікі Беларусь);

2) шырокая распаўсюджанасць аднародных членаў сказа, колькасць якіх можа даходзіць да дзесяці і нават больш. Напрыклад: *Устанавіць, што ў 1996–1997 гадах не менш чым 25 працэнтаў плошчы жылых памяшканняў, пабудаваных за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту для прадстаўлення па дагаварах найму грамадзянам, якія маюць адпаведныя льготы, выдзяляецца наступным катэгорыям маладых грамадзян, што стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў: інвалідам; сем'ям загінуўшых або прапаўшых без вестак воінаў; воінам-інтэрнацыяналістам; асобам, пакутуючым цяжкімі формамі некаторых хранічных захворванняў; мнагадзетным сем'ям, якія маюць трох і больш дзяцей; сем'ям пры нараджэнні блізнят; адзінокім маці; удзельнікам ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС* (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь);

3) выкарыстанне такога парадку слоў, пры якім рэма (новае) папярэдняга сказа становіцца тэмай (вядомае) наступнага, што садзейнічае дасягненню лагічнасці, паслядоўнасці выказвання. Напрыклад: *Выканкам выдае ордар на займанне жылога памяшкання. У ордары ўказваецца тэрмін яго дзеяння. На працягу гэтага тэрміна ордар павінен быць здадзены ў домаўпраўленне* (З інструкцыі);

4) прамы парадак слоў, пры якім дзейнік знаходзіцца перад выказнікам, азначэнне – перад азначаемым словам, акалічнасць – бліжэй да азначаемага слова, пабочныя словы – у пачатку сказа (гл. прыклады вышэй).

Афіцыйна-справавому стылю ўласцівы рубрыкацыя і наяўнасць рэквізітаў.

Рубрыкацыя – дзяленне тэксту на састаўныя часткі, графічнае аддзяленне адной часткі ад другой пры дапамозе абзацаў, пунктаў, раздзелаў, глаў, параграфаў і інш.

Рэквізіты – пастаянныя элементы дзелавых папер: назва дакумента, указанне на адрасата і аўтара, выклад сутнасці справы, дата, подпіс аўтара (асобы ці арганізацыі) і г. д. Рубрыкацыя і рэквізіты з'яўляюцца знешнім выражэннем кампазіцыйнай завершанасці тэксту, ствараюць агульную форму дакумента.

Такім чынам, мова афіцыйна-справавых тэкстаў – правільная літаратурная мова без адхіленняў ад агульнапрынятых нормаў. Спецыфіка яе заключаецца ў тым, што пры агульнай функцыі афіцыйна-справавога стылю – паведамляльнай – тут пераважае функцыя моўнага выражэння

абавязковасці, волевыяўлення, прадпісання, што адбіваецца на мэтанакіраваным адборы лесічных, граматычных, сінтаксічных сродкаў.

НАВУКОВЫ СТЫЛЬ

Навуковы стыль абслугоўвае разнастайныя галіны навукі (гуманітарныя, прыродазнаўчыя, дакладныя і інш.), вобласць тэхнікі і вытворчасці і рэалізуецца ў манаграфіях, дысертацыях, навуковых дакладах, артыкулах, рэфератах, тэзісах, вучэбных дапаможніках, падручніках, курсавых і дыпломных работах і інш.

Даследчыкі называюць наступныя функцыі навуковага стылю:

- адлюстраванне рэчаіснасці і захаванне ведаў;
- атрыманне новых ведаў;
- перадача спецыяльнай інфармацыі.

Галоўнай камунікатыўнай задачай зносін у навуковай сферы з'яўляецца выражэнне навуковых паняццяў і вывадаў. Мысленне тут носіць абагульнены, абстрагаваны характар. Адсюль вынікаюць такія рысы навуковага стылю, як абагульненасць, лагічнасць, абстрактнасць, аб'ектыўнасць навуковых сцвярджэнняў, доказнасць, аргументаванасць выкладу, лаканічнасць, інфармацыйная насыча- насць, адсутнасць вобразнасці.

У залежнасці ад характару выкладу, мэты паведамлення і спецыфікі адрасата вылучаюць наступныя **падстылі навуковага стылю:**

1) уласна навуковы (акадэмічны) – рэалізуецца ў тэкстах манаграфій, дысертацый, аўтарэфератаў, дакладаў, артыкулаў. Работы, вытрыманыя ў названым падстылі, прызначаны для вузкага кола спецыялістаў, таму не з'яўляюцца агульнадаступнымі. Вузкаспецыяльныя тэрміны тут звычайна не тлумачацца, эмацыянальнасць выкладу поўнасцю адсутнічае. Разуменне і асэнсаванне такога тэксту патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі;

2) навучальны (вучэбна-навуковы) – выкарыстоўваецца пры напісанні падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, лекцый, курсавых работ, дакладаў, рэфератаў і інш. Тэкстам уласцівыя даступнасць, нязначная эмацыянальнасць, шырокае ўжыванне прыкладаў і іншага ілюстрацыйнага матэрыялу, тлумачэнне тэрмінаў;

3) навукова-папулярны – прадстаўлены ў тэкстах брашур, выступленняў, артыкулаў. Матэрыял агульнадаступны, разлічаны на шырокае кола чытачоў і слухачоў, не патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі, уключае цікавыя звесткі, факты, прыклады. Выкладанне эмацыянальнае,

вузкаспецыяльныя тэрміны не ўжываюцца.

Жанры навуковага стылю:

Артыкул – невялікі твор у газеце/часопісе, які змяшчае інфармацыю па розных навуковых пытаннях адпаведных галін ведаў.

Аўтарэферат – кароткі пераказ якога-небудзь даследавання, напісаны самім аўтарам.

Водзыў – навуковая праца-меркаванне з ацэнкай (водгук на манаграфію).

Дапаможнік – кніга для навучання па якім-небудзь адным прадмеце.

Дыпломная работа – самастойнае навуковае даследаванне, праведзенае студэнтам.

Дысертацыя – навуковая праца, якая публічна абараняецца аўтарам на пасяджэнні вучонага савета для атрымання вучонай ступені.

Лекцыя – вусны выклад вучэбнага прадмета, як правіла, у вышэйшай навучальнай установе.

Манаграфія – навуковы твор, што даследуе адно якое-небудзь пытанне, асвятляе адну тэму.

Рэцэнзія – крытычны водзыў, ацэнка навуковага ці іншага твора (можа быць ацэнка публіцыстычнага, мастацкага твора, а таксама спектакля, кінафільма).

Слоўнік – даведачная кніга, якая змяшчае словы (марфемы, словазлучэнні, выразы і пад.), размешчаныя ў пэўным парадку, тлумачыць значэнні ўключаных адзінак, дае розную інфармацыю пра іх ці пераклад на іншую мову, паведамляе звесткі пра пэўныя прадметы.

Тэзісы – палажэнні, якія коратка перадаюць асноўныя думкі з дакладаў, лекцый.

Энцыклапедыя – навуковы даведачны дапаможнік у форме слоўніка, дзе змешчаны звесткі па ўсіх ці асобных галінах ведаў.

Сярод **лексічных асаблівасцей** навуковага стылю вылучаюцца наступныя:

1) тэрміналагічны характар мовы, што дасягаецца шырокім ужываннем тэрмінаў. Усе тэрміны, якія выкарыстоўваюцца ў навуковых тэкстах, умоўна можна падзяліць на тры групы:

- тэрміны агульнанавуковага ўжывання, якія выкарыстоўваюцца ў розных галінах ведаў, напрыклад, *крызіс*, *адаптацыя, рух, жывы, цвёрды, цяжкі.* У канкрэтным тэксце такія тэрміны рэалізуюць адно значэнне, уласцівае ім у той галіне ведаў, якой прысвечаны тэкст;
- вузкаспецыяльныя тэрміны пэўнай галіны навукі, напрыклад, лінгвістычныя тэрміны *прэфіксацыя, інтэрфікс, нулявая суфіксацыя, сузалежнае падпарадкаванне*;

• запазычаныя тэрміны, якія перадаюцца сродкамі мовы-крыніцы, напрыклад, *homo sapiens* ‘чалавек разумны’, *singularia tantum* ‘адзіночналікавыя’, *pluralia tantum* ‘множналікавыя’;

2) адсутнасць эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі, усе словы ўжываюцца зпрамым значэннем. Аднак поўнасцю адмаўляць эмацыянальнасць і вобразнасць у названым стылі нельга: яны ўласцівы ў першую чаргу навукова-папулярным тэкстам, а таксама палемічнай і навучальнай літаратуры, бо актывізуюць увагу чытача. Акрамя гэтага, многія тэрміны ўзніклі на аснове пераносу сэнсу, напрыклад, *корань слова;*

3) шырокае выкарыстанне абстрактнай лексікі: *мысленне, адлюстраванне, гіпотэза, аргумент, абстракцыя, значымасць, аспект, функцыя.* Абагульнены характар тэкстам надаюць словы *звычайна, заўсёды, пастаянна, сістэматычна, рэгулярна, усякі, кожны, любы;*

4) частотнасць складанаскарочаных слоў, якія з’яўляюцца тэрмінамі, напрыклад: *ЛСГ* (лексіка-семантычная група), *ФА* (фразеалагічная адзінка);

5) ужыванне скарачэнняў, умоўных абазначэнняў, формул, графікаў, схем, дыяграм: *5 см;*

6) наяўнасць фразеалагічных словазлучэнняў тэрміналагічнага характару: *санорныя гукі, дзеепрыслоўнае словазлучэнне, адкрыты рад аднародных членаў.* Такія словазлучэнні ўзнікаюць са свабодных спалучэнняў на аснове пераносу, але з цягам часу экспрэсіўнасць і вобразнасць у іх сціраюцца і словазлучэнні становяцца састаўнымі тэрмінамі;

7) адсутнасць нелітаратурнай лексікі – жарганізмаў, дыялектызмаў, размоўных, грубых, лаянкавых слоў.

Навуковаму стылю ўласцівы наступныя **м а р ф а л а г і ч н ы я р ы с ы :**

1) іменны характар мовы, перавага іменных часцін мовы над дзеясловамі;

2) шырокае выкарыстанне абстрактных назоўнікаў з фіналямі ***-нне, -цыя, -асць, -ка:*** *рашэнне, выкарыстанне, ужыванне, даследаванне, вывучэнне, сістэматызацыя, класіфікацыя, магчымасць, абумоўленасць.* Як бачна, многія з такіх назоўнікаў з’яўляюцца аддзеяслоўнымі;

3) расшчапленне выказніка: ужыванне спалучэнняў *знаходзіць прымяненне, аказваць уплыў, рабіць разлікі, рабіць назіранні,* замест адпаведных дзеясловаў *прымяняць, уплываць, разлічваць, назіраць;*

4) адсутнасць дзеясловаў у форме 1-й і 2-й асобы, большасць дзеясловаў ужыта ў форме 3-й асобы цяперашняга часу: увага сканцэнтравана на змесце, а не на суб’екце дзеяння, дзеясловы абазначаюць пастаянныя ўласцівасці, прыметы, якія з’яўляюцца пазачасавымі. Пры гэтым асабовы займеннік ***ён (яна, яно, яны)*** паказвае

на паняцце, з’яву, тэрмін, а не на асобу. Напрыклад: *Коска ставіцца паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа, калі яны маюць адносіны пералічэння і цесную сэнсавую сувязь паміж сабой; Па структуры ўсе прозвішчы падзяляюцца на першасныя і другасныя;*

5) ужыванне складаных слоў з каранёвымі марфемамі грэча- скага і лацінскага паходжання ***аэра-*** ‘паветра’, ***баты-*** ‘глыбокі’, ***гала-*** ‘соль’, ***геа-*** ‘;

6) адсутнасць асабовых займеннікаў ***я, ты, вы.*** Наяўнасць дадатковых сэнсавых адценняў узайменніка ***мы,*** які можа абазначаць ‘мы сумеснасці’ (мы з вамі) і выражаць саўдзел са слухачом ці чытачом. Займеннік *мы* выкарыстоўваецца таксама для абазначэння любой асобы, чалавека ўвогуле: *мы можам прасачыць; мы выявім найбольш ужывальныя формы.*

Формы 1-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў і займеннік *я* ў навуковай літаратуры не ўжываюцца, бо ўвага тут сканцэнтравана на змесце выкладу, а не на суб’екце. Нярэдка займеннік у сказе зусім адсутнічае.

Не выкарыстоўваюцца формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку як канкрэтныя, што абазначаюць аўтара маўлення і адрасата. У навуковых тэкстах аўтар і адрасат адхілены, бо тут важна не хто гаворыць, а пра што гавораць. Адрасатам навуковай інфармацыі з’яўляецца не канкрэтная асоба, а нявызначанае шырокае кола людзей;

7) частотнасць дзеясловаў незакончанага трывання, якія называюць пастаянную ўласцівасць, дзеянне: *дзеяслоў спрагаецца назоўнік скланяецца, металы ўступаюць у рэакцыю з кіслотамі;*

8) ужыванне абстрактных і рэчыўных назоўнікаў у форме множнага ліку, што вядзе да іх канкрэтызацыі і тэрміналагізацыі: *блакітныя гліны, санорныя гукі;*

9) перавага аналітычнай (складанай) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання прыметнікаў над сінтэтычнай (простай): *найбольш распаўсюджаныя, больш эфектыўныя, менш прадуктыўныя.* Пры гэтым найбольш характэрна ўтварэнне найвышэйшай ступені пры дапамозе прыслоўяў *найбольш, найменш,* зрэдку далучаецца слова *вельмі,* слова ж *самы* практычна не выкарыстоўваецца. Сінтэтычная форма амаль не ўжываецца, бо з’яўляецца эмацыянальнай;

10) высокая частотнасць састаўных адыменных злучнікаў і прыназоўнікаў *пры дапамозе, у сувязі з, у адпаведнасці з, у параўнанні з, у якасці, у выніку, па прычыне, на аснове, у адносінах, у залежнасці ад;*

11) перавага адносных прыметнікаў над якаснымі і прыналежнымі: *Славяне, як правіла, даюць сваім дзецям кананічныя імёны, што прыйшлі*

да нас разам з прыняццем хрысціянства; Знешняя форма, гучанне ўласнага імені нярэдка з'яўляецца паказчыкам таго, прадстаўнік якой народнасці або нацыянальнасці перад намі; Як вядома, славянскім і іншым антрапанімным сістэмам здаўна ўласціва традыцыя называць чалавека па месцы яго нараджэння або жыхарства;

12) прадуктыўнасць формаў роднага склону назоўнікаў, якія пераважаюць над астатнімі формамі і выступаюць, як правіла, у ролі азначэння: *рэакцыя далучэння, асіміляцыя гукаў, супастаўленне нашых назіранняў з матэрыяламі дыялектных атласаў.* Нярэдка назіраецца нанізванне формаў роднага склону, напрыклад: *вывучэнне тэрытарыяльных асаблівасцей размяшчэння прозвішчаў;адносна першага спосабу аб'яднання слоў.* Пасля роднага склону па частотнасці ўжывання стаяць формы назоўнага і вінавальнага склонаў; у складзе пасіўных канструкцый распаўсюджаны формы творнага склону: *адкрыты Дарвінам, вынайдзены Мендзялеевым, сфармуляваны Арыстоцелем.*

Імкненне да інфармацыйнай насычанасці дыктуе наступныя **сінтаксічныя асаблівасці** навуковага стылю:

1) перавага розных па структуры складаных сказаў над простымі. Сярод складаных найбольш распаўсюджаны злучнікавыя, сярод простых – няпэўна-асабовыя аднасастаўныя, абагульнена-асабовыя і безасабовыя;

2) сярод злучнікавых сказаў найчасцей ужываюцца складаназалежныя, для якіх характэрна наступнае: асноўную інфармацыйную нагрузку нясе даданая частка, галоўная ж пазбаўлена ці амаль пазбаўлена зместу і служыць для пераходу ад адной думкі да другой. Тыповымі з'яўляюцца такія канструкцыі ў ролі галоўнай часткі: *Варта адзначыць, што...*; *Неабходна падкрэсліць, што...*; *Вартай увагі падаецца думка, што...*; *Матэрыял даследавання паказвае, што...*; *Нашы назіранні выявілі, што...* . Замест прыведзеных вышэй складаназалежных могуць выкарыстоўвацца таксама складаныя бяззлучнікавыя сказы накшталт *Варта адзначыць наступнае:* ...; *Матэрыял даследавання паказвае наступнае:* ...; *Нашы назіранні выявілі наступнае:* ...;

3) частотнасць сказаў з састаўным іменным выказнікам, што абумоўлена задачай навуковых тэкстаў – вылучаць прыметы, уласцівасці, якасці даследаваных з'яў і прадметаў;

4) шырокае выкарыстанне пабочных канструкцый прыслоўяў, злучнікаў *па-першае, па-другое, такім чынам, значыць, з аднаго боку, з другога боку, затым, таму, пагэтаму, у выніку, так, нарэшце,* якія лагічна звязваюць часткі тэксту;

5) прамы парадак слоў: *Лінгвістычныя карты ілюструюць наяўнасць пэўных макраарэалаў – значных па плошчы зон, дзе*

прадуктыўнасць або ступень лакалізацыі прозвішчаў прыкладна супадае (З дысертацыі);

6) ускладненасць сказаў дзеепрыслоўнымі і дзеепрыметнымі словазлучэннямі, аднароднымі членамі, устаўнымі і ўдакладняльнымі канструкцыямі. Пры гэтым называецца крыніца інфармацыі, канкрэтызуецца, абмяжоўваецца аб'ём, што спрыяе сэнсавай дакладнасці і інфармацыйнай насычанасці. Напрыклад: *Энцыклапедычныя (ад грэч. enkyklopaideia – кола ведаў) слоўнікі – даведачныя навуковыя выданні, якія ў сціслай форме змяш- чаюць звесткі па ўсіх ці асобных галінах навукі. У залежнасці ад аб'ёму энцыклапедыі падзяляюцца на вялікія (некалькі дзясяткаў тамоў ці больш за дзесяць), напрыклад, «Большая Советская Энциклопедия» (30 т.), «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (12 т.), і малыя, або кароткія (чатыры-шэсць тамоў) – «Беларуская ССР: Кароткая Энцыклапедыя» (5 т.), і адна-, трохтомныя, якія звычайна называюцца энцыклапедычнымі даведнікамі – «Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік»* [63, с. 99];

7) апавядальны характар мовы, адсутнасць пытальных і клічных сказаў. Некаторыя даследчыкі адзначаюць, што неагульнадаступнасць навуковага стылю – гэта не характэрная яго рыса, а вынік індывідуальнага стылю прац асобных аўтараў, якія, імкнучыся да залішняй «навуковасці», злоўжываюць спецыяльнай тэрміналогіяй. М. Я. Цікоцкі прыводзіць наступны прыклад двух тоесных па змесце сказаў, першы з якіх напісаны зразумелай навуковай мовай, а другі – псеўданавуковым (гелертэрскім) стылем:

ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ СТЫЛЬ

Публіцыстычны стыль – функцыянальная разнавіднасць літаратурнай мовы, якая выкарыстоўваецца ў сродках масавай інфармацыі, агітацыйна-прапагандысцкіх выступленнях. Названы стыль выконвае дзве функцыі: *інфармацыйную* (паведамленне пра навіны, падзеі, з'явы грамадскага жыцця) і *агітацыйную* (фарміраванне грамадскай думкі, правядзенне ў жыццё пэўнай палітыкі, ідэалогіі). Публіцыстычныя творы ўздзейнічаюць на розум чытачоў і слухачоў шляхам лагічных доказаў і экспрэсіўнага пераканання, а на пачуцці – праз эмацыянальнасць і вобразнасць мовы. Публіцыстыка – гэта слоўнае мастацтва, дзе важна не толькі, што гаворыцца, але і як гаворыцца.

У публіцыстыцы адкрыта выяўляецца пазіцыя аўтара, які не толькі апісвае падзеі і факты, але і выражае свае адносіны да іх. Эмацыянальна-экспрэсіўная афарбоўка названага стылю адрозніваe яго ад навуковай і афіцыйна-справавой мовы.

Сярод агульных рыс публіцыстыкі варта адзначыць таксама агульнадаступнасць, падкрэслены сацыяльны характар, уключэнне элементаў іншых стыляў, стандартызаванасць, часам нават шаблоннасць выражэння думкі.

З усіх функцыянальных стыляў публіцыстычны – самы разгалінаваны. У ім вылучаюць наступныя **падстылі:**

1) *газетна-публіцыстычны;*
2) *радыёжурналісцкі і тэлежурналісцкі;*
3) *аратарскі (палітычнае красамоўства).*

Выбар моўных сродкаў абумоўлены не столькі падстылем, колькі жанрам публіцыстыкі. Жанры таксама дзеляцца на групы:

1) інфармацыйныя (рэпартаж, інтэрв'ю, інфармацыя, хроніка);
2) аналітычныя (карэспандэнцыя, рэцэнзія, артыкул, агляд, пісьмо);
3) мастацка-публіцыстычныя (нарыс, замалёўка, фельетон, памфлет, эсэ).

Вылучаюць інфармацыйныя, аналітычныя і мастацка-публіцыстычныя жанры публіцыстычнага стылю.

І н ф а р м а ц ы й н ы я ж а н р ы :

Інтэрв'ю – гутарка журналіста з адной ці некалькімі асобамі па якіх-небудзь актуальных пытаннях. Мае патрэбу ў дэталі, у цікавай фактычнасці, якая не проста ўпрыгожвае матэрыял, а надае сваёй нечаканасцю дадатковую сэнсавую нагрузку, дазваляе ўбачыць з'яву з нечаканага боку. Задача, якая стаіць перад карэспандэнтам, – апрацаваць мову так, каб яна падыходзіла да кніжна- літаратурнай нормы і ў той жа час мела адценне размоўнага стылю, каб за праўкамі не прапала індывідуальнасць маўлення субяседніка.

Інфармацыя – кароткае паведамленне пра становішча спраў у пэўнай галіне, аб чыёй-небудзь дзейнасці.

Рэпартаж – аператыўнае паведамленне ў друку, на радыё ці тэлебачанні пра якія-небудзь здарэнні, падзеі, сведкам ці ўдзельнікам якіх з'яўляецца сам карэспандэнт.

Хроніка – кароткае паведамленне пра значны факт (падзею), абавязкова з указаннем на дату, месца (мае, як правіла, гістарычны характар).

А н а л і т ы ч н ы я ж а н р ы (ім уласціва абагульненнефактаў, вывады):

Агляд – некалькі кароткіх паведамленняў пра з'явы, падзеі, факты, якім-небудзь чынам аб'яднаныя паміж сабой (агляд падзей культуры – сферай, можа быць звязаны часам, месцам: мінскія/ віцебскія навіны і г. д.).

Артыкул – публіцыстычнае сачыненне на актуальную, злабадзённую

тэму (абавязкова мае сюжэт: завязка (уступ), фактычна замацаванае развіццё думкі, вывады (развязка)).

Карэспандэнцыя – паведамленне пра падзеі, дасланыя аднекуль у газету, часопіс.

Рэцэнзія – крытычны водзыў на раней змешчаны ў перыёдыцы матэрыял або на спектаклі, выставы ці іншыя падзеі грамадска-культурнага жыцця.

Ліст (пісьмо) – пішацца ў адвольнай форме, змяшчае ацэнку чытачом/слухачом сучасных з'яў, фактаў, падзей сацыяльнага, грамадска-палітычнага характару.

Мастацка-публіцыстычныя жанры (мастацкае асэнсаванне сацыяльных, грамадска-палітычных, гістарычных, культурных падзей, фактаў):

Замалёўка – аповед, звычайна невялікага памеру (эмацыянальна-эсэістычнага характару), пра жыццё, сусвет, з'явы з разнастайнымі філасофскімі вывадамі; часам мае дачыненне да ўласнага жыцця карэспандэнта.

Нарыс – дакументальны твор, які апавядае (аналізуе) аб разнастайных фактах і з'явах грамадскага жыцця з аўтарскім іх тлумачэннем, з лірычнымі адступленнямі (апісанні прыроды, разважанні аўтара), каб чытач мог адпачыць ад фактаў, лічбаў, дат.

Памфлет – злабадзённы публіцыстычны твор, мэта і пафас якога – сацыяльна-палітычнае выкрыццё, што дасягаецца шляхам выкарыстання сродкаў сатыры.

Фельетон – жанр, які выяўляе востра-крытычныя адносіны да чалавека, з'явы, прадмета гумарыстычнымі і сатырычнымі прыёмамі.

Эсэ – празаічна-публіцыстычны твор навукова-гістарычнага, крытычнага, філасофскага характару, напісаны ў адвольнай форме. Для яго неабавязковыя сістэматычнасць, аргументаванасць, аднак абавязковыя вобразнасць, афарыстычнасць, суб'ектыўнасць, індывідуальная інтанацыя аўтара, яго імкненне да самавыяўлення, самааналізу.

Лексічныя асаблівасці публіцыстычнага стылю:

1) шырокае ўжыванне грамадска-палітычнай лексікі, у якую ўваходзяць назвы палітычных, філасофскіх, сацыяльна-эканамічных напрамкаў, класавых, партыйных, ідэалагічных паняццяў, грамадска-палітычных падзей і інш.: *прагрэс, дэмакратыя, рэферэндум, публічнасць, апартэід, плюралізм, тэрарызм, шавінізм, экстрэмізм;*

2) выкарыстанне газетызмаў – слоў і выразаў, якія найчасцей сустракаюцца на старонках перыядычнага друку: *пасланец, міралюбівы, пазітыўны, гарант, альтэрнатыва, перадавік, місія, форум, візіт,*

інцыдэнт, кансалідацыя, дапусціць пралікі ў рабоце, падрастаючае пакаленне. Як бачна, газетызмы нярэдка маюць станоўчую або адмоўную ацэначнасць;

3) стандартызаванасць, якая выражаецца ў выкарыстанні гатовых устойлівых выразаў тыпу *вытрымаць экзамен на сталасць, пакет прапаноў, даць пуцёўку ў жыццё, удзельнікі мелі магчымасць, далейшае ўдасканаленне і развіццё, прыняць меры па ліквідацыі.*

Такія і падобныя спалучэнні дапамагаюць аўтарам напісаць публіцыстычны твор за кароткі час. Аднак залішняя «заштампаванасць» надае тэкстам адценне штучнасці, афіцыйнасці, пазбаўляе іх вобразнасці і эмацыянальнасці. Як негатыўны факт успрымаецца ўжыванне пры словах пастаянных, традыцыйных азначэнняў (так званых слоў-спадарожнікаў), у якія не заўсёды ўкладаецца належны сэнс: *заслужаны адпачынак* ‘пенсія’, *гарачая падтрымка, карэнныя пераўтварэнні*, *радыкальныя меры, вострая крытыка, значны ўклад.* Імкненне некаторых журналістаў абавязкова, ва ўсіх выпадках, гаварыць эмацыянальна і вобразна непазбежна прыводзіць да ўзнікнення штампаў, і чытач, наглытаўшыся “вобразных” трафарэтаў накшталт чорнага або белага золата, пачынае сумаваць па звычайным, простым, канкрэтным слове;

4) наяўнасць адзінак, якія набываюць выразную публіцыстычную афарбоўку пры ўжыванні ў пераносным значэнні. Напрыклад, словы *арэна, школа, платформа, людзі* ў прамым значэнні не маюць функцыянальна-стылістычнай афарбоўкі (*арэна цырка, базавая школа, чыгуначная платформа, шчырыя людзі*), у пераносным жа значэнні яны такую афарбоўку набываюць: *арэна палітычнай барацьбы, школа выжывання*, *палітычная платформа, людзі добрай волі.* У пераносным значэнні выкарыстоўваюцца тэрміны з вобласці спорту (*апошні раўнд сустрэчы*), ваеннай справы (*армія беспрацоўных, фронт барацьбы, увесці ў строй*), навукі (*атмасфера даверу, дыялог паміж краінамі*), мастацтва (*палітычны спектакль, закуліcныя перагаворы*) і інш.;

5) увядзенне ў тэксты нядаўна запазычаных слоў: *біл(г)борд* ‘рэкламны шчыт’, *графіці, бігмак, брэйкер* і інш. Напрыклад: *Па загадзе прэзідэнта з білбордаў на цэнтральных вуліцах Мінска знялі твары і целы замежных мадэляў; Сацыяльны работнік – сапраўдная квінтэсенцыя разнастайных пазнанняў і тэорый, уменняў і магчымасцей.*

Працэс пранікнення названых адзінак у друк з кожным годам становіцца ўсё больш інтэнсіўным. Лінгвісты выказваюць думку, што без многіх запазычаных слоў, якія прыходзяць у нашу мову праз публіцыстыку, мы можам абысціся. Таму ўжываць іх трэба з улікам тэматыкі, сэнсавай і эстэтычнай мэтазгоднасці;

6) частотнасць складаных і складанаскарочаных слоў (*непаўналетнія*), абрэвіятур: *Беларускі саюз прадпрымальнікаў (БСП) і прафсаюз «Садружнасць» намераны аспрэчыць у Канстытуцыйным судзе (КС)...;*

7) ужыванне эмацыянальна-ацэначнай лексікі, слоў з пераносным значэннем: *Створанае ім [Максімам Багдановічам] вытрымала выпрабаванне часам і не толькі не паблякла, а, наадварот, яшчэ ярчэй зазіхацела, здзіўляючы сваім харaством увесь славянскі свет;*

8) выкарыстанне нелітаратурных моўных сродкаў – дыялектызмаў, жарганізмаў, варварызмаў, экзатызмаў, размоўнай і прастамоўнай лексікі: *Новы альбом [гурта «Глюкоза»] пастаянна дапісваецца, перарабляецца. У Макса Фадзеева фантан ідэй. Мне здаецца, альбом атрымаецца проста «зэ бэст». Незвычайны, моцны; Як звычайна, на ростанях зімы і вясны, калі яўрэі адзначаюць сваё старадаўняе свята Пурым, у Віцебску адбыўся ўжо традыцыйны для горада Міжнародны фестываль «пурымшпляў» – тэатралізаваных прадстаўленняў, прысвечаных нацыянальнай урачыстасці еўрапейскіх яўрэяў;*

9) увядзенне ў тэксты аўтарскіх неалагізмаў, якія з'яўляюцца яркім вобразным сродкам: *І праўда, пахарашэла Камароўка. Толькі пасля будаўнічага еўрашухеру тавар харчовы падаражэў ці не ўдвая;*

10) шырокае выкарыстанне фразеалогіі (у вузкім і шырокім сэнсе). Прыказкі, прымаўкі, крылатыя выслоўі і ўласна фразеалагізмы нярэдка становяцца загалоўкамі публіцыстычных твораў: *Абвяла вакол пальца; Новае – гэта забытае старое; Хто ў лес, а калгасы – па дровы; Саюз прайшоў агонь, ваду, але спатыкнуўся на газавых трубах; Любіш катацца – за саначкі плаці; Талачын – горад кантрастаў.*

Як бачна з прыведзеных прыкладаў, устойлівыя спалучэнні нярэдка ўжываюцца ў зменeным, ператвораным і абноўленым выглядзе, набываючы пры гэтым новыя сэнсава-экспрэсіўныя адценні і становячыся фразеалагічнымі неалагізмамі;

11) ужыванне тэрміналагічнай лексікі ў тэкстах, прысве- чаных пытанням навукі, тэхнікі, эканомікі культуры. Нярэдка тэрміны пераасэнсоўваюцца, набываюць нехарактэрнае значэн- не, абыгрываюцца аўтарамі:

Восень – дзіўная пара: прыгожая, каляровая, але і каварная. Сягоння цёпла, заўтра холадна... Сезон абвастрэння розных хвароб. Людзі хварэюць на грып, прастуду – гэта хваробы часовыя. А бываюць яшчэ хваробы прафесійныя, напрыклад, «філалагічная хвароба».

Гісторыя хваробы выглядае так: пачынаецца яна ў шаснаццаці- або сямнаццацігадовым узросце, якраз у той момант, калі чалавек рашае,

што яму трэба (проста неабходна!) быць філолагам.

Прагрэсуе названая хвароба звычайна на працягу ўсяго пе- рыяду навучання.

Сімптомы наступныя: «хворы» чытае ўсё, што бачыць, шукае граматычныя памылкі, вызначае жанравую прыналежнасць тэксту. Звычкай «хворага» становіцца лінгвістычны аналіз (часам нават на падсвядомым узроўні).

Станоўчае тое, што абвастрэнне не выклікае пабочных эфектаў і прыносіць толькі карысць. Адзінае – «хвароба» цяжка паддаецца лячэнню, нярэдка пераходзіць у хранічную форму. Часам бывае заразнай.

Словам, хварэйце на здароўе! (З газеты);

12) частотнасць вобразных сродкаў мовы (гл. урыўкі, пададзеныя вышэй).

Марфалагічныя асаблівасці публіцыстычных тэкстаў:

1) ужыванне адзіночнага ліку назоўнікаў у значэнні множнага: *Няшчодрая зямля прывучыла калісьці беларуса да разліку ў вядзенні гаспадаркі, да ашчаднасці, да таго, што «нішто не прападае», усё ідзе ў справу, нават падабраны цвік, нават лясіна ці калода, прыплаўленая ракой, і, аднак, дужа памыліўся б той, хто назваў бы яго скупым. Беларус якраз адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе* (У. Караткевіч); *Пунктуальнасць нарадзілася раней за немца* (У. Караткевіч);

2) выкарыстанне назоўнікаў, якія не паддаюцца лічэнню, у форме множнага ліку: *размовы, свабоды, настроі, пошукі.* Пры гэтым некаторыя з лексем набываюць асаблівае, спецыфічнае значэнне, напрыклад, *улады* ‘сукупнасць асоб, якім уласцівы найвышэйшыя паўнамоцтвы’ (гарадскія ўлады): *Гарадскія ўлады звярнулі ўвагу на неабходнасць азеляненння цэнтральных вуліц горада* (З газеты);

3) ужыванне формаў загаднага ладу: *Паважаныя чытачы! Вашы прапановы і пажаданні накіроўвайце (дасылайце) у рэдакцыю газеты!* Такія формы нярэдка выкарыстоўваюцца ў загалоўках як сродак актывізацыі ўвагі чытача, напрыклад: *Апраніся ў кімано, абмахніся веерам; Прападзі, грыбок вялікі і маленькі;*

4) прадуктыўнасць формаў роднага склону назоўнікаў: *падвядзенне вынікаў, , забруджванне навакольнага асяроддзя, прыняцце рашэння;*

5) выкарыстанне формаў цяперашняга і прошлага часу дзеясловаў;

6) вялікая колькасць адмоўных часціц ***не, ні,*** часціцы ***ж (жа)*** ва ўзмацняльнай функцыі, а таксама часціц ***нават, усяго толькі:*** *Здаецца, пытанне вырашаецца вельмі проста: небяспечныя атамныя станцыі – не*

выкарыстоўваць. Жылі ж людзі калісьці і без іх. Жылі ж людзі і без электрычнасці (З газеты);

7) выкарыстанне вытворных прыназоўнікаў больш частае, чым невытворных: *на шляху, на аснове, на базе, у бок, у вобласці, у якасці, у ходзе, у імя, у духу, у інтарэсах, з улікам* і інш.;

8) ужыванне займенніка ***мы*** са значэннем ‘група, супольнасць людзей, у якую ўваходзіць і сам апавядальнік’, што збліжае чытача і слухача з публіцыстам, надае выказванню адценне шчырасці і нязмушанасці: *Якая яна, мая зямля? Гэта ў мінулым гераічная і шматпакутная зямля. Безліч разоў грукаталі па ёй калясніцы вайны. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі не была агрэсарам* (У. Караткевіч).

Сінтаксічныя асаблівасці публіцыстычнага стылю выражаюцца ў тым, што ў ім у адпаведнасці са зместам і жанрам твора функцыянуюць усе тыпы сказаў, як простых, так і складаных. Сярод іншых рыс варта адзначыць наступныя:

1) вялікая колькасць экспрэсіўных канструкцый, сярод якіх ужываюцца рытарычныя пытанні, форма «пытанне – адказ» (публіцыст задае пытанне і сам на яго адказвае), клічныя сказы, градацыя, паўторы, парцэляваныя канструкцыі і інш. Напрыклад: *Пра сябе як паэта ён [Максім Багдановіч] заявіць адразу і адразу ж упэўненай хадой пойдзе наперад, пераадольваючы цяжкасці* (А. Бачыла); *А праз паўгода я не пазнаў Васіля. Мажны, лянівасыты, як кот на канапе. Праходжваўся па вуліцы Кульман. Парукаліся. Цікаўлюся пра жыццё* (З газеты);

2) інверсійны парадак слоў: *Хлеб – аснова жыцця. Хлеб надзённы й хлеб духоўны, ім трываліцца людства. Хлеб з зерня – з кроплі вечнасці, а зерне сведчыць пра неўміручасць жыцця. Подавы хлеб, каравай вясельны паўтараюць аблічча сонца. Хлебам вымяраецца праца, хлебам вымяраецца багацце, хлебам вымяраецца вартасць хлебароба* (Р. Барадулін);

3) інфінітыў у ролі галоўных членаў сказа: *Жыць – Радзіме служыць; Вучыцца – мучыцца?* (З газеты);

4) адсутнасць дзеяслоўнага выказніка, што надае маўленню яркасць і экспрэсіўнасць: *Цэнтр – Віцебску; За грыбы – абсталяванне; Мільёны – у фонд Чарнобыля* (З газеты);

5) ужыванне састаўных іменных выказнікаў, што вядзе да вылучэння прымет, якасцей прадметаў, а не засяроджвання ўвагі на дзеянні: *І наперакор вялікадзяржаўным скептыкам, якія не прызнавалі за беларускай мовай яе самастойнасці, [Максім Багдановіч] дакажа, што яна ніколькі не бяднейшая і не горшая за іншыя мовы, што ёй падуладны ўсе віды і жанры, зведаныя і асвоеныя высокаразвітымі літаратурамі, і што на ёй можна паспяхова перадаваць найтанчэйшыя адценні чалавечых пачуццяў*

(А. Бачыла);

6) увядзенне цытат, простай і няўласна-простай мовы: *«Хлеб наш надзённы дай нам сёння», / – моліць людства Звышняга ўжо якое тысячагоддзе* (Р. Барадулін).

Лінгвісты адзначаюць таксама наступныя **г р а м а т ы ч н ы я а с а б л і в а с ц і** публіцыстычнага стылю:

1) уласныя імёны з суфіксамі ***-чын-(-шчын-):*** *Віцебшчына, Брэстчына, Лагойшчына;*

2) суб'ектыўна-ацэначныя фарманты ў назоўніках, прыметніках, прыслоўях: *пчолка, маленькі, высачэзны, нізка-нізенька.*

Такім чынам, для мовы публіцыстыкі характэрна спалучэнне лагічнага і вобразнага, рацыянальнага і эмацыянальнага. У гэтым стылі, як ні ў якім іншым, аўтар мае магчымасць праявіць сваю індывідуальнасць як словатворца, як чалавек і як грамадзянін. Кожны публіцыстычны твор – гэта адбітак асобы аўтара, ілюстрацыя яго светабачання і светаразумення.

МАСТАЦКІ СТЫЛЬ

Мастацкі стыль, або стыль мастацкай літаратуры, займае асаблівае месца сярод іншых функцыянальных стыляў. Ён ужываецца ў эстэтычнай сферы зносін, задавальняе духоўныя патрэбы грамадства. Усе моўныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым стылі, падпарадкаваны функцыі эстэтычнага ўздзеяння на чытача або слухача. Яны цесна звязаны з ідэйна-кампазіцыйнымі задачамі твора, індывідуальнымі рысамі і мастацкім майстэрствам аўтара, асаблівасцямі таго асяроддзя, якое апісваецца.

Пытанне пра месца мастацкага стылю ў сістэме функцыянальных стыляў вырашаецца па-рознаму. Адны даследчыкі (В. У. Вінаградаў, Р. А. Будагаў, М. М. Кожына, А. Н. Васільеў, Б. М. Галавін) уключаюць яго ў сістэму функцыянальных стыляў. Другія (Л. Ю. Максімаў, М. А. Мяшчэрскі, М. М. Шанскі, Д. М. Шмялёў, В. Д. Бандалетаў) сярод функцыянальных стыляў не называюць мастацкага, вылучаючы такую моўную катэгорыю, як мова мастацкай літаратуры, і аргументуючы гэта наступным:

1) мова мастацкай літаратуры не ўваходзіць у паняцце літаратурнай мовы;

2) стылю мастацкай літаратуры ўласціва незамкнёнасць: у яго ўключаюцца сродкі іншых функцыянальных стыляў;

3) мастацкі стыль выконвае асаблівую, эстэтычную функцыю, якая выражаецца ў даволі спецыфічным адборы моўных сродкаў.

Сапраўды, мова мастацкай літаратуры і літаратурная мова – паняцці нераўназначныя. Літаратурная мова – унармаваная, узорная, правільная мова, у ёй не дапускаецца ўжыванне дыялектыз- маў, жарганізмаў, грубых і лаянкавых слоў, індывідуальна- аўтарскіх неалагізмаў і іншых пазалітаратурных сродкаў. Мова ж мастацкай літаратуры – паняцце больш шырокае, чым літаратурная мова: яна нярэдка выходзіць за межы літаратурнай мовы і ўключае нелітаратурныя элементы, а таксама сродкі і нават урыўкі з розных функцыянальных стыляў (афіцыйна-справавога, публіцыстычнага, навуковага, размоўнага), што абумоўлена зместам твора, аўтарскай задумкай, у тым ліку стылізацыяй.

Стылізацыя – мэтанакіраванае ўзнаўленне ў мастацкіх творах моўных асаблівасцей стылю пэўнай эпохі, літаратурнага напрамку, сацыяльнага асяроддзя, індывідуальнай манеры пісьменніка, выбраных аўтарам у якасці аб’екта пераймання (імітацыі). Навукоўцы вылучаюць наступныя віды стылізацыі:

1) стылізацыя, арыентаваная на фальклорныя жанры;

2) гістарычная стылізацыя, якая аднаўляе пэўную эпоху, побыт, звычаі, асаблівасці мовы тагачасных людзей;

3) сацыяльная, якая дае магчымасць перадаць псіхалогію, інтэлектуальны і маральны ўзровень дзейнай асобы;

4) стылізацыя, якая ляжыць у аснове літаратурных пародый; яна імітуе стыль пісьменніка ці літаратурнага напрамку.

Разгледзім адзін з відаў стылізацыі на прыкладзе ўрыўка з п’есы «Вечар» А. Дударава:

В а с і л ь (*адзін*). Ты не крыўдуй на яго... Душа ў чалаве- ка баліць. Нічога за жыццё нікому не аддаў... Аддаць трэба... Трэба... Тады ты і сагрэеш, і суцешыш, і сілы пад старасць дасі... Праўда? Слухаеш? Пайду свіннату сваю карміць... Чуеш, вішчаць? Эх, ручухны мае, ручухны!.. Што ж гэта вы так расхадзіліся? Ці не дождж збіраецца?.. Не падобна як быццам...

Г а н н а. Канчай маліцца – будзем весяліцца...

Васіл ь. Хлеба купіла? Г анн а. Ага...

В а с і л ь. А пенсію прынесла?

Г анн а. Пенсію не далі... Ты, кажуць, з завітушкамі распісваешся, а я без завітушак... Сам сходзіш.

Як бачна, аўтар выкарыстоўвае размоўную лексіку, спрошчаны сінтаксіс для індывідуалізацыі мовы персанажаў (сацыяльная стылізацыя).

Стылізацыю нельга блытаць з літаратурнай рэмінісцэнцыяй, якая ўяўляе сабой вобразны(-ыя) выраз(-ы) з тэксту (часцей мастацкага), устаўлены ў твор для таго, каб выклікаць у памяці субяседнікаў, чытачоў мастацкі вобраз для суаднесенасці яго з пэўнай маўленчай сітуацыяй. Разгледзім прыклад – верш Г. Бураўкіна, у якім паэт уводзіць у свой твор радкі з фальклору:

На дрогкіх выбоінах
Шляху зямнога
Згубілася многа,
Забылася многа.

Ды помню:
На печы
У вечар зімовы
Матуля шаптала
Чароўныя словы.

Я помню ўсё добра,
Я помню ўсё цвёрда:
“Кацілася торба
З высокага горба”…

І помніцца,
Мроіцца,
Чуецца мне
Прытомлены шэпт:
“Ішоў Бай па сцяне”…

Няма на зямлі ўжо
Ні хаты,
Ні печы.
Унук
У мяне на каленях
Ляпеча.

Яму я шапчу

Таямніча і горда:
“Каціласяторба
З высокага горба”...

І разам з наследнікам
Верыцца мне,
Што Бай барадаты
Ідзе па сцяне.

Такія ўкрапленні вядомых выразаў узмацняюць выразнасць, эмацыянальнасць твораў, а ў размове паміж субяседнікамі садзейнічаюць устанаўленню кантакту.

У адпаведнасці з трыма родамі літаратуры – лірыкай, эпасам і драмай – вылучаюць наступныя падстылі мастацкага стылю:

1) *вершаваная мова* – прадстаўлена такімі жанрамі, як верш, паэма і інш.;

2) *мастацка-празаічны* – рэалізуецца ў аповесцях, апавяданнях, раманах і г. д.;

3) *драматычны*, жанрамі якога з’яўляюцца камедыя, драма, трагедыя і інш.

Жанры мастацкага стылю:

Апавяданне – невялікі апавядальны твор, у якім расказваецца, як правіла, пра нейкі адзін вызначальны выпадак (сітуацыю, падзею) з жыцця чалавека. Апавяданню ўласціва адна сюжэтная лінія, абмежаваная колькасць дзейных асоб з дастатковым раскрыццём характараў, апісанні адсутнічаюць, а калі ёсць, то вельмі сціслыя.

Аповесць – апавядальны мастацкі твор, у якім з дапамогай шэрагу эпізодаў, больш ці менш разгорнутых апісанняў выяўляецца сутнасць нейкай падзеі, абмалёўваецца станаўленне характару адной ці некалькіх дзейных асоб у іх развіцці.

Верш – невялікі па аб’ёме, завершаны па думцы і форме твор, напісаны вершаванай мовай; у ім знаходзяць адлюстраванне з’явы і падзеі рознага характару (драматычныя, трагічныя, камічныя і г. д.), выяўляюцца адносіны аўтара да гэтых падзей. Вылучаюцца вершы філасофска-медытатыўныя (медытацыя, пасланне, стансы, ямбы, філасофскі верш, элегія), велічальныя (ода, дыфірамб, панегірык, апалог, мадрыгал, гімн, эпітафія, рацэя, эпіграма), песенныя (раманс, песня, серэнада, марш, псалом, кантата і інш.) і г. д.

Драма – твор, у аснове якога ляжыць востры канфлікт, што не

заканчваецца трагічнай развязкай.

Камедыя – гумарыстычна-сатырычная п’еса, у якой паказваюцца камічныя падзеі і з’явы, высмейваецца негатыўнае ў жыцці.

Паэма – буйны вершаваны твор, у якім важныя праблемы рэчаіснасці раскрываюцца эпічнымі (наяўнасць у творы сюжэта, персанажаў) і лірычнымі (вобраз лірычнага героя, шматлікія лірычныя адступленні) сродкамі.

Раман – твор, у якім шырока ахоплены істотныя жыццёвыя з’явы пэўнага сацыяльнага асяроддзя, нацыі і эпохі, паказаны шматлікія характары ў іх развіцці, псіхалагічнай напоўненасці, створаны разнастайныя бытавыя малюнкі.

Трагедыя – адзін з відаў драмы, заснаваны на непрымірымым, трагічным канфлікце паміж моцнай высакароднай асобай і абставінамі, якія не даюць магчымасці ажыццявіць яе мары.

Жанравая сістэма мастацкага стылю спазнае змены ў выніку мадэрнізацыі – сінтэз наяўных і стварэнне новых жанраў, міграцыя жанраў з аднаго стылю / падстылю ў іншы.

Мова мастацкай літаратуры, нягледзячы на стылёвую неаднастайнасць і шырокае праяўленне аўтарскай індывідуальнасці, валодае шэрагам спецыфічных рыс, якія дазваляюць адрозніць стыль мастацкай літаратуры ад іншых функцыянальных стыляў.

Лексічныя асаблівасці мастацкага стылю:

1) шырокае ўжыванне слоў з пераносным значэннем: *А ўсё ж вясны ўжо чуцен подых: / Яе прыход мы пазнаём / Па тым, як трушчыць лёд нязгоды / Жаночай ласкі крыгалом* (Н. Гілевіч). Часам у мастацкім кантэксце слова набывае значэнне, не зафіксаванае ў слоўніках;

2) выкарыстанне сінонімаў усіх тыпаў (семантычных, стылістычных, семантыка-стылістычных, кантэкстуальных) і антонімаў: *Гэтых матчыных / Песень дзівоснае прадзіва: / І вясёлых, / І сумных, / І слёзных, / І грозных* (Н. Гілевіч);

3) перавага канкрэтнай лексікі над абстрактнай;

4) наяўнасць слоў абмежаванага ўжытку:

• дыялектызмы ў творах пісьменнікаў старэйшага пакалення, напрыклад, пачатку XX ст., выконваюць намінатыўную функцыю: *Гаспадар разгаманіўся, нават лішне стаў зюклівы* ‘гаваркі’ (М. Гарэцкі). У мове ж мастацкай літаратуры і публіцыстыкі, пачынаючы з 40-х гг. XX ст., тэрытарыяльна абмежаваныя словы выкарыстоўваюцца са стылістычнай мэтай – як сродак замалёўкі побыту жыхароў пэўнай мясцовасці, стварэння этнаграфічнага каларыту, а таксама як сродак індывідуалізацыі мовы персанажаў: *Загаварылася я. Вячэру ж трэба ісці строіць* ‘гатаваць’

(І. Пташнікаў);

• жарганізмы з’яўляюцца яркім стылістычным сродкам характарыстыкі людзей пэўных сацыяльных груп: *«Жытуху» стварылі сабе тарбахваты* (Н. Гілевіч);

• спецыяльная лексіка (тэрміны і прафесіяналізмы) – стылістычны сродак адлюстравання рэчаіснасці, стварэння прафесійнай атмасферы, апісання персанажа праз яго мову: *Праўда, меў спраўную рыбацкую гаспадарку: два чаўны і розныя там сеткі, мярэжы, бучы, перамёты і шмат іншага, чаму Мікола і назвы не ведаў [сеткі, мярэжы, бучы, перамёты – прылады для лоўлі рыбы]* (М. Машара);

• устарэлая лексіка (архаізмы і гістарызмы) у творах пісьменнікаў ранейшага пакалення выконвае намінатыўную функцыю: у час напісання твораў гэтыя словы актыўна ўжываліся для называння прадметаў і з’яў: *Я буду маліцца да нівы ўсёй сілаю, / Каб лепшаю ўродай [ураджаем] плаціла за труд* (Я. Купа- ла). У мове тэкстаў сучасных аўтараў устарэлая лексіка выконвае стылістычную ролю – стылізуе мову персанажаў, стварае каларыт мінулай эпохі: *Аказваецца, паўтара года таму назад Раман прапанаваў пану Аляхну пяцьдзясят бітых талераў за тое, как ён адпусціў на волю сваю халопку Ірыну* (У. Караткевіч). У творах на сучасную тэматыку архаізмы і гістарызмы выкарыстоўваюцца таксама для надання апісанай з’яве ці падзеі адцення іроніі, камічнасці, часам – урачыстасці, узнёсласці: *Ствараю дзіўнай прыгажосці перлы, / На дне якіх заснуў нясцерпны боль, / Мая жывая і мая памерлая, / Крыніца шчасця, мук маіх юдоль* (У. Караткевіч), дзе [*перл* – устар. тое, што і жэмчуг; перан. пра што-небудзь выдатнае, цудоўнае (высок. і іран.); *юдоль* – устар.

1. даліна, лог;
2. месца, дзе пакутуюць, плачуць;

• неалагізмы (у першую чаргу індывідуальна-аўтарскія) – яркі эмацыянальна-экспрэсіўны сродак з незвычайным, свежым значэннем: *Божа, я ўжо былых не ўзнаўлю / Яснадум, яснадзён, ясназорак* (Н. Гілевіч). Неалагізмы ўжываюцца і для дасягнення мастацкіх эфектаў, для гульні слоў;

• экзатызмы і варварызмы выконваюць у мастацкіх творах стылістычную функцыю – ствараюць каларыт пэўнай дзяржавы, народа, характарызуюць персанажы, з’яўляюцца сродкам стварэння гумару і сатыры: *Я апрануўся, сеў на нарты, і каюр – паганяты запрэжкі – пагнаў сабак [нарты ‘вузкія, доўгія сані ў народаў Поўначы для язды на сабаках або аленях’]* (Я. Брыль).

Лексіка-семантычная структура мовы мастацкага стылю залежыць ад ідэйна-эмацыянальнага зместу канкрэтнага твора, ад задач, што

вырашаюцца ў ім, ад пэўнай сітуацыі, якая апісваецца. Таму тут выкарыстоўваюцца словы як стылістычна нейтральныя, так і функцыянальна афарбаваныя (з размоўнай ці кніжнай афарбоўкай). Так, у творах, дзе апавядаецца пра пэўную галіну вытворчасці, навукі, культуры і пра людзей, занятых у гэтай галіне, будзе шмат прафесіяналізмаў, тэрмінаў. Пры апісанні пейзажаў дамінуюць словы, што называюць з'явы прыроды, іх прыметы. Калі мы чытаем твор пра вясковае жыццё, то нярэдка сустракаем назвы прадметаў сялянскага побыту, а таксама дыялектную лексіку і г. д.

Марфалагічныя асаблівасці мастацкага стылю:

1) насычанасць тэксту дзеясловамі, што робіць яго дынамічным (афіцыйна-справавому і навуковаму стылям уласціва статыка): *Потым, зразумела, узнімецца вецер, паабтрасе светлыя кроплі-пацеркі, што вось зараз качаюцца на лістах, і яны, буйныя і цяжкія, пазашпокаюць, нібы пераспелыя лясоўкі, па кустах, па траве, па зямлі...* (Я. Сіпакоў);

2) ужыванне ўсіх асабовых займеннікаў, якія замяняюць назоўнік любога разраду, а не толькі абстрактнае паняцце, як у навуковым стылі: *Усюды чакалі дажджу. І ён недзе пад абед, нарэшце, зашумеў* (Я. Сіпакоў); *Сцяблінка – тонкая, кволая, танчэйшая за жытнюю – аж дзівішся, як яна трымае такія шырокія лісты!* (І. Мележ);

3) выкарыстанне ўсіх формаў асабовых дзеясловаў (у тым ліку 1-й і 2-й асобы, якія не ўласцівы навуковаму і афіцыйна-справавому стылям): *Я запрашаю цябе ў свой рай! / Прылятай да мяне, прылятай!; Дазволь! / Я яшчэ за цябе памалюся / У цішы сваёй светлай радасці. / І ў выспелай скрушнай скрусе / Я яшчэ за цябе памалюся...* (А. Багамолава);

4) формы слоў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, якія не толькі ўплываюць на семантыку слова, але і надаюць дадатковае сэнсавае адценне лакальнасці, пяшчоты, шкадавання, зневажальнасці, іранічнасці і інш.: *Ну і дзіўны / Гэты вожык – / Не відаць / Ягоных ножак. / Не відаць / Ягоных вочак – / Ну, не вожык, / А клубочак* (П. Марціновіч);

5) выкарыстанне формаў клічнага склону назоўніка, якія заўсёды з'яўляюцца стылістычна афарбаванымі, бо выражаюць пяшчоту, любасць, узвышанасць, часам архаічнасць: *Гуслям, княжа, не пішуць законаў* (Я. Купала); *Паклон табе, мой беларускі краю!* (Н. Гілевіч);

6) ужыванне ў вершаваных творах інфінітываў на ***-ці,*** якія з'яўляюцца паэтычным сродкам: *Ой, хацела ж мяне маці / Ды за трэцяга аддаці. / А той трэці – / Як у полі вецер.*

Што да **сінтаксічных асаблівасцей,** то ў мастацкім стылі выкарыстоўваецца ўсё багацце сінтаксісу беларускай мовы: простыя і складаныя сказы, сказы з апавядальнай, пытальнай, клічнай і пабуджальнай інтанацыяй, аднародныя члены сказа, звароткі, экспрэсіўнае

вылучэнне членаў сказа (сегментацыя, далучэнне, парцэляцыя і інш.).

Выбар пэўнага тыпу сказа прадыктаваны кантэкстам, сітуацыяй, асаблівасцямі стылю аўтара. Так, дыялогам уласцівы няпоўныя сказы, сказы з умоўчаннем – спецыяльна незакончаныя канструкцыі для ўзмацнення экспрэсіі.

Безасабовыя сказы, якія абазначаюць дзеянні і працэсы, што адбываюцца нібы самі па сабе, ужываюцца пры апісанні з'яў прыроды, псіхічнага або фізічнага стану чалавека. З дапамогай намінатыўных сказаў ствараюцца малюнкі прыроды, апісваюцца побыт, прадметы, з'явы, якія ўспрымаюцца наглядна, як існуючыя ў дадзены момант: *Ноч. / Халодная зямлянка. / Перастрэлка. / Цішыня* (П. Глебка).

Пытальныя, пабуджальныя і клічныя сказы – экспрэсіўна-стылістычныя сродкі мовы, бо выражаюць эмоцыі чалавека: захапленне, радасць, смутак, шкадаванне, абурэнне, здзіўленне і інш. Інверсія надае выказванню дадатковыя сэнсавыя і экспрэсіўныя адценні: найбольшы акцэнт прыпадае на той член сказа, які стаіць у канцы ці ў пачатку канструкцыі.

Складаныя сказы шырока ўжываюцца пры стварэнні пейзажных замалёвак, апісанні знешняга выгляду персанажаў, пры перадачы думак і разважанняў аўтараў ці дзейных асоб.

Сродкі стварэння выразнасці:

- ***сінонімы,*** якія дазваляюць пазбегнуць паўтораў, дапамагаюць найбольш поўна, усебакова апісаць прадметы і з'явы: *Прабегшы некалькі хат, Арцём звярнуў на агароды, шуснуў у каноплі, адтуль разораю між капусты забег у надворак Юркі Труса, з надворку заламаў у вулачку і пасучыў проста да калодзежа* (Я. Колас);
- ***амонімы (амографы, амафоны, амаформы)*** з'яўляюцца сродкам стварэння каламбураў, выразнай рыфмы: *Я на елку палячу – / Усе галінкі палячу: / Дзюба ў мяне доўгая, / Буду стукаць доўга я. / Назіраю я тады, / Як буяюць ягады: / З журавін зрабіў каралі – / Журавы мяне каралі, / Што не ўсе яны паспелі, / А дразды скляваць паспелі* (Загадка. Адгадка: дзяцел; С. Грахоўскі);
- ***антонімы:*** *Шчасце ходзіць толькі ў пары з горам* (Н. Гілевіч). Антонімы таксама ляжаць у аснове ***антытэзы*** – стылістычнага прыёму, заснаванага на супастаўленні процілеглых з'яў, прадметаў, характараў, пачуццяў, ідэй, вобразаў: *Мы – кансерватары ўсе / Тупаватыя. / Вы – завадатары бур і наватары. / Мы ўсе – аўральнікі, / Культу стваральнікі, / Вы – праўдалюбы, / Хлусні выкрывальнікі...* (П. Панчанка); *Слову жывому – на глебу ўрадлівую, / Мёртваму слову – на камень, на жвір. / Шчыраму сэрцу – долю шчаслівую, / Чэрстваму сэрцу –*

балота і вір (С. Дзяргай) і ***аксюмарана*** – спалучэння супрацьлеглых разуменняў, якія лагічна выключаюць адно другое, але ўжытыя разам даюць новае паэтычнае ўяўленне (разумны ду- рань, жывы труп, звонкая цішыня і г. д.): *Ці доўга было гэта? / Можа, хвіліна, / Можа, паўвека, а можа, больш... / Але пакінула ты, дзяўчына, / Смутную радасць і светлы боль* (М. Лужанін);

- ***алітарацыя*** – паўтарэнне аднолькавых або падобных зычных гукаў, прадвызначанае пэўнымі мастацкімі задачамі: *Дзе возера пад сонцам млее / І, як стамлёны матылёк, / Закалыханая лілея / На рукі просіцца здалёк* (Г. Бураўкін); *Сеецца, / Сыплецца, / Падае снег, / Сцелючы белую коўдру – пасцель. / Дрэмлюць прысады ў задумлівым сне, / Снежную ловячы голлем шрапнель* (Н. Гілевіч);
- ***асананс*** – паўтарэнне аднолькавых або падобных галосных гукаў: *На возеры лодкі-маторкі / І вёсел вясёлы ўсплёс; / Усміхнуліся першыя зоркі, / І вечар расінкі растрос* (Я. Пушча).

Вобразна-выяўленчыя сродкі – тропы і фігуры – надаюць выказванню эмацыянальнасць, служаць для маляўнічага адлюстравання рэчаіснасці, эстэтычнага ўздзеяння на чытача або слухача.

Тропы – словы ці моўныя выразы, ужытыя з пераносным значэннем. Да асноўных тропаў адносяцца:

- ***метафара*** – перанос назвы з аднаго прадмета на другі на аснове падабенства: *Страсае светлякоў цыгаркі на росы прыцемак-хвалько* (Р. Барадулін); *Сонца ці то спала, ці то блукала ў высокіх шэрых хмарах* (А. Багамолава);
- ***метанімія*** – перанос назвы з аднаго прадмета на другі на аснове сумежнасці: *Мінск едзе па грыбы* (П. Панчанка); *Вячэрні Беласток каханнем апантаны* (Я. Чыквін);
- ***сінекдаха*** – перанос назвы з аднаго прадмета на другі на аснове колькасных суадносін: *А ў жытнёвае лета вісіць над зямлёй яблык, пераспелы і светлы, як даўняя журба; ён упадзе – і надыдзе восень...* (М. Стральцоў); *Пахне лес апалым лісцем* (С. Грахоўскі);
- ***перыфраза*** – вобразны выраз, які апісальна называе і характарызуе з'яву, прадмет, дзеянне: *Яблынька для занесенага аднекуль зернейка клёна як маці: яна аберагае ад сцюжы і вятроў узімку, прыкрывае галінкамі ад халодных дажджоў увосень, жывіць уласным сокам карэнне прыёмнага сына ў час вясны; Дзённік мой – мае далоні, / Мазалі – мае адзнакі* (В. Шніп);
- ***эпітэт*** – мастацкае акрэсленне істотнай прыметы якога-небудзь прадмета ці з'явы: *Прывяла папараць, / Пясок пасох, / Да пнёў згарнуліся апенькі сонныя, / Ласкавы, мяккі мох / Нячутна лёг, / Нібы сняжынак*

зорачкі зялёныя (Р. Барадулін); *Ільняная і жытнёвая, сялянская, / Баравая ў казачнай красе, / Старажытнейшая, / Самая славянская, / Светлая, як травы ў расе, / Вобразная, вольная, пявучая, / Мова беларуская мая* (П. Панчанка);

• ***параўнанне*** – такое супастаўленне двух прадметаў, з'яў або паняццяў, у выніку якога сутнасць аднаго з іх вытлумачваецца праз сутнасць другога: *Як у бары, бы маленькія вожыкі, / Шышкі хваёвыя ўсыпалі дол* (Р. Барадулін); *Толькі страціўшы Радзіму, / Будзеш як камень, / Сляпы, і глухі, і нямы* (М. Танк);

• ***увасабленне*** – наданне чалавечых уласцівасцей рэчам, прадметам, з'явам прыроды: *– Як сціпла пражыла век цётка Вольха... / – Які харошы чалавек быў дзядзька Вяз...* (Я. Сіпакоў); *Ранак вытарашчыў вочы, / Як дзіця, глядзіць наўкола* (Н. Гілевіч);

• ***гіпербала*** і ***літота*** – рэзкае перабольшванне або змяншэнне якіх-небудзь уласцівасцей чалавека, прадмета ці з'явы з мэтай звярнуць на гэтыя ўласцівасці асаблівую ўвагу: *Сабралі ўраджай. / Хочаш прывезці яго – / Мурашку ў воз запрагай* (А. Наўроцкі).

Стылістычныя фігуры – своеасаблівыя сінтаксічныя канструкцыі, якія маюць спецыфічную будову, чым узмацняюць эстэтычную выразнасць і эмацыянальнасць выказвання, акцэнтуюць увагу на важкім слове або выразе, дапамагаюць лепш выявіць думку аўтара, перадаць яго душэўны стан.

Да асноўных стылістычных фігур адносяцца наступныя:

• ***анафара*** – паўтарэнне аднолькавых гукаспалучэнняў, слоў ці выразаў у пачатку вершаваных радкоў або суседніх строфаў:

Калі хто скажа,
што ў каханні ён
Усё спазнаў і вычарпаў дазвання, Не верце.
Ён не знаў яшчэ кахання.
Ён яшчэ трапіць да яго ў палон,
І будзе плакаць над сабой былым, І пракляне ўчарашняе бяссонне,
І здзівіцца,
што, можа, толькі сёння Узнік кахання воблік перад ім.
Калі хто скажа,
што даўно
ані Ужо няма ў каханні таямніцы, Не верце,
і яму яшчэ прысніцца
Яно, як цуд нязнанай чысціні (Г. Бураўкін);

Там трава – нібы лес такая: Без касы ў яе не ўвайсці,
А валоў і з рагамі схавае – Не знойдзеш ніколі ў жыцці.

Там рыбы ў рэчках і ставах Столькі, што нават калі
Пугаўё паміж хваляў паставіш, Будзе стаяць, бы ў зямлі.

Там мёду – бяры, колькі ўлезе, А пчол нічыіх – табуны.
Іх мала ўжо дуплаў у лесе –
У ямы мёд носяць яны (Я. Сіпакоў);

• ***эпіфара*** – паўтарэнне аднолькавых гукаў, слоў ці выразаў у канцы вершаваных радкоў або строфаў:

Падыходзяць да парога, Углядаюцца без слоў,
Запрашаюць у дарогу Бог, Радзіма і Любоў.

Каб, не здзейсніўшы, не згінуць, Не карміць чужых бажкоў,
Хай жывуць у кожным сэрцы Бог, Радзіма і Любоў (Л. Сіманёнак);

• ***кальцо страфы*** – паўтарэнне ў пачатку і ў канцы асобных вершаваных радкоў, строфаў ці цэлага твора аднолькавых гукаспалучэнняў, слоў або выразаў:

Край мой беларускі, край! Дай мне прыгарнуцца, дай!
Да твайго ляснога Верасnога долу,
Дзе так шчасця многа Выпала на долю, –
Дай жа прыгарнуцца, дай! (Н. Гілевіч);

• ***кампазіцыйны стык*** – паўтарэнне ў пачатку наступных радкоў або строфаў гукаспалучэнняў, слоў, словазлучэнняў, якімі заканчваюцца вершаваныя радкі або цэлыя строфы:

Купалачка, дзе твая дачка? Мая дачушка ў гародзе,
У гародзе лянок поле, Лянок поле, краскі шчыпле,
Краскі шчыпле, вянкі ўе, Вянкі ўе, на сябе кладзе,
На сябе кладзе, да шлюбу йдзе (З песні);

• ***паралелізм*** – паралельнае размяшчэнне аднатыпных элементаў выказвання (з'яў, вобразаў, матываў і г. д.), што супастаўляюцца паміж сабой: *Хіба можна рабіць нешта добрае, калі самі злыя? / Хіба можна быць святым, калі думкі нашы далёкія ад святасці?* (Я. Сіпакоў); *А мне яшчэ і сёння памятаюцца два выбухі. Адзін – гулкі і моцны, які аж скалануў лес. Гэта Пеця з падлеткамі знайшлі недзе снарад і ўзарвалі яго ў лесе. Другі – ціхі, ледзь чутны... Гэта немцы, пачуўшы выбух, выехалі ў лес і злавілі там Пецю* (Я. Сіпакоў); *Хто сказаў – вада без паху, / Хто сказаў – вада без смаку? / Той, відаць, не смяг у спёку і ад смагі ў суш не млеў* (Я. Сіпакоў);

• ***градацыя*** – такое размяшчэнне слоў і выразаў, пры якім назіраецца нарастанне або аслабленне іх эмацыянальна-сэнсавай нагрузкі:

Мы – не з гіпсу, мы – з камення, Мы – з жалеза, мы – са сталі, Нас кавалі ў пламенні,

Каб мацнейшымі мы сталі (Цётка);

• ***рытарычнае пытанне*** – пытанне, якое не патрабуе адказу, бо змяшчае ў сабе сцвярджэнне:

Ці ж мы, хлопцы, рук не маем, Ці ж нам сілы Бог не даў?

Ці ж пад родным нашым краем Промень волі не блішчаў?

(Я. Колас).

Г р а ф і ч н а я а д м е т н а с ц ь стылю. З дапамогай графічных сродкаў (як правіла, у мове паэзіі) аўтары выдзяляюць радзей – літары, часцей – тыя словы / сказы, якія маюць адметную сэнсава-эмацыйную нагрузку. Гэта могуць быць і апорна моцныя моманты тэксту (назва твора, радкі з указаннем адрасата, напрыклад, у прысвячэннях, эпіграф, завязка / першы радок тэксту, заключныя радкі / радок ці канцавое слова / яго частка), анафары ці эпіфары, ключавыя ці іншыя словы, якія выяўляюць ідэйна-эмацыйны змест, “высвечваюць” глыбіню падтэксту.

Графічныя сродкі выразнасці ўтвараюць так званыя прыёмы катраснага акцэнтавання (сродкі акцэнтавання часам называюць астэрызмамі – грэч. aster – зорка: унутраная форма гэтага тэрміна ўтрымлівае падабенства акцэнтаваных адзінак да зорак, якія кантрасна вылучаюцца на фоне начнога неба).

Найбольш прадуктыўным сродкам акцэнтуацыі ўвагі ў мове мастацкай літаратуры з’яўляецца ***курсіў***: Ну а гэты мой сябар / Піша праўду гусцей / На сваёй беларускай бяросце: / “***Трэба дома бываць часцей***, / ***Трэба дома бываць не госцем***” (П. Панчанка).

Як відаць, пры цытаванні радкоў з мовы твораў іншых аўтараў, каб вылучыць іх змест (адлюстраваць іх сэнсавую важнасць), выкарыстоўваецца іншае графічнае афармленне, а сама фігура вызначаецца як ***рэмінісцэнцыя***.

У сваю чаргу з дапамогай курсіву ў драматургічным падстылі афармляюцца аўтарскія рэмаркі:

К а р а в а й. Дарагі мой энтузіяст! Ну, твая праўда. Канечне ж, я вінаваты. (*А цяпер хоць і шчыра гаворыць, але цяжка зразумець*: *блазнуе ён ці сур’ёзна просіць*.) Ну, даруй мне! Ну, прашу, злітуйся! Не судзі строга (А. Макаёнак);

Б у ш ц е ц (*аглядаючы аўтамат, радасна*). Усё будзе абгэмахт, капітан… (*Пайшоў у пралом, спыніўся, блазнавата ўсміхнуўся*.) Іш, герой! (А. Дудараў).

Як відаць, курсіў адмяжоўвае словы аўтара ад слоў персанажа, такое графічнае афармленне тэксту дае магчымасць зрокава ўспрымаць яго не суцэльна, як, напрыклад, у празаічных творах; аўтарскія заўвагі маюць важнае, хоць і другаснае значэнне, бо ў драматургічным падстылі развіццё дзеяння, сюжэта адбываецца праз маўленне персанажа – праз маналог, дыялог, палілог, аднак важным з'яўляецца аўтарскае бачанне эмоцый, рухаў, інтанацый персанажа і інш., якраз такіх момантаў, якія падаюцца курсівам у рэмарках.

Адзначым, што аўтарскія рэмаркі могуць афармляцца петытам у тым выпадку, калі яны не перарываюць маўленне персанажа:

Д у г і н. Калі што якое, крыўдзіць пачнуць – скажы, што ў аддзяленні Дугіна ваяваў… Цэлы год…

Дзерваед сабраў рэчы Адуванчыка, падае.

А д у в а н ч ы к. Дзед, ну скажы ты… Колькі там тае вайны засталося? Цэлы я буду…

Петыт часам мае функцыю ўдакладняльную, а думку, пададзеную з яго дапамогай, адначасова можна і нельга кваліфікаваць як другасную: яна заключае ў сабе пэўную інфармацыю, важную для раскрыцця зместу ўсяго твора, а значыць, для разумення тэксту і выяўлення аўтарскіх асацыятыўных падтэкстаў: так афармляюцца зноскі, эпіграфы, рэмаркі, радкі, у якіх названы адрасат ці імя / прозвішча таго, каму твор прысвячаецца:

Я ІДУ

“Калі ты ведаеш, на што здатнае каханне,
і калі ты мужчына, пашкадуй мяне, не
кажы “не” і дай мне ўвайсці”…

Надпіс на муры ў Пампеях

Надпіс моліць. Журба скамянелая,
Быццам рана, гарыць на сцяне
(У. Караткевіч).

Тлусты шрыфт (магчымы каляровы шрыфт у творах для дзяцей) ужываецца пры афармленні назваў ці пачатку тэкстаў: напрыклад, вялікая тлустая каляровая літара пры афармленні назваў раздзелаў – **ПАЛЯВЫЯ РАСЛІНЫ**. **КВЕТКІ**. **ДРЭВЫ**; **ЧАЛАВЕК**. **МОВА**. **КУЛЬТУРА** – назвы раздзелаў кнігі М. Пазнякова “Падарожжа ў краіну загадак”; часам націскная літара ў друкаваным слове можа вылучацца курсівам ці тлустым шрыфтам, каб дасягнуць большай мілагучнасці, каб пазбегнуць двухсэнсоўнасці выказвання ці пазбегнуць аманіміі: На падлеткавай сцяжынцы / “др***а***маў”, як заўжды, стае: / мамка волі не дае.

Вялікая літара, вылучаная ці не вылучаная тлустым шрыфтам, таксама з’яўляецца сродкам акцэнтуацыі ўвагі на сэнсе таго слова, якое

паводле арфаграфічных нормаў пішацца з малой літары: Запяўшы / Хмарай шэрае радно, / Нябесны **Г**аспадар / Сузор'і вешае (Р. Барадулін); Скуль ведаеш пра смутак мой чарговы? / А ведаеш, бо йдзеш яго разважыць. / Як бачыш, што мяне чакае заўтра? / А бачыш, бо заўсёды папярэджваеш. / Жыццё стамляе, МАМА. / Не стамляе і не стамляецца толькі любоў (Н. Мацяш). Функцыя такога графічнага афармлення слоў, адпаведнага ўжывання вялікай літары – стылістычная.

Прабелы паміж літарамі, або **разбіўка літар**, выкарыстоўваюцца пры афармленні назваў твораў, іх раздзедаў, асобных слоў, выразаў, якія, у дадатак да ўсяго, могуць падавацца тлустым шрыфтам: напрыклад, у заключным чатырохрадкоўі верша "Спадчына" вылучаны словы: Жыве з ім дум маіх сям'я / І сніць з ім сны нязводныя.../ Завецца ж спадчына мая / Ўсяго С т а р о н к а й Р о д н а ю (Янка Купала); **Б А Й К І**, **П А Ц Е Ш К** І – назвы частак кнігі В. Жуковіча "Свет – дзівосны" (Мінск, 2000).

Ужыванне іншамоўнай графікі, у тым ліку варварызмаў, у эпіграфах і ў тэкстах (проза, паэзія, драматургія) абумоўлена неабходнасцю афармлення крылатых выразаў часам з мэтай стылізацыі маўлення персанажаў, стварэння фігуры рэмінісцэнцыі. Абавязковым патрабаваннем пры ўвядзенні такіх выразаў у твор з'яўляецца іх пераклад, які можа афармляцца петытам ці падавацца адразу ў тэкце: Прывет ім! Хай налягуць двое, / І мо звярнецца зноў пара, / Калі чыталі "Громобоя", / "Пастушки грусть" **etetera** – і гэтак далей франц. (М. Багдановіч); І курс немедыцынскае лацінкі / "**Peraspera**…" – будзілі слых (Я. Янішчыц).

Да графічных сродкаў выразнасці адносяцца таксама незвычайныя па графічным афармленні творы, у тым ліку **паліндром**, **акраверш**. Акраверш, напрыклад, ужываецца для стварэння вершаў-прысвячэнняў, загадак; ён, як і ўсе іншыя графічныя сродкі выразнасці, разлічаны на зрокавае ўспрыманне: у ім пачатковыя літары радкоў, што чытаюцца зверху ўніз, утвараюць слова – імя ці прозвішча таго, каму адрасуецца прызнанне, пажаданне ці адгадка да загадкі:

СПРОБА АКРАВЕРША

Аленю здзіўлення аб скалы адчаю
разбіцца ў запале.
Ледзь Вашая ўсмешка ўзыдзе – ўхвал
загрыміць абвал.
Але, асмялеўшы ад страху,
выводжу світальнае Але (Р. Барадулін).

Акратэкст, у якім пачатковыя літары складаюць алфавіт, называецца абцэдарыем (лац. abcedarium – алфавіт). Абцэдарый як літаратурны жанр можа быць у вершаванай форме і ў празаічнай, таму яго нельга кваліфікаваць

як разнавіднасць акраверша. Узорам абцэдарыя можа быць верш Рыгора Барадуліна “Па схіле алфавіту”: на кожную літару алфавіта паэт прыводзіць тыя словы, якія ў яго выклікаюць пэўныя ўспаміны; значыць, сувязь паміж совамі, якія будзяць тыя думы-згадкі, асацыятыўная; можна сказаць, што сувязь паміж словамі ўмоўная, як і паміж літарамі самога алфавіта, а яшчэ сувязь – духоўная, яна мацнейшая за ўсе іншыя віды сувязяў, нават за граматычную, якая дазваляе са слоў скласці цэлае выказванне з завершаным сэнсам. У названым творы граматычнай сувязі паміж членамі сказа няма, паколькі кожны слупок складаецца з некалькіх намінатыўных сказаў – ад 4 да 24:

Мара,
мана, Менск, Маскалёўшчына, мярэжы,
мя́лінне, мох, мярлог, мурог, меліва,
мліва, малодзіва, мех, мядзяк, міжы́парніца,
маладзьба, Міклашэўская, маладзік,
Мілавіца, мураванка, мама, маркота.

Даследаванне мовы мастацкага тэксту дазваляе гаварыць пра існаванне розных стылістычных прыёмаў, заснаваных на цытаванні.

Аплікацыя – гэта агульная назва, прынятая для абазначэння з’явы; яна кваліфікуецца як украпванне гатовых моўных адзінак у тэкст, мае свае віды і падвіды, рэалізуецца праз іх узнаўленне.

Адным з відаў аплікацыі з’яўляецца **алюзія –** увядзенне фразеалагізмаў, прыказак, традыцыйных перыфраз, якія ў мастацкім радку ўжываюцца, каб забяспечыць характарыстыку персанажаў, зрабіць іх маўленне адметным, арыгінальным і разам з тым дапамагчы пісьменніку дасягнуць натуральнасці апавядання, выразнасці, вобразнасці і разнастайнасці, якія складуць аснову аўтарскага ідыялекту. Вядома, што ўстойлівыя выразы функцыянуюць у любым мастацкім падстылі з узуальнай ці аказіянальнай функцыямі:

Маўчанне
Ніколі не было
І **не будзе золатам**.
Яно – або
У шмат разоў даражэйшае,
Або – нічога не вартае (*М. Танк*).

У прыкладзе назіраем выкарыстанне вобразнай асновы фразеалагізма, якое разлічана на веданне першавыразу і яго значэння; у выніку аўтарскага жыццёвага вопыту, разваг над каштоўнасцямі чалавека адбылася трансфармацыя выказвання *Маўчанне – золата.*

Агульнавядомыя выразы з трапным зместам могуць выкарыстоўвацца ў

спецыфічным аўтарскім кантэксце, што змяняе/дэфармуе структуру, часам удакладняе іх змест ці, найчасцей, той стылістычны эфект, які аўтары хацелі атрымаць у адпаведнай маўленчай сітуацыі:

Яму прысвоілі званне Героя
За тое, што двойчы
Фарсіраваў Бярэзіну:
Першы раз – у разведцы,
Другі раз – у баю,
У якім грудзьмі пагасіў
Амбразуру фашысцкага дота.
Каб знаў Геракліт пра такіх,
Не сказаў бы, што ***нельга***
Двойчы перайсці
Праз адну і тую ж раку (*М. Танк*).

У прыкладзе аўтар выкарыстоўвае выраз *нельга двойчы ўвайсці ў адну і тую ж раку*, які ўвасобіў у сабе вопыт не аднаго пакалення. Аднак паэт уводзіць вядомыя радкі ў такі кантэкст, які выяўляе яшчэ і яго прамое значэнне: герой Вялікай Айчыннай вайны двойчы фарсіраваў раку Бярэзіну, але загінуў, пагасіўшя грудзьмі амбразуру варожага дота. Па меркаванні паэта, чалавек можа мяняць нешта ў сваім жыцці, у сваім лёсе, калі мае ўнутраную гатоўнасць, духоўнасць, а таксама веру ў тое, што робіць. Вось у такім выпадку можна двойчы ўвайсці ў адну і тую ж раку.

Арыгінальнымі паводле зместу і графічнага афармлення з'яўляюцца выразы іншамоўнага паходжання, напрыклад, з лацінскай мовы. Пры цытаванні ў мастацкім творы яны могуць перакладацца ці не перакладацца (у самім тэксце, у зносках), аднак змест іх ці хаця б сутнасць павінны быць вядомымі, зразумелымі чытачу: *Па жыцці не прайсці, / Каб не зведаць бяды. / Нам бы ж толькі пярсцёнкі шапталі / Праз вясну і праз слоту, / Праз сівыя гады: /* ***AMO TE, / AMO ME, / FIDES IMMORTALES***; *Ах, не час валошкавы мой тае – / То пылок / З трапятлівых крыльцаў асыпае / Матылёк!.. /* ***Vita brevis***. */* ***Patria aeternis*** (Н. Мацяш). Першы выраз пісалі старажытныя рымляне на заручальных пярсцёнках, ён у перакладзе з лацінскай мовы абазначае «*Кахаю цябе, кахай мяне, вернасць несмяротная»*; другі выраз больш вядомы – «*Жыццё кароткае. Радзіма вечная»*. Цытаванне з іншамоўных крыніц дэманструе інтэлектуальнасць мастацкага тэксту: старажытныя ўстойлівыя выразы, спраектаваныя аўтарамі на сучаснае жыццё, пацвярджаюць іх крылатасць, узнаўляльнасць, змястоўнасць; іх ужыванне дазваляе і твор, і любы кантэкст напоўніць глыбокім зместам. Вядома, што «інтэлектуальнасць» літаратурнага твора разлічана на адпаведнага чытача, слухача – менавіта ў такім выпадку можна атрымаць

«асалоду чытання».

Наступны від аплікацыі, уласцівы мастацкаму маўленню, кваліфікуецца як прыём **рэмінісцэнцыі**, сутнасць якога ў цытаванні аўтарам вядомых афарыстычных выслоўяў з мэтай пацверджання ўласных думак/пачуццяў. Такія «ўкрапванні» ў мастацкі радок не бяруцца звычайна ў двукоссе, аднак друкуюцца курсівам: *Дык ці здольныя з поўнаю кайстрай / Мы па свеце ісці, як раўня, / Каб* ***народ наш / Усё ж дачакаўся / Залацістага яснага дня****?; Нявесела ўсміхнуся: /* ***– Сэ ля ві****, – / І апушчуся на прывялы верас. / – Перажыві мяне, / Перажыві! – / Я папрашу каханую яшчэ раз* (Г. Бураўкін).

Нельга блытаць цытаванне радкоў з хрэстаматыйных літаратурных тэкстаў, якія вывучаліся носьбітамі мовы, напрыклад, у сярэдняй школе (*Хіба на вечар той можна забыцца?* (П. Броўка); *Я не паэта, о крый мяне божа*; *А хто там ідзе?* (Я. Купала); *З легендаў і казак былых пакаленняў* (М. Танк); *Кажуць, мова мая аджывае* (П. Панчанка)) і выразаў афарыстычнага характару (***Не забывайце мовы роднай, каб не ўмёрлі*** (Ф. Багушэвіч); ***Нашто нам сваркі і звадкі, / Калі мы разам ляцім да зор***? (М. Багдановіч); ***Трэба дома бываць часцей, / Трэба дома бываць не госцем*** (Р. Барадулін)). Прыведзеныя выразы аб'ядноўвае тое, што яны агульнавядомыя, але толькі апошнія з'яўляюцца афарыстычнымі, паколькі перадаюць узорнасць пачуццяў, арыгінальнасць светаўспрымання, з'яўляюцца, як слушна сцвярджаюць навукоўцы, надпадзейнымі, надчасавымі. Думкі, выказаныя знакамітымі асобамі, як правіла, пісьменнікамі, могуць быць запатрабаваны ў маўленні не адным чалавекам, каб акрэсліць, пацвердзіць меркаванні, разважанні, апісаць паводзіны, ахарактарызаваць стан душы.

Цытаванне як з'ява можа быць выкарыстана ў якасці эпіграфа:

Б'ецца, уецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.
М. Багдановіч

Лілею
млявы
плёс
люляе,
З-пад злежаных
аблок
здалёк
Ляціць віхлясты і бялявы,
Пялёстак лёгкі –
матылёк (*Р. Барадулін*).

Такі від афармлення чужых думак забяспечвае найперш дакладнасць маўлення, таму цытата-эпіграф павінна быць тэкстуальна выверанай, з афармленнем адпаведнай спасылкі на аўтара/крыніцу.

Адным з відаў аплікацыі з'яўляецца цытаванне царкоўна-рэлігійнай літаратуры (канфесійны стыль); напрыклад, увядзенне радкоў з малітвы можа быць неабходнае аўтару для надання тэксту праўдзівасці, а таксама актуалізацыі дадзенай тэмы, для стылізацыі маўлення персанажаў сталага пакалення ці вернікаў пэўнай канфесіі. Такі прыём кваліфікуецца ў лінгвістыцы як **біблеізм**. Так, напрыклад, Янка Сіпакоў у адной з нерыфмаваных паэм «Одзіум», прысвечаных тэме Чарнобыльскай катастрофы, выкарыстоўвае цытаванне малітвы «Ойча наш». Малітву аўтар падзяляе на часткі, тым самым перарываючы на кавалкі твор. Такая пабудова сюжэта бачыцца нам аптымальнай для перадачы аўтарскіх эмоцый, разважанняў – пратэсту. Чалавек перапыняецца на малітву: хіба можна без болю і без малітвы гаварыць пра пакуты людзей, якія пацярпелі ад смяротнага выбуху:

Ойча наш, калі ты ёсць на нябёсах! [...] // *Атамнікі пасварылі чалавека з усёю прыродаю. / З жывою і мёртваю пасварылі. / І нават жывую прыроду зрабілі мёртваю. / Чыстае зрабілі брудным. / І зараз патрабуюць ад нас: / Жыць ля вады і не мець вады. / Спяліць яблыкі і не есці іх. / Бачыць траву і не хадзіць па ёй. / Жыць ля хлеба і быць без хлеба... / На лавачку каля хаты не садзіся. / А дзе сядзець? / Па зямлі не хадзі. / А дзе хадзіць? / Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне наша, о Божа, бязмежнае*! ***// Хай свяціцца імя Тваё, хай прыйдзе Царства Тваё, хай будзе воля Твая*** (Я. Сіпакоў).

Бываюць такія моманты ў жыцці, калі гаварыць з чалавекам можна ці варта толькі праз Бога: і гэта сувязь трывалая, і гэта сувязь у бядзе і ў радасці ідзе праз малітву.

Біблеізм можа таксама праяўляцца праз цытаванне асобных рэплік ці стылізацыю да канфесійнага стылю: *Устаўшы з пасцелі, як з дамавіны, / Дзякую табе, Госпадзе Трыадзіны, / Што Ты, даўца дабрыні і цярплівосці, / На мяне, лянотнага і грэшнага, / Не ўтаіў ні гневу, ні злосці / І за мае беззаконствы / Мяне не прывёў да згубнасці, / а падняў па Сваёй людалюбнасці…; У Божы свет ішло сяло Вялічка – / Святое свята ўдзячных слёз. /* ***Хрыстос уваскрос***! / ***Хрыстос уваскрос***! / *Свяціла промнямі крынічка* (Р. Барадулін).

Біблеізм як стылістычны прыём можа выкарыстоўвацца аўтарамі ў мастацкім маўленні: цытавацца могуць з пэўнай стылістычнай мэтай як асобныя радкі з канфесійнага стылю (дакладнае цытаванне), царкоўна-рэлігійных выданняў, так і відазмененыя выразы (калі адзін кампанент,

напрыклад, замяняецца аўтарам у адпаведнасці з галоўнай думкай твора ці дадаецца): *Ты мой ясны хлеб і каханы май, / Песня продкаў, нашчадкаў палі, / Без цябе, не з табой – не патрэбен мне рай, /* ***На душы, ў небясі. На зямлі*** (У. Караткевіч) – трансфармуецца праз спалучэнне ***на душы*** біблейскі выраз *«Да святится имя Твое, да приидет Царствие Твое, да будет воля Твоя, яко на небеси и на земли»*. Відавочна, што гэты прыём разлічаны на веданне чытачом структуры і зместу ўстойлівых выразаў. З дапамогай названага прыёму вельмі ярка і дакладна адлюстраваны адносіны лірычнага героя да прадмета гутаркі – абагаўленне.

Біблеізм выкарыстоўваецца ў эпіграфах з мэтай перадаць асноўную думку. Ужыванне выразаў з рэлігійных крыніц у апорна моцнай пазіцыі не толькі раскрывае тэму, асноўны змест наступных радкоў, але і задае танальнасць, настрой тэксту:

Ісціна ўзгікне з зямлі, і праўда
прыхіліцца з неба…
Псальм 84:12

Не на тушчай – / На нашчай зямлі / Так, як асака разучая, / Ісціна – / Парабчанка разутая – / Галаруч нясе вугалі. / Зоркамі вугалі былі, / Ды зрабіліся зоркі / Знічкамі (Р. Барадулін).

Адметнай з’явай мастацкага маўлення з’яўляецца **фальклярызацыя** – адна з разнавіднасцей стылізацыі, увядзенне ў мастацкі твор элементаў фальклору. Ляскаталі колы, грукалі капыты, доўгі шлейф пылу і дыму ад люлек стаяў за атрадам. Сям-там шляхта пачынала скакаць у вазах. Некаторыя вывальваліся ў пыл, іх на хаду ўсцягвалі на салому. Рогат, крыкі. У такт стуку капытоў гучала шалёная песня:

Чым жа цябе частаваць,
Ты ж мой міленькі?
Чым жа цябе частаваць,
Голубе сівенькі?
Бізуном, мілая,
Бізуном, мілая,
Бізуном, ух-ха-ха,
Мая чарнабровая (У. Караткевіч).

Цытаванне з любых крыніц, тым больш з фальклорных, надае выказванню пэўную стылістычную афарбоўку: у радках прыведзенай песні гучаць радасць, весялосць, народны гумар. Увядзенне элементаў вуснай народнай творчасці з мэтай захавання ў паэтычным радку спецыфічнага, адметнага, народнага, што, на думку аўтара, найбольш ярка раскрые характар персанажа, дэманструе самабытныя беларускія звычаі, прыкметы, творчасць: *«Воўк» у вывернутым кажусе кідаецца на казу, і яго б’юць снежкамі. Усе*

даўно забылі, што каза – дух нівы і плоднасці, як і ў старажытных грэкаў: ***Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць, / Дзе каза хвастом, / там жыта кустом, / Дзе каза рогам, там жыта стогам*** (У. Караткевіч); *Ведала* [мама] *міфалогію / Паганскае даўніны, / Старых святых, а ўсе яны, / Як і суседзі, / Малацілі і веялі / Зярняты спагады, надзеі, / Заклапочаныя, ды не хмурыя / Міколы ды Юр'і, / Варвары ды Аўдакеі. /* ***Хоць да Міколы, / Ні зімы, ні лета ніколі. / Нішто, што Варвары / Начы ўварвалі*** (Р. Барадулін); ***«На Беларусі / Пчолы, як гусі», –*** */ Прыгадваў зямляк / у выраі* (Р. Барадулін).

Відавочна, што прыведзеныя цытаванні з народных крыніц надаюць выказванням і маўленчым сітуацыям адпаведную танальнасць/настрой.

Цікавым і арыгінальным фактам мастацкага маўлення з'яўляецца выкарыстанне **хрыі** – кароткага апавядання, невялікага анекдота з павучальным зместам, вывадам. Такія мініатворы ў шырокім кантэксце напоўнены глыбокім сэнсам і цікавым падтэкстам. І хоць гучаць яны з вуснаў персанажаў, за імі заўсёды асоба аўтара, яго стаўленне да жыцця ва ўсіх яго духоўна-маральных праяўленнях:

То паслухайце прытчу:

– Бог, мне сумна.

І Бог даў чалавеку тэлебачанне.

– Бог, мне сумна.

І Бог даў чалавеку камп'ютар.

– Бог, мне сумна.

Бог даў чалавеку сотавы тэлефон. Чалавек пераадрасаваў просьбу.

– Мне ўсё роўна сумна, д'ябал.

І д'ябал прымусіў чалавека, за ўсё, што даў Бог, плаціць грошы. Больш просьбаў не было. На іх цяпер чалавеку не хапае часу. Ведаеце, хто геній з геніяў?

– Хто?

– Той, хто прыдумаў людзям Бога і чорта (Г. Марчук).

У дадзеным выпадку аўтар дае магчымасць чытачу яшчэ раз пераацаніць каштоўнасці і падказвае: радуйся малому, радуйся кожнаму моманту, з удзячнасцю прымай і беражы дабро.

МОЎНЫЯ НОРМЫ Ў СІСТЭМЕ ТЭРМІНАЛОГІІ

Арфаэпічныя нормы

Арфаэпічныя нормы рэгулююць правільнасць вымаўлення галосных і зычных гукаў, а таксама іх спалучэнняў. Парушэнне арфаэпічных нормаў прыводзіць да арфаэпічных памылак, асноўныя прычыны якіх наступныя:

1. Недастатковае засваенне нормаў беларускай мовы, уплыў арфаэпіі рускай мовы. Напрыклад, памылкай з'яўляецца вымаўленне на канцы слоў на месцы літары ***г*** гука [к]: *сто даро[к], сто[к] сена, зялёны лу[к].* У такіх выпадках трэба вымаўляць *даро[х], сто[х], лу[х],* бо пара па звонкасці/глухасці ў беларускай мове [г] фрыкатыўны – [х], у рускай адпаведна [г] выбухны – [к].

2. Уплыў арфаграфіі. Напрыклад, цвёрдае вымаўленне [з], [с], [дз], [ц] перад наступнымі мяккімі: *[з]мена, [с]мех, [дз]веры, [ц]вёрды;* адсутнасць якання ў часціцы ***не*** і прыназоўніку ***без*** перад націскным складам: *[н'э] бачыў, [н'э] хоча, [б'э]з доказаў, [б'э]з сораму.*

3. Уплыў дыялектнага маўлення. Напрыклад, у маўленні ўраджэнцаў паўночна-ўсходняй Беларусі сустракаецца дысімілятыўнае аканне: *с[і]м'я, в[і]сна.*

Асноўныя арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы:

1. Усе націскныя галосныя вымаўляюцца выразна, ненаціскныя – менш выразна, а некаторыя з іх змяняюць сваю якасць.

2. Поўнае аканне – вымаўленне націскных [о], [э] пасля цвёрдых і зацвярдзелых як [а] у ненаціскным становішчы: *та- поля – тапаліны, рэкі – рачны, шэпт – шаптаць.*

Аканне назіраецца ў іншамоўных агульных назоўніках з фіналямі ***-аль, -ар*** (*шніцаль, камп'ютар,* але ва ўласных назоўніках захоўваецца ***э:*** *Потэр, Пітэр, Юпітэр*).

У запазычаных словах ненаціскное [э] захоўваецца ў пачатку слоў (*элемент, экватар*), пасля шыпячых (*жэтон*), пасля [р], [д], [т], цвёрдага [ц] (*рэклама*, *гардэроб, ветэран, цэнтральны*).

У некаторых словах на месцы ***э*** вымаўляецца і пішацца ***ы:*** *аўтарытэт, брызент, арышт, інжынер, канцылярыя, дрызіна, рызіна, дрымучы, цырымонія, рысора, марыва, почырк, хрысціцца, хрыбет, яблык(-ня, -чны), трыснёг (трысцё), трывога, горыч, чырвоны(-ец), дырыжор, мачы(а)ха, зары(а)ва.*

Не падпарадкоўваюцца аканню словы са спалучэннямі ***ро, рэ, ло,*** якія чаргуюцца з ***ры, лы:*** *кроў – крыві, крывавы, крывя- носны; дровы – дрывотня, дрывасек; глотка – глытаць, глыток; дрогнуць – дрыжаць,*

дрыжыкі; блохі – блыхасты, блышыны; крошкі – крышыць; хрэст – хрысціцца, хрышчэнне; скро(ы)гат – скрыгатаць, скрыгатанне; бровы – брыво, брывамі; гром – гры- мець, грымоты; трое – трыма.

1. Няпоўнае яканне – вымаўленне [о], [э] (графічна *е, ё*) пасля мяккіх як [а] (графічна я) у першым складзе перад ненаціскам: *пё- ры – пяро, вена – вянозны, сем – сямнаццаць, восем – васямнаццаць.* Часціца ***не*** і прыназоўнік ***без*** таксама падпарадкоўваюцца яканню: *[н'а] бачыў, [н'а] чулі, [б'аш] шапкі, [б'ас] сораму,*
[б'аз'] лесу.

У запазычаных словах і пасля *г, к, х* яканне адсутнічае: *метровы, паралелепіпед, сегмент, аперацыя; кефір, герой, Германія, Генадзь, Герасім, Херсон, Туркестан.*

Падпарадкоўваюцца яканню даўно запазычаныя словы: *дзяжурны, каляндар, сяржант, яфрэйтар, мянтуз, ядловец, яўрэй, ялей, ярмолка, янот, валяр'ян.*

2. Гук [г] у большасці слоў фрыкатыўны. Выбухным (як у рускай мове) ён з'яўляецца толькі ў некаторых запазычаных словах: *ганак, гуз, гузік, гвалт, газа, гарнец, гонта, гэбель, гарсэт, гірса, рэзгіны, розгі, мазгі, швагер, агрэст, нягеглы*, а таксама ў сярэдзіне слоў перад звонкім на месцы ***к:*** *э[г]замен, ане[г]дот, ва[г]зал, э[г]зотыка.*

3. Свісцячыя [з], [с], [дз], [ц] перад наступнымі мяккімі (акрамя ***г, к, х***) вымаўляюцца мякка: *[з']вер, [з']мены, [з'jэс']ці, [с']мелы, [с']цябло, [дз']веры, [дз']віна, [ц']вёрды, [ц']вік, але: [з]гінуць, [с]кептык, [с]хіл.*

4. Перад мяккім [ф'] дапускаецца варыянтнасць у вымаў- ленні: *атма[с']фера* і *атма[с]фера, [с']фінкс* і *[с]фінкс.*

5. Беларуская мова пазбягае спалучэнняў галосных у ме- жах слова (яны магчымыя толькі на стыку марфем: *паабедаць, заасфальтаваць*), таму паміж галоснымі ў запазычаных словах вымаўляецца ўстаўны гук [й]: *фізіёлаг, біятокі, рацыён, радыяцыя* вымаўляем так: *фізі[йо]лаг, бі[йа]логія, рацы[йо]н, ды[йа]пазон.*

Літара ***і*** ў залежнасці ад яе становішча і тэмпу маўлення можа абазначаць гукі [і], [ы], [й], [йі]

[і]	*[ы]*	*[й]*	[йі]
Пасля зычных у сярэдзіне слова: л[і]сце, м[і]ска	*У пачатку слова пасля зычных: з [ы]ванам, пад [ы]голкамі*	*Ненаціскны ў пачатку слова пасля галосных пры хутнкім тэмпе*	*Заўсёды ў сярэ- дзіне слова пасля галоснай: за[йі]грываць, за[йі]нтрыгаваць*

Заўсёды злучнік **і** *пасля г, к, х* і мяккіх зычных*: сне[х] [і]дзе, Віцебск [і] Полацк; пяць [і] шэсць, конь [і]*	*Пасля запазычаных прыста- вак на зычны: звыш[ы]мклівы, контр[ы]гра, між[ы]нстытуцкі*	*Пасля галосных на месцы злучніка і: яна [й] я, поле [й] луг*	*Націскны ў пачатку слова пасля галоснай: за [йі]рай, з-за [йі]х, ненаціскны пры сяроднім тэмпе малення: за [йі]ванам*
Зрэдку ў пачатку слова і пасля галосных у запазычаных словах: [і]дэал, [і]ерогліф, за [і]далам	*Пасля зычных у складаных словах: пед[ы]нстытут, борт[ы]нжынер*		*Пасля мяккага знака, у нескладовага, апострафа: у Іль[йі], салаў[йі]ны, у сям'[йі]*
	Злучнік ***і*** *пасля слова на цвёрды зычны (выключэнне –* ***г,к, х****): Вільнюс [ы] Талін*		*Націскны* ***і*** *ў пачатку слова пасля слова на цвёрды зычны: перад[ji]мі, паўз [ji]х*

9. Беларускай мове ўласцівы падоўжаныя зычныя. Падоўжана вымаўляюцца паміж галоснымі шыпячыя [ж], [ш], [ч] і мяккія зубныя [з'], [с'], [дз'], [ц'], [л'], [н']: *збо[жж]а, заці[шш]а, лама[чч]а, пало[з'з']е, кало[с'с']е, асяро[дз'дз']е, сукве[ц'ц']е, ва[л'л']як, апыле[н'н']е.* Вымаўленне ў такіх выпадках аднаго гука ці спалучэння зычнага з [й] – парушэнне літаратурнай нормы.
10. Гукі [б], [п], [м], [ф] у канцы слоў і перад мяккімі зычнымі (у тым ліку і перад [j]) не змякчаюцца: *голуб* – чытаем *голу[п], глыб – глы[п], насып, сып, восем, сем, верф, п'яўка – [пj]а[ў]ка, б'еш – [бj]э]ш* (параўн. адпаведныя руск.: *голу[п'],* а таксама *насыпь, сыпь, восемь, семь, верфь, [п'j]а]вка, [б'j]о]шь*).
11. Вымаўленне спалучэнняў зычных не ў адпаведнасці з напісаннем:

а) свісцячыя [з], [с], [дз], [ц] перад шыпячымі [ж], [ш], [дж], [ч] вымаўляюцца як шыпячыя: *сшытак – [шш]ытак, расчапіць – ра[шч]апіць, пясчаны – пя[шч]аны, з шышкамі – [ш] шышкамі;*

б) шыпячыя перад свісцячымі вымаўляюцца як свісцячыя:
на рэчцы – на рэ[цц]ы, у бочцы – у бо[цц]ы;

в) звонкія перад глухімі вымаўляюцца як адпаведныя глухія:
лёгка – лё[х]ка;

г) глухія перад звонкімі вымаўляюцца як адпаведныя звонкія:
просьба – про[з']ба, касьба – ка[з']ба;

д) спалучэнне ***дс*** вымаўляецца як [ц]: *гарадскі – гара[ц]кі, суседскі –*

сусе[ц]кі;

е) спалучэнне ***чн*** вымаўляецца нязменна: *смачны – сма[чн]ы, ручнік – ру[чн]ік, яечня – яе[чн]я;*

ж) спалучэнні ***шс, жз, зс*** у становішчы паміж галоснымі вымаўляюцца як доўгі мяккі гук [с'с']: *вучы<u>шся</u> – вучы[с'с']я, купае<u>шся</u> – купае[с'с']я,* а ў становішчы паміж галосным і зыч- ным – як адзін гук [с]: *пары<u>жс</u>кі – пары[с]кі, чэ<u>шс</u>кі – чэ[с]кі, францу<u>зс</u>кі – францу[с]кі;*

з) спалучэнні ***дц, тц*** вымаўляюцца як доўгі [цц] або [ц'ц']: *падцягнуць – па[ц'ц']ягнуць, братцы – бра[цц]ы, ад цябе – а[ц'ц']ябе;*

і) спалучэнні ***дч, тч*** вымаўляюцца як доўгі [чч]: *выклад- чык – выкла[чч]ык, адчыніць – а[чч]чыніць, пераплётчык – пераплё[чч]чык.*

12. Наяўнасць прыстаўных галосных і зычных: *аржаны, ір- жаны, пад ільдом; вусцейка, вока, воспа, вокіс, гэты, гісторыя, Ганна.*
13. Чаргаванне [у] з [ў] пасля галосных: *за Уралам – за [ў]ра- лам, за ўніверсітэтам – за [ў]ніверсітэтам, спрыяльныя ўмовы.*
14. Чаргаванне гука [в] з [ў]: *дрэсіроўка, зімоўка, кроў, праўда, лоўкі, заўтра, траўка* (параўн. руск.: *дрессировка, зи- мовка, кровь, правда, ловкий, завтра, травка*).
15. Чаргаванне гука [л] з [ў]: *воўк, даўганосік, жаўток, жоўць* (параўн. руск.: *волк, долгоносик, желток, жёлчь*).

Акцэнтныя нормы

Акцэнтныя нормы рэгулююць правільнасць пастаноўкі націску ў словах.

Націск – гэта вылучэнне фанетычным спосабам аднаго са складоў у слове (слоўны націск). Аднак у кожнай фразе адно са слоў мае больш моцны націск, чым астатнія, што дазваляе слухачу засяродзіць на ім большую ўвагу, выдзеліць яго лагічна. Такі націск называюць лагічным – сэнсава важкае слова прамаўляецца з большай сілай і працягласцю голасу. Бывае таксама эмфа- тычны націск – слова вымаўляецца эмацыянальна, з самымі разнастайнымі адценнямі: іроніі, пагарды, пяшчоты, спагады і інш., чым і выяўляе адносіны апавядальніка да прадмета гутаркі або да субяседніка.

Інтанацыйна-рытмічнае выдзяленне націскных складоў (слоўны націск) і асобных слоў (лагічны і эмфатычны націск) з'яўляецца абавязковай умовай выразнасці вуснага маўлення.

Асноўны націск – слоўны – гэта абавязковая прымета фане- тычна самастойнага слова, якая забяспечвае яго адзінства. Самастойны націск у беларускай мове маюць таксама інфармацыйна моцныя словы:

- сцвярджальныя і адмоўныя часціцы ***але, так, не*** і інш.;
- выклічнікі ***гэй! Ох!*** і г. д.: *О! Ляціце, журавы, ляціце!*

Беларускі націск мае яшчэ некалькі важных характарыстык:

1. Ён дынамічны (сілавы) і колькасны (квантытатыўны, больш працяглы) адначасова, таму яго кваліфікуюць як дынамічна-колькасны.

2. У некаторых мовах націск фіксаваны, ці аднамясцовы, – заўсёды на адным складзе любога слова (у французскай, турэцкай, армянскай – на апошнім складзе, у польскай – на перадапошнім, у чэшскай, латышскай, венгерскай – на першым).

У беларускай мове націск прыпадае на розныя склады, ён свабодны, ці рознамясцовы.

3. Паводле акцэнталагічных суадносін формаў слова беларускі націск можа быць як рухомы, так і нерухомы, г. зн. пры формаўтварэнні месца націску можа змяняцца (пераходзіць на іншы склад): *бе́лы – бе́лага – белава́ты – бяле́ецца – бялю́сенькі; зе́лень – зеляні́на* або заставацца нязменным на тым самым складзе: *ха́та – у ха́це – ха́тні – ха́тнічак – ха́тай – ха́ты; тво́р – тво́ры – тво́рамі – тво́ру.*

4. Націск маюць толькі самастойныя словы. Службовыя словы націску, як правіла, не маюць: яны прымыкаюць у якасці ненаціскных складоў да самастойных слоў, утвараючы разам з імі адно фанетычнае слова (праклітыкі ці энклітыкі (**да** ці **пасля** самастойнага слова)): *да во́кнаў, хаце́ў бы*; такія з'явы адпаведна называюцца праклізы/энклізы.

Трэба ведаць, што двухскладовыя часціцы, вытворныя злучнікі, прыназоўнікі маюць слабы, пабочны націск (гравіса), у адрозненне ад асноўнага, больш моцнага (акута): *т`олькі адзі́н, вак`ол до́ма, п`ерад ад'е́здам.*

5. У складаных ці нескладаных шматскладовых словах (сло- вы са складанай рытмічнай структурай) можа ўзнікаць пабочны націск: *м`овазна́ўства, к`олерамузы́чны*; пры трох-чатырох каранях у складаным слове – 3–4 націскі (першыя – пабочныя, апошні – асноўны): *м`отав`елаго́нкі, пы`лав`оданепранікальны.*

6. Слоўны націск з'яўляецца дадатковым сродкам фанетычнага адрознення слоў у тых выпадках, калі словы аднолькавыя паводле колькасці складоў і паслядоўнасці размяшчэння гукаў*: па́ра – пара́, пры́ клад – прыкла́д, гу́сты – густы́ , лю́ бы – любы́ .*

Такім чынам, націск у беларускай мове выконвае дзве функцыі:

а) аб'яднанне складоў у слова;

б) словаразмежаванне (*бу́йны* 'неспакойны, свавольныдзёрзкі, нястрыманы' і *буйны́* 'вялікі па памерах, па значэнні', *зака́паць – закапа́ць, за́раз – зара́з, ка́зачка – каза́чка*) ці формаразмежаванне (*ру́кі – рукі́, тра́вы – травы́ , ву́чыць – вучы́ць, вы́клікаць – выклі́каць* і г. д.).

Як слушна сцвярджаюць мовазнаўцы, у беларускай мове на месца слоўнага націску ўплывае наяўнасць суфікса ці прэфікса. Напрыклад, калі ў назоўніках ёсць суфіксы ***-ыст(-іст), -ан (-ян), -ей(-эй), -ізм(-ызм), -ант, -ёр,*** то на іх, як правіла, пры- падае націск: *журналі́ст, вакалі́ст, велікáн, багацéй, палані́зм, дыпламáнт, кіяскёр*.

Назоўнікавыя прэфіксы ***вы-, по-, под-, про-, поў-*** таксама ма- юць фіксаваны націск (незалежна ад колькасці складоў у слове, калі яно ўтворана ад дзеяслова): *вы́лет, вы́дых, по́дых, по́дступ, про́пуск, по́ўдзень* і інш.

У вытворных прыметніках націск фіксуецца на такіх слова-ўтваральных суфіксах, як ***-ават-(-яват-), -ат-, -арн-(-ярн-), -ічн- (-ычн-), -оў-(-ёў-):*** *цеплава́ты, рага́ты, папуля́рны, рытмі́чны, Міхасёў*.

У памяншальна-ласкальных формах прыметнікаў з фарман- тамі ***-еньк-(-эньк- / -аньк-)*** націск можа быць як на корані, так і на суфіксе: *стары́ – старэ́нькі, цёплы – цёпленькі, малы́ – малёнькі, вясёлы – вясёленькі* (калі ў пачатковай форме націск прыпадае на канчатак, то ў вытворным слове націскным з'яўляецца суфікс; у прыметнікаў з націскным коранем націск нерухомы). Што да астатніх суб'ектыўна-ацэначных формаў прыметнікаў, то ў іх фармант, як правіла, націскны: *ціхо́ткі, бялю́сенькі, малюпа́сенькі, высо́зны, вялі́зны, веліза́рны, страшэ́нны*.

У дзеясловах пільнай увагі патрабуюць формы 1-й асобы множнага ліку абвеснага ладу і формы 1-й асобы множнага ліку загаднага ладу. Адпаведна першыя будуць з націскным канчаткам

-ём(-ом): *бяро́м, нясём, кладзём* (абвесны лад), другія – з канчат-

кам ***-ем(-эм):*** *бярэ́м, нясе́м, кладзе́м* (загадны лад).

Дзеяслоўныя формы 2-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць націск:

1) на апошнім складзе канчатка, калі ў 1-й асобе множна- га ліку яны мелі націскны канчатак (*бяро́м – бераце́, глядзі́м – гледзіце́, даём – даяце́*); такія формы нельга блытаць з формамі 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу, у якіх націск прыпадае на першы склад канчатка: *крычы́це, маўчы́це, глядзі́це*;

2) на аснове, калі ў 1-й асобе множнага ліку націск падаў на аснову: *пі́шам – пі́шаце, малю́ем – малю́еце*.

Пастаноўку месца націску ў асобных лічэбніках трэба запомніць: *адзіна́ццаць, адзіна́ццаты, чатырна́ццаць, чатырна́ццаты, шэ̀сцьдзяся́т*.

Паводле Правілаў-2008 у складаных словах лічэбнік *сто* заўсёды мае форму *ста* (*стато́нны, статы́ сячны, стаметро́вы*), а гэта значыць, што ў такіх утварэннях адсутнічае пабочны націск. У складаных лічэбніках, што маюць некалькі каранёў, можа быць адпаведная колькасць націскаў, апошні з якіх – асноўны: *трыццаць̀ішасць̀ільённы, сарак̀апяць̀ітысячны*.

У адмоўных займенніках ***ніхто (нішто)*** пры скланенні націск прыпадае на першы галосны канчатка: *нікога́, нічога́ (нікому́, нічому́)* і г. д. (параўн. формы адносных займеннікаў: *каго́, чаго́, каму́, чаму́)*.

У займенніку ***ніякі*** ва ўсіх склонах націск захоўваецца на ас- нове (на ***я***): *ніякага, ніяка́му, ніякіх* і г. д.*: Лепш ніякі, чым абы-які; Ядуць на свеце хлеб траякі: белы, чорны і ніякі;* параўн. адносныя займеннікі: *якога, яко́му.*

Калі пры адмоўным займенніку ўжываецца прыназоўнік, то ён ставіцца пасля адмоўнай часціцы ***ні,*** тады націск можа прыпа- даць на розныя склады займеннікаў: *ні на кога* (не спадзяваліся) – *ні на каго́, ні да чога* (рукі не прыстаюць) – *ні да чаго́, ні за якія* (грошы) – *ні за якія́*. Першыя варыянты больш уласцівыя літаратурнай мове, чым апошнія.

Пры скланенні займеннікаў ***сам, са́мы*** трэба памятаць на- ступнае: у займенніку ***сам*** ва ўскосных склонах націск прыпа- дае на першы галосны канчатка: *само́га (-о́му, -і́м, -у́ю, -і́х),* а ў займенніку ***са́мы*** – на аснову: *са́мага (-аму, -ым, -ай, -ым)*.

Арфаграфічныя нормы

Арфаграфічныя нормы дэманструюць правільнасць пісь- мовай мовы, спрыяюць аднастайнасці напісання слоў і іх формаў. Веданне арфаграфічных нормаў – паказчык адукаванасці асобы, яе ўважлівага стаўлення да мовы.

23 ліпеня 2008 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», паводле якога замацаваліся некаторыя змены ў арфаграфічнай і пунктуацыйнай сістэмах беларускай мовы ў параўнанні з нормамі, прынятымі ў 1957 г. Змены закранулі правапіс галосных, зычных, а таксама правапіс вялікай літары: былі ўведзены новыя правілы, а таксама ўдакладнены ўжо існуючыя.

Згодна з «Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» 2008 г. (далей – Правілы-2008) [53], літара ***э*** пішацца ў канцы за- пазычаных нязменных слоў пасля зычных, у тым ліку ва ўласных імёнах і геаграфічных назвах: *рэзюмэ, купэ, кафэ, каратэ, кабернэ, шымпанзэ; Морзэ, Брыгвадзэ, Душанбэ, Струвэ.* **Выключэнне:** пасля ***л, к*** пішацца літара ***е:*** *сальта-мартале, філе, камюніке, піке.*

Літара ***э*** пішацца таксама пасля губных зычных і пасля ***з, с, н*** у сярэдзіне запазычаных слоў: *экзэмпляр, капэла, сурвэтка, маянэз, тунэль, інтэрнэт, сэ́рвіс* ‘абслугоўванне’ (але: *ме- даль, менеджмент, нервы, парламент, газета, сервіз* ‘набор посуду’).

Аканне распаўсюджваецца на ненаціскныя фінальныя спа- лучэнні ***-аль, -ар*** слоў іншамоўнага паходжання: *шніцаль, шпа- таль, камп’ютар, пэйджар, ордар, світар, менеджар, лідар, альма-матар, тэндар, фарватар* і інш. **Выключэнне:** уласныя запазычаныя назоўнікі, якія пішуцца праз ***-эль, -эр,*** калі на іх не падае націск: *Гендэль, Пітэр, Юпітэр, Потэр, Ландэр, Лютэр, Одэр, Гюнтэр;* вытворныя ад такіх

назоўнікаў словы: *юпітэрны, лютэранства.*

Літара ***о*** пішацца і вымаўляецца толькі пад націскам незалежна ад паходжання слова: *Орша, ордэн, рэкорд, рэформа.* Не пад націскам заўсёды пішацца і вымаўляецца ***а:*** *аршанскі, ардэнаносны, рэкардсмэн, Токіа, Бакачыа, трыа, адажыа, Ватэрлоа, імпрэсарыа* і г. д.

Літара ***ё*** пішацца ў наступных выпадках:

1) пад націскам: *вёска, мёд, цёплы;*

2) не пад націскам у словах з коранем ***ёд-*** і ***ёт-:*** *ёдапірын, ётаванне;*

3) у складаных словах з першай часткай ***радыё-:*** *радыёстанцыя, радыёантэна;* калі першая частка складанага слова – назва хімічнага элемента ***радый-,*** то пішацца ***е*** (яно з'яўляецца злучальнай галоснай): *радыеактыўнасць, радыебіялогія* (але: *радыяхімія, радыялогія* ў першым складзе перад націскам).

! Дарэчы, пастаноўка кропак над літарай ***ё*** ў беларускай мове абавязковая.

Адсутнасць кропкі над *і* дапускаецца толькі ў адным выпадку – над літарай І ў друкаваных тэкстах, у тым ліку і калі тэкст надрукаваны вялікімі літарамі: *ФЕСТЫВАЛЬ МУЗЫКІ І ПЕСНІ*. Адхіленне ад гэтай нормы з'яўляецца памылкай.

Яканне распаўсюджваецца на:

1) усе словы са славянскай лексічнай асновай: *дзянёк, медз- ведзяня́, квяці́сты, пячо́ра, Пятру́сь;*

2) усе простыя па структуры лічэбнікі: *дзявя́ты, дзяся́ты, сямна́ццаць, васямна́ццаць, сямёра;*

3) даўно запазычаныя і таму асвоеныя беларускай мовай сло- вы: *дзяжу́рны, каляндар, мянту́з, яно́т, яфрэйтар, сяржа́нт, яхі́дны, яле́йны, яўрэ́й,* у тым ліку ўласныя асабовыя імёны: *Яку́б, Ягор, Яўге́н, Яўста́х, Веньямі́н, Валяр'я́н, Валянці́н* і інш.;

4) злучальныя галосныя ў складаных словах: *жыццяра́дас- ны, краяві́д, зерняхо́вішча, земляро́бчы.*

Літара ***е*** ніколі не пераходзіць у ***я*** ў наступных пазіцыях:

1) у большасці іншамоўных слоў: *метро́, сезо́н, легенда, бензі́н, калекты́ў, сенса́цыя, апеты́т, Еўро́па, Егіпет, Палес- ці́на, Берлі́н;*

2) пасля ***г, к, х:*** *гектар, геро́й, Генадзь, Герасім, кефір, кераміка, Македо́нія, Херсо́н;*

3) у прыназоўніку ***без*** і часціцы ***не***: *без цукру, без кло́пату, не́ ёў, не хо́ча, не́ бы́ў* (але пры напісанні разам ***без*** і ***не*** стано- вяцца прыстаўкай і падпарадкоўваюцца яканню: *бязме́жны, бяскры́ўдны, нядо́ўга, няшу́мна*).

У невялікай групе слоў каранёвая ***я*** пішацца незалежна ад націску: *святкаваць, лямантаваць, цяжар, цягавіты, пя- цярня, завязь,*

калядаваць, дзевяць, ядавіты, мяккаваты і інш. Правапіс такіх слоў можна праверыць, паставіўшы ***я*** ў моцную пазіцыю: *свя́та, ля́мант, цяжкі, цягне, пяць, вяжа, Каляды, дзявяты, яд, мя́ккі*. Напісанне некаторых слоў трэба запомніць або правяраць па слоўніку: *сённяшні, языкасты, яравы, віцязь, месяц, памяць, пояс, тысяча, Прыпяць, Свіцязь, Бесядзь, Вячаслаў.*

Патрабуе ўвагі правапіс галосных у складаных словах.

У першай частцы складаных слоў пішацца літара ***я*** перад па- бочным націскам, калі асноўны націск падае не на першы склад другой часткі: *нядо̀бра/зы-члі́-вы, вялі̀ка/дзяр-жа́ў-ны, Вялі̀ка/ бры-та́-нія.* Літара ***е*** пішацца ў першай частцы складаных слоў славянскага паходжання, калі пад націскам знаходзіцца першы склад другой часткі (пабочны націск не ўзнікае): *бела/ве́ж- скі, света/по́-гляд, свежа/вы́ -мы-ты, сена/жа́ць, веліка/све́ц- кі, веліка/ду́ш-ны, веліка/му́-ча-нік* (такое напісанне адпавядае правапісу літары ***е*** ў простых па структуры словах).

У складаных словах, утвораных ад колькасных лічэбнікаў ва ўскосным склоне, першая частка пішацца так, як ва ўскосным склоне лічэбніка (незалежна ад націску ў другой частцы): *пяціметровы* (як *пяці*), *сямітонны, сямімільённы* (як *сямі*), *дзевяцікласнік, дзевяцірублёвы* (як *дзевяці*), *сямнаццацітонны, сямнаццацімільярдны* (як *сямнаццаці*).

Літара ***о*** ў першай частцы складаных слоў пішацца ў наступ- ных выпадках:

1) калі пад націскам знаходзіцца не першы (а другі, трэці або іншы) склад другой часткі: *выс̀ока/і-дэ́й-ны, каро́тка/ме-тра́ж- ны;*

2) калі другая частка пачынаецца з ***ў*** (нескладовага): *вогне/ўстойлівы, мароза/ўстойлівы, дробна/ўласнік, поўна/ўладны;*

3) незалежна ад націску, калі другая частка ***-вед-, -знав- (-знаў-):*** *японавед, мовавед, усходазнавец, манголазнаўства;*

4) незалежна ад націску, калі першая частка ***аснова-, азо- на-, азотна-, вока-, грос-, збожжа-, іголка-, колера-, контр-, матора-, моцна-, множна-, мова-, мота-, попела-, проці-, ру- жова-, свабода-, слова-, фонда-, фота-, што-:*** *асноватвор- ны, азонастойкі, азотнакіслы, вокамгненны, гросмайстар, збожжасховішча, ігołкападобны, колерамузыка, контрата- ка, маторазборка, моцнапорысты, множналікавы, моватвор- часць, мотаролер* (**выключэнні:** *матавоз, матацыкл* і вы- творныя ад іх: *матацыкліст* і інш.), *моцнатокавы, попелапад, проціатамны, ружовашчокі, свабодамысны, словатворчасць, фондасховішча, фотаздымак* (**выключэнне:** *фатаграфія* і вытворныя ад яго: *фатаграфаваць, фатаграфаванне* і інш.), *штомесяц.*

Літара ***а*** пішацца ў першай частцы складаных слоў, калі пад націскам

знаходзіцца першы склад другой часткі: *даўга/вéч-ны, чарна/брó-вы, карáтка/хвá-ле-вы, заа/пáрк.* Першая частка ***ста-*** заўсёды пішацца праз ***а:*** *стагоддзе, стаметровы, старублёвы*.

Літара ***э*** пішацца ў першай частцы складаных слоў нязмен- на (незалежна ад націску ў другой частцы): *рэдкапасаджаны, рэдкалессе, мэтанакіраваны, арэхападобны, крэдытаздольны, шэравокі, шэразём.*

У складаных словах, што пішуцца праз злучок, кожная частка захоўвае свой націск і пішацца як самастойнае слова: *шоу-бізнес, рок-спявак, гротмачта, чорна-сіні.*

Лічэбнікі *шэсцьсот, семсот, восемсот* утвараюць асобны тып складаных слоў, у якіх першая частка скланяецца і пішацца як самастойнае слова:

Н. *шэсцьсóт, семсóт, восемсóт*

Р. *шасцісóт, сямісóт, васьмісóт*

Д. *шасцістáм, сямістáм, васьмістáм*

В. *шэсцьсóт, семсóт, восемсóт*

Т. *шасцюстáмі, сямюстáмі, васьмюстáмі*

М. (у, пры, на) *шасцістáх, сямістáх, васьмістáх*

Нескладовае ***й*** пішацца ў сярэдзіне іншамоўных слоў (у тым ліку і ва ўласных назвах) толькі перад зычнымі: *дызайнер, лайнер; Драйзер, Айні*.

Гукавое спалучэнне гука ***й*** з галоснымі ў запазычаных словах перадаецца ётаванымі галоснымі (як і ў словах уласнабеларускіх): у пачатку слова – *ёд, ёгурт, Ёфе, Нью-Ёрк*, пасля галоснага ў сярэдзіне слова – *маёр, маянэз, раённы,* пасля галоснага на канцы слова – *фае, сквоя, папая, Мая*.

Літара ***і*** пасля прыставак на галосны чаргуецца з ***й*** у наступ- ных выпадках:

1) у словах з коранем ***іс***-ці, ***ігр***-аць, ***ім***-я, ***інач***-ай: *зайсці, выйсці, выйграць, перайграць, займеннік, пайменны, перайна- чыць, няйначай;*

2) у словах ***займаць, наймаць, пераймаць, перайманне, праймаць.***

Пачатковы каранёвы ***і*** пасля прыставак на галосны захоў- ваецца ў наступных выпадках:

1) калі ўтварае склад: *заіскрыцца, заіканне, праілюстра- ваць, праіснаваць, неістотны, Прыіртышша, заінтрыгаваць,* у тым ліку калі на ***і*** падае націск: *заíгрываць, заíнелы, заíклівы,* і інш.;

2) пасля ***звыш-, між-, гіпер-, контр-, пан-, пост-, супер-, транс-, фор-:*** *звышідэйны, міжінстытуцкі, гіперінфляцыя, контрігра, панісламізм, постіндустрыяльны, суперінтэлект, трансіндыйскі,*

форінжэктар і прыставак, якія пішуцца праз злучок: *па-іспанску, па-італьянску.*

Пасля прыставак на зычны (у тым ліку іншамоўных ***дэз-, суб-***) літара ***і*** чаргуецца з ***ы:*** *перадынфарктны, абышоў, падыграў, зымправізаваць, дэзынфекцыя, дэзынтэграцыя, дэзынфармацыя, субынспектар.* Прэфіксоід ***экс-*** пішацца праз злучок, пасля яго ***і*** не пераходзіць у ***ы:*** *экс-інжынер, экс-імпарцёр.*

Чаргаванне адсутнічае ў складанаскарочаных словах, пер- шая частка якіх заканчваецца на зычны: *бортінжынер, санін- структар, педінстытут, гарінспекцыя, палітінфармацыя, дзяржінспектар.*

Літара ***ў*** (нескладовае) пішацца:

1) у пачатку слова пасля галоснай незалежна ад паходжан- ня лексемы: *моцны ўдар, крыкі «ўра», жанчына-ўрач, ва ўнівер- сітэце, няма ўрану, прыёмка ўтылю;*

2) у сярэдзіне слова перад зычнымі: *ноўтбук, фаўна, саўна, аўдыякасета, аўра, аўдыторыя, аўдыенцыя, паўза, Браўн, За- ўралле* (але: *траур*).

Не скарачаецца ***у*** ў літарных абрэвіятурах: *РУУС – раённае ўпраўленне ўнутраных спраў.*

У канцы запазычаных слоў ненаціскное ***у*** не скарачаецца:

фрау, ток-шоу, Ландау, Цеміртау і інш.

Націскны гук ***у*** не чаргуецца з ***ў:*** *Брэсцкая унія, аул, за урнай, купіла унты, сказала «ух ты!», баул, аукаць, Іуда.*

Не адбываецца чаргаванне ў запазычаных словах, якія за- канчваюцца на ***-ум, -ус:*** *прэзідыум, калёквіум, вакуум, кансіліум, радыус, страус, анчоус* і інш., і вытворных ад іх: *прэзідыумны, страусаў, радыусны, калёквіумы.*

Вялікая літара ***у*** складовая заўсёды пішацца без надрадко- вага значка (незалежна ад вымаўлення): *да Усяслава, за Уралам, Таццяна Уладзіміраўна, ва Украіне* (але: *ехаць па ўральскіх дарогах, за ўкраінцам*).

Напісанне каранёвых спалучэнняў ***зн, рц, нц, сл,*** якія ўтварыліся ў выніку выпадзення *д, т, л,* заснавана на фанетычным прынцыпе: *позна, баразна, сэрца, сонца, разаслаць.*

У канцавых спалучэннях каранёвых ***зд, зг, ст, ск, рд*** перад суфіксальнымі ***н, л*** адбылося выпадзенне сярэдняга зычнага незалежна ад паходжання слова: *праязны (праезд), бразнуць (бразгатаць), посны (пасціцца), абласны (вобласць), кантрасны (кантраст), кампосны (кампост), кантэксны (кантэкст), баласны (баласт), шчаслівы (шчасце), бліснуць (бляск), міласэрны (сардэчны).*

Спалучэнне ***дт*** на канцы іншамоўных слоў перадаецца праз

т: *Рэмбрант, Брант, Шміт, Кранштат.*

Змякчальны мяккі знак пішацца пасля ***з, л, н, с, ц, дз,*** калі яны абазначаюць мяккія гукі:

1) на канцы слова: *шэсць, мядзведзь;*

2) у сярэдзіне слова перад цвёрдым зычным: *дзядзька, вязьмо;*

3) у сярэдзіне слова перад мяккім зычным, калі пры змене формы слова (замене яго аднакаранёвым) гэты зычны становіцца цвёрдым, а папярэдні захоўвае сваю мяккасць: *васьмісоты (восьы), пісьменнік (пісьмо), разьбяр (разьба), вазьмі (вазьму),* бо мяккасць тут не ад суседняга зычнага;

4) у дзеясловах загаднага ладу перад канчаткам 1-й асобы множнага ліку ***-ма:*** *сядзьма (сядзь), станьма (стань);* 2-й асобы множнага ліку ***-це:*** *кіньце (кінь), будзьце (будзь);* перад зваротнай часціцай ***-ся:*** *намылься (намыль), завесься (завесь);*

5) у назоўніках перад канчаткам творнага склону множнага ліку ***-мі:*** *дзецьмі, грудзьмі, людзьмі;* перад суфіксам ***-чык-,*** калі слова без яго заканчваецца на мяккі знак: *агеньчык (агонь), карэньчык (корань);* пасля ***н*** перад суфіксам ***-к-*** у словах *вішанька, песенька, соценька* і інш.;

6) перад суфіксам ***-ск-*** у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў і ад слова ***восень:*** *снежаньскі, ліпеньскі, восеньскі* (у тым ліку ў суадносных уласных назвах: *Чэрвеньскі раён, Ліпеньская школа*); у суфіксе ***-еньк-(-эньк-/-аньк-):*** *маленькі, даражэнькі, прыгожанькі;*

7) у сярэдзіне складаных слоў, калі пры адкіданні другой часткі мяккасць апошняга зычнага захоўваецца: *шэсцьдзясят (шэсць), чвэрцьфінал (чвэрць), дзевяцьсот (дзевяць);*

8) у займенніках і прыслоўях на ***-сьці:*** *хтосьці, чымсьці, дзесьці;*

9) у слове ***ледзьве (ледзь).***

Змякчальны мяккі знак не пішацца:

1) пасля шыпячых ***ж, ш, дж, ч, р, ц, д, т:*** *дождж, рэжце, Сібір, ноч, мыш;*

2) пасля губных ***б, п, м, ф, в:*** *голуб, стэп, сем, сям'я, верф, В'етнам;*

3) пасля ***з, с, дз, ц*** перад мяккімі зычнымі, калі пры змене формы слова (замене яго аднакаранёвым) абодва зычныя (папярэдні і наступны) становяцца цвёрдымі: *дзве (два), косці (костка), мас- лёнка (масла), чысціць (чысты)* ці застаюцца абодва мяккімі: *свет (свяціць, светлы, прасвятленне), усмешка (смех, смяяцца, рассмяшыць, смешны);*

4) перад суфіксам ***-ск-*** у прыметніках, утвораных ад назваў на ***-нь*** (у тым ліку ад кітайскіх), якія не звязаны з назвамі месяцаў і словам ***восень:*** *любанскі, астраханскі, хатынскі, цяньшанскі, чаньчунскі* (**выключэнне:** *гданьскі*);

5) паміж падоўжанымі зычнымі: *Таццяна, насенне, калоссе, суддзя;*

6) перад літарай ***ш:*** *меншы, іншы.*

Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля ***з, с, дз, ц, л, н*** перад ***е, ё, ю, я, і:***

1) у словах іншамоўнага паходжання: *паштальён, мільён, манпансье, Нью-Ёрк, Фацьян, Лавуазье* (**в ы к л ю ч э н н е :** *булён*);

2) ва ўтварэннях ад уласных імёнаў на ***-ій(-ый)*** перад суфіксальным ***-еў-(-ев-):*** *Генадзій > Генадзьеў, Генадзьевіч; Васілій > Васільеў, Васільевіч;* калі ўласнае імя заканчваецца не на ***-ій(-ый),*** а на цвёрды або мяккі зычны, то ва ўтварэннях мяккі знак не пішацца: *Генадзь > Генадзевы, Генадзевіч; Васіль > Васілевіч; Арсен > Арсенавіч;*

3) пасля ***л*** у асабовых формах дзеяслова ***ліць*** і вытворных ад яго: *лью, лье, нальяце, вальеш.*

Апостраф пішацца пры асобным вымаўленні зычных з наступным галосным:

1) пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны, перад ***е, ё, ю, я*** і націскным ***і:*** *аб'ём, раз'юшаны, уз'яднаць, аб'інець;*

2) у сярэдзіне слова пасля губных ***б, в, м, п, ф,*** заднеязычных ***г, к, х,*** зубных ***д, т*** і дрыжачага ***р*** перад ***е, ё, і, ю, я:*** *вераб'і, інтэрв'ю, надвор'е, сям'я, п'юць, В'етнам, Х'юстан, Сант'яга, Мар'ін;*

3) у складаных словах з першай часткай ***двух-, трох-, чатырох-, шмат-*** перад ***е, ё, ю, я:*** *трох'ярусны, двух'ярусны, шмат'ядзерны, шмат'ёмісты.*

Апостраф не пішацца:

1) пасля ***ў*** (нескладовага): *здароўе, салаўі, шматтраўе, пагалоўе* (часам нават на шыльдах, афармленне якіх павінна быць узорным, можна прачытаць *Заслаў'е* (грубая памылка!));

2) у складаных і складанаскарочаных словах на мяжы састаўных частак, у тым ліку калі іх часткі пішуцца праз злучок: *цэхячэйка, дзяржюрвыдавецтва, Мінюст, трэд-юніёны.*

Скарочаныя часткі ў абрэвіятурах пішуцца так, як у адпаведных поўных словах: *гарсавет* (параўн. *гарадскі савет*), *прафкам* (*прафсаюзны камітэт*), *заапарк* (*заалагічны парк*), *член-кар.* (*член-карэспандэнт*), *інтэрпал* (*інтэрнацыянальная паліцыя*), а таксама *рыбгас, лясгас, галоўурач, вучгас* і інш.

Літарныя, гукавыя і змешаныя абрэвіятуры звычайна пішуцца вялікімі літарамі без кропак: *ВНУ, НАН Беларусі, ААН.*

Калі да абрэвіятуры дадаецца лічба, то яна пішацца праз злучок: *ВАЗ-21, МАЗ-82.*

Пры скланенні абрэвіятур канчаткі пішуцца разам малымі літарамі:

рамонт ЦУМа, дысертацыя ў ВАКу, артыкул у ЛіМе. Малыя літары могуць самі ўваходзіць у камбінаваныя абрэвіятуры (напрыклад, *БелТА, ЛіМ, БелНДВІ*).

Напісанне запазычаных абрэвіятур вызначаецца па слоўніку; поўны сэнсавы беларускі адпаведнік перадае значэнне такіх слоў, а не расшыфроўвае іх: *палітрук* (палітычны кіраўнік), *заўгас* (загадчык гаспадарчай часткі), *завуч* (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце), *бомж* (без пэўнага месца жыхарства), *спецназ* (атрад спецыяльнага прызначэння), *ЮНЕСКА* (Камісія Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры).

У некаторых абрэвіятурах напісанне можа не адлюстроўваць іх вымаўленне: ТЮГ [цюх], РІВШ [рыўш].

Пры афармленні абрэвіятур і ініцыялаў трэба выкарыстоўваць літару ***д*** на месцы гука ***дз'***: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – *БДУ,* Дзмітрый Якаўлевіч Бугаёў – *Д. Я. Бугаёў.*

Правапісу вялікай і малой літар у Правілах-2008 прысвеча- на адпаведная глава. Так, з вялікай літары пішуцца:

1) найменні найвышэйшых божастваў (бостваў) у рэлігійных культах, а таксама ўсе словы ў спалучэннях, якія змяшчаюць гэтыя назвы: *Бог, Алах, Яхве; Гасподзь (Усявышні), Усемагутны Бог, Святая Тройца, Бог Айцец, Бог Сын, Бог Святы Дух, Божая (Боская) Маці, Царыца Нябесная, Прасвятая Дзева Марыя* і інш.;

2) прыметнікі, утвораныя ад слова ***Бог:*** *Божы (Боскі) суд, Божы (Боскі) храм, Божая (Боская) міласць;*

3) асабовыя імёны (і ўсе словы ў састаўных асабовых назвах, акрамя агульных назваў) заснавальнікаў рэлігійных вучэнняў, а таксама біблейскіх асоб (апосталаў, прарокаў, святых і інш.): *Ісус Хрыстос, Буда, Брахма, Іаан Хрысціцель, Святая Царыца Алена;*

4) імёны легендарных і міфічных асоб, язычніцкіх багоў: *Антэй, Зеўс, Венера, Пярун, Цмок,* але як агульныя назвы: *пярун* – удар грому, *тытан* – волат, *іуда (юда)* – здраднік, *фурыя* – злосная істота;

5) уласныя назвы ўяўных і казачных істот, герояў літаратур- ных твораў: *Чырвоная Шапачка, Калабок, Снягурка, Дзед Мароз, Буцэфал, Баба Яга, Пегас* і інш., але як агульныя назвы: *буцэфал* – стары конь, *дзед-мароз* – ёлачнае ўпрыгожанне;

6) агульныя назвы істот, а таксама з'яў і прадметаў, калі яны персаніфікуюцца, выступаюць у ролі імёнаў літаратурных твораў (у казках, байках і інш.): *Мядзведзь, Воўк, Ліса (Ліска), Каза-дзераза, Сарока-белабока, Сонца, Праўда, Крыўда, Саломінка, Лапаць* і інш.

З малой літары пішуцца:

1) слова *бог (гасподзь)* ва ўстойлівых выразах, звязаных з выказваннем розных пачуццяў, з адценнем прастамоўнасці, а не са зваротам да Бога як найвышэйшага боства паводле рэлігійнай абраднасці і ўяўленняў: *божа (божачка) ты мой, бог яго ведае, дай божа, бог з табой, крый бог,* а таксама *алах з ім* і інш.;

2) слова *бог* з агульным значэннем *‘боства’* ў спалучэнні з асабовай назвай або з назоўнікам з агульным значэннем у родным склоне: *старажытны славянскі бог Пярун, бог сонца Дажбог, Сварог – бог неба;*

3) агульныя назвы ўяўных істот: *архангел, анёл, фея, муза, дамавік, русалка, здань, хут, ваўкалак, гном, троль* і інш.

У найменнях пасад і званняў, ветлівых зваротах і спецыяльных абазначэннях з вялікай літары пішуцца:

1) словы або спалучэнні слоў, якія з’яўляюцца афіцыйнымі назвамі асобы па вышэйшых дзяржаўных і рэлігійных пасадах: *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь, Папа Рымскі, Кароль Іярданіі, Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі.* У неафіцыйных тэкстах без указання на канкрэтную асобу словы *прэзідэнт, міністр, старшыня* пішуцца з малой літары;

2) словы або спалучэнні слоў, якія з’яўляюцца назвамі асо- бы па вышэйшых дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь і іншых краін (акрамя слова *кавалер*): *Герой Беларусі, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы,* але: *Георгіеўскі кавалер, кавалер ордэна Ганаровага Легіёна.*

Словаўтваральныя нормы

Веданне законаў словаўтварэння, якія дэманструюць адметнасць той ці іншай мовы, забяспечвае правільнасць маўлення. Словы ў беларускай мове ствараюцца па пэўных мадэлях. У сваю чаргу запазычаныя словы, адаптуючыся, таксама падпарадкоўваюцца словаўтваральным нормам беларускай мовы. Так, у Правілах-2008 звяртаецца ўвага на ўжыванне дзеяслоўнага суфікса ***-ірава-(-ырава-),*** выкарыстанне якога мае абмежаваны характар. Гэты фармант можа быць ужыты:

1) калі без яго ўзнікае аманімія адпаведных дзеясловаў з дзеясловамі з фармантам ***-ава-(-ява-):*** *буксіраваць – буксаваць, газіраваць – газаваць, парыраваць – параваць, паніраваць – па- наваць, камандзіраваць – камандаваць* і інш.;

2) калі дзеяслоў без ***-ір-(-ыр-)*** губляе сваю фармальную і семантычную акрэсленасць: *лавіраваць, курыраваць, гарманіра- ваць,*

фантазіраваць, сервіраваць і інш.;

3) калі дзеяслоў мае вузкатэрміналагічнае значэнне: *манціраваць, юсціраваць, дэкаціраваць* і інш. У некаторых выпадках магчыма выкарыстанне паралельна дзвюх формаў: *калькіраваць – калькаваць, акупіраваць – акупаваць, базіраваць – базаваць.*

Відавочна, што сістэматызацыя моўных фактаў у межах прыведзенай словаўтваральнай мадэлі забяспечвае культуру маўлення, у прыватнасці яе дакладнасць, чысціню, мілагучнасць. Патрабуе каментарыяў ужыванне дзеяслоўнага суфікса ***-ава-/(-ява-)*:** ён пішацца ў інфінітыве і ў формах прошлага часу тады, калі ў 1-й асобе адзіночнага ліку дзеясловы страчваюць гэты суфікс і заканчваюцца на ***-ую(-юю):*** *даследую – даследаваць, ка- мандую – камандаваць, пакутую – пакутаваць, рэкамендую – рэкамендаваць* і г. д. Калі ў 1-й асобе адзіночнага ліку дзеясловы заканчваюцца на ***-ваю,*** то ў інфінітыве і ў прошлым часе пішацца суфікс ***-ва:*** *загадваю – загадваць, расказваю – расказваў.*

Галосная ***я*** перад суфіксам ***-н-*** пішацца ў дзеепрыметніках, утвораных ад дзеясловаў на ***-яць:*** *засеяць – засеяны, развеяць – развеяны, аблаяць – аблаяны.*

Прыстаўкі ***су-*** і ***са-*** таксама часам ужываюцца без уліку зна- чэння слоў, магчыма, таму новыя правілы якраз і акрэсліваюць шэраг патрабаванняў, якія трэба ўлічваць пры выбары гэтых марфем. Так, прыстаўка ***су-*** пішацца:

1) у назоўніках, дзе ***су-*** выдзяляецца толькі гістарычна: *супынак, сувязь, сусед;*

2) у новых утварэннях (прыстаўка мае значэнне сумеснасці), калі ёсць слова і без ***су-:*** *сукіраўнік, суапякун, сувыканаўца, суродзіч, сунаймальнік;*

3) у словах, якія без ***су-*** не ўжываюцца: *суквецце, сугучча, сумежжа, суладдзе.*

Прыстаўка ***са-*** пішацца:

1) у тых назоўніках, дзе прыстаўка выдзяляецца толькі гістарычна: *сабор, савет;*

2) у запазычаных словах і кальках (пераважна з рускай мовы) на месцы ***о:*** *саіскальнік, сакурснік, сатрапезнік;*

3) у тых дзеясловах, у якіх ***са-*** з'яўляецца варыянтам ***с-(з-)*** (перад збегам зычных): *сажмурыць, сасватаць, састыкавацца.*

Варта памятаць асаблівасці беларускага словаўтварэння і формаўтварэння:

1) рускім назоўнікам на ***-тель*** адпавядаюць лексемы з су- фіксамі ***-льнік, -нік, -ец(-ца), -овец(-аўца), -чык, -шчык, -ун, -іт,***

-ар, -аль, -ач, -к-, -ыр: *прадпрымальнік, уладальнік, пакупнік, усынаўляльнік, вынаходнік, вандроўнік, жылец, даследчык, жыхар, лекар, цясляр, уцякач, глядач, чытач;*

2) пры ўтварэнні назваў асоб замест субстантываваных дзее-прыметнікаў на ***-ач- (-яч-), -уч-(-юч-), -уц-(-юц-), -уш-*** тыпу *гаворачы, вядучы, пацярпеўшы* і да т. п. мэтазгодна выкарыстоўваць уласцівыя беларускай мове суфіксы: *апавядальнік, вядоўца, выканаўца, пацярпелы;*

3) найбольш прадуктыўным памяншальна-ласкальным фармантам назоўнікаў з'яўляецца суфікс ***-ечк-(-ачк-)*** (параўн.: бел. *доч**ачк**а* – руск. *доч**енък**а*, бел. *дзядз**ечк**а* – руск. *дяд**енък**а,* бел. *галов**ачк**а* – руск. *голов**ушк**а* і інш.);

4) суфікс ***-ян-(-ан-)*** утварае назоўнікі – назвы маладых іс- тот (параўн.: бел. *зубраня* – руск. *зубрёнок*, бел. *кураня* – руск. *цыплёнок,* бел. *бусляня* – руск. *аистёнок,* бел. *сланяня* – руск. *слонёнок* і інш.);

5) пры ўтварэнні адносных прыметнікаў варта выкарыстоў- ваць суфіксы ***-ав-(-ёв-/-ов-/-ев-), -ін-:*** *весн**ав**ы/вясн**ов**ы, зім**ов**ы* замест *вясенні, зімні;*

6) на месцы рускага суфікса ***-онн-*** ужываецца суфікс ***-н-:*** *арганізацый**н**ы, сенсацый**н**ы, аперацый**н**ы, рэгістрацый**н**ы, рэс-таўрацый**н**ы*;

7) рускаму фарманту ***-чат-*** у беларускай мове адпавядае шэраг фармантаў, найбольш ужывальныя з іх – ***-ав-, -ават-, -іст-,***

-аст-: бел. *рассыпісты* – руск. *рассыпчатый*, бел. *сеткавы* – руск. *сетчатый,* бел. *складкавы* – руск. *складчатый,* бел. *ігалкаваты* – руск. *игольчатый* і г. д.;

8) замест суфіксаў ***-цельн-(-іцельн-), -чн-*** трэба выкарыс-тоўваць фарманты ***-льн-, -н-, -ч-, -лів-:*** *глядзельны, адукацыйны, недаверлівы, помслівы, грыміравальны, трэніравальны;*

9) зборныя лічэбнікі ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў

-ой-, -ер-(-ёр-), але толькі ад лічэбнікаў ***два – дванаццаць*** уключна такія дэрываты могуць ужывацца ва ўсіх стылях (*двóе*, *чацвёра*, *дзявя́цера*, *дванáццацера*), іншыя ўтварэнні (*васямнáццацера, дваццáцера*) маюць размоўную афарбоўку;

10) функцыю дзеяслоўнай прыстаўкі ***у-*** выконвае шэраг прыставак (параўн.: бел. *выдаляць* – руск. *удалять*, бел. *адбыць, выбыць* – руск. *убыть,* бел. *паважаць* – руск. *уважать,* бел. *заплаціць* – руск. *уплатить,* бел. *збегчы* – руск. *убежать*).

Асобна трэба спыніцца на ўтварэнні прыметнікаў ад геа- графічных назваў і ад прозвішчаў. Як адзначае І. Я. Лепешаў, прыметнікі на ***-інскі(-ынскі)*** утвараюцца ад назваў на ***-ін(-ын):*** Шамякін – *шамякінскі*, Вялюгін –

вялюгінскі, Шчучын – *шчучынскі*, Валожын – *валожынскі*; прыметнікі на ***-оўскі*** ўтвараюцца ад назоўнікаў з націскным канчаткам: Масты – *мастоўскі*, Літва – *літоўскі*, Крапіва – *крапівоўскі,* Стаўбцы – *стаўбцоўскі*.

Націск у такіх прыметніках захоўваецца, як правіла, на тым складзе, на якім ён быў у адпаведным назоўніку: Купа́ла – *купа́лаўскі*, Ко́лас – *ко́ласаўскі*, Шага́л – *шага́лаўскі*, Шаўчэ́нка – *шаўчэ́нкаўскі*, Леў Талсто́й – *лева-талсто́ўскі*, Ясе́нін – *ясе́нінскі,* Та́нк – *та́нкаўскі* (але: Брыль – *брылёўскі*).

У адносных прыметніках, утвораных ад геаграфічных назваў, націск бывае рухомы і нерухомы: ён можа захоўвацца на той са- май марфеме (Талачы́н – *талачы́нскі*, Маладзе́чна – *маладзе́чанскі*), сыходзіць з кораня на інтэрфікс (Лёцты – *лятчанскі*, О́рша – *аршанскі,* Слу́ч – *случанскі*), з канчатка на корань (Ака́ – *о́кскі*), перамяшчацца ў межах кораня з аднаго склада на другі (Еўпато́рыя – *еўпатары́йскі,* Беразіно́ – *бераз'інскі,* Барадзіно́ – *барадзінскі*).

У беларускай мове пашыраны канструкцыі з прыналеж- ным прыметнікам, напрыклад: руск. *дневник Алеси* – бел. *Алесін дзённік.* Пры ўтварэнні такіх прыметнікаў трэба памятаць, што ў беларускай мове, у адрозненне ад рускай, суфіксы ***-оў, -аў, -еў, -ёў*** далучаюцца да асноў назоўнікаў **мужчынскага** роду (*Пецеў, Колеў, Васеў, Валодзеў, бацькаў, дзядулеў, сынаў*), а суфіксы ***-ін, -ын*** – да асноў назоўнікаў **жаночага** роду (*даччын, жончын, Валін, Наташын, сяброўчын*). Вынікам няведання гэтага правіла з'яўляюцца інтэрферэнтныя памылкі тыпу *Пеціна, Мішын, Васін, Толін* і г. д. Няправільнымі з'яўляюцца таксама формы з суфіксам ***-яў*** тыпу *Пецяў, дзядуляў.*

Лексічныя нормы

Лексічныя нормы патрабуюць правільнага выкарыстання слоў у адпаведнасці з іх значэннем (рэальным зместам), спалучальнасцю, стылістычнай афарбоўкай. Безумоўна, не ўсе словы, што функцыянуюць у беларускай мове, уласцівы яе літаратурнай форме, а гэта значыць, што ўжыванне іх не заўсёды з'яўляецца нарматыўным. Так, не характэрны для літаратурнай мовы ды- ялектныя (*картопля, гарэх, чытаець*) і прастамоўныя (*пля- вузгаць, гваздануць*) словы. Сфера іх ужывання вызначаецца нарматыўнымі слоўнікамі і функцыянальна-стылістычнай нор- май мастацкага стылю. Параўнаем: *Каханая, зірні на месяц, / Зірні, але не з поснай мінай, / Бо ён у бляску столькі месціць / Маіх найлепшых успамінаў*; *Што ты робіш, выradак?! На свя- ты калодзеж пляваць!..* (А. Дудараў). У першым прыкладзе аўтар неапраўдана ўжывае стылёва

зніжаны выраз *посная міна* ў адносінах да каханай, а ў другім – прастамоўнае *вырадак* дапа- магае персанажу выказаць негатыўныя адносіны.

Слова дзякуючы свайму лексічнаму значэнню і сінтаксічным сувязям з'яўляецца сродкам камунікацыі. Калі лекчная норма парушана, то працэс маўленчых зносінаў усклад- няецца. Адпаведна ўзнікаюць розныя тыпы памылак, якія кваліфікуюцца як моўныя. Найчасцей сустракаюцца наступныя парушэнні:

1) ужыванне слова з неўласцівым значэннем праз няведан- не яго нарматыўнай семантыкі, а таксама ў выніку парушэння спалучальнасці: *Наш саюз амаль распаўся, / Паміж намі – часу цень. / Я з узростам закахаўся / У святло, у ясны дзень;*

2) змешванне слоў паранімічнай пары пры неразмежаванні іх семантыкі: *Еўфрасіння Полацкая ў 12 год нічога нікому не ска- зала, пастрыглася і пайшла ў манастыр* (З сачыненняў);

3) ужыванне мнагазначнага слова ў недастатковым, недаска- налым моўным кантэксце, што прыводзіць да двухсэнсоўнасці: *І вось там, у агні, нешта запішчэла, засквірчэла, засіпела... Сала пацямнела і пачало слязіцца.*

Ад гэтага тыпу памылак трэба адрозніваць такі стылістычны прыём, як зеўгма (пэўнае слова паўтараецца два-тры разы, але кожны раз з новым значэннем): *Тут гуло калісь маё вяселле – / Падышло, каб «горка» крыкнуць мне! / Палынам ківаю згодна – горка, / Горка, як ніколі не было* (М. Мятліцкі).

Пры зеўгме двухсэнсоўнасць з'яўляецца мэтай аўтарскай задумы; двухсэнсоўнасць неабходна, каб узмацніць экспрэсію радка праз сугучча амонімаў ці праз магчымасць збліжэння ў кантэксце розных значэнняў аднаго слова;

4) ужыванне русізмаў: *Пачаў паціху наладжваць гандаль лякарствамі; Адказнасць прадугледжана за разарэнне і разбурэнне жытла птушак* (З газеты);

5) выкарыстанне лексічных анахранізмаў – лексем, якія не адпавядаюць кантэксту часу: *Францыск Скарына знайшоў сабе спонсараў* (З сачынення).

Лексічная норма заўсёды адлюстроўвае змены ў жыцці грамадства, таму пэўнае слова, якое актыўна функцыянуе на сучасным этапе развіцця мовы, можа быць у хуткім часе ўжо незапатрабаваным. Словы, што былі ў пасіўным запасе, могуць вяртацца ў мову па розных прычынах. Напрыклад, назвы рэлігійных свят і абрадаў доўгі час падаваліся ў раздзеле «Пасіўная лексіка» і запісваліся з малой літары. Сёння ж словы *Каляды, Дзяды, Вялікдзень, Купалле* і іншыя складаюць частку актыўнага запасу беларускай

мовы.

Лексічныя анахранізмы адлюстроўваюць вузкі кругагляд асобы, што праяўляе сябе і праз мову: *«Хатынская аповесць» пачынаецца з таго, што франтавыя баевікі...*

У мастацкім стылі, калі гаворка ідзе не пра стылізацыю, а пра стварэнне стылістычных эфектаў, могуць змешвацца розныя пласты лексікі, напрыклад, сучасны і ўстарэлы, і гэта будзе стылістычна апраўдана: *Эх, сонечныя гурбы, / Калі вас намяло. / Пасіверылі вусны / І выцвіла чало* (Н. Гілевіч).

Значэнне і стылістычная афарбоўка слова патрабуюць пільнай увагі апавядальніка яшчэ і таму, што слова не існуе ў тэксце ізалявана, яно ўступае ў сувязі з шэрагам іншых лексем. Прычым блізкія па значэнні словы могуць па-рознаму кіраваць дапаўненнямі: *удзяліць увагу пашырэнню – звярнуць увагу на пашырэнне, здзівіліся з факта – былі здзіўлены фактам.*

Парушэннем лексічнай нормы з'яўляецца ўжыванне ў маўленні блізкіх па сэнсе слоў: *дзесяць чалавек студэнтаў, у чэр- вені месяцы, памятны сувенір, доўгі і працяглы тэрмін, мая аўтабіяграфія.* Такая памылка кваліфікуецца як плеаназм і ўзнікае праз неахайнае ці няўважлівае стаўленне да мовы. На жаль, яна ўласціва не толькі нязмушанаму вуснаму маўленню, але і пісьмоваму, напрыклад, мове мастацкай літаратуры: *...[Мішэль] і мяне, тутэйшага абарыгена, заўважыў; Магчыма, там спасцігну глыбіню і шчырасці, і нізкага падману.*

Аднак варта ўлічваць, што з мэтай узмацнення экспрэсіі радка пісьменнікі могуць выкарыстоўваць так званы «ўяўны плеаназм», які з'яўляецца стылістычным прыёмам: *Хачу імчаць на быстрым скакуне, Але скажы: дзе табуны начуюць... (Р. Барадулін).*

Важнай умовай маўленчай культуры асобы з'яўляецца ўмелае выкарыстанне сінонімаў. Веданне блізкіх па значэнні слоў дазваляе пазбегнуць паўтораў, удакладніць змест паняцця, выказаць адносіны апавядальніка да прадмета гутаркі: *— Як разам мы — бягуць-бягуць гадзіны. Нічым іх не спыніць і не суняць* (А. Вярцінскі); *Возера зноў зрабілася ціхім і спакойным, а вада чыстай і празрыстай* (В. Вольскі); *Тут жа, — выштурханая на бераг мноствам бурных прыбояў, парахнее, петрае на сонцы разбітая лодка* (Я. Брыль).

Аднак нанізванне (ампліфікацыя) сінонімаў часам можа быць стылістычна не апраўданым. Як правіла, гэта здараецца пры няўменні дакладна, а часам і лагічна выказаць думку, пры неразмежаванні сэнсавых нюансаў у семантычных / семантыка-стылістычных сінонімах, пры няўдалым выбары слова з сінанімічнага рада: *Тое, што занадта ці празмерна, часта выглядае хлуснёю*; *Там жывуць дзве пары лебедзяў і цэлая*

зграя качак, зразумела, дзікіх (з газеты); *Душа-гармонік, што ж ты сціх З няпамятных часоў? І не чуваць нідзе тваіх Басоў і галасоў; Ён быў заўсёды рыжым і крайнім* (з газеты).

Значэнне слова, як і стылістычная афарбоўка, вызначае яго спалучальнасць, пагэтаму варта памятаць, што нельга *ўзводзіць лазню* ці *будаваць будынак*.

Для выражэння кантрасных думак і пачуццяў у маўленні могуць выкарыстоўвацца словы з супрацьлеглым значэннем — антонімы: *Жыццё, як свята, адзначаем разам, А паміраем — толькі па адным* (С. Законнікаў); *Былі часамі святам будні, А святы буднямі былі...* (С. Грахоўскі); *А Мацвей не хацеў ні ганіць, ні хваліць: быў у ім боль за ўбоства і прыгажосць свайго краю* (В. Казько).

Пры аналізе асаблівасцей ужывання названага пласта лексікі ў маўленні можна адзначыць розныя недакладнасці, напрыклад, адсут- насць у антанімічнай пары супрацьлеглай семантыкі, нематываваны аксюмаран: *Такая плынь жыцця і вір Зямных трагедый і іроній; Пры забеспячэнні незабяспечанасці вёсак маладымі спецыялістамі паўстаюць пытанні* (з газеты).

Лексічныя памылкі скажаюць сэнс выказвання, робяць выклад думкі абсурдным, камічным, што ў сваю чаргу зніжае інфармацыйную і эстэтычную каштоўнасць тэксту любога стылю: *Як гэта?! У адносінах да мяне была дапушчана несправядлівасць! Я хачу яе аднавіць* (з газеты); *Спазніўся дождж — было спачатку слова. А безгалоўе паспрыяе мне Жыццё асэнсаваць усебакова.*

Прачытаўшы прыведзеныя і падобныя на іх радкі, хочацца параіць аўтарам часцей звяртацца да тлумачальных слоўнікаў беларускай мовы, каб не ўзнікала жадання *жыць безгалова* і *аднаўляць несправядлівасць* у адносінах да сябе.

Фразеалагічныя нормы

Фразеалагічныя нормы рэгулююць ужыванне ўстойлівых выразаў у адпаведнасці з іх значэннем, з улікам стылістычнай афарбоўкі, а таксама ў пэўнай, прынятай форме і, што вельмі важна, з улікам іх валентнасці.

Фраземы маюць спецыфічныя арфаграфію, пунктуацыю, націск, якія могуць не адпавядаць сістэмным адносінам у мове. Пры ўвядзенні фразем у тэкст трэба памятаць пра:

1) адсутнасць вялікай літары ў выразах тыпу *дамоклаў меч,*

ахілесава пята, як піліп з канапель;

2) спецыфічнае напісанне асобных структурных кампанентаў: *збоку прыпёку, пачым фунт ліха;*

3) адсутнасць коскі пры паўторных злучніках (*і нашым і вашым, ні ўзад ні ўперад, то бокам то скокам, ні рыба ні мяса*), а таксама перад злучнікамі *як, што, нібы,* якія пачынаюць фразему/стаяць у яе сярэдзіне: *спіць як пшаніцу прадаўшы; памінай як звалі; крывіцца як серада на пятніцу*; не адасабляюцца коскамі фраземы, што паходзяць з дзеепрыслоўных зваротаў: *прызнаўся паклаўшы руку на сэрца; дзеці раслі на лес гледзячы;*

4) адсутнасць двукосся пры афармленні фразем. Няправільна аформлены ўстойлівыя выразы ў наступных прыкладах: *Начальнік зверху выклікаў Назара на «дыван» і «стружку» зняў; – І не ад такога «дах» зносіць, – адказаў другі і піхнуў нагой пярэднюю лаўку* (З газеты). Калі прыняць такое афармленне, то прыйдзецца ўсе метафары запісваць у двукоссі: *восень «плача», цягнік «ідзе»,* у такім выпадку радок стане пярэстым, неэстэтычным, а само напісанне – неправамерна ўскладненым.

Аналізуючы правільнасць выкарыстання фразеалагізмаў у функцыянальных стылях, трэба памятаць пра аб’ект фразеалогіі, якая вывучае як уласна фраземы, у тым ліку праклёны, так і прыказкі, крылатыя выслоўі, афарызмы і інш.

Марфалагічныя нормы

Марфалагічныя нормы ў сістэме розных часцін мовы даволі падрабязна апісаны ў граматыках для школ і ВНУ. Аднак білінгвізм, унутрымоўная марфалагічная варыянтнасць, сэнсавыя нюансы ў словах, уплыў дыялектаў і рускай мовы абцяжарваюць засваенне гэтых нормаў.

Марфалагічныя нормы ў сістэме назоўніка. Пэўныя цяжкасці выклікае катэгорыя роду назоўнікаў, што звязана з наяўнасцю варыянтаў родавых формаў. У сучаснай беларускай літаратурнай мове варыянтных родавых пар няшмат (вучоныя адзначаюць каля ста). Як нарматыўныя слоўнікамі дазваляюцца варыянтныя родавыя формы *прастор – прастора, гармонік – гармонь, бярлога – бярлог, зала – зал, замша – замш, клавіша – клавіш, перыфраза – перыфраз, прычасце – прычасць, прышчэпа – прышчэп, салата – салат, таполя – тополь, шчаўе – шчавель, каромысел – каромысла.* Практыка паказвае, што ў маўленні перавага аддаецца ўсё ж формам жаночага роду. Асобныя варыянтныя родавыя формы адрозніваюцца сферай выкарыстання:

санаторый (агульнаўжывальнае) – *санаторыя* (устарэлае), *сахарын* (агульнаўжывальнае) – *сахарына* (размоўнае).

Пры вызначэнні роду нязменных запазычаных назоўнікаў улічваецца іх семантыка. Назоўнікі мужчынскага роду – назвы асоб мужчынскага полу, жывых істот (*аташэ, канферансье, маэстра, янкі; фламінга, зебу, гну, какаду, шымпанзэ*); назоўнікі жаночага роду – назвы асоб жаночага полу (*фрау, міс, місіс, пані*); назоўнікі ніякага роду – агульныя назвы неадушаўлёных прадметаў (*кашнэ, паліто, жэле, жалюзі, журы*). Рэдкія лексемы захоўваюць род, які маюць назоўнікі – родавыя найменні (*цэцэ* – муха (ж. р.), *івасі* – рыба (ж. р.)).

Род уласных нязменных назваў вызначаецца па агульным назоўніку: *Дэлі* (м. р.) – горад, *Янцзы* (ж. р.) – рака, *Конга* (ж. р.) – рака, дзяржава, *Антарыё* (н. р. або ж. р.) – возера і правінцыя.

Род суб'ектыўна-ацэначных формаў назоўнікаў супадае з родам пачатковай формы: *ручышча* (ж. р.) – рука, *галавішча* (ж. р.) – галава, *дамішча* (м. р.), *насішча* (м. р.), *нажышча* (ж. р., калі ад *нага,* і м. р., калі ад *нож*).

Асноўнай прычынай адхіленняў ва ўжыванні родавых формаў з'яўляецца ўплыў рускай мовы, у якой такія назоўнікі адносяцца да іншага роду.

Так, напрыклад, у беларускай мове мужчынскі род маюць наступныя назоўнікі: *гваздзік, боль, валяр'ян, дроб, жывапіс, медаль, мазоль, накіп, насып, палын, перапіс, роспіс, летапіс, запіс, подпіс, поступ, сабака, стэп, туфель, цень, шаль, шынель: белы гваздзік, моцны боль.* У рускай мове ўсе яны жаночага роду: *белая гвоздика, сильная боль.*

У беларускай мове назоўнікі *яблык, капыт* мужчынскага роду, а ў рускай – ніякага: *яблоко, копыто.*

У беларускай мове словы *бронха, гусь, кафля, табака* жаночага роду, у рускай – мужчынскага: *бронх, гусь, кафель, табак.*

У беларускай мове назоўнік *брыво* ніякага роду, у рускай – жаночага – *бровь.*

Да назоўнікаў ніякага роду адносяцца таксама назвы маладых істот: *бусляня, ягня, кацяня, шчаня, дзіця,* у рускай мове яны мужчынскага роду: *аистёнок, ягнёнок, котёнок, щенок, ребёнок.* Што да назоўнікаў, якія маюць у структуры ацэначныя суфіксы ***ішч-а(-ышч-а), -іск-а (-ыск-а):*** *дамішча, халадзішча, вятрыска, даміска,* то яны будуць мець такі самы род, як і адпаведныя назоўнікі без суфіксаў: *дом, холад, вецер* – мужчынскі род.

Род нязменных складанаскарочаных назоўнікаў, у тым ліку абрэвіятур, трэба вызначаць па апорным слове адпаведнага словазлучэння:

ДАІ (ж. р.) – дзяржаўная аўтамабільная *інспекцыя; ААН* (ж. р.) – *Арганізацыя* Аб'яднаных Нацый; *СПБ* (м. р.) – *Саюз* пісьменнікаў Беларусі. У зменных аналагічных назоўніках род вызначаецца па канчатках: *ЦУМ* (м. р.) – *ЦУМам, у ЦУМе, ЦУМу; ЛіМ* (м. р.) – *ЛіМа, ЛіМам, у ЛіМе.*

У беларускай мове часам не супадае род зменных уласных і адпаведных ім агульных назоўнікаў, якія адлюстроўваюць родавідавую суаднесенасць назваў: *горад* (м. р.) *Гродна* (н. р.), *рака* (ж. р.) *Нёман* (м. р.), *часопіс* (м. р.) *«Полымя»* (н. р.), *возера* (н. р.) *Нарач* (ж. р.). Такія ўласныя назоўнікі скланяюцца ці не скланя- юцца ў залежнасці ад наяўнасці/адсутнасці родавай назвы: *на рацэ Нёман, на Нёмане; у возеры Нарач, у Нарачы.*

Пэўныя цяжкасці выклікае катэгорыя ліку назоўнікаў. Гэта звязана найперш з тым, што ў беларускай і рускай мовах лік сугучных назоўнікаў падобнай марфемнай будовы часам не супадае: бел. *клопат* (адз. л.) – руск. *хлопоты* (мн. л.); бел. *чарніла* (н. р., толькі адз. л.) – руск. *чернила* (толькі мн. л.); бел. *дзверы, грудзі* (мн. л.) – руск. *дверь, грудь* (адз. л. і мн. л); бел. *каноплі, крупы* (толькі мн. л.) – руск. *конопля, крупа* (толькі адз. л.); бел. *суніцы, брусніцы, маліны, ажыны, клубніцы, галубіцы, чарніцы* (найчасцей у мн. л.) – руск. *земляника, брусника, малина, ежевика, клубника, голубика, черника* (адз. л.).

У выніку дзеяння ўнутрымоўнай аналогіі часам ужываюцца няправільныя формы множнага ліку назоўнікаў *пяро, промень/ прамень, бервяно, камень, колас, корань, палена, крыло, ліст.* Правільныя формы множнага ліку ад пералічаных і падобных назоўнікаў наступныя: *пёры, промні/прамені, бярвёны, камяні, каласы, карані, палены, крылы, лісты.* Памылковыя формы: *пер'і, праменні, каменні, калоссі, карэнні, паленні, крыллі, лісці.* Ад тых жа самых назоўнікаў утвараюцца і адзіночналікавыя формы зборных назоўнікаў: *пер'е, праменне, бярвенне, каменне, калоссе, карэнне, паленне, крылле, лісце* (зборныя назоўнікі не маюць формаў множнага ліку!).

Рэчыўныя і абстрактныя назоўнікі, якія ў літаратурнай мове маюць форму адзіночнага ліку, у навуковым і мастацкім маўленні могуць ужывацца ў форме множнага ліку з пэўнай мэтай: *блакітныя гліны, сыпучыя пяскі, лячэбныя гразі, дасканалыя густы, маладыя таленты, шумы ў сэрцы.*

Скланенне назоўнікаў – адно з самых складаных пытанняў для многіх носьбітаў мовы.

Так, пры скланенні назоўнікаў **першага скланення** важна памятаць, што ў **давальным** і **месным склонах** канчаткі супадаюць:

- канчатак ***-і*** маюць назоўнікі з мяккай асновай: *зямлі, хвалі*,

песні;

• канчатак ***-е*** – назоўнікі з асновай на ***г, х,*** якія чаргуюцца з ***з', с':*** *страха – страсе, нага – назе, крыга – крызе;*

• канчатак ***-ы*** – назоўнікі з асновай на зацвярдзелы і на ***к,*** які чаргуецца з ***ц:*** *гутарка – гутарцы, мяжа – мяжы, сцежка – сцежцы, сястра – сястры,* але пад націскам ***-э:*** *шчака – шчацэ, рука – руцэ, рака – рацэ.*

Назоўнікі **другога скланення** мужчынскага роду ў **родным склоне** маюць у залежнасці ад семантыкі канчаткі ***-а(-я)*** або ***-у(-ю).***

Канчатак ***-а(-я)*** маюць назоўнікі, што называюць:

• канкрэтныя прадметы: *стала, алоўка, медаля;*

• асоб і жывых істот: *салаўя, сябра, чалавека;*

• установы, арганізацыі, прадпрыемствы: *універсітэта*, *ліцэя, саюза, прафкама;*

• геаграфічныя назвы, населеныя пункты, астранамічныя паняцці: *Мінска, пасёлка, Месяца, Сожа;*

• навуковыя тэрміны, адзінкі вымярэння даўжыні, вагі і інш.: *кораня, суфікса, метра, літра, сюжэта, рубля;*

• танцы, гульні, іх часткі: *тэніса, турніра, вальса, тура, ба- лета,* але: *спорту, батэрфляю;*

• прамежкі часу: *года, тыдня, жніўня, сезона,* але: *веку, абеду, ранку;*

• органы, часткі цела чалавека і жывых істот: *носа, рота, языка,* але: *твару.*

Канчатак ***-у(-ю)*** маюць назоўнікі, што называюць:

• зборныя прадметы, у тым ліку расліны – травы і кустовыя: *калектыву, бярэзніку, бэзу, чабору, верасу;*

• рэчывы, хімічныя злучэнні: *алею, соку, рысу, шоўку,* але: *хлеба, аўса, жаўтка;*

• абстрактныя паняцці, апрадмечаныя якасці, дзеянні, стан: *таленту, смеху, блакіту, даходу, разліку;*

• прасторавыя паняцці: *лугу, краю, шляху, лесу;*

• з'явы прыроды і стыхійныя бедствы: *інею, граду, ветру, грому, галалёду, ўрагану;*

• грамадскія фармацыі, навуковыя плыні, тэорыі, падзеі: *рамантызму*, *гуманізму, дарвінізму, фэсту, фестывалю;*

• захворванні: *грыпу, апендыцыту, інфаркту;*

• стравы: *гуляшу, супу.*

Мнагазначныя назоўнікі могуць мець абодва канчаткі: ***-а(-я)*** і ***-у(-ю)*** у залежнасці ад кантэксту: *час лістападу – сёмага лістапада;*

беларускага народа (‘нацыя, насельніцтва краіны’) – *на плошчы сабралася шмат народу* (‘сукупнасць людзей увогуле’); *слухалі маладога таленту* (‘чалавек з надз- вычайнымі здольнасцямі’) – *яму не хапае таленту* (‘надзвычайныя прыродныя здольнасці’); *каля пятага пад’езда – не было пад’езду да вёскі; сустрэліся каля клёна, ясеня, дуба – мэбля з клёну, ясеню, дубу.*

Канчатак ***-у*** выкарыстоўваецца таксама пры назоўніках ва ўстойлівых выразах *з году ў год, з веку ў век, ні следу ні знаку, даць маху, з’ехаць з глузду, ні роду ні племені.*

Пільнай увагі патрабуе **месны склон** назоўнікаў **мужчынскага роду другога скланення,** калі выбар канчатка залежыць і ад семантыкі слова, і ад тыпу асновы.

Так, канчатак ***-е*** маюць назоўнікі з асновай на цвёрды (*сне, стале*), неасабовыя назоўнікі з асновай на *г, х*, якія чаргуюцца з *з’, с’* (*снезе, кажусе, лузе, парозе*); канчатак ***-у(-ю)*** – асабовыя назоўнікі адпаведна з асновай на зацвярдзелы ці мяккі (*Рыгору, чытачу, Багдановічу, герою*), а таксама неасабовыя назоўнікі з асновай на *к* (*у друку, пры лясочку*), назоўнікі на *г, х*, якія не чаргуюцца з *з’, с’:* назвы абстрактных паняццяў (*смеху, подыху, страху, пасагу*), назвы некаторых рэчыўных паняццяў (*тварагу, пуху*), запазычаныя назоўнікі (*каталогу, штрыху, маркетынгу, трэнінгу*), уласныя назвы (*Цюрыху, Гамбургу, Бугу)*; канчатак ***-ы*** – неасабовыя назоўнікі з асновай на зацвярдзелы (*дажджы, шалашы, гушчары*); канчатак ***-і*** – неасабовыя назоўнікі з асновай на мяккі (*у гаі, у музеі, у цяні*).

У **творным склоне** назоўнікаў на *-ін(-ын)* выбар канчатка залежыць ад семантыкі назоўніка: *Нікалаевам, Гагарынам, Туравам* (назвы геаграфічных аб’ектаў) – як *Магілёвам*, але: *Нікалаевым, Туравым, Гагарыным* (прозвішчы людзей); у іншамоўных прозвішчах канчатак ***-ам:*** *Рузвельтам, Шэкспірам.*

Пры засваенні назоўнікаў **трэцяга скланення** ўзнікаюць цяжкасці менавіта з формамі **творнага склону:** для іх уласціва падаўжэнне зычных (*ноччу, печчу, мышшу, папараццю, Беларуссю*); не падаўжаюцца губныя *б, п, м, в, ф, ў* і вібрант *р* (*глыб’ю, Об’ю, верф’ю, шыр’ю, любоўю*); некаторыя назоўнікі маюць варыянтныя формы: *кроўю – крывёю, далонню – далоняй, граззю – гразёю.*

Пры скланенні назоўнікаў **агульнага роду** з ненаціскным кан- чаткам *-а(-я),* якія называюць асоб мужчынскага ці жаночага полу, узнікаюць пэўныя цяжкасці. Трэба памятаць, што ў першым выпадку такія найменні змяняюцца, як назоўнік *бацька: пры калегу, цёзку, сведку, ціхоню, Жэню, Сашу, Валеру (бацьку),* у другім выпадку – як назоўнікі першага скланення з адпаведнай асновай: *пры калезе* (як *кнізе), ціхоні* (як *песні), цёзцы, сведцы* (як

сцежцы), Жэні, Сашы, Валеры. Уласныя назоўнікі скланяюцца так, як і агульныя.

У межах скланення назоўнікаў у множным ліку патрабуюць каментарыяў формы роднага і творнага склонаў.

У **родным склоне** адзначаецца шырокая варыянтнасць канчаткаў, абумоўленая катэгорыяй роду назоўнікаў, іх скланеннем, тыпам асновы, націскам, семантыкай.

Напрыклад, назоўнікі **першага скланення** маюць канчаткі *-аў(-яў)* пры аснове на збег зычных (*кафедраў, нормаў, формаў*) і нулявы канчатак пры аснове на зычны (*бяроз, краін, хат*), у тым ліку на *г, к, х* і на губныя *б, в, п, м* (*рук, кніг, баек; спраў, асоб*). Некаторыя назоўнікі маюць варыянты канчаткаў, пры гэтым вар'іруюцца нулявыя канчаткі з матэрыяльна выражанымі: *норм – нормаў, астр – астраў, сясцёр – сёстраў, вішань – вішняў.* Відавочна, што мілагучнасць мовы забяспечваюць формы з матэрыяльна выражаным канчаткам: беларускай мове не ўласцівы збег зычных у канцы і ў пачатку слоў (*ільвяня, аржаны, бабёр, рубель*).

Назоўнікі **другога скланення** маюць канчаткі *-аў(-яў)* не пад націскам, *-оў(-ёў)* пад націскам (*караваяў, вокнаў; палёў, садоў*); радзей ім уласцівы націскны канчатак *-эй(-ей): гасцей, вушэй.* Назоўнікі ніякага роду з асновай на збег зычных маюць варыянты канчаткаў: *прозвішч – прозвішчаў, вёсел – вёслаў, гнёзд – гнёздаў.*

Назоўнікі **трэцяга скланення** пад націскам ужываюцца з канчаткам *-эй(-ей),* не пад націскам – *-аў(-яў): начэй, печаў, гусей, даляў.* Некаторым назоўнікам уласціва варыянтнасць: *вобласцяў – абласцей, нацыянальнасцяў – нацыянальнасцей, ніцей – ніцяў, мадэлей – мадэляў.* Множналікавыя назоўнікі маюць канчаткі *-аў(-яў): фінансаў, апладысментаў, вуснаў,* а таксама нулявы канчатак, калі ў іх аснове суфіксы *-ін, -іц* (*нажніц, паводзін*), збег зычных, паміж якімі з'яўляецца беглы галосны (*дажынак, сутак*), геаграфічныя назвы на *-ічы(-ычы), -аны(-яны): Баранавіч, Бараўлян* (і *Баранавічаў, Бараўлянаў*). Радзей ужываецца канчатак *-ей(-эй/-ай): дзвярэй, людзей, грошай.*

У **творным склоне** некаторым назоўнікам уласцівы варыянты канчаткаў: *грудзямі – грудзьмі, санямі – саньмі; плячамі – плячыма, вачамі – вачыма, грашамі – грашыма,* але: *людзьмі, вушамі.*

Марфалагічныя нормы ў сістэме прыметніка. Цяжкасці ўзнікаюць пры ўтварэнні і выкарыстанні ступеняў параўнання. Складаныя формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання ўтвараюцца практычна ад усіх якасных прыметнікаў: *больш цёплы, менш моцны, найбольш чысты, самы прыгожы* і г. д. Ненарматыўнымі лічацца формы тыпу *больш дабрэйшы, самы цяплейшы.*

Не ўтвараюць ступеняў параўнання прыметнікі, што абазначаюць стан (*нямы, жывы, мёртвы, жанаты, халасты*), масці жывёл (*гняды, вараны, русы, пярэсты, рыжы*), колькасна нязменную знешнюю фізічную прымету (*босы, голы, вусаты, рагаты, барадаты, кульгавы*), а таксама складаныя прыметнікі (*светлавалосы, цёмна-сіні, белабароды, чарнавокі*) і прыметнікі, што называюць колер праз адносіны да іншых прадметаў (*салатавы, фіялетавы, вішнёвы, ружовы, карычневы, бэзавы*). Простую форму не ўтвараюць прыметнікі, што перайшлі з адносных у разрад якасных і маюць у структуры суфіксы ***-ав-(-яв-)*** (*перадавы, бя- лявы*), ***-іст-*** (*галасісты, агністы*), ***-к-*** (*коўкі, ліпкі*), ***-ат-*** (*шурпаты*), ***-аўн-*** (*сакаўны*), ***-ічн-*** (*гераічны*), ***-ніч-*** (*маляўнічы*), ***-юч-*** (*балючы*), ***-эзн-*** (*даўжэзны*), ***-еньк-*** (*дробненькі*) і інш. Складаныя формы больш ужывальныя яшчэ і праз стылістычную афарбоўку: яны ўласцівы пісьмовай мове, аднак не кантрастуюць з нейтральным маўленчым фонам.

Прыметнікі ў форме вышэйшай ступені параўнання ўводзяцца ў тэкст з дапамогай прыназоўніка ***за*** і назоўніка ў вінавальным склоне (*ліпень цяплейшы за верасень, журавіны кіслейшыя за брусніцы*) або параўнальных зваротаў са злучнікамі ***як, чым*** і назоўнікам у назоўным склоне (*Антось больш моцны, чым брат; няма цікавейшых казак, як нашы*). Недапушчальнай лічыцца структура канструкцый тыпу *ліпень цяплей за верасень, Андрэй за ўсіх мудрэй* (хоць у фальклоры, паэзіі, гутарковым стылі такія адзінкі ўжываюцца, што можа быць звязана з захаваннем рытму і рыфмы ў тым ліку), бо суфікс *-эй(-ей)* характэрны для прыслоўяў.

Парушэннем нормы з’яўляюцца таксама выразы са значэннем гранічнай ступені якасці тыпу *цікавейшая пастаноўка, прыгажэйшыя азёры,* якія ўжываюцца пад уплывам рускай мовы. Нельга забываць, што пры вышэйшай ступені параўнання могуць ужывацца часціцы ***яшчэ, куды,*** якія надаюць не толькі ўзмацняльнае значэнне (*яшчэ цікавейшыя, куды хутчэйшыя*), але і размоўнае адценне ўсяму выказванню. Значэнне найвышэйшай ступені параўнання можа перадавацца таксама з дапамогай слоў ***вельмі, надта, надзвычай, выключна:*** *вельмі спагадлівы, надта спакойны, надзвычай моцны, выключна смелы.* Выкарыстанне розных спосабаў для ўтварэння ступеняў параўнання ўзбагачае маўленне.

Увагі патрабуюць поўныя, кароткія і сцягнутыя формы якасных і прыналежных прыметнікаў. У беларускай мове, у адрозненне ад рускай, вельмі абмежаванае выкарыстанне кароткіх формаў якасных прыметнікаў. Толькі наступныя адзінкі без стылістычных абмежаванняў рэгулярна ўжываюцца ў кароткай форме: *гатоў, рад, повен, павінен, відзён, чуцён.* Астатнія кароткія прыметнікі тыпу *сыт, цёмен, дораг, свецел, багат, дуж, весел, хмур* ужываюцца ў фальклоры, у паэзіі высокага стылю. Памылкай

з’яўляюцца скалькаваныя з рускай мовы кароткія формы тыпу *працавіт, актывен, уважліў, маральна ўстойліў, фізічна выносліў* і інш. Кароткія формы якасных прыметнікаў не скланяюцца, але змяняюцца па родах і ліках: *ён рад, яна рада, яно рада, яны рады*; ужываюцца яны, як правіла, у мастацкім і размоўным стылях.

Для прыналежных прыметнікаў кароткая форма з’яўляецца літаратурнай нормай: *матчыны песні, бацькаў камп’ютар, вавёрчына дупло* і г. д. Пры гэтым прыметнікі скланяюцца і набываюць поўныя формы, а пры неадушаўлёных назоўніках мужчынскага і ніякага роду ў вінавальным склоне форма застаецца кароткай (параўнайце: каго? што? *бацькавага сябра, бацькаў стол; матчыну песню, матчыну сяброўку; даччыно паліто, даччынога мужа*). Само ўтварэнне прыналежных прыметнікаў вымагае каментарыяў, паколькі розныя фарманты замацаваныя за пэўнымі тыпамі асноў. У прыметніках, утвораных ад назваў асоб ці жывых істот мужчынскага роду, пішуцца суфіксы ***-еў-(-ев-), -оў- (-ов-), -аў-(-ав-), -ёў-(-ёв-),*** а ў прыметніках, утвораных ад назваў асоб ці жывых істот жаночага роду, выкарыстоўваецца суфікс ***-ін-(-ын-):*** *Сцёпкава сачыненне, Аленчына кніга, Мурчыны ка- цяняты, буслава гняздо;* утварэнні тыпу *Віціны цацкі* – грубае парушэнне нормы.

Скланенне прыметнікаў, як правіла, не выклікае цяжкасцей, патрабуюць каментарыяў толькі канчаткі прыметнікаў жаночага роду у родным і творным склонах. Скарочаныя канчаткі ***-ой, -ай, -яй*** (*малая* радзіма) могуць выкарыстоўвацца ў прыметніках ва ўсіх стылях, а поўныя канчаткі ***-ое, -ае, -яе*** ў родным склоне (*малое* радзімы) і ***-ою, -аю, -яю*** ў творным склоне (*малою* радзімаю) уласцівыя мастацкаму і гутарковаму стылям.

Формы суб’ектыўнай ацэнкі і непаўнаты якасці ўласцівы мастацкаму, гутарковаму і часам публіцыстычнаму стылям. Далучаючыся да асновы якасных прыметнікаў, яны адлюстроўваюць розную ступень праяўлення якасці: *беленькі* – вельмі белы; *шырачэзны* – надзвычай шырокі; *цемнаваты* – не зусім цёмны; прычым павелічальна-ўзмацняльныя і памяншальна-ласкальныя суфіксы ўтрымліваюць, акрамя ўсяго, аўтарскую ацэнку рэчаіснасці ці прадмета гутаркі (від ацэнкі – станоўчая ці негатыўная – канкрэтызуецца кантэкстам).

Марфалагічныя нормы ў сістэме лічэбніка.

Запатрабаванасць лічэбніка рознымі стылямі мовы зразумелая: ён забяспечвае дакладнасць маўлення. Аднак у функцыянаванні гэтай часціны мовы ёсць асаблівасці: напрыклад, выклікае цяжкасці скланенне гэтай часціны мовы.

Таму важна памятаць, што ў колькасных лічэбніках ад ***пяці*** да

дваццаці і лічэбніку ***трыццаць*** у творным склоне адбываецца падаўжэнне зычных: *пяццю, адзінаццаццю, трыццаццю,* але: *шасцю, сямю, васьмю.* Пры скланенні складаных лічэбнікаў (ад ***пяцідзесяці*** да ***васьмідзесяці*** іад ***двухсот*** да ***дзевяцісот***) змяняюцца дзве часткі: *шасцідзесяці*, *шасцісот, васьмідзесяці*, *васьмісот; пяццюдзесяццю*, *сямюдзесяццю*; *пяццюстамі*, *сямюстамі*). Лічэб- нікі ***сто*** і ***сорак*** маюць дзве формы: назоўны і вінавальны склоны – *сто* і *сорак,* а родны, давальны, творны і месны – *ста, сарака.* Як відаць, лічэбнік *сто,* з яўляючыся самастойным словам і структурным кампанентам складанага лічэбніка, змяняецца па-рознаму. Ёсць лічэбнікі, якія зусім не скланяюцца, напрыклад, ***паўтара*** (м. і н. р.), ***паўтары*** (ж. р.), але назоўнікі пры іх змяняюцца ўсё роўна, прычым у назоўным і вінавальным склонах назоўнікі маюць форму роднага склону адзіночнага ліку (*паўтара вядра, паўтары тоны*), у астатніх ускосных склонах – адпаведнага склону і множнага ліку (*к паўтара літрам, к паўтары тонам; паўтара літрамі, паўтары тонамі*).

Часам розныя маўленчыя сітуацыі патрабуюць апісання недакладнай колькасці, для чаго беларуская мова прапаноўвае шэраг варыянтаў з рознай стылістычнай афарбоўкай. Так, найбольш ужывальнымі з’яўляюцца наступныя нейтральныя варыянты:

1) адваротны парадак слоў: *чалавек дваццаць, тыдні тры;*

2) два лічэбнікі: *два-тры гады, пяць-сем дзён;*

3) спалучэнне лічэбніка з назоўнікам у родным склоне з прыназоўнікамі ***пад, за, з, каля:*** *гадзін пад дзесяць раніцы, вучняў з дваццаць;*

4) спалучэнні ***больш як, больш чым, менш як, менш за*** і пад.: *менш за восем студэнтаў, больш як адзінаццаць дрэў.*

Размоўнымі лічацца спалучэнні лічэбніка са словамі ***лішак, гак, хвосцік*** і прыназоўнік ***з*** для перадачы прыблізнага ўзросту: *сем гадоў з хвосцікам, восемдзесят гадоў з гакам*, спалучэнне лічэбніка з няпэўнымі займеннікамі ***якіх, нейкіх:*** *нейкіх дзесяць гадоў, якіх пяць гадоў усяго*.

Пэўныя цяжкасці выклікае таксама спалучальнасць лічэбнікаў з назоўнікамі. Напрыклад, назоўнікі пры дробавых лічэбніках ужываюцца ў родным склоне: *адна трэцяя насельніцтва, дзве пятыя тэрыторыі.* Зборныя лічэбнікі патрабуюць ужывання пры сабе толькі пэўных разрадаў назоўнікаў. Яны спалучаюцца:

1) з назвамі асоб мужчынскага полу: *шасцёра чалавек, дзевяцера гімназістаў;*

2) назвамі маладых істот: *трое кацянят, сямёра дзяцей, двое буслянят;*

3) множналікавымі назоўнікамі, што абазначаюць парныя і састаўныя прадметы: *двое саней, пяцёра дзвярэй, чацвёра нажніц;*

4) субстантываванымі прыметнікамі, дзеепрыметнікамі: *трое хворых, двое параненых;*

5) асабовымі займеннікамі: *трое нас, чацвёра іх;*

6) са словамі ***гусі, людзі, коні, куры, свінні:*** *трое коней, пяцёра гусей.*

Да зборных адносяцца лічэбнікі ***абодва*** (спалучаецца з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду), ***абедзве*** (спалучаецца з назоўнікамі жаночага роду), ***абое*** (пра асоб мужчынскага і жаночага полу): *абодва хлопцы; абедзве сяброўкі; абое нічога не зрабілі, каб захаваць шлюб.*

Лічэбнікі ***два (дзве), абодва (абедзве), тры, чатыры*** спалучаюцца з назоўнікамі ў форме назоўнага склону множнага ліку: *тры сталы, абодва акцёры.* Усе астатнія лічэбнікі, акрамя састаўных, якія заканчваюцца пералічанымі вышэй, патрабуюць ад назоўнікаў формы роднага склону множнага ліку: *пяць алоўкаў, дзевяць карцін, семдзясят сем гадоў.* Адпаведнай будзе форма прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, парадкавых лічэбнікаў, займеннікаў прыметнікавага тыпу *мой, наш, гэты,* якія дапасуюцца да назоўнікаў: *два вясёлыя дні* і *пяць вясёлых дзён, чатыры цікавыя кнігі* і *сем цікавых кніг.*

Для абазначэння адлегласці ў беларускай мове ўжываецца спалучэнне лічэбніка з назоўнікам і прыназоўніка ***за:*** *за два крокі ад мікрафона, за сто метраў ад дарогі;* пры абазначэнні даты выкарыстоўваецца форма роднага склону: *сёння сёмага студзеня – Раство.*

Марфалагічныя нормы ў сістэме займенніка.

Лексічнае значэнне займенніка канкрэтызуецца кантэкстам, паколькі гэта часціна мовы можа замяняць і назоўнік, і прыметнік, і лічэбнік. Маючы, як правіла, нейтральную стылістычную афарбоўку, займеннік дазваляе пазбегнуць непажаданых лексічных паўтораў у тэкстах усіх стыляў, робіць маўленне больш разнастайным. Аднак менавіта займеннік пры неахайным выкарыстанні абцяжарвае ўспрыманне і засваенне інфармацыі, пазбаўляючы выказванне дакладнасці, лагічнасці. Значыць, неабходна акрэсліць патрабаванні, якія дапамогуць пазбегнуць названых і іншых маўленчых недахопаў.

Асабовы займеннік можа выкарыстоўвацца пасля назоўніка для падкрэслівання асобы ці прадмета: *цэлая гадзіна – яна мне яшчэ спатрэбіцца*; *бацька – ён прыгадваецца мне маладым.* Відавочна, што сінтаксічная адзінка, пабудаваная такім чынам, мае размоўную афарбоўку, таму ў строга ўнармаваных тэкстах не ўжываецца. У вусным маўленні ўжываюцца сегментаваныя канструкцыі, у якіх частка з займеннікам стаіць перад часткай з назоўнікам: *Які ён – дзень заўтрашні?*

Займеннік, які суадносіцца з назоўнікам, павінен адпавядаць форме

назоўніка, што адсутнічае: *На канферэнцыі выступіла шмат прафесуры. Яна разглядала пытанні сучаснага правапісу.* Паміж займеннікам і назоўнікам не павінна быць назоўніка ў такой самай форме, інакш можа ўзнікнуць двухсэнсоўнасць: *Сонца ўзышло над полем – і яно* [сонца ці поле?] *заіграла ранішнімі фарбамі.*

Цяжкасці пры выкарыстанні выклікаюць некаторыя займеннікавыя канструкцыі.

Так, спалучэнні ***не хто іншы, як; не што іншае, як*** ужываюцца ў сказах, дзе няма другога адмоўя: *Гэта было не што іншае, як просьба дапамагчы (= не што іншае, а просьба дапамагчы).* Тут слова *што* можна замяніць на *штосьці* або ўсё спалучэнне замяніць на часціцу *менавіта (= Гэта была менавіта просьба дапамагчы).* Аналагічна: *Прыйшоў не хто іншы, як мой сын (= не хто іншы, а мой сын; не хтосьці іншы, а мой сын; Прыйшоў менавіта мой сын).*

Словазлучэнні ***ніхто іншы не; нішто іншае не*** выкарыстоўваюцца ў адмоўных сказах, дзе пры выказніку ўжо ёсць адмоўе ***не:*** *Нішто іншае, акрамя гімнастыкі, Надзю не цікавіла.* Слова *іншае* можна апусціць: *Нішто, акрамя гімнастыкі, Надзю не цікавіла.*

Сугучнымі, але рознымі па значэнні, з'яўляюцца азначальныя займеннікі ***сам*** і ***самы.*** Першы з іх паказвае, што дзеянне выконваецца самастойна асобай або прадметам, падкрэслівае значнасць асобы ці прадмета, азначае паважаную, знакамітую асобу (кіраўніка, вядомага акцёра і інш.), ілюструе, што хто-небудзь асабіста выконвае дзеянне або адчувае яго на сабе і да т. п.: *Самога яшчэ не сустрэлі; Мы самі вызначым мэту; Сам загадчык бярэ на сябе адказнасць.*

Займеннік ***самы*** ў спалучэнні з якаснымі прыметнікамі ўтварае форму найвышэйшай ступені параўнання; пры ўжыванні з назоўнікамі ўказвае на гранічную ступень колькасці або якасці; выкарыстоўваецца для ўдакладнення месца і часу (мае значэнне 'прама, якраз, непасрэдна'), пры асабовых займенніках – значэнне 'менавіта', а пры ўказальных (*той, гэты*) – для ўдакладнення: *самы прыгожы дзень; самыя сцюжы пачаліся; самы час у суніцы ісці; гэта тая самая кніга; дом ля самага возера.* Займеннік *самы* ўваходзіць у склад устойлівых выразаў з рознай стылістычнай афарбоўкай: *на самай справе* (сапраўды, нейтр.), *самы раз, у самы раз* (у патрэбны момант, разм.), *самы той!* (не на таго напалі, іран.). Нагадаем, што націск у гэтых займенніках пры іх формазмяненні фіксаваны: ва ўскосных склонах у займеннiку *сам (само, сама, самі)* націск падае на канчатак, а ў займеннiку *самы (самае, самая, самыя)* – на аснову:

Н. *сам, само, сама, самі;*

Р. *самога* (м. і н. р.), *самой, саміх;*
Д. *самому* (м. і н. р.), *самой, самім;*
В. *сам* (самога), *само, саму, саміх;*
Т. *самім* (м. і н. р.), *самой, самімі;*
М. *(у) самім, (у) самой, (у) саміх.*

Як бачна, у займенніку *сам* націск падае менавіта на першы галосны канчатка, а не на апошні; гутарковыя формы *самаго, самаму* – адхіленні ад нормаў, іх трэба пазбягаць.

Н. *самы, самае, самая, самыя;*
Р. *самага* (м. і н. р.), *самай, самых;*
Д. *самаму* (м. і н. р.), *самай, самым;*
В. *самы (самага), самае, самую, самыя (самых);*
Т. *самым* (м. і н. р.), *самай, самымі;*
М. *(па) самым, (па) самай, (па) самых.*

У адмоўных займенніках ***ніхто, нішто*** пры скланенні націск прыпадае на першы галосны канчатка: *нікога, нічога; нікому, нічому* (параўн. з адпаведнымі адноснымі займеннікамі, ад якіх яны ўтварыліся: *каго, чаго, каму, чаму*).

Па адным тыпе скланяюцца займеннікі ***ты*** і ***сябе:***

Н.	*ты*	–
Р.	*цябе*	*сябе*
Д.	*табе*	*сабе*
В.	*цябе*	*сябе*
Т.	*табой(-ою)*	*сабой(-ою)*
М.	*пры табе*	*пры сабе*

Займеннікі прыметнікавага тыпу ў форме жаночага роду ***мая, свая, твая, наша, ваша, гэтая, тая, такая, сама, самая, кожная, ніякая*** ў родным склоне маюць варыянтныя канчаткі: больш ужывальныя няпоўныя канчаткі ***-ой(-ай/-ёй),*** аднак у мастацкім і публіцыстычным стылях усё часцей выкарыстоўваецца поўны канчатак ***-ае:*** *такое бяды, ніякае радасці.* У творным склоне названым займеннікам таксама ўласцівы варыянты канчаткаў: побач з нейтральнымі няпоўнымі канчаткамі ўжываюцца поўныя: ***-ой*** і ***-ою, -ёй*** і ***-ёю, -ай*** і ***-аю*** (*такой* і *такою, тваёй* і *тваёю, самай* і *самаю*), апошнія запатрабаваны мастацкім стылем (найперш паэзіяй). У вінавальным склоне ёсць стылістычна нейтральныя варыянты ў наступных займеннікаў: *нашу – нашую, вашу – вашую, гэту – гэтую, саму – самую.*

Марфалагічныя нормы ў сістэме дзеяслова.

Гэта часціна мовы, якая валодае семантычнай разнастайнасцю, называючы дзеянне, працэс ці стан, маючы вялікую колькасць граматычных катэгорый, складаную сістэму формаў, патрабуе пэўных каментарыяў. Так, у зваротных дзеясловах замест постфікса *-ся* часам памылкова выкарыстоўваецца *-сь,* што з'яўляецца парушэннем літаратурнай нормы: правільна – *вучыся, купаліся, напрацаваліся* і г. д.

Умоўны лад, як вядома, выражаецца дзеясловам у форме прошлага часу і часціцай *бы (б),* пры гэтым дзеяслоў, які заканчваецца на зычны, патрабуе часціцы *бы,* на галосны – *б: сказаў бы, прынеслі б, намалявала б.*

Асаблівай увагі патрабуе складаная форма прошлага часу, паколькі яна мае структурныя адрозненні ў параўнанні з адпаведнай формай рускай мовы. У беларускай мове яна ўтвараецца шляхам спалучэння дзеяслова ўпрошлым часе і дапаможнага дзеяслова *быць,* які мае тыя самыя формы роду і ліку, што і асноўны дзеяслоў: *падышоў быў, падышла была, падышлі былі, падышло было,* але па-руску інакш: *подошел (подошла, подошло, подошли) было.*

Катэгорыя спражэння не выклікае асаблівых цяжкасцей пры засваенні, аднак рознаспрагальныя дзеясловы маюць спецыфічныя парадыгмы: ***есці*** – *ем; ясі; есць; ядзім, ямо; ясце; ядуць;* ***даць*** *– дам; дасі; дасць; дадзім; дамо; дасце; дадуць;* ***бегчы*** *– бягу; бяжыш; бяжыць; бяжым; бежыце; бягуць.*

Самай распаўсюджанай памылкай, выкліканай уплывам рускай мовы, з'яўляецца ўжыванне дзеясловаў у 2-й асобе множным ліку абвесным ладзе з націскам на першым складзе канчатка (гэта памылка!). Трэба цвёрда засвоіць правіла: у гэтай форме націск падае на аснову або на другі склад канчатка, на склад ***-це:*** *гуля́- еце, зно́йдз-еце, забіра́-еце; нес-яце́, прыжывяцёся, падрасц-яце́, сме-яцё-ся.*

Неабходна адрозніваць таксама канчаткі дзеясловаў у абвесным і загадным ладах. У загадным ладзе ў 1-й асобе множным ліку дзеясловы могуць мець спецыфічныя для беларускай мовы канчаткі ***-е́м, -э́м*** (пад націскам), ***-ма*** (не пад націскам): *нясе́м, кладзе́м, бярэ́м*; *скла́двайма́ся, працуйма, канча́йма, шука́йма, не забыва́йма́ся.* У абвесным ладзе ў 1-й асобе множным ліку гэтыя дзеясловы маюць канчаткі: *нясё́м, кладзё́м, вя́жам, стрыжо́мся*; *скла́дваемся, канча́ем.* Як бачна, у загадным ладзе канчаткі ***-е́м*** і ***-э́м*** націскныя, а ў абвесным ладзе канчатак ***-ем*** ненацискны.

У 2-й асобе множным ліку ў загадным ладзе націск можа падаць на канчатак ***-ы(-і)*** перад постфіксам ***-це:*** *нясі́це, кладзі́це, пішы́це.*

Мастацкаму, часткова публіцыстычнаму, а таксама гутарковаму

маўленню ўласціва ўжыванне экспрэсіўных формаў (*скокнуць, бразнуць; папабегаць, папахадзіць; пачытваць, пабольваць; плявузгаць, клыпаць, рынуцца* і інш.) і ўзаемазамяняльнасць формаў часу і ладу. Так, дзеясловы цяперашняга часу могуць ужывацца са значэннем прошлага ці будучага, што дапамагае апавядальніку ажывіць мінулыя падзеі ці адлюстраваць дзеянне, якое абавязкова павінна адбыцца пасля моманту гутаркі: *бывала, іду я ў грыбы* (цяперашні гістарычны), *заўтра абавязкова іду ў грыбы.* Дзеясловы будучага часу могуць ужывацца са значэннем цяперашняга ці прошлага, гэта робіць маўленне экспрэсіўным: так падкрэсліваецца паўтаральнасць дзеяння (*то паверне дарога ўлева, то роўнаю стужкаю цягнецца*) або яго нечаканасць, выпадковасць (*колькі ні прыеду дадому – ідзе маці насустрач*).

Формы ладу таксама могуць набываць экспрэсіўнасць пры іх узаемазамяняльнасці: так, дзеясловы ўмоўнага ладу могуць ужывацца са значэннем загаднага, што надае выказванню разнастайныя адценні: просьбу, параду, запрашэнне выканаць дзеянне (магчыма, з афарбоўкай нерашучасці, далікатнасці ці папроку): *прачытаў бы ты кнігу, прыбрала б ты ў пакоі, прылеглі Вы б адпачыць.* Загадны лад можа мець значэнне ўмоўнага, што забя- спечвае непасрэднасць выкладу думкі: *дапамажы мы ім – яны ўсё паспелі б выканаць.* У дзеясловах маўлення, успрыняцця, думкі можа аслабляцца ці ўвогуле сцірацца інтанацыя загаду і само лексічнае значэнне: *глядзі ты, які разумны*!; *скажыце, які добранькі!*

Форма 2-й асобы адзіночнага або множнага ліку можа мець абагульнена-асабовае значэнне, якое яна рэалізуе ў прыказках: *Сей у пару – збярэш хлеба гару; Сон на заўтра адкладзі, а справу сёння давядзі; Божа памажы, але і сам падбяжы.*

Марфалагічныя нормы ў сістэме дзеепрыметніка

Самымі ўжывальнымі ў беларускай літаратурнай мове з’яўляюцца дзее- прыметнікі прошлага часу залежнага і незалежнага стану з суфіксамі ***-л-, -н-, -ан-, -ен-, -т-:*** *выцвілы, пахарашэлы, зачараваны, устрывожаны, знесены, змолаты.* Выкарыстанне іншых формаў абмежаванае па розных прычынах. Так, дзеепрыметнікі прошлага часу незалежнага стану з суфіксамі ***-ўш-, -ш-*** у форме мужчынскага роду аманімічныя з дзеепрыслоўямі: *прачытаўшы, пацярпеўшы, збегшы* і г. д. Многія лінгвісты акцэнтуюць увагу на немілагучнасці гэтых формаў, што з’яўляецца правамерным.

Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану цяперашняга часу з суфіксамі ***-уч-(-юч-), -ач-(-яч), -ем-(-ом-), -ім-*** уласцівы публіцыстычнаму і навуковаму стылям, дзе могуць уваходзіць у склад тэрмінаў або іншых

устойлівых выразаў кніжнага харак- тару: *шыпячы гук, вісячы замок, нераскладаемыя элементы, рухаючыя сілы, кіруючая роля, чытаемая літаратура.* Каб пазбегнуць непажаданых формаў, асабліва падчас перакладу з рускай мовы, трэба памятаць, што ў беларускай мове існуе шмат сродкаў замены такіх адзінак:

1) ужывальныя формы дзеепрыметнікаў: руск. *покрывшийся инеем* – бел. *пакрыты інеем,* руск. *выгоревший луг* – бел. *выгаралы луг.*

2) прыметнікі: руск. *приносящий прибыль* – бел. *прыбытковы,* руск. *дрожащая трясина* – бел. *дрыготкая багна;* руск. *сыпучее вещество* – бел. *сыпучае рэчыва;*

3) даданыя сказы: руск. *растущий у дома* – бел. *які расце ля дома;* руск. *вышедший на сцену* – бел. *які выйшаў на сцэну;*

4) дзеясловы: руск. *светящиеся окна* – бел. *свецяцца вокны;*

5) назоўнікі: руск. *комплектующий отдел* – бел. *аддзел камплектавання,* руск. *купающийся* – бел. *купальшчык;*

6) дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя словазлучэнні: руск. *рядом шел возвращающийся из города сосед* – бел. *побач ішоў, вяртаючыся з горада, сусед;*

7) прыдаткі: руск. *вещества, стимулирующие рост* – бел. *рэчывы-стымулятары росту;*

8) спалучэнні назоўнікаў з прыназоўнікамі: руск. *умоляющим голосом* – бел. *з мальбой у голасе;*

9) паўтор слоў: руск. *возрастающий грохот* – бел. *усё большы і большы грукат* і інш.

Марфалагічныя нормы ў сістэме дзеепрыслоўя

Дзеепрыслоўе, як і дзеепрыметнік, дапаўняе дзеяслоў сэнсава. Узнікае шэраг патрабаванняў да выкарыстання дзеепрыслоўяў у звязным маўленні. Так, утваральнік асноўнага і дадатковага дзеянняў павінен быць адзін: *Прачытаўшы кнігу, я абавязкова падзялюся ўражаннямі.* У безасабовых сказах няма і не можа быць утваральніка дзеяння, таму сказ тыпу *Хораша дыхаецца, гуляючы па летнім лесе пасля дажджу* будзе пабудаваны няправільна. Месца дзеепрыслоўяў незакончанага і закончанага трыванняў у сказе заўсёды абумоўлена паслядоўнасцю дзеянняў – асноўнага і дадатковага: *Прыехаўшы ў вёску на канікулы, я абавязкова сустрэнуся з аднакласнікамі.* У абагульнена-асабовых сказах асноўнае і дадатковае дзеянні таксама выконваюцца адной асобай, але яна ўяўляецца абагульненай і абазначае любога, кожнага: *упрошваючы не намілуешся; узяўшыся за гуж, не кажы, што не дуж; згубіўшы, не тужы, знайшоўшы, нікому не кажы.*

Марфалагічныя нормы ў сістэме прыслоўя

Прыслоўю ў культурамоўным аспекце надаецца мала ўвагі, хоць рэдка які тэкст абыходзіцца без характарыстыкі акалічнасцяў дзеяння. Некаторыя лінгвісты правамерна адзначаюць, што прыналежнасць прыслоўяў да пэўнага разраду вызначае іх ролю ў тэксце. Акалічнасныя прыслоўі стылістычна нейтральныя, яны заключаюць інфармацыю пра месца, час, прычыну, мэту дзеяння; якасныя прыслоўі не толькі перадаюць інфармацыю, але і ўтрымліваюць яе ацэнку. У сувязі з гэтым прыслоўі запатрабаваны ўсімі стылямі: *Вядома больш за 20 відаў пшаніцы. Аднак найбольш шырока вырошчваецца толькі два віды – мяккая і цвёрдая; Пры пад'ёме ўверх кінутага мяча сіла цяжару запавольвае яго рух.* У мастацкім стылі прыслоўі ўжываюцца і з пераносна-вобразным значэннем: *Сосны гамоняць. Нібы расказваюць чароўныя казкі маленства – адну за адной, нястомна і радасна, ціха і мудра, як гэта можа добрая, пагодлівая старасць* (Я. Брыль).

Прыслоўі, утвораныя ад якасных прыметнікаў, маюць ступені параўнання. Складаная форма вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання ўтвараецца, як правіла, шляхам далучэння слоў ***найбольш (найменш)*** і адпаведна ***больш (болей), менш (меней)*** да якасных прыслоўяў, таму ўтварэнні тыпу *найбольш гучней, менш цікавей* будуць парушэннем нормы.

Трэба памятаць, што прыслоўе, як і прыметнік, мае элятыў, аднак ён выражаны формай вышэйшай ступені параўнання, якая страчвае супастаўляльнае значэнне: *раней, далей, даўней.* Як відаць, першыя два словы міжстылёвыя, апошняе мае размоўную афарбоўку.

Якасныя прыслоўі маюць формы ацэнкі і меры якасці: *ціхутка, добранька, памалюсеньку, страшэнна, высачэзна, ранічкай, далекавата;* праз сваю экспрэсіўнасць, размоўную афарбоўку яны найбольш запатрабаваны мастацкім і гутарковым стылямі.

2.4 КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ЯКАСЦІ МАЎЛЕННЯ

Дакладнасць маўлення

Дакладнасць такая камунікатыўная якасць маўлення, якая прадугледжвае адпаведнасць яго сэнсавага боку (плану зместу) адлюстраванай рэчаіснасці і праяўляецца ва ўменні знаходзіць адэкватнае слоўнае выражэнне паняцця. Такім чынам, дакладнасць уяўляе сабой уменне правільна адлюстроўваць рэчаіснасць і правільна выказваць думкі і афармляць іх пры дапамозе слоў.

Дакладнасць у першую чаргу залежыць ад правільнасці словаўжывання, ад выбару слова, якое найбольш адпавядае названаму ім прадмету ці з'яве, зместу выказвання і яго мэце. Пры выбары слова неабходна ўлічваць яго семантыку, стылістычную прыналежнасць, сферу ўжывання.

Так, напрыклад, назоўнік *рэзюмэ* ў літаратурнай мове мае значэнне 'кароткі вывад са сказанага, напісанага', таму яго ўжыванне будзе да месца ў кантэксце *рэзюмэ аўтарэферата*, *даклада*, *артыкула.* Часам у маўленні названая лексема выкарыстоўваецца для абазначэння вынікаў дзеянняў, мерапрыемстваў, падзей: *рэзюмэ чэмпіяната, турніра, спаборніцтваў* (правільна: *вынікі чэмпіяната, турніра, спаборніцтваў*).

Дакладнасць маўлення прадугледжвае пэўныя патрабаванні да спецыяльнай лексікі. Так, тэрміны павінны быць адназначнымі ў межах дадзенай тэрмінасістэмы, сціслымі, нейтральнымі з эмацыянальна-экспрэсіўнага пункту погляду, мець дакладны змест. Аднак пералічаныя патрабаванні захоўваюцца не заўсёды, бо абцяжарваюць зносіны ў навуцы, тэхніцы, упраўленні.

Замена тэрміна адпаведнай абрэвіятурай не павінна выклікаць цяжкасці пры яе ўспрыманні і расшыфроўцы, і тым больш – непатрэбных асацыяцый.

Вузкаспецыяльныя тэрміны, ужытыя па-за сферай, для якой яны характэрны, абавязкова патрабуюць тлумачэння: калі тэрміны не зразумелыя адрасату, яны не выконваюць інфарматыўную функцыю і перашкаджаюць успрыняццю і разуменню тэксту, а значыць, пазбаўляюць тэкст даступнасці.

Асаблівай увагі падчас выкарыстання патрабуюць інтэрферэмы – словы, якія ў розных мовах часткова ці поўнасцю супадаюць па гучанні, але адрозніваюцца па значэнні: руск. *диван* = бел. *канапа,* бел. *дыван* = руск. *ковёр;* руск. *мех* = бел. *футра,* бел. *мех* = руск. *мешок.*

Дакладнасць маўлення патрабуе не толькі ведання значэння слоў, але і ўмення ўлічваць іх валентнасць – здольнасць уступаць у кантэкст з іншымі словамі. Адной з распаўсюджаных памылак з'яўляецца парушэнне нормаў лексічнай спалучальнасці, што вядзе да недакладнасці маўлення: *дасягнутыя недахопы* (лексема *недахопы* не спалучаецца са словам *дасягнутыя*), *паменшыць узровень* (трэба *знізіць узровень*), *заняць першынство* (трэба *заваяваць першынство*). Частка такіх памылак

дапускаецца ў выніку кантамінацыі – змешвання двух блізкіх па семантыцы словазлучэнняў.

Прычынамі недакладнасці, двухсэнсоўнасці, незразумеласці выказвання з'яўляюцца:

1) ужыванне слоў з неўласцівым для літаратурнай мовы значэннем;

2) недакладнае выкарыстанне сінонімаў, паронімаў, тэрмінаў, мнагазначных слоў, амонімаў;

3) міжмоўная лексіка-семантычная інтэрферэнцыя ва ўмовах білінгвізму;

4) парушэнне нормаў лексічнай, граматычнай і стылістычнай спалучальнасці слоў;

5) слоўная збыткоўнасць;

6) слоўная недастатковасць.

Лагічнасць маўлення

Лагічнасць маўлення прадугледжвае паслядоўнасць, несупярэчлівасць і аргументаванасць выкладу думак. Лагічнасць характарызуе структуру маўлення, яе арганізацыю і ацэньвае сэнсавыя спляценні маўленчых адзінак з пункту погляду законаў логікі і правільнага мыслення.

Выдзяляюць два віды лагічнасці – прадметную і паняційную. Прадметная лагічнасць заключаецца ў адпаведнасці семантычных сувязяў і адносін адзінак маўлення сувязям і адносінам прадметаў і з'яў у рэчаіснаці. Паняційная лагічнасць – гэта адэкватнае адлюстраванне структуры думкі і яе развіцця ў сэнсавых сувязях кампанентаў маўлення.

Для дасягнення лагічнасці мыслення і выказвання трэба, каб яны адпавядалі асноўным лагічным законам – тоеснасці, супярэчнасці, выключэння трэцяга, дастатковага абгрунтавання. Толькі пры гэтай умове маўленне будзе паслядоўным, змястоўным, несупярэчлівым і абгрунтаваным.

Паслядоўнасць думкі, яе адназначнасць, зразумеласць дасягаюцца дзякуючы дзеянню закона тоеснасці, згодна з якім кожная думка ў працэсе аднаго абмеркавання павінна заставацца нязменнай, захоўваючы адзін і той жа змест. Сам прадмет гаворкі ці нашы веды пра яго могуць з цягам часу змяняцца. Аднак у працэсе абмеркавання адны веды аб прадмеце не павінны падмяняцца другімі, інакш размова стане беспрадметнай, неканкрэтнай.

Парушэнне закона тоеснасці прыводзіць да падмены тэзіса, замены адной тэмы другой, неадпаведнасці аргументаў, што выкарыстоўваюцца пры доказе, тэзісу.

Несупярэчлівасць мыслення дасягаецца дзякуючы дзеянню закона супярэчнасці, згодна з якім два меркаванні пра адзін і той жа прадмет, якія ўзаемавыключаюць адно другое, узятыя ў адзін і той жа час і пры адных і тых жа ўмовах, не могуць быць адначасова сапраўднымі. Напрыклад, калі з дзвюх думак *Залік прызначылі на заўтра* і *Залік прызначылі на паслязаўтра* адна сапраўдная, то другая – несапраўдная.

Нельга прыйсці да аднаго меркавання, калі прадмет разглядаецца з розных пазіцый. Напрыклад, той факт, што пачаўся дождж, адны ахарактарызуюць як станоўчы (калі да гэтага была суш), а другія – як адмоўны (калі яны сабраліся пагуляць у футбол).

З законам супярэчнасці звязаны закон выключэння трэцяга: з двух супярэчлівых меркаванняў адно павінна быць сапраўдным, другое – несапраўдным, а трэцяга не можа быць увогуле. Гэты закон распаўсюджваецца толькі на супярэчныя меркаванні, супастаўце: *Мы пойдзем на канцэрт – Мы не пойдзем на канцэрт. Я дачытаў раман – Я не дачытаў раман.*

Паводле закона дастатковага абгрунтавання ўсялякая правільная думка павінна быць аргументаванай. Гэты закон не дапускае неабгрунтаваных вывадаў і сцвярджэнняў; менавіта ў навуковым стылі з'яўляецца асабліва актуальным.

Веданне і свядомае прымяненне законаў логікі дысцыплінуе суразмоўцу, павышае яго культуру, дазваляе зрабіць выказванне аргументаваным і эфектыўным, дапамагае пазбегнуць лагічных памылак.

падкрэсленая лагічнасць, якая абумоўлівае адбор і арганізацыю ўсіх моўных сродкаў. Змест навуковых тэкстаў павінен быць ёмкім, недвухсэнсоўным, абгрунтаваным. У навуковым стылі не дапускаецца падтэкст. Сэнс навуковага паведамлення павінен аднолькава ўспрымацца ўсімі адрасатамі.

Чысціня маўлення

Чысціня маўлення як камунікатыўная якасць цесна звязана са стылістычнымі і этычнымі нормамі, якія дапамагаюць берагчы мову ад засмечвання, кантралююць ужыванне нелітаратурных моўных элементаў і некаторых літаратурных, унармаваных, якія знаходзяцца па-за межамі мовы асобных функцыянальных стыляў. У сувязі з гэтым лінгвісты прапаноўваюць размяжоўваць дзве крыніцы засмечвання мовы.

Асноўную шкоду чысціні маўлення наносяць менавіта не-літаратурныя моўныя элементы – дыялектызмы, жарганізмы, прастамоўі (сярод іх вульгарныя і лаянкавыя словы), фразеалагізмы з прастамоўнай афарбоўкай, некаторыя, як правіла, немілагучныя неалагізмы. Пералічаныя нелітаратурныя лексемы і выразы «размываюць» адну з самых важных камунікатыўных якасцяў – чысціню, абцяжарваюць працэс зносін не толькі з лінгвістычнага боку, але і з этычнага, маральнага. Мова, «перасыпаная» словамі з незра- зумелай семантыкай, са зніжанай стылістычнай афарбоўкай, блакіруе інфармацыйную і эмацыянальную яе

засваяльнасць субяседнікам. Што да літаратурных моўных элементаў, то негатыўны эфект маўленню могуць надаваць канцылярызмы, іншамоўныя словы, вузкія прафесіяналізмы (часам сінонімы эквівалентных ім тэрмінаў), маўленчыя штампы. Такія словы і выразы шкодныя асабліва тады, калі выходзяць за межы тых стыляў, адметнасць якіх складаюць, і калі іх колькасць з'яўляецца празмернай. Кожны функцыянальны стыль мае адметныя нормы форма- і словаўтварэння, форма- і словаўжывання, таму чысціня маўлення залежыць ад шматлікіх стылістычных патрабаванняў, веданне якіх дазволіць засцерагчы мову ад ужо пералічаных і некаторых іншых моўных з'яў (напрыклад, слоў-паразітаў і пустаслоўя).

Дарэчнасць маўлення

Дарэчнасць – такая камунікатыўная якасць, пры якой ужытыя моўныя сродкі адпавядаюць месцу, часу, жанру, мэтам і ўмовам зносін. Маўленне дарэчнае, калі яно строга адпавядае задачам зносін, зместу інфармацыі, выбранаму жанру і стылю выкладання, індывідуальным асаблівасцям аўтара і адрасата.

Захаванне дарэчнасці прадугледжвае веданне стылістычнай сістэмы мовы, заканамернасцей ужывання моўных сродкаў у кожным функцыянальным стылі, што дазваляе знайсці найбольш мэтазгодны спосаб выражэння думкі, перадачы інфармацыі.

Неабходная ўмова дарэчнасці – добрае веданне і асэнсаванне прадмета інфармацыі. Вялікае значэнне мае таксама агульная культура аўтара, яго адносіны да адрасата, уменне хутка арыентавацца ва ўмовах зносін.

У лінгвістычнай літаратуры вылучаюць дарэчнасць стылёвую, кантэкстуальную, сітуацыйную і асобасна-псіхалагічную. Дарэчнасць кантэкстуальную і сітуацыйную размежаваць цяжка, таму нярэдка іх аб'ядноўваюць і гавораць пра сітуацыйна-кантэкстуальную дарэчнасць.

Пытанне пра стылёвую дарэчнасць той ці іншай моўнай адзінкі ў кожным стылі вырашаецца па-рознаму. Для кожнага функцыянальнага стылю характэрны свае заканамернасці адбору, арганізацыі і ўжывання моўных сродкаў. Напрыклад, у афіцыйна-справавым і навуковым стылях выкарыстоўваюцца агульнаўжывальныя, нейтральныя і кніжныя моўныя сродкі. Недарэчным будзе ўвядзенне ў такія тэксты нелітаратурных элементаў. У публіцыстыцы ж нелітаратурныя моўныя сродкі (дыялектызмы, жарганізмы, варварызмы, экзатызмы, размоўная і прастамоўная лексіка) дапушчальныя, калі яны выконваюць стылістычную функцыю. Тое ж самае можна сказаць і пра мастацкі стыль, у якім ужыванне моўных сродкаў падначалена аўтарскай задуме, стварэнню мастацкага вобраза.

Сітуацыйна-кантэкстуальная дарэчнасць дыктуе ўжыванне сродкаў у залежнасці ад сітуацыі зносін і кантэксту, у якім моўная адзінка знаходзіцца. Асноўным крытэрыем гэтай разнавіднасці дарэчнасці

з’яўляюцца сітуацыя і задачы зносін. Нельга гаварыць з рознымі людзьмі (напрыклад, з дарослым і з дзіцём) аднымі і тымі ж словамі: трэба ўлічваць разумовыя магчымасці і падрыхтаванасць адрасата да ўспрымання інфармацыі. Не варта злоўжываць у тэксце мастацкага стылю спецыяльнымі і прафесійнымі словамі, значэнне якіх незразумела неспецыялісту (выключэнне – калі яны выконваюць стылістычную функцыю).

Парушэннем дарэчнасці з’яўляецца ўжыванне стылістычна маркіраваных адзінак без уліку іх функцыянальнай і эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі, нематываванае парушэнне адзінства стылю.

Асобасна-псіхалагічная дарэчнасць рэгулюе маўленчыя зносіны. Маўленне не толькі змяшчае інфармацыю, але і выражае адносіны гаворачага да рэчаіснасці, да людзей вакол яго. Таму аўтар выказвання павінен улічваць, як яго словы падзейнічаюць на адрасата. Асобасна-псіхалагічная дарэчнасць прадугледжвае павагу, тактоўнасць, уменне «чытаць» настрой суразмоўцы, улічваць яго індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці, майстэрства знаходзіць адпаведнае сітуацыі слова, інтанацыю.

Выдзяленне розных відаў дарэчнасці з’яўляецца некалькі ўмоўным. Стылёвая дарэчнасць прасочваецца яскрава. А вось сітуацыйна-кантэкстуальная і асобасна-псіхалагічная цесна пераплятаюцца не толькі паміж сабой, але і з маўленчым этыкетам, які прадугледжвае тактоўнасць, павагу, дабрыню, шчырасць у паводзінах удзельнікаў зносін.

Характар размовы вызначаюць не толькі ўжытыя словы, але і тон, інтанацыя, з якой яны выказаны. Адзін і той жа выраз можа ўспрымацца па-рознаму ў залежнасці ад тону. Заўсёды трэба браць пад увагу інтарэсы чалавека, з якім уступаеце ў размову, месца, дзе вы знаходзіцеся, настрой і стан людзей, што вакол вас.

Напрыклад, недарэчна перарываць выступоўцу да моманту, пакуль не выйшаў рэгламент, аднак калі рэгламент выйшаў, то напамін пра гэта выглядае дарэчным.

Багацце маўлення

Багацце маўлення – гэта адна з найбольш важных камунікатыўных якасцей, бо дэманструе лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя, граматычныя і стылістычныя рэсурсы мовы. Багацце любой мовы можна ўявіць, калі паглядзець вакол сябе, падумаць пра тое, што прадметы, дзеянні, іх якасці і ўласцівасці, абстрактныя паняцці і інш. – усё мае назву, а часам і не адну. Значыць, наколькі разнастайны свет, наколькі развіта мысленне і жыццядзейнасць чалавека, настолькі багатая і мова.

Маўленчае багацце кожнай канкрэтнай асобы праяўляецца індывідуальна і залежыць ад розных фактараў: ад неабыякавага стаўлення да мовы, ад прафесіі, начытанасці, пачуццёвай гамы чалавека ва ўспрыманні свету. Адны навукоўцы сцвярджаюць, што актыўны слоўнік сучаснага чалавека складае каля 8 тысяч розных слоў, другія называюць лічбу 12 тысяч. Лічыцца, што нават творчыя і высокаадукаваныя людзі, якія

пішуць мастацкія, навуковыя, публіцыстычныя тэксты, выкарыстоўваюць толькі каля 10 працэнтаў агульнаўжывальнага лексікону. Падлічана, напрыклад, што Францыск Скарына ўжыў больш за 13 тысяч розных слоў, Якуб Колас – 500 тысяч.

Варта памятаць: поўнасцю моўнае багацце не адлюстроўвае ніводзін лексікаграфічны даведнік, паколькі тэрміны, дыялектызмы, устарэлыя словы, аўтарскія неалагізмы, складаныя лексемы, словы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, жарганізмы, запазычаныя адзінкі, геаграфічныя, астранамічныя і іншыя індывідуальныя назвы поўнасцю слоўнікамі не ўлічваюцца.

Выразнасць і вобразнасць маўлення

Выразнасць – камунікатыўная якасць маўлення, з дапамогай якой аўтар тэксту падтрымлівае ўвагу чытача або слухача, прымушае задумацца над зместам выказвання, кранае думкі і пачуцці, не пакідае раўнадушным. Часам у мовазнаўчай літаратуры атаясамляюць паняцці вобразнасці і выразнасці; аднак вобразнасць заўсёды звязана з пераносным значэннем слова, з ужываннем слова ў кантэксце, у той час як для стварэння выразнасці (экспрэсіўнасці) могуць ужывацца словы і з прамым значэннем. Несумненна адно: і вобразнасць, і выразнасць упрыгожваюць маўленне.

Як вядома, маўленчая выразнасць залежыць ад многіх прычын: ступені асэнсаванасці аўтарам прадмета гутаркі, стаўлення да тэмы і зместу выказвання, наяўнасці/адсутнасці псіхалагічнага кантакту паміж адрасатам і адрасантам. Аднак веданне мовы, моўнае чуццё – гэта перадумова стварэння экспрэсіўнага тэксту. Важна ўсвядоміць, што выразнасць дэманструе неардынарнасць мыслення, спецыфічнасць светаўспрымання і выяўляецца на ўсіх моўных узроўнях: фанетычным, лексічным, фразеалагічным, словаўтваральным, граматычным (марфалагічным і сінтаксічным) і экстралінгвістычным (нямоўным).

Гукапіс як крыніца выразнасці мовы прапаноўвае шэраг **фанетычных прыёмаў**, якія найчасцей функцыянуюць у мастацкім стылі – у мове паэзіі ці лірычнай прозы: **алітарацыя** і **асананс**, **складападзел**, **даўжыня слова**, **сказа**, **радка**. На **лексічным узроўні** маўленчая выразнасць забяспечваецца, як ужо адзначалася, словамі з пераносным значэннем (тропамі) і словамі з прамым значэннем (сродкамі стварэння слоўнай выразнасці). Найбольш ужывальнымі тропамі з'яўляюцца эпітэт, метафара, параўнанне, перыфраза, гіпербала, літота.

Сродкі стварэння слоўнай выразнасці – **сінонімы**, **амонімы**, **антонімы**, **паронімы** – утвараюць шэраг стылістычных прыёмаў, якія надаюць тэкстам незвычайнае гучанне, глыбокі падтэкст і тым самым забяспечваюць экспрэсіўнасць радка.

На **фразеалагічным узроўні** выразнасць ствараецца дзякуючы ўстойлівым выразам, якія, як ужо адзначалася, з'яўляюцца яркім, каларытным сродкам мовы. **Фраземы**, **прыказкі**,

крылатыя выслоўі надаюць мове эмацыянальнасць, забяспечваюць дакладныя характарыстыкі і ацэнку вобразаў, а значыць, выражаюць адабрэнне, захапленне ці асуджэнне, іронію і іншыя эмоцыі. Асаблівай экспрэсіяй валодаюць **устойлівыя іншамоўныя выразы,** якія падаюцца ў пісьмовай мове графічнымі сродкамі мовы-крыніцы: *Veni, vidi, vici* (лац.) – ‘прыйшоў, убачыў, перамог’; *Per aspera ad astra* (лац.) – ‘праз церніі да зорак’. У мастацкіх тэкстах яны выкарыстоўваюцца як сродак стылізацыі мовы персанажаў.

Сінтакс ічны ўзровень таксама мае значную колькасць экспрэсіўных сродкаў, найперш – гэта прыёмы сінтаксічнай арганізацыі маўлення, сутнасць якіх ва ўзмацненні, падкрэсліванні асобных слоў, словазлучэнняў, сказаў. Як вядома, у залежнасці ад месца ў радку, сказе, чатырохрадкоўі, абзацы сінтаксічныя прыёмы падзяляюцца на **анафару, эпіфару, паралелізм, градацыю, кальцо страфы, кампазіцыйны стык, рытарычнае пытанне** і інш.

Экстралінгвістычныя сродкі выразнасці, як і лінгвістычныя, спрыяюць выразнасці маўлення. Да іх адносяцца **жэсты, міміка, пантаміма, рухі.**

Сцісласць маўлення

Сцісласць (лаканічнасць) маўлення – камунікатыўная якасць, непасрэдна звязаная з законам эканоміі моўных сродкаў. У выніку рэалізацыі гэтай маўленчай адметнасці перыяд гаварэння скарачаецца, але застаецца нязменнай інфармацыйная частка. Варта памятаць, што празмерная сцісласць можа прыводзіць да неразумення і двухсэнсоўнасці выказвання, у такім разе яе вызначаюць як ілжывую, памылковую.

У сваю чаргу маўленчая збыткоўнасць – загана любога тэксту. Аднак ёсць шэраг сітуацый, у якіх ужыванне разгорнутых апісанняў апраўдана, а яны, як вядома, немагчымыя без складаных развітых сказаў, без ускладненых сінтаксічных канструкцый. Напрыклад, навуковы стыль прадугледжвае выкарыстанне складаных сказаў, асабліва калі тэксты адрасаваны вучням старэйшых класаў, студэнцкай аўдыторыі, навукоўцам. Аднак паколькі гэтаму стылю ўласцівы дакладнасць і лагічнасць, рэалізацыя ў пісьмовай форме, то ў адным і тым жа тэксце могуць ужывацца разгорнутыя фармулёўкі і сродкі стварэння сцісласці (**агульнапрынятыя ўмоўныя скарачэнні, абрэвіяцыя тэрмінаў,** іх **паўтор** з тым, каб пазбегнуць двухсэнсоўнасці і вялікіх апісанняў, пропуск выказніка, які аднаўляецца з папярэдняга кантэксту, і інш.).

Сцісласць выкладу ў навуковым стылі ўсё ж неабходная. Яна забяспечваецца, як адзначалася, абрэвіятурамі, умоўнымі скарачэннямі, а таксама **напісаннем лічэбнікаў арабскімі ці рымскімі лічбамі, рубрыкацыяй,** што спрыяе апраўданаму скарачэнню радка ў такіх жанрах, як энцыклапедыя ці падручнік.

Варта памятаць, што сцісласць навуковага стылю рэалізуецца таксама праз скарачэнне, або абрэвіяцыю, тэкстаў, напрыклад, пры напісанні

тэзісаў ці аўтарэфератаў, дзе лаканічнасць выкладу павінна суправаджацца максімальнай інфармацыйнай насычанасцю зместу. Гэтай якасцю навуковы стыль збліжаецца з афіцыйна-справавым.

Як слушна сцвярджаецца, для ўсіх справавых папер характэрна сцісласць, эканомнасць выкладу. Менавіта таму мы маем у справаводчым стылі асаблівыя сродкі забеспячэння лаканічнасці ў дадатак да пералічаных вышэй: напрыклад, **устойлівая форма напісання дакументаў,** прычым ступень стандартызаванасці настолькі высокая, што для некаторых з іх ствараюцца спецыяльныя бланкі, пасведчанні (бланкі для афармлення розных заяў; пасведчанні аб нараджэнні, шлюбе; заліковыя кніжкі; вадзіцельскія правы і інш.). Чым больш аб'ёмны ствараецца дакумент, тым большая верагоднасць рубрыкацыі тэксту, сістэмы нумарацыі, што, у сваю чаргу, спрыяе як дакладнасці, лагічнасці, так і сцісласці выкладу матэрыялу:

Як відаць, сцісласць афіцыйна-справавога стылю забяспечваецца таксама **стандартызаванымі выразамі,** або **канцылярызмамі,** іх шматлікімі паўторамі, што, акрамя ўсяго, не дапускае расплывістасці фармулёвак, двухсэнсоўнасці.

На граматычным узроўні сцісласць дасягаецца шляхам выкарыстання розных тыпаў **няпоўных сказаў, слоў-сказаў, аднасастаўных сказаў,** а таксама праз **эліптычную субстантывацыю.** Амаль усе пералічаныя сродкі скарачэння маўленчага перыяду магчыма выкарыстоўваць пры пэўных умовах у мастацкім, публіцыстычным і размоўным стылях. Паколькі сцісласць можа быць запатрабавана ў залежнасці ад сітуацыі, значыць, яна цесна звязана з дарэчнасцю.

ІІІ. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ВМК

Табліца нумарацыі спецыялізацый

№ практ.	Спецыяльнасці, спецыялізацыі
0.1.	заданні для ўсіх спецыяльнасцей
0.2.	усе спецыяльнасці і спецыялізацыі факультэта музычнага мастацтва
0.3.	менеджмент сацыяльна-культурнай сферы
0.4.	сацыяльная педагогіка, сацыяльная работа
0.5.	народныя рамёствы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва
0.6.	бібліятэказнаўства і бібліяграфія
0.7.	харэаграфічнае мастацтва
0.8.	музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны
0.9.	тэатральная творчасць, рэжысура

ПРАКТЫКУМ

БЕЛАРУСКАЯ МОВА СЯРОД ІНШЫХ МОЎ СВЕТУ. ГЕНЕЗІС БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ, ЯЕ РАЗВІЦЦЁ Ў ЧАСЕ

Складзіце схему паходжання беларускай мовы, карыстаючыся даведнікам «Беларуская мова. Энцыклапедыя» (Мінск, 1994).

Пытанні для самакантролю

1. З якога стагоддзя пачалося выдзяленне славянскіх моўных груп?
   а) з пятага стагоддзя;
   б) з шостага стагоддзя;
   в) з сёмага стагоддзя.

2. Да якой групы славянскай сям'і моў належыць беларуская мова?
   а) заходнеславянскай;
   б) паўднёваславянскай;
   в) усходнеславянскай.

3. Хто рэфармаваў кірыліцу і стварыў узоры літар грамадзянскага шрыфту, якім мы сёння карыстаемся?
   а) Францыск Скарына;
   б) Ілья Капіевіч;
   в) Лаўрэнцій Зізаній.

4. Якая навучальная ўстанова лічыцца першым універсітэтам у Беларусі?
   а) Полацкая акадэмія;
   б) Віленская езуіцкая акадэмія;
   в) Грэка-лаціна-руская акадэмія ў Смаленску.

5. Каго называюць заснавальнікам сучаснай беларускай мовы і літаратуры?
   а) Францішка Багушэвіча;
   б) Якуба Коласа;
   в) Максіма Гарэцкага.

6. Калі і кім была выдадзена першая навуковая граматыка – «Беларуская граматыка для школ»?

а) Язэпам Лёсікам у 1910 г.;

б) Браніславам Тарашкевічам у 1918 г.;

в) Якубам Коласам у 1920 г.

7. Якія гаворкі пакладзены ў аснову сучаснай беларускай літаратурнай мовы?

а) паўночна-ўсходнія;

б) сярэднебеларускія;

в) паўднёва-заходнія.

8. У якія гады рэфармаваўся беларускі правапіс?

а) 1918, 1948, 2010;

б) 1933, 1957, 2008;

в) 1905, 1937, 1990.

СПЕЦЫФІКА ФАНЕТЫЧНА-АРФАЭПІЧНАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

§ 1. Асаблівасці фанетычнай сістэмы беларускай мовы

1. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. У перакладзе ў выдзеленых словах вызначце суадносіны паміж гукамі і літарамі. Растлумачце, чым адрозніваюцца гукі ад літар.

Букву и звук путать нельзя. А часто *путают*, – притом всегда страдает звук: его *называют* буквой (сказывается преклонение перед письменной речью). Говорят: «Слушая Яхонтова, я наслаждаюсь каждым словом, каждой буквой». *Как будто*, выступая на сцене, он писал, а не произносил стихи!

Буква – фигурная линия, рисунок (недаром многие художники прославились как мастера рисованного шрифта), рисунок произнести нельзя…

Неразличение звука и буквы *мешает* понять строение языка. И. А. Бодуэн де Куртенэ писал: кто смешивает звук и букву, письмо и язык, «тот только с трудом отучится, а может быть, и никогда не отучится смешивать человека с паспортом, национальность с алфавитом, человеческое достоинство с чином и званием», т. е. сущность с чем-то внешним (*М. Панов*).

2. Вызначце, колькі літар, колькі гукаў у словах.

2.1. Акадэмія, акацыя, Беларусь, інтэрв’ю, панацэя, явар, фантазія.

2.2. Дыялог, прэлюдыя, прэм’ера, сімфаньета, араторыя, трыа.

2.3. Аўкцыён, індэксацыя, кар’ера, ліцэнзія, рэалізацыя, праваслаўе.

2.4. Адукацыя, гульня, дэвіянтны, рэабілітацыя, суб’ект, эрудыцыя.

2.5. Барэльеф, інтарсія, інтэр’ер, мазаіка, пэндзаль, ювелір, пейзаж.

2.6. Абрэвіятура, бібліятэка, гісторыя бібліяграфіі, выданне, дайджэст, дыяпазітыў, рэцэнзія.

2.7. Рэпетыцыя, харэаграфія, балетаманія, балетмайстар, экспрэсія.

2.8. Сярэднявечча, картаграфаванне, музей, экспанат, экспазіцыя.

2.9. Летуценнік, натхненне, увасабленне, ілюзія, спектакль, камедыя.

3.Знайдзіце словы, у якіх выяўляецца адметнасць гукавога ладу беларускай літаратурнай мовы. Выпішыце з тэксту словы, у якіх ёсць асіміляцыя зычных. Адкажыце, які гук і да якога прыпадабняецца. Зрабіце рэферыраванне тэкстаў.

А. Культура кожнага народа ўвогуле найлепш за ўсё вызначаецца тым, як ён ставіцца да сваёй гісторыі, духоўных традыцый папярэдніх пакаленняў. Паважаючы сваё, трэба шанаваць і створанае іншымі народамі, бо чым больш культурных каштоўнасцей знаходзіцца ў іх распараджэнні, тым багацейшы духоўны патэнцыял сусветнай цывілізацыі. У літаратуры вельмі абіднымі словамі называюць разбуральнікаў культуры іншых народаў: вандалы, варвары. Шкада, што няма трапнага вызначэння для тых, хто знішчае ўласную культуру, бо такіх выпадкаў у гістарычнай практыцы вядома нямала. І, відаць, першае месца тут належыць грэку з г. Эфес (Малая Азія) Герастрату. Не маючы ніякіх заслуг перад народам, але моцна прагнучы жаданнем абессмяроціць сваё імя, ён у 356 г. да н. э. спаліў адно з «сямі цудаў свету», найпрыгажэйшы ў сваім родзе храм Артэміды Эфескай. Атрымалася так, як таго жадаў Герастрат. Хоць пасля пакарання смерцю Герастрата яго імя было забаронена ўпамінаць, яно ўсё ж не трапіла ў нябыт. І сёння ўсякія дзеянні па разбурэнні духоўных каштоўнасцей прынята называць герастратаўскімі (*Л. Лыч)*.

Б. СУСТРЭЧА З МАНЮШКАМ

Станіслаў Манюшка нарадзіўся ў фальварку Убель цяперашняга Чэрвеньскага раёна ў сям’і шляхціца. З дзяцінства любіў слухаць беларускія песні, казкі, таму нацыянальны каларыт пераважаў у ранніх творах кампазітара. Музыцы вучыўся ў Мінскай музычнай школе Д. Стафановіча. Потым 18 гадоў працаваў арганістам і дырыжорам у Вільні, а з 1858 г. і да канца жыцця быў дырыжорам опернага тэатра ў Варшаве і прафесарам Музычнага інстытута.

Першыя вадэвілі, музычныя камедыі і камічныя оперы С. Манюшка пачаў пісаць у Беларусі. Першы яго музычны спектакль «Канторскія служачыя» паставілі аматары ў Мінску. У 1852 г. на сцэне гарадскога тэатра была пастаўлена на лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча, на музыку С. Манюшкі і К. Крыжа-

ноўскага першая беларуская камічная опера «Ідылія» пад назвай «Сялянка». Поспех быў ашаламляльны.

Манюшка напісаў 12 песень на вершы Яна Чачота. Рэцэнзаваў кнігу Н. Орды «Граматыка музыкі». Найбольш вядомыя яго оперы «Галька», «Графіня», «Вербум нобіле», «Страшны дом».

На скрыжаванні вуліц Інтэрнацыянальнай і Энгельса ў Мінску ў доме № 21/3 працяглы час жыў кампазітар, стваральнік беларускай класічнай оперы Станіслаў Манюшка (*Т. Казлоўская*).

В. ВЫДАТНЫ БАЛЕТМАЙСТАР І ПЕДАГОГ

«На працягу многіх гадоў сваёй працы я стараўся папулярызаваць беларускі танец, бо ён народжаны ў народзе і павінен служыць народу». Гэтыя словы належаць Канстанціну Андрэевічу Алексютовічу, выдатнаму балетмайстру і педагогу, з імем якога звязана станаўленне прафесійнага харэаграфічнага мастацтва на Беларусі. Працягваючы славутыя традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча, І. Буйніцкага, ён здолеў узняць беларускі танец на новую вышыню.

Канстанцін Алексютовіч нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і. У 1906 г. скончыў Пецярбургскае тэатральнае вучылішча. Пэўны час удасканальваў сваё майстэрства ў Саратаве. З 1921 па 1928 г. працаваў балетмайстрам БДТ-1 (тэатра імя Я. Купалы), стварыўшы пры ім балетную студыю. Дзякуючы харэаграфічным нумарам, спектаклі БДТ-1 «На Купалле», «Машэка», «Каваль-ваявода», «Панскі гайдук», «Паўлінка», «Мешчанін у шляхецтве» набывалі асобы каларыт і маляўнічасць, эмацыянальную насычанасць. У БДТ-1 ён упершыню на прафесійнай сцэне ажыццявіў пастаноўкі балетаў «Капелія» Л. Дэліба, «Зачараваны лес» Р. Дрыга, «Фея лялек» І. Баера.

Найбольш поўна і ўсебакова раскрыўся талент Алексютовіча-харэографа ў час работы балетмайстрам ансамбля беларускай народнай песні і танца Беларускай філармоніі, здзейсненыя ім пастаноўкі народных танцаў «Лявоніха», «Крыжачок», «Мяцеліца», «Мікіта», «Таўкачыкі», «Бычок», «Юрачка», «Лянок», «Галубец», «Казачок» увайшлі ў залатую скарбонку нацыянальнай харэаграфіі *(Т. Кекелева).*

4. Прачытайце. Выпішыце словы, у якіх гукаў больш, чым літар. Колькі гукаў абазначаюць спалучэнні літар у гэтых словах? Абгрунтуйце адказ.

Баец, паэт, смяяцца, фае, саюз, тэатр, сітуацыя, акварэль, баюся, клоўн, вастрыё, вуаль, інтэр'ер, дэкарацыі, бутаньерка, аю'ява, есаул, суб'ект, шоу, эмоцыя, віртуоз.

5. Выпішыце ў асобныя слупкі словы, у якіх: **а)** дзве літары абазначаюць адзін гук; **б)** адна літара абазначае два гукі.

5.1. Дзеці, здзіўляюць, краіна, нараджэнне, падзямелле, паджынаць.

5.2. Дзякі, джаз, дыяфанія, п'еса-папуры, пеўчыя, «Юрачка».

5.3. Акцыянер, бюджэт, гаспадарчая дзейнасць, менеджар.

5.4. Асяроддзе, давер'е, дэпрэсія, інтэрв'ю, сям'я, паводзіны.

5.5. Асветніцкая дзейнасць, барэльеф, мальберт, пап'е-машэ, пэндзаль, статуя.

5.6. Дайджэст, дзвюхкарткавая абанементная сістэма, дзень спецыяліста, дзень інфармацыі, дзесятковая індэксацыя, дзіцячае чытанне, дзяржаўная бібліятэка.

5.7. Генеральная рэпетыцыя, аркестравая яма, варыяцыі, фартэпіяна, прыняць удзел у шоу.

5.8. Ляднае земляробства, выяўленне, калекцыяніраванне, інтэр'ер.

5.9. Тэатральнае жыццё, стагоддзе, дзейнічаць, інтанацыя, алегорыя.

КНИГИ – ВЕРНЫЕ ДРУЗЬЯ

Человек, любящий и умеющий читать, – счастливый человек. Он окружён множеством умных, добрых и верных друзей. Друзья эти – книги.

Книги встречают нас в самом раннем детстве и сопровождают всю жизнь. Они заставляют нас непрерывно совершенствоваться, чтобы мы могли стать настоящими людьми.

Огромный мир – заманчивый и разнообразный – врывается к нам в комнату со страниц любимых книг.

Читайте, читайте и читайте! Читайте не торопясь, чтобы не терять ни одной капли драгоценного содержания книги. Человек, «глотающий» книги, похож на путешественника, знакомящегося со страной из окна вагона. Заставляйте себя читать медленно, запоминая, обдумывая, представляя самого себя в гуще тех событий и той обстановки, какими наполнена книга, делая себя как бы их непосредственным свидетелем и даже участником. Только

тогда перед вами до конца откроется созданный писателем большой и прекрасный мир.

Читайте, но умейте сдерживать себя, если чтение отрывает вас от учения, от работы… Сначала учение – потом чтение. Это – закон. Ведь человек, чтобы приобщиться к великолепному миру книг, должен сначала одолеть грамоту, должен научиться читать. Каждая область знаний, будь то математика, география, физика, история или ботаника, подготавливает нас к наилучшему восприятию книг. Учитесь у героев книг любить нашу землю – её поля и леса, её города и деревни, её небо, её реки, её язык и искусство. Читайте! Пусть не будет ни одного дня, когда бы вы не прочли хотя бы одной страницы из новой книги *(по К. Паустовскому)*.

6. Выпішыце з тэксту ў адзін слупок словы, у якіх ёсць свісцячыя, а ў другі – словы, у якіх зацвярдзелыя гукі. З якім зацвярдзелым зычным няма слоў у вершы?

Не шукайце шчасця на чужыне,
Дзесьці за марамі, за гарамі,
Бо туга па дарагой Айчыне
Будзе крочыць след у след за вамі.
Не цурайцеся і роднай мовы,
Што з калыскі навучала маці,
Як для дрэва корань, так і слова
Сілу, годнасць не дае нам страціць.
Продкамі не грэбуйце ніколі,
Бо яны жыццём сваім, крывёю
Здабывалі і зямлю, і волю.
І вітайце племя маладое –
Пачалі бацькі, завершаць дзеці
Будаваць свет новы на планеце.

Э. Валасевіч

7. Выпішыце прыклады, у якіх цвёрды зычны перад мяккім вымаўляецца мякка.

КАЛЫХАНКА МАМЕ

Быць разам выпадае нам так мала…
Забудзь трывогу вечную сваю,
Прыляж, мая натомленая мама,
Як некалі ты мне, табе спяю.

Задрэмлюць вei над вачыма карымі –
Не дам упасці парушынцы я.
Сустрэнься ў сне з сабой, мая ласкавая,
З вясной сваёю, любая мая.

Хоць кропля з абяцанага нам маем
Збываецца праз мулкія гады.
Прыляж, мая даверлівая мама,
Спяю табе, як мне спявала ты.

Любоў нябёсы над табой трымае,
Любоўю зораць дні ў тваім акне.
Прыляж, мая ўсмешлівая мама,
Спяю табе, як ты спявала мне.

Н. Мацяш

8. Запішыце назвы фанетычных асаблівасцей, якія адбыліся ў наступных радах слоў:

1) калона, трыа, марскі, камп’ютар, аперэта;
2) вяснянкі, Ясенін, дзяжурны, каляровы;
3) шэраг, рэпетыцыя, жоўты, кажаш, чарга;
4) апавяданне, жыццё, Палессе, панна, суддзя;
5) ільгота, навучэнец, вастрыё, аржаны, гэты;
6) княства, Раство, студэнцтва, харaство, мноства;
7) салаўі, аўтэнтычны, казаў, паўтакт;
8) вучышся, сшытак, рэзчык, на дошцы;
9) казка, хрэсьбіны, экзамен;
10) дзень, цвёрды, камандзір, цітры;
11) апладысменты, свята, атмасфера, цвёрды.

9. Знайдзіце чацвёртае лішняе ў кожным радзе слоў:

1) дзённы, падземка, пэндзаль, подзвіг;

2) гонар, геральдыка, ганак, герой;

3) вастрыё, навука, ільгота, гісторыя;

4) бязмежны, схематычны, зменлівасць, атмасфера свята;

5) атракцыён, бібліятэка, тэатр, геніяльны;

6) герой, бельведэр, мячэць, берэт;

7) басейн, група, алея, манна.

10. Выпішыце спачатку словы, у якіх гукаў больш, чым літар, а затым словы, у якіх літар больш, чым гукаў.

А. Чароўнымі, сардэчнымі песнямі спавіта наша звонкагалосая беларуская зямля. Дзе б ні быў чалавек, дзе б ён ні хадзіў, дзе б ні ездзіў, а заўсёды ў яго сэрцы жыве родная мелодыя як успамін аб той зямлі, што ўзгадавала яго і дала ў далёкую дарогу найцудоўнейшы скарб – задушэўныя беларускія песні. Вясёлыя і сумныя, жартоўныя і працяжныя, яны нашы вечныя спадарожнікі ад бязвоблачных дзён маленства да сівізны. Яны дапамагаюць нам, старым, захоўваць духоўную маладосць, якая не баіцца сівых валасоў, а маладым дае магутныя крылы і ў кожнага выклікае энтузіязм і непахіснае перакананне ў перамозе дабра над злом, над сіламі цемры і прымусу *(Р. Шырма).*

Б. Беларускае народнае адзенне фарміравалася на працягу стагоддзяў. У святочным і абрадавым адзенні адлюстроўвалася само жыццё беларуса, яго светапогляд, адносіны да людзей. Ільняное белае адзенне спадарожнічала беларускаму селяніну ад нараджэння да канца жыцця. У беленькія пялёнкі спавівалі немаўлятка, у далікатна вышытай кужэльнай кашулі апускалі нябожчыка ў магілу.

Сама назва Беларусь, як мяркуюць некаторыя гісторыкі і этнографы, паходзіць ад таго, што ўлюбёным колерам адзення беларусаў быў белы (*М. Раманюк).*

11. Змяніце прыведзеныя словы так, каб у іх адбыліся чаргаванні гукаў.

Узор: каманд**а** – каманд**з**ір.

Эпас, фонд, архіварыус, каталог, нага, вокладка, арнамент, узор, партрэт, каманда, дарога, палёт, уздым, рука, год, горад, ільгота, апладысменты.

12. Прачытайце словы. Знайдзіце чацвёртае лішняе, характарызуючы асаблівасці беларускай фанетычнай сістэмы. Выбар абгрунтуйце.

1) трыумф, саліруеш, экспазіцыя, трыёль;
2) джаз, джэм-сэйшн, аджаць, джангл;
3) гама, гармонія, габой, гвалт;
4) падзагаловак, уздзеянне (на гледача), у гукарадзе, Вердзі;
5) пэндзаль, удзячнасць (гледачоў), дзейсны, дзьмуць (прыём);
6) спевы, скерца, свята, зменлівасць;
7) навука, вакал, шматвобразны, завочны;
8) без голасу, вяснянкі, каляндар, голасавядзенне.

13. Спішыце тэкст. Знайдзіце і падкрэсліце ў словах літары, якія адлюстроўваюць асаблівасці беларускай фанетыкі. Вусна назавіце гэтыя асаблівасці. Затранскрыбіруйце другі сказ. Вусна назавіце правілы транскрыпцыі.

А. Пры інструментоўцы фартэпіяннага клавіра неабходна ўлічваць, па-першае, асаблівасці канструкцыі фартэпіяна, да якіх адносяцца: а) ударнае паходжанне гуку і яго затухаючы характар; б) вялікі дыяпазон, рэгістравая і тэмбравая раўнавага па ўсім гукавым аб'ёме; в) значная працягласць гуку ў нізкім рэгістры і невялікая – у высокім; г) разнастайныя тэхнічныя магчымасці. Па-другое, адметныя асаблівасці фартэпіяннай фактуры маюць непасрэдную сувязь са спецыфікай канструкцыі інструмента. Фартэпіянная фактура адрозніваецца адсутнасцю вялікай колькасці галасоў, што кампенсуецца магчымасцю выкарыстоўваць правую педаль, калі, акрамя рэальных, запісаных у нотах гукаў, узнікаюць і абертоны. Такім чынам ствараецца эфект гарманічнага шматгалосся і насычанасці гучання. Пры пераапрацоўцы фартэпіяннай фактуры ў аркестравую немэтазгодна пераносіць усе педальныя гукі і абертоны літаральна *(І. Малахава).*

Б. Тэрыторыя музея (маецца на ўвазе Беларускі дзяржаўны музей-запаведнік «Менка») – месца захоўвання не толькі пераве-зеных помнікаў, але і помнікаў гісторыі і культуры мясцовага навакольнага асяроддзя. Гісторыя вёскі Строчыцы, напрыклад, цесна звязана з паўстаннем 1863 года, гэта родны край Чачотаў. Тут ёсць мемарыяльныя помнікі XIX – пачатку XX стагоддзя.

Тэрыторыя музея была выбрана з улікам гістарычнай важнасці гэтага куточка Беларусі – помнік сусветнага значэння Гарадзішча на знакамітай рэчцы Менка, шматлікія курганы і селішча. Гэтыя помнікі не могуць заставацца за межамі ахоўнай зоны музея «Менка». Музей захоўвае помнікі гісторыі і культуры, экалогіі і прыроды, археалогіі і архітэктуры *(Г. Ткацэвіч).*

14. Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго дзесяць слоў з адметнымі асаблівасцямі беларускай фанетыкі.

Знайдзіце словы з асіміляцыяй зычных, размяркуйце іх па групах:

а) асіміляцыя па мяккасці;
б) па звонкасці;
в) па глухасці;
г) асіміляцыя шыпячых да свісцячых;
д) асіміляцыя свісцячых да шыпячых.

А. Творчае жыццё мастака цяжка ўціснуць у абмежаваныя радкі публікацый і прамавугольнікі рэпрадукцый. Яно значна больш складанае і цікавае. Для гэтага кактэйлю сумненняў, пошукаў і эмоцый нават не заўсёды знаходзяцца адпаведныя выразы. У большасці мастакі – не вельмі гаварлівыя асобы, і часцей за ўсё яны сцвярджаюць, што ўсе свае думкі і пачуцці выплёскваюць на палатно ці паперу. І сапраўды, глядач, які вядзе дыялог з карцінай, інтуітыўна заўважае, што менавіта гэты твор выкананы тэмпераментным разумным аўтарам, а іншы зроблены нібы засынаючым з пэндзлем у руках кволым майстрам *(В. Дударэнка)*.

Б. НЯМА ПРАРОКА…

Беларусь мае завіднае права ганарыцца сваім Сынам, Грамадзянінам, Пісьменнікам Васілём Быкавым. Яго ведае Свет. Кнігі яго перакладзены і чытаюцца на мовах: расійскай, нямецкай, французскай, італьянскай, кітайскай, японскай… Цяжка пералічыць і ўзважыць усё напісанае Быкавым: раманы, аповесці, апавяданні, сцэнарыі, п’есы… Змест усяго ім створанага трагічна аплочаны пакутамі і ахвярамі апошняй сусветнай вайны.

З дзеючай арміяй Быкаў прайшоў Румынію, Венгрыю, Югаславію, Аўстрыю… Служыў на Украіне, у Беларусі, на Далёкім Усходзе – на востраве Кунашары. Там ён і напісаў сваё першае апавяданне. Яно няхутка ўбачыла свет. Найперш з прычыны жорсткай патрабавальнасці аўтара да самога сябе. «Ісціна знаходзілася ў занадта высокім бастыёне, каб з першага наскоку яе дасягнуць…». Ён не адступаўся ад гэтага «бастыёна».

«Трэцяя ракета», «Круглянскі мост», «Альпійская балада», «Пастка», «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца», «Мёртвым не баліць», «Сотнікаў», «Яго батальён», «Абеліск», «Кар’ер», «Дажыць да світання», «Знак бяды», «Сцяна», «Пакахай мяне, салдацік», «На балотнай сцяжыне», «Народныя мсціўцы»…

Усе гэтыя выданні зведалі нямала пакут, атрымалі нямала найвышэйшых прэмій, званняў, ордэнаў… *(А. Васілевіч).*

15. Прачытайце скорагаворкі: спачатку па складах, потым не спыняючыся, а затым бегла. Сачыце за правільнасцю вымаўлення, імкніцеся перадаць сэнс скорагаворкі. Вызначце неадпаведнасць вымаўлення і напісання слоў.

Блізка то блізка, ды каб не было слізка.
Каб не ежка ды не адзежка, было б грошай поўная дзежка.
Жвавы вожык жыва жуку пашыў кажух.
Дзятлы дзюбамі дзяўблі дзеравіну.
Уцякай цецеручыха з цецеручанятамі.
Шэсць мышанят у шалашы шамацяць.

16. Паўтарыце асаблівасці беларускай фанетыкі. Сфармулюйце тэзісы да канца і праілюструйце прыведзенымі ніжэй словамі.

1) беларускі гук [ў] паходзіць з … : лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, матыў, паўтакт, напеўка;
2) аканне – гэта моўная з’ява, пры якой … : меладычны, харавы, танальнасць, сінкапіраваць;
3) яканне – гэта моўная з’ява, пры якой … : пясняр, спявак, вячоркі, лягчэй;
4) дзеканне – гэта моўная з’ява, пры якой … : на акордзе, у эпізодзе, у музычным фондзе, на прыкладзе;
5) цеканне – гэта моўная з’ява, пры якой … : пры канкурсанце, на вакалісце, у кантрапункце, у акампанеменце, на флейце;
6) 9 падоўжаных зычных – гэта … : асяроддзе, чатырохгалоссе, музіцыраванне, трохгучча, падарожжа, вяселле, багацце (беларускай народнай песні);
7) беларускі [г] (які?) … : гастролі, музычны кругагляд, гран-пры, карагод;
8) беларускія [р] і [ч] ... : скрыпічны ключ, арыя, п’еса-папуры, рэфрэн, частка (п’есы), аранжыроўшчык;
9) 6 складаных гукаў (афрыкат) – гэта … : апладзіраваць, джазмен, цымбалы, дзынкаць, валачобнік, напеўнасць;
10) прыстаўныя галосныя, якія ўзнікаюць перад … : ільняны, аржаны, імкненне, амшары;
11) прыстаўныя зычныя, якія ўзнікаюць перад … : вушы, трохвугольнік, востракамедыйны, гэй, гэтакі;
12) поўнагалоссе: далонь, сорам, полымя, узнагарода, галава;

13) у беларускай мове [в] чаргуецца з … : калектывам – калектыў; мова – моў, моўны; кіраваць – кіраўнік, кіраўнічы;

14) заднеязычныя [г], [к], [х] чаргуюцца з … : у правай руцэ, у эпосе Адраджэння, на кнізе, у (музычнай) практыцы.

§ 2. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны адхілення ад іх

1. Паводле якой прыметы аб'яднаны зычныя гукі?

а) б, б' , г, г', Г, Г', д, дж, дз', дз, ж, з, з'
п, п', х, х', к, к', т, ч, ц,' ц, ш, с, с';

б) б, в, г, Г, д, з, к, л, м, н, п, с , т, ф, х
б, в', г', Г' , дз', з ', к', л' м' н', п', с', ц', ф', х';

в) ж, ш , ч , дж, р, ц (не ўтвораны з т);
г) дж, дз, дз' , ц, ц', ч;
д) г, г', Г, Г', к, к', х, х';
е) з, з', с, с', ц, ц,' дз'.

2. Прачытайце словы, звярніце ўвагу на вымаўленне гука [і].

1) ігры, іншы, краіна, ручаіна, вар'іраваць, аб'інець, Ільіч, салаўі;
2) ураджаі, юбілеі, звычаі, у маі;
3) музыкі іграюць, рэжысёры і рэстаўратары, вясёлы і цікавы;
4) пад іконай, суперінтэлект, спортінвентар, дэзынфармацыя, звышінтэлігентны;
5) аўторак і серада, гук і фанема, педагог і студэнт, удых і выдых;
6) імідж, інтэрпрэтацыя, імкненне, ігра, ігліца.

3. Прачытайце прыказкі, прымаўкі, загадкі ў адпаведнасці з арфаэпічнымі нормамі.

Ганарлівы ды ўпарты нічога не варты. Не памогуць і чары, як каму хто не да пары. Без шчасця не будзе багацця, а за грошы шчасця не купіш. Каб не піў ды не еў, то залатога б каня меў. Адклад не ідзе ў лад. Без рук, без галавы, а маляваць умее. Зялёная, а не луг, белая, а не снег, кучаравая, а без валасоў.

4. Прачытайце ў адпаведнасці з літаратурнымі нормамі наступныя словы.

Развітанне, свята, спяваць, песня, свядомасць, спектакль, знявага, здзек, узнікненне, світанне, з неба, снеданне, схіліцца, схітрыць, скіба, скеміць, згінуць, разгінаць, без смеху, бясхітрасны, дзверы, Дзвіна, чацвер, цвярдыня, перадсвяточны, адвезці, на першынстве.

5. Запішыце словы ў адпаведнасці з нормамі правапісу:

[грамацтва], [з’ берахчы], [займайэс’с’а], [спаччына], [дас’л’ эччык], [н ‘ас’в’ іск’і], [л’ охка], [згатка], [дыйалох], [на лаваццы], [рас’ц’ ашка], [латыск’ і].

6. Прачытайце словы, захоўваючы асаблівасці вымаўлення галосных, зычных гукаў і іх спалучэнняў.

Жыццё, выяўленчы, вобраз, падарожжа, габелен, дзеяч, аншлаг, абстракцыя, імідж, Ірына, іграць, падтэкст, падсветка, авангард, пераўвасабленне, пасведчанне, кастынг, эцюд, інтэрв’ю, бясшумны, узнімацца, спазніцца, гарнец, просьба, завязка, дасведчанне, бард, апафеоз, персанаж, вернісаж, звышімклівы, пэндзаль, святлацень, мужчынскія ролі, насмешка, салодкі, гарадскі, рыхтуешся, шчаслівы, разносчык, цвёрды, сталічны, пражскі, брыджы, экзамен, футболка.

7. Адкажыце, якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары.

Ва**кз**ал, ра**сш**ыць, жані**ць**ба, звыш**і**мклівы, па**зн**ей, **с**кінуць, лю**дс**кі, лі**ч**ба, пры вёса**ч**цы, ра**з**гінацца, **з** пятніцы, б**ез** хітрасці, не парэ**ж**ся, а**дж**ыць, **зж**аліцца, стрые**чн**ы, аб’е**зд**чык, нясві**жс**кі, вучы**шс**я, мене**дж**ар, **с**кептык, **Дз**мітрый.

8. Як у адпаведнасці з арфаэпічнымі нормамі вымаўляюцца звонкія зычныя на канцы і ў сярэдзіне слоў.

Луг, сад, дуб, казка, вораг, галубка, нізка, цяжка, холад, кніжка, важкі, лёгкі, бегчы, легчы, вывезці, сядзьце, загадка, разьба, хадзьба, адказ, падказка, мароз, звесткі, вобраз, тыраж, вернісаж, фонд, віртуоз, стэнд, гукарад, досвед, паланез, эцюд.

9. Выпішыце словы, у якіх зычныя гукі аглушаюцца. У дужках пазначце гэтыя гукі.

Узор: цяжка – [ш].

Без прынцыпу, з кішэні, з татам, з характарам, з пагардай, цераз поле, ад смеху, над сабою, над Пінскам, ад туфель, ад туману, над сцежкай.

10. Як неабходна вымаўляць глухія зычныя перад звонкімі ў наступных словах:

просьба, барацьба, носьбіт, касьба, анекдот, вакзал, экзамен, экзатычны, экзэмпляр, як быццам, як бачыш, баскетбол, футбол.

11. Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце. Параўнайце вымаўленне губных зычных гукаў у беларускай і рускай мовах.

Восемь, восемьдесят, голубь, дробь, насыпь, накипь, поступь, поставьте, прорыв, степь, семь, бьёт, верфь.

12. Як вымаўляюцца пачатковы націскны і ненаціскны гукі, абазначаныя літарай *і*, пры адсутнасці паўзы:

а) калі папярэдняе слова заканчваецца *на галосны*:
за імі, у ім, пры іх, на імху, прыгожае імя, пара ісці, з вялікімі іклямі, серабрысты іней, першае інтэрв'ю, пасыпаліся іскры, мая Ірына, яна ідзе, да інстытута, святло і цень;

б) калі папярэдняе слова заканчваецца *на зычны*:
сын і дачка, мароз і вецер, дождж ішоў, пад ігліцай, лён ірваць, перад Іванам, наш Ігнат, плод ігрушы;
в) калі папярэдняе слова заканчваецца *на г, к, х:*
выбег і стаў, бераг і рэчка, педагог і студэнт, луг і поле, аднакурснік і аднакурсніца, аўторак і серада, хвойнік і асіннік, садок і агародзік, сынок і пасынак, поспех і слава, пух і пер'е, страх і сум, удых і выдых, мох і верас;
г) у сярэдзіне і на канцы слова пасля *галосных* і *зычных*:
гаі, раі, звычаі, ураджаі, юбілеі, краіна, маімі, ручаіна, салаўіныя, Ільіч, вераб'і, вар'іраваць, аб'інець.

13. Прачытайце словы, вызначце, якія гукі абазначаюць літары *і, е, я*.

Краіна, у маі, іхні, цацкі і цукеркі, вазьму і пайду, заіграцца, паслаў ім, стары і малы, пад ільдом, ільгота, дрот іржавы, імчаць, імкненне, звышідэйны, Ізмаіл, ірыс, інтэлект, ідэал, івалга, вераб'і, вар'іраваць, Гаіці, з'явіцца, з'ехаць, уз'яднацца, раз'язджаць, аб'ява, аб'інець, ад'ехаць, ад'езд, ад Яна, раз'езд, з'ява, раз'яднаць, з'езд.

14. Патрэніруйцеся ў правільным вымаўленні некаторых зычных і іх спалучэнняў.

Вымаўленне некаторых зычных

Гукі	Вымаўленне	Прыклады
[г]	Вымаўляецца фрыкатыўна, працяжна. На канцы слова і перад глухімі аглушаецца і вымаўляецца як **[х]**	**г**арох**[ɣ],** луг **[х],** лёг**к**а **[хк]**
[Г] (выбухны)	Вымаўляецца толькі ў некаторых запазычаных словах	**г**узік**[Г], г**анак **[Г]**
[ж], [ш], [ч], [дж], [р], [ц]	У беларускім літаратурным вымаўленні заўсёды цвёрдыя	**ж**ук**, дж**эм**,** г**р**ыбы, **ч**орны і пад.
[дж], [дз'], [дз]	Вымаўляюцца як адзін злітны непадзельны гук. Афрыкаты **[дж], [дз']** на канцы слоў і перад глухімі аглушаюцца адпаведна ў **[ч], [ц'], [ц]**	**дж**ала **[дж], дз**івак **[дз'], дз**ынькаць **[дз],** калед**ж [ч],** ксёнд**з [ц],** рэд**з**ька **[ц']** і пад.
Падоўжаныя (падвоеныя) **[ж], [ш], [ч], [ц]** ды інш.	Вымаўляюцца як адзін доўгі гук	узбярэ**жж**а**[ж],** узвы**шша [ш],** лама**чча [ч], ва́нн**а **[н],** ра**сс**ыпаць **[с]** і пад.
зж [жж]:	зжоўкнуць, зжывацца, зжарыць, з жаданнем, з жартам, зжаць;	
сш, зш [шш]:	замерзшы, з шумам, праз шыбу, падвёзшы, з шышкамі, бясшумна, расшыфраваць;	
шс [с'с']:	смяешся, застаешся, вучышся, рыхтуешся, цешышся;	
жс, шс [с]:	Нясвіжскі, парыжскі, пражскі, латышскі;	
чц [цц]:	у хустачцы, на печцы, пры дачцы, па звычцы, на рэчцы, у вадзічцы;	
дч [чч], тч [ч]:	адчуць, выкладчык, дакладчык, дасведчаны; час ад часу, адчайна; лётчык, пераплётчык;	
дц [цц], [ц'ц'], тц	адцягнуць, на градцы, на кладцы, адціснуць, пад	

[цц]:	цяжарам, у палатцы, братцы, на вокладцы;
дс, тс [ц]:	гарадскі, Кіславодск, брацкі, заводскі, грамадства;
гк [хк]:	лёгкі, пругкі;
гч [хч]:	магчымасць, берагчы, дапамагчы;
зс, гс [с]:	французскі, пецярбургскі;
чн [чн]:	ручнік, сцэнічны, сталічны, яечня, смачны, але канечне/канешне

15. Растлумачце, з якімі арфаэпічнымі нормамі звязана вымаўленне зычных на стыку прыстаўкі і кораня, на стыку кораня і суфікса.

Збудаваць, збегчы, знайсці, узлесак, узбярэжжа, узнагароджанне, узрадавацца, спісаць, скінуць, сфатаграфаваць, бясхмарны, бясшумны, рассмяшыць, расцвісці, роспіс, расшнураваць, абходзіць, адбыць, адпусціць, адсыпаць, падкрэсліць, подпіс, расчасаць, прадбачыць, перадсвяточны; выкладчык, пераплётчык, суседскі, гарадскі, наводчык, лётчык, грамадскі, старасветчына.

16. Прачытайце правільна, улічваючы, што [з] і [с] перад мяккім зычным вымаўляецца мякка.

Развітанне, звер, разліць, разбіць, узнімацца, разняць, спазніцца, знікнуць, з людзьмі, з неба, з лесу, з верасня, змяць, узнікненне, змяшаць, змяя, змена; сцежачка, снеданне, чысціць, світанне, святіць, поспех, песня, рассмяяцца, разнесці, бясследна, узнесці.

17. Як вымаўляюцца шыпячыя перад свісцячымі, а свісцячыя перад шыпячымі.

Зжаць, счапляць, сшытак, перапісчык, у сутычцы, на рэчцы, у бочцы, пясчынка, адгрузчык, рэзчык, падмазчык, нясвіжскі, пражскі, смяешся, вучышся.

18. Прачытайце, запомніце запазычаныя словы, у якіх гук [г] выбухны.

Ганак, гарнец, гвалт, гірса, гонты, гуз, гузік, зацугляць, нягеглы, розгі, швагер, мазгі, агрэст, рэзгіны.

19. Спішыце, абазначце, як вымаўляюцца выдзеленыя галосныя, зычныя ці спалучэнні зычных.

Узор: з’езд [зь], згіб [з].

Рада**сц**ь, ё**сц**ь, раз**ж**аваць, ра**сш**ыфраваць, да**жджы**, прые**зджы**, пака**зч**ык, разно**сч**ык, **з ч**асам, му**жч**ынскі, ве**чн**ы, була**чн**ая, дакла**дч**ык, а**дч**уваць, а**дч**ыніць, рыхтуе**шс**я, вучы**шс**я, ма**гч**ымасць, ле**гч**ы, гара**дск**і, грама**дск**і, на пала**чц**ы, на рэ**чц**ы, а**дв**ажыць, а**д**'езд, до**кт**ар, та**кт**, **к г**ораду, **к** дзіцяці, ра**здз**ел, **з дз**едам, пра**з** зямлю, па**зн**ей, бе**з** Сяргея, шча**сл**івы, пе**сн**я, ра**сцвісц**і, **з**весткі, **с**вітанне, **с**мех, ра**с**кідаць, мін**с**кі, **дз**ве, па**д** садам, а**д** сонца, па**д** дзень, молад**зь**, роз**г**і, з **і**голачкі, н**е і**дзе, ва**кз**ал, **с**хема, лу**г**, адрэ**ж**, салод**к**і, восе**м**, про**сьб**а.

20. Як вымаўляюцца свісцячыя [з], [с] перад мяккімі зычнымі?

Смех, снег, світанне, скінуць, збегчы, схітрыць, схіліцца, згіб, сцвярджаць, след, святло, скіба, спіс, сліва, скіраваць, звіць, зліць, спектр, апладысменты, атмасфера, песня, марозлівы, пяскі, разгінаць, скеміць, няўрымслівы; звесткі з гісторыі, ліў з вядра, выехаў з лесу, зрабілі з бяроз..

21. Размяжуйце з'явы акання і якання ў прыведзеных словах.

Сакратар, канцэртмайстар, дэнамінацыя, далікатны, царква, гарманічны, танцавальны, характарыстыка, галава, грамада, высакавата, дапамагчы, галасаваць, ганарыцца, вятры, вясна, бяроза, дзяўчына, не трэба, не ведае, без вынікаў, сардэчнасць, адсвяткаваць, кнігазабеспячэнне, прысядаць, напярэдадні, сакрэт, каляндар, мячэць.

22. Прачытайце і растлумачце, чаму не заўсёды ў словах неславянскага паходжання адбываецца змена гукаў у першым складзе перад націскам.

Мелодыка, балерына, бенефіс, абанемент, вернісаж, апякун, перформанс, легенда, метро, берэт, абеліск, сезон, метровы, медаль, аперацыя, калектыў, каляндар, сяржант, мячэць, брызент, канцылярыя, рысора, цырымонія.

23. Калі змякчаюцца ці не змякчаюцца ў вымаўленні зычныя *д, т*?

Дзеці, дзверы, дзве, адвесці, ціха, цётка, цвёрды, тлець, клятве, бітве, дэлегат, медыцына, тэхніка, камандзір, гвардзеец, індзейскі, Індыйскі (акіян), білецёр, манцёр, дзюна, эцюд, накцюрн, Дзяніс, Дзвіна, Барадзіно, Таіці, Тыбет, Тэгеран.

24. Ці змяняюцца *д* і *т* прыставак (прыназоўнікаў) на дз’ і ц’, а таксама ў форме давальнага і меснага склонаў назоўнікаў на *-тва* перад мяккімі губнымі?

Пад бярозай, падмесці, ад верасу, падвязаць, падбягаць, падбел, падпяваць, пад Петрыкавам, ад Пінска, падпісаць, у Літве, у грамадстве, на брытве, Мацвей, Дзіяна.

25. Як вымаўляецца *у*/*ў* у наступных словах?

Паўза, няўжо, няўмелы, аўдыторыя, лаўрэат, аўкцыён, на ўчастку, ва ўстанове, прэзідыум, кансіліум, раўнд, клоўн, ва ўнісон, ва ўніверсітэце, ва Украіне, да Уладзіміра, да ўрокаў, за ўзгоркам, шоу-праграма, шоу-бізнес, трыумф, фаўна, архіварыус, фрау, Бернард Шоу.

26. Ці супадае напісанне з вымаўленнем:

а) *у словах, якія абазначаюць прозвішчы, імёны, геаграфічныя назвы:*
на Урале, ва Ушачы, ва Уруччы, артыстка Уланава, на рацэ Уса, па Уругваі, ва Узбекістане, на Устроні, да Уладзіміра;
б) *у запазычаных словах:*
ва ўніформе, такі ўнікальны, яна ўніверсальная, ва ўнісон, за ўніверсітэтам, Брэсцкая унія, хвалі ультрагукавыя, выбарчая урна.

27. Як вымаўляюцца спалучэнні галосных у наступных словах?

Бібліятэкар, бібліёграф, наадварот, суаўтар, алімпіяда, індывідуальны, ініцыялы, ініцыятар, дылогія, відэафільм, візуальны, акіян, акцыя, акардэаніст, аўкцыён, кіяскёр, ажыятаж, сальфеджыа, апасіяната, афіцыёз, фае, кліентура, энтузіязм, прыярытэт, аўдыя- і відэазапісы, Токіа, Ватэрлоа.

28. Прачытайце беларускія вітанні і зычанні. Звярніце ўвагу на вымаўленне зацвярдзелых зычных. Назавіце маўленчыя сітуацыі, у якіх вы можаце іх выкарыстаць, ахарактарызуйце ўзрост адрасатаў.

Узгадайце іншыя маўленчыя сітуацыі і розныя стандартныя і асабістыя выразы, якімі вы у іх карыстаецеся.

Добры дзень вам! Добры дзень! Дабрыдзень добрым людзям! Дзень добры! Добрага дня (ранку)! З панядзелкам вас (з аўторкам

вас і г. д.)! Здаровенькі! Маё вам шанаванне! Прывітанне! Вечар добры! Добры вечар вам, ці рады нам?

Будзьце жывы, здаровы! Жыві ты з Богам! Будзьце жывенькі, здаровенькі! Бывайце здаровы! Да пабачэння! Дабранач! Добрай ночы, заставайцеся здаровы! Здаровы бывайце, нас не забывайце! Пакуль! Усяго добрага! Усяго найлепшага!

ЛЕКСІЧНАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

§ 3. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання

1. Прачытайце, выпішыце словы, якія называюць паняцці са сферы культуры. Карыстаючыся лексікаграфічнымі даведнікамі, удакладніце мову-крыніцу, з якой запазычана тое ці іншае слова, а таксама семантыку слоў.

Экскурсія, студэнт, этнаграфія, градацыя, гальштук, вернісаж, прэйскурант, каталагізацыя, рыторыка, дублёр, матч, харэограф, скотч, брыльянт, амплуа, маркетынг, барэльеф, калізія, кансіліум, пэндзаль, цэнзура, журы, фуэтэ, пано, благаславенне, чало, сальфеджыа, ганак, чамадан, эўрыка, соцыум, мулінэ, араторыя, экзэмпляр, сінтаксіс, барабан, крытыка, экслібрыс, трэнінг, эліпс, віньетка, архіварыус, балетмайстар, абітурыент, культуралогія, інцыдэнт, штрудзель, рэзюмэ, рэжысёр, джаз, ваяж, юны, прэм’ера, апера, штора.

2. Запішыце да кожнага назоўніка-назвы асобы мужчынскага полу паводле роду дзейнасці па два адпаведныя назоўнікі жаночага роду, каб адзін з іх называў жонку, а другі – дачку. Прааналізуйце, ці ва ўсіх выпадках назвы асоб жаночага полу паводле сваяцтва ўтвараюцца з дапамогай адпаведных суфіксаў. Узгадайце назвы мастацкіх / фальклорных твораў, у якіх дзейнічаюць названыя асобы, кшталту «Бандароўна» – дачка бондара, паэма Янкі Купалы.

Бондар, ткач, поп, ляснік, войт, кароль, князь, цар, скрыпач, мастак, танцор, акцёр.

3. Дайце азначэнне варварызмаў і экзатызмаў, прывядзіце прыклады ахарактарызаваных моўных з’яў. Як вы разумееце наступныя выразы з

лацінскай мовы: alma mater, Memento mori? Калі словы *дранік*, *лявоніха*, *цымбалы* могуць выступаць у ролі экзатызмаў?

4. Прачытайце, вусна акрэсліце лексіка-семантычныя групы назоўнікаў, якія адносяцца да спрадвечна беларускай лексікі. Растлумачце значэнне слоў, якія складаюць групу лексікі роднасці і сваяцтва.

Вуж, веліч, мара, спёка, здрок, змрок, снягір, вабіць, туляцца, ласка, клопат, бараніць, бацька, швагер, залоўка, вячысты, ганаровы, знахар, дранікі, дзейнік, выказнік, бадзёры, гумно, адрына, лясун, ваўкалак, глог, парэчкі, ісці, араты, сейбіт.

5. Дайце азначэнне запазычаных слоў. Запішыце беларускія словы, якія ўтварыліся на базе прыведзеных слоў іншамоўнага паходжання.

Культура, язмін, бульба, шыфр, пашпарт, афарызм, метр, група, каляндар, фонд, маніторынг, каталог.

6. Прачытайце, ахарактарызуйце лексіку прыведзеных урыўкаў з пункту погляду паходжання. З тэксту А выпішыце спрадвечна беларускія словы і растлумачце іх значэнне; з тэксту Б выпішыце запазычаныя словы і растлумачце іх значэнні.

А. Пасты заканчваліся святочнымі днямі, якім спадарожнічалі абрадавыя дзействы, тэатралізаваныя прадстаўленні, гульні і шчодры святочны стол. Найбольш багатым быў стол на Вялікдзень, Радаўніцу, Сёмуху (Духа, Троіца), Спас, Дзяды, Васілле (Новы год). Прычым кожнаму святу адпавядала пэўная ежа, цэлы набор страў. У прыватнасці, на посную куццю (перад Раством) іх было не менш сямі, у тым ліку аўсяная поліўка ці кісель, хлебны квас, аладкі з мёдам ці малаком, бліны, рыба, клёцкі і, нарэшце, сама каша з мядовай сытай. На шчодрую куццю на стол падаваліся, апрача таго, разнастайныя скаромныя стравы – мяса, нярэдка смажанае парася, каўбасы, бліны з салам, боршч з мясам і інш. (*В. С. Цітоў*);

Б. Беларускі фальклор (англ. *folklore* – ʻнародныя веды’, ʻнародная мудрасць’) – сукупнасць розных відаў народнага мастацтва беларусаў, такіх як вусна-паэтычная творчасць, народная музыка, танцы, разнастайныя віды прыкладнога мастацтва, народны тэатр. Пераважна ўжываецца для абазначэння мастацтва слова – вусна-паэтычнай творчасці.

Разам з тым фальклор разумеецца не толькі як сукупнасць жанраў вуснай народнай творчасці, але і як сістэма поглядаў на навакольны свет, традыцыйная духоўная культура ў цэлым у шматлікіх яе выяўленнях. Таму фальклор знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад міфалогіі, абраднасці, мовы і г. д., а самі фальклорныя жанры разглядаюцца не толькі ў мастацкім аспекце, але і як функцыянальны складнік народнага жыцця.

На працягу многіх стагоддзяў фальклор жыў у асяроддзі сваіх стваральнікаў, чуйна рэагуючы на ўсе змены, што несла з сабой гістарычнае развіццё і ў быце, і ў светапоглядзе, і ў сацыяльных стасунках. Фальклор – мастацкі летапіс народа, але гэта толькі адна, прычым не самая галоўная яго функцыя. Ён – захавальнік працоўнага вопыту, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне, і ў той жа час узбуджальнік творчай энергіі, новых ідэй і нават пэўных тэхнічных рашэнняў, якія з цягам часу рэалізоўваліся ў адпаведных умовах. Вусна-паэтычная творчасць замацоўвала многія маральна-этычныя нормы, якія рэгулявалі адносіны людзей у грамадстве і ў сям'і. Дзякуючы гэтым нормам чалавек доўгі час жыў у суладдзі з прыродай, абагаўляў і абараняў яе, ахоўваючы тым самым сваё асяроддзе існавання. Сямейная абрадавая паэзія, шматлікія прыказкі і прымаўкі і многія іншыя творы былі накіраваны на ўмацаванне сям'і і сямейных адносін, на выхаванне новых пакаленняў у адпаведнасці з высокімі нормамі і патрабаваннямі народнай маралі *(Беларускі фальклор. Хрэстаматыя, Мінск, 1996).*

7. Спішыце тэкст. З дапамогай «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы» вызначце па 5–10 слоў спрадвечна беларускіх (падкрэсліце прамой рыскай) і 5–10 запазычаных (падкрэсліце хвалістай рыскай).

7.1. Больш як чвэрць стагоддзя працуе Ніл Гілевіч у літаратуры. За гэты час ён стварыў больш дваццаці паэтычных зборнікаў, кожны з якіх у той ці іншай меры адлюстраваў на сваіх старонках не толькі паэтычнае развіццё таленту, але час і жыццё народа, думы і парыванні грамадзяніна. Наогул трэба сказаць, што ў паэзіі Ніла Гілевіча ў вельмі выразнай форме знайшлі выяўленне грамадзянскасць, скандэнсаваная сацыяльнасць, аб чым сведчаць яго шматлікія лірычныя і ліра-эпічныя творы і асабліва ягоныя сатыра і гумар, у якіх паэт мае свой непаўторны голас, свой характэрны смех і сваю іронію. Сіла ягонай пагарды і выкрыцця такая вялікая, а смех такі з'едлівы, што часам здзіўляе ягоная здольнасць пераходу да вельмі шчырай замілаванасці, дабрыні і

пранікнёнага лірызму ў вершах і паэмах іншага характару, у лірычных творах, дзе Ніл Гілевіч паказвае зусім іншыя грані свайго таленту. Гэтыя два розныя бакі яго творчасці знітоўваюцца адной моцнай, я сказаў бы, высакароднай якасцю, якую можна вызначыць як фальклорную, вельмі народную, што ідзе з самых вытокаў беларускага жыцця, з яго нацыянальнага характару і ягонай гісторыі *(паводле В. Быкава).*

7.2. У працэсе вакальна-харавых практыкаванняў важным момантам з'яўляюцца правільныя суадносіны паміж працай над асобным навыкам ці прыёмам і аб'яднаннем гэтых навыкаў у адзіны комплекс выяўленчых сродкаў мастацкага выканання. Правільны падбор практыкаванняў дапамагае выпрацаваць і замацаваць кожны элемент паасобку, а таксама замацаваць комплекс гэтых навыкаў і ўменняў у іх сукупнасці. Неабходна ўлічваць, што нельга зводзіць практыкаванні толькі да работы над асобнымі навыкамі, так як пры гэтым будзе адсутнічаць неабходная сувязь і каардынацыя паміж імі. Аднак непрыдатным з'яўляецца і выключна цэласны падыход да вырашэння задач вакальнага навучання: вучыць адразу ўсяму, не замацоўваючы асобныя элементы голасаўтварэння. Гэта прыводзіць да адсутнасці тэхнічнай дакладнасці ў рабоце голасаўтваральнага апарату. Як жа трэба вырашаць гэтую праблему ў вакальным выхаванні навучэнцаў? Мастацтва спеваў патрабуе авалодання складаным комплексам мастацка-тэхнічных элементаў. Дасягаецца гэта шляхам фіксацыі ўвагі на канкрэтнай вакальна-тэхнічнай задачы. Пры гэтым мэтанакіраваны матэрыял, які паступова ўскладняецца, будзе спрыяць замацаванню асобных навыкаў *(паводле С. Максімава).*

7.3. Выкарыстанне трэнінгу ў навучальным працэсе пры падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці таксама абумоўлена наступнымі яго адметнымі асаблівасцямі. Па-першае, у час трэнінгу група аказвае ўздзеянне на кожнага ўдзельніка працэсу ў трох плоскасцях: пазнавальнай – удзельнік групы ўсведамляе, як яго звыклыя паводзіны і спосабы адносін дазваляюць вырашыць праблему, асэнсоўвае прычыны сваіх паводзін і разумее, як у далейшым больш эфектыўна весці сябе ў падобных сітуацыях, якія складваюцца як у пра фесійнай, так і асабістай сферах; эмацыянальнай – удзельнік трэнінгу, падтрыманы іншымі членамі групы, усведамляе свае псіхалагічныя ахоўныя механізмы, карэкціруе адносіны з іншымі, змяняе эмацыянальнае стаўленне да сябе, і, як вынік, павялічваецца яго самапавага,

стабілізуецца самаацэнка, што дазваляе яму стаць кваліфікаваным спецыялістам; паводніцкай – удзельнік групы выпрацоўвае адэкватныя той ці іншай сітуацыі спосабы паводзін у бяспечнай абстаноўцы, а не ў рэальным жыцці з яго пагрозамі, рызыкай, трывогай пра непрыемныя наступствы ў выпадку няправільнага рашэння.

Па-другое, трэнінг як форма групавой працы дазваляе выкарыстоўваць самыя разнастайныя інтэрактыўныя метады, сярод якіх дыскусійныя метады (дыскусія, метад кейсаў і інш.), гульнявыя метады (імітацыйныя, дзелавыя, ролевыя гульні), мазгавы штурм і інш. *(В. У. Рагачова).*

7.4. Сацыяльная абарона насельніцтва – адзін з найважнейшых кірункаў дзяржаўнай палітыкі ў нашай краіне. На Случчыне мэтанакіраваную работу па сацыяльнай абароне і падтрымцы розных катэгорый грамадзян праводзіць упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама. Для аказання насельніцтву сацыяльных, бытавых, рэабілітацыйных і псіхалагічных паслуг у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва працуюць аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў, кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання, сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі. 206 сацыяльных работнікаў тэрытарыяльнага цэнтра абслугоўваюць 1 819 пажылых грамадзян і інвалідаў. Яны акружаюць сваіх падапечных увагай, цеплынёй, дапамагаюць ім і справай, і добрым словам. У аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў знаходзіцца 31 чалавек, створаны добрыя ўмовы для пражывання. 24 маладыя інваліды наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання ў цэнтры, у якім дзейнічаюць гурткі па інтарэсах, рэабілітацыйна-працоўная майстэрня, арт-студыя, клубы «Надзея», «Пілігрымы», «Імяніннік». Спецыялісты аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў праводзяць работу па падрыхтоўцы да самастойнага жыцця маладых людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (*В. Бойка).*

7.5. Саломапляценне з’яўляецца адным з найбольш распаўсюджаных відаў старажытных народных промыслаў, яно займае сёння ў мастацкай прамысловасці даволі значнае месца. Здаўна ў сялянскім побыце ўжываліся самыя разнастайныя вырабы: каробкі, шыяны, сявенькі, лубкі, гарцы, лапці, капелюшы, цацкі, дэкаратыўныя аздобы. Утылітарныя вырабы – каробкі, лубкі, шыяны – ужываліся для захавання збожжа, мукі, розных рэчаў.

Незалежна ад форм і велічыні саламянага посуду ў аснове яго стварэння ляжаў адзін тэхнічны прыём – перапляценне саламянага жгута палоскай лазы ці арэшніку. Зграбныя формы, прыгожы рытмічны ўзор паверхні, які ствараўся залацістай саломкай і карычневымі палоскамі лазы, надавалі гэтым утылітарным вырабам пэўныя мастацкія якасці. Аднак найбольш выразна гэтыя якасці саломкі праявіліся ў вырабах пластычнага і дэкаратыўнага характару. З саломы рабілі розныя цацкі ў выглядзе фігур чалавека, жывёл, птушак. Шырокае распаўсюджанне набылі плеценыя шкатулкі розных форм і памераў *(М. Шкут)*.

7.6. Традыцыйна ў краязнаўчай бібліяграфіі дзіцячай літаратуры склаліся наступныя асноўныя разнавіднасці бібліяграфічных дапаможнікаў: універсальныя паказальнікі «Што чытаць пра … край»; тэматычныя; бібліяграфічныя і персанальныя краязнаўчыя даведнікі. У цэлым сістэма краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў па дзіцячай літаратуры ідзе па шляху «дарослай» краязнаўчай бібліяграфіі, хаця складальнікі і хацелі адлюстраваць спецыфіку ў тэматыцы і праблематыцы дапаможнікаў, адборы імёнаў, падзей, матэрыялаў для чытання. Да моманту перабудовы гэтая сістэма склалася (хаця і не ва ўсіх галінах) і была прадстаўлена асноўнымі тыпамі дапаможнікаў (паказальнік, спіс, агляд), а таксама іх разнавіднасцямі (памятка, размовы пра кнігі, методыка-бібліяграфічныя матэрыялы, календары знамянальных і памятных дат і інш.) *(А. Тамашава)*.

7.7. Цудоўная сцэнічная «Мяцеліца» была створана адным з патрыярхаў нацыянальнай харэаграфіі А. Рыбальчанкам у танцавальным калектыве гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў. У ёй пастаноўшчык захаваў і развіў кожны з кампанентаў фальклорных скокаў, звязаўшы іх адзінай фабулай. Матыў ныранне пар пад рукі адзін аднаму пераўтварыўся ў калейдаскоп разнастайных варыяцый на гэтую тэму. Вярчэнне за рукі пераўтварылася ў разнастайныя вярчэнні цэлых груп танцораў, якія ўтвараюць складаны дынамічны малюнак. Удала выкарыстоўваліся ў сцэнічнай пастаноўцы і традыцыйныя атрыбуты – ручнікі, роля якіх пераасэнсоўвалася. Наяўнасць жа дакладнай драматургічнай асновы сюжэтнага тыпу, трохчасткавая форма пабудовы, рэжысёрская аформленасць мізансцэн, эмацыянальнае і тэхнічнае нарастанне да кульмінацыі ў фінале – усё гэта было плёнам уласнай думкі балетмайстра, заснаванай на веданні законаў сцэны *(паводле Ю. Чурко)*.

7.8. Вывучэнне музейных прадметаў, якое ляжыць у аснове работы па камплектаванні, уліку, захаванні фондаў і кансультацыйнай работы, адначасова мае самастойнае значэнне, уключае азначэнне (атрыбуцыю), класіфікацыю і сістэматызацыю, інтэрпрэтацыю прадметаў.

Паняцце «вывучэнне музейных прадметаў» вельмі блізкае да паняцця «вывучэнне гістарычных крыніц». Адрозніваецца толькі аб'ём паняцця «інтэрпрэтацыя». Крыніцаведы-гісторыкі задачай інтэрпрэтацыі прадмета ставяць яго вытлумачэнне як крыніцу ведаў. Музеязнаўцы вытлумачваюць прадмет не толькі як крыніцу ведаў, але і як крыніцу эмоцый, як культурную каштоўнасць у цэлым, ацэньваюць атрактыўныя ўласцівасці прадмета *(паводле В. Херберта)*.

7.9. Адной з найважнейшых сфер уключэння музыкі ў мастацкае жыццё Беларусі быў тэатр. Традыцыі выкарыстання музыкі ў тэатральных пастаноўках здаўна склаліся ў еўрапейскай культуры і былі звязаны з антычнай драмай, сярэднявечнай містэрыяй і іншымі відамі старажытнага тэатра. На Беларусі гэтыя традыцыі ўвасобілі і адлюстравалі ў розных тэатральных формах – батлейцы, школьным і прыватнаўласніцкім тэатры.

Батлейка – гэта старажытны тэатр лялек, звязаны сваім паходжаннем з заходнееўрапейскімі містэрыямі. На Беларусь ён трапіў у XVI ст. Сюжэты батлейкі былі заснаваныя на біблейскай і евангельскай тэматыцы, а таксама народна-жанравых матывах. Дзеянне адбывалася ў спецыяльна пабудаваным двухпавярховым доміку з вежачкай-мезанінам, канструкцыя якога адпавядала сюжэтнай іерархіі: на самым верхнім «узроўні» разыгрываліся сцэнкі са святога пісання пра Адама і Еву, нараджэнне Ісуса, на сярэднім распавядалася пра злачынствы цара Ірада, а ў самым нізе ставіліся сцэнкі з народнага побыту *(паводле В. У. Дадзіёмавай)*.

8. Выпішыце з тэксту запазычаныя словы, падкрэсліце прыметы запазычаных слоў, адзначце, з якой мовы словы запазычаны, вусна растлумачце іх значэнне. Пры выкананні задання карыстайцеся «Слоўнікам іншамоўных слоў» А. М. Булыкі (2005).

8.1. У чым феномен творчасці нашага славутага земляка, ураджэнца Оршы? Уладзімір Караткевіч – заснавальнік беларускага гістарычнага рамана. Менавіта Караткевіч упершыню аздобіў беларускую літаратуру дэтэктыўным жанрам. Няскончаны раман пра падзеі 1863 года на Беларусі «Каласы пад сярпом тваім»,

гістарыясофскі раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» – гэта зусім новы для айчыннай літаратуры стыль мыслення, стыль выкладання, стыль пісьма… Зусім новыя і разнастайныя сюжэтныя ходы, новая гістарычная канцэпцыя, новы мастацкі рытм… Праўда і ілюзія. Упершыню ў мастацкі ўжытак шырока ўведзеныя матэрыялы хронік і летапісаў, парафразы біблейскіх тэкстаў, варыяцыі ў розных кантэкстах біблейскіх выразаў і народных выслоўяў. А «Сівая легенда», «Цыганскі кароль», «Паром на бурнай рацэ»… Можна доўга пералічаць. Глыбокае, дасканалае веданне фактаў, падзей, рэалій часу. Веданне мастацтва, этнаграфіі, архітэктуры, фальклору, літаратуры. Сусветных і беларускіх. Віртуознае валоданне сюжэтам, фабулай. І – мастацкая «рэканструкцыя» часу, сацыяльнага і побытавага каларыту, псіхалогіі людзей, самасвядомасці. Жывы подых часоў, водар жыцця. Тое, што даецца творчай інтуіцыяй, мастакоўскімі зрокам, слыхам, усімі чуццямі, культурай ведаў – і геннай памяццю, геннай культурай, генезісам маральнага «Я». Тым, што не сёння з’явілася, мела гістарычны шлях, перадавалася гадамі, стагоддзямі, у пэўных свядомасных, сітуацыйных, падзейных, сацыяльных умовах *(Н. Фенчанка)*.

8.2. Спецыяльныя практыкаванні і папеўкі падбіраюцца згодна з узроўнем пеўчага развіцця навучэнцаў і ўскладняюцца паступова ў працэсе навучання. Першай умовай сістэмы вакальна-харавых практыкаванняў з’яўляецца выхаванне свядомых адносін навучэнцаў да вучэбных задач, якія ставяцца ў працэсе практыкавання. Другой умовай сістэмы практыкавання з’яўляецца паступовае і паслядоўнае ўскладненне вучэбных задач. У працэсе практыкаванняў шлях ад простага да больш складанага, ад зразумелага, даступнага – да больш цяжкага. Новае практыкаванне павінна быць звязана з папярэднім, абапірацца на яго і рухацца далей. Трэцяй умовай сістэмы практыкавання з’яўляецца ўлік асаблівасцей самога працэсу ўтварэння навыкаў. Новая песня, новае практыкаванне, новая задача пры паўтарэнні вядомага матэрыялу, новы метадычны прыём у замацаванні навыкаў, эмацыянальнасць кіраўніка – усё гэта садзейнічае падтрыманню цікавасці ў працэсе работы. Чацвёртая ўмова – разнастайнасць заданняў, пераключэнне ўвагі навучэнцаў у працэсе практыкаванняў з аднаго практыкавання на іншае, ахоп цэлага комплексу заданняў *(паводле Т. Растаргуевай)*.

8.3. У задачы менеджара па рабоце з персаналам уваходзіць зрабіць работнікаў здольнымі да сумесных дзеянняў, надаць іх

намаганням эфектыўнасць і выніковасць, зменшыць уласцівыя людзям індывідуальныя недахопы. Асабліва цяжка працаваць з творчымі, якіх нельга прымушаць пастаянна справаздачыцца за кожны крок. На менеджару таксама ляжыць адказнасць за ацэнку работы супрацоўнікаў, вызначэнне неабходнага ўзнагароджання за вынікі работы, арганізацыю дзейнасці і кантроль за яе ажыццяўленнем, вырашэнне канфліктных сітуацый і выпрацоўку кампрамісных рашэнняў і г.д. Арганізацыя работы з персаналам уключае ў сябе выпрацоўку кадравай палітыкі, падрыхтоўку, падбор і расстаноўку кадраў, іх ацэнку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі, стымуляванне, фарміраванне і развіццё матывацыі *(паводле Г. Тульчынскага)*.

8.4. Неад'емнай часткай дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца сацыяльная падтрымка ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, асоб, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў, адзінокіх пажылых людзей і інвалідаў. Вядзецца пастаянны маніторынг сістэмы сацыяльнай, што, у канчатковым выніку, дазваляе ўдасканальваць сістэму паўсядзённай дзейнасці ўсіх зацікаўленых бакоў, павышаць яе эфектыўнасць за кошт узмацнення адраснай накіраванасці. Прадпрыемствы і арганізацыі аказвалі дапамогу ветэранам у рамонце кватэр і дамоў, гаспадарчых пабудоў, апрацоўцы прысядзібных участкаў. У рамках праграмы «Саўдзел у лёсе» ў мультымедыйным цэнтры раённай бібліятэкі адбыўся кінолекторый «Сінема – адкрытае акно». Праведзена дзевяць сустрэч, дзе інваліды мелі магчымасць пазнаёміцца з навінкамі беларускага і замежнага кіно. Людзі з абмежаванымі магчымасцямі з Лепельскага раённага таварыства інвалідаў і Расійскага таварыства інвалідаў г. Балахна Ніжагародскай вобласці на працягу года абмяркоўвалі розныя тэмы падчас чатырох скайп-канферэнцый: «Мы разам», «Сям'я – маленькая дзяржава», «Традыцыі і абрады Беларусі», «Талерантнасць». У сельскіх бібліятэках арганізоўваліся акцыі міласэрнасці «Добры дзень у вашу хату», «Мы разам з вамі»; візіт дабрыні «Перадай дабро па крузе»; гадзіна міласэрнасці «Для вас адкрыты нашы дзверы і сэрцы» *(У. Шаўчэнка)*.

8.5. Па матывах дэкору і характары кампазіцыі маляваныя дыванымі падобныя на тканыя і вышываныя насценныя дываны, але менш працаёмкія і выступалі як танны іх заменнік. На сшытае з двух кавалкаў палотнішча даматканага льнянога палатна памерамі прыкладна 1,5х2 м, афарбаванае ў чорны колер, наносілі асноўныя дэталі малюнка (часам ужывалі выразаныя з паперы трафарэты),

падмалёўку дробных дэталей і нанясенне светлаценяў рабілі ад рукі. У некаторых рэгіёнах выпрацаваліся мясцовыя варыянты кампазіцыі і дэкору. Адметнымі мастацкімі асаблівасцямі вызначаюцца маляваныя дываны поўначы Беларусі (Мядзельскі, Вілейскі раёны Мінскай, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі, Глыбоцкі, Міёрскі, Докшыцкі раёны Віцебскай вобласці). Кампазіцыя іх звычайна ўяўляе размешчаны ў цэнтры букет кветак у вазе, кошыку ці перавіты стужкай, акаймаваны па краях гірляндай з кветак і лісця або скіраванымі да цэнтра букетамі, рассыпанымі па ўсім полі. Часта ў кампазіцыю ўключаліся выявы птушак – ластавак, галубоў, паваў, зязюль, а таксама ініцыялы аўтараў ці заказчыкаў. Спарадычна па ўсёй Беларусі сустракаліся маляваныя дываны сюжэтна-тэматычнага характару, якія ў наіўна-рэалістычным стылі адлюстроўвалі сцэнкі катання на лодках, сустрэчы ці развітанні закаханых, архітэктурныя пейзажы і інш., часта ў акаймоўцы арнаментальна-раслінных узораў (творы Я. Драздовіча) *(Я. Сахута)*.

8.6. Як і асобныя людзі, што ўтвараюць грамадства, так і сацыяльныя органы, уключаючы бібліятэкі, адыгрываюць устаноўленыя ролі, прычым іх межы вызначаюцца культурай і інстытутамі, якія яе ўтвараюць. Традыцыйная роля бібліятэкі як часткі камунікатыўнай сістэмы заключаецца ў захаванні і перадачы культурнай спадчыны. Бібліятэка можа перадаваць каштоўнасці і іншых культурных сістэм – і яна, сапраўды, павінна гэта рабіць, – але калі бібліятэка вельмі адыходзіць ад сістэмы каштоўнасцей сваёй культуры, яна абавязкова апынецца ў цяжкім стане. Такім чынам, бібліятэка адлюстроўвае пэўны «светапогляд», «парадыгму», па тэрміналогіі Томаса Куна, або «імідж», згодна з Кенетам Боўлінгам *(паводле Джэса Х. Шыры)*.

8.7. У адных выпадках пастаноўшчык, які ўзяўся за распрацоўку таго ці іншага танца, ускладніў і разнастаіў рухі, якія ўваходзяць у яго лексіку, імкнучыся пры гэтым захаваць стылявыя асаблівасці арыгінала, не ўносячы ў яго іншародных элементаў. Паказальнай у гэтых адносінах з’яўляецца шмат гадоў таму сцэнічная распрацоўка Л. Алексютовіч «Полькі-вязанкі», якая бытавала ў вёсцы Лань Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Танец, які выконваўся з прыпеўкамі, атрымаў сваю назву ад спосабу пабудовы: фігуры танца спалучаюцца, «вяжуцца» жартоўнымі выкрыкамі і прыпеўкамі, змест якіх дзяўчаты ілюструюць рухамі, звяртаючыся да гледача ці адзін да аднаго. У першапачатковым выглядзе, да яе мастацкай распрацоўкі, «Вязанка» будавалася ў асноўным на

адным найпрасцейшым руху полькі. Працуючы над сцэнічнай пастаноўкай, харэограф увяла ў яе разнастайныя полечныя варыянты: «з прысядамі», «з драбушкай», «трасуху» і г.д., пабудаваўшы кожнае з кален на новым руху і не змяняючы істотна кампазіцыі прасторавага малюнка *(паводле Ю. Чурко)*.

8.8. Задачам выкарыстання музейных фондаў служаць кансультацыі, якія праводзяцца супрацоўнікамі фондавых аддзелаў. Кансультацыі палягчаюць непасрэдны доступ да фондаў супрацоўнікам дадзенага музея, іншых музеяў, архіваў, бібліятэк, работнікам навукі, мастацтва, адукацыі, навучэнцам. Яны вельмі разнастайныя.

Кансультацыі даюць агульную характарыстыку фондаў: іх зместу, складу, структуры. Такія кансультацыі часцей за ўсё цікавяць супрацоўнікаў фондавых аддзелаў музеяў, работнікаў архіваў і бібліятэк, навучэнцаў ВНУ.

Іншыя кансультацыі накіраваны на характарыстыку канкрэтнага музейнага збору, калекцыю або асобныя яе прадметы. У гэтым звычайна маюць патрэбу супрацоўнікі экспазіцыйных аддзелаў, аддзелаў навуковай прапаганды, гісторыкі-крыніцаведы *(паводле В. Херберта)*.

8.9. У адрозненне ад іншых партытур геніяльнага італьянскага маэстра, «Аіда» – манументальная опера, якая дае ўяўленне пра «вялікі стыль». У цэнтры спектакля – не толькі класічны любоўны трохкутнік (Аіда – Радамес – Амнерыс). Гэта твор пра жорсткія і трагічныя ўзаемадачыненні чалавека і дзяржавы, таму пастаноўка шматнаселеная і вялікую ролю ў ёй адыгрываюць масавыя сцэны і хары. Невыпадкова папярэдняя версія оперы, ажыццёўленая ў Мінску Ларысай Александроўскай, не сыходзіла з нашай сцэны больш за 50 гадоў. «Аіда» – спектакль-візітоўка, пастаноўка-талісман, у якой змяніліся некалькі пакаленняў выканаўцаў.

Адметнасць апошняга прачытання вердзіеўскай оперы (і гэта адразу пазіцыянавала пастановачная група) – у звароце да эскізаў дэкарацый і касцюмаў, зробленых вядомым сцэнографам, народным мастаком Беларусі Яўгенам Чамадуравым падчас пастаноўкі «Аіды» ў Бухарэсце ў 1953 годзе. Сам мастак лічыў, што перад ім «стаяла задача зрабіць вялікі парадны спектакль, прызначаны для асабліва ўрачыстых дзей» *(Т. Мушынская)*.

9. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую і вызначце асаблівасці асваення запазычаных слоў у беларускай мове.

Аккордеон, аудитория, декламировать, Григорий, архивариус, дивертисмент, жюри, дисквалификация, иероглиф, конституция, минимум, полиглот, паритет, факультет, шрифт, координация, архитектура, вернисаж, коэффициент, дискета, компьютер, библиография, абонент, автореферат.

10. Падбярыце да запазычаных слоў спрадвечна беларускія сінонімы.

Адукацыя, аранжарэя, аргумент, афарызм, аратар, аплады-сменты, аркуш, дыкцыя, рэзюмэ, маёнтак, фігура, арфаграфія, аўдыенцыя, фрукты, эксперымент, антыкварны, карэктны, вакантны, манумент, фантом, фіяска, вібрыраваць, гуманны, традыцыя, фіксаваць, інцыдэнт, аналіз, эфект, маштаб, утрыраваць, арфаэпія, архітэктар.

11. Напішыце сачыненне-мініяцюру на тэму «Мая прафесія», выкарыстоўвайце культуралагічныя агульназразумелыя і вузкаспецыяльныя тэрміны.

12. Якія назвы танцаў, музычных інструментаў можна вызначыць як словы-экзатызмы і чаму?

Каму патрэбнае «Поле-полечка»,
Каб у душы запал закіпеў,
А мне – «Купалінка»,
«Перапёлачка»,
І звон цымбальны,
І дудкі спеў.

Каму – «Лезгінка»,
«Гапак»
Ці «Хора»,
Каб у вандроўках быў лёгкім крок,
А мне найлепей,
Каб быць у гуморы, –
«Мікіта»,
«Бульба»
І «Чабарок».

Хто – стэп карнаямі агалошвае,
Хто – дудуком адгукаецца з гор.
Мая жалейка –

Зусім не горшая,
Не сапсуе паважаны хор.

Няхай дзівак ярлыкі развешвае,
Багацце ўзважвае –
Дзе чыё.
Маё – не горшае,
Хай і не лепшае.
А Богам дадзенае –
Маё.

Г. Бураўкін

§ 4. Лексіка паводле сферы ўжывання і характару маўленчых зносін

1. Прачытайце ўрыўкі з мастацкіх тэкстаў, выпішыце тэрміны і прафесіяналізмы, вусна растлумачце іх значэнне. Адзначце прычыны адхілення ад літаратурных маўленчых норм.

Чмель пузаты на басолі гучна грае, / А на йскрыпцы ёмка пчолка падсякае. / І знайшоўся мушанёнак нейкі малы, / Што званіў-такі някепска ў цымбалы *(М. Багдановіч)*;

Цяпер завея на скрыпцы грае, / Цымбалаў струны перабірае, / Дзьме ў гармонік, / Б'е ў бубен глуха *(М. Танк)*.

2. Прачытайце. Назавіце словы абмежаванага ўжытку, вызначце прычыну абмежаванага выкарыстання і адпаведна іх разрад паводле сферы ўжывання.

ХАРЧАВАННЕ Ў ПОСТ

У пост варылі *аўсяны кісель*. Мука была аўсяная – уліеш у яе цёплай вады, каб трохі падкісла, тады крухмалу, разведзенага з вадой, і падварыш. Вось і кісель. Без крухмалу ён лёгкі атрымліваецца, а з крухмалам крапчэйшы. Кісель варылі з ягад – чарніц і журавін.

Пяклі *абаранкі з картопляў*. Трэба надраць на тарку картопляў (у нас кажуць не бульба, а картопля), пакласці ў васкавік, каб сцякло, а тады выняць і дадаць трошкі мукі, солі, скруціць у каўбаску, пакласці абаранкам на бляху – і ў печ.

Бабку гаспадыні пяклі ў пост з грыбамі або сушанымі яблыкамі, сухімі ягадамі (чарніцы трэба распарыць і кінуць у драную бульбу, калі яна ўжо сцякла ў васкавіку). Раней бабку пяклі без нічога, толькі падсаліўшы.

Галушкі рабілі з тарчанай бульбы, якая сцякла ў васкавіку: накачаюць у руках кружочкі і кідаюць у гарачае малако, а ў пост – у ваду. Калі перад гэтым галушкі падпячы, то яны будуць цэленькія, а калі не падпячэш, вада становіцца густаватай, бо галушкі ў ёй разварваюцца.

З грыбоў варылі *квас*: з кіслай капусты бралі расол, туды дадавалі круп прасяных, а картопліну, морквіну і грыбы – парэзанымі кубікамі. У нядзельку самая яда – квас з грыбамі і каша. А калі яшчэ бліны ці аладкі, а то і сухары на сыроватцы спякуць, – гэта ўжо на свята або хто багаты. Тады ядуць з кісялём.

Ягадны кісель у Восаве называецца *ягодніца*. Падвараць ягады ў вадзе, тады ўліюць крухмалу з халоднай вадой, цукар па смаку. Ён застыне, а ў ім – ягады *(з часопіса «Алеся», запісана ад Т. Ф. Кавалені, в. Восава, Салігорскі р-н, Мінская вобл.).*

3. Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову. Перакажыце ў адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення. Пісьмова складзіце тлумачальны слоўнік слоў і словазлучэнняў – тэрмінаў.

БАЛЕТ

Бале́т (фр. *ballet*, от итал. *ballo* – танцую) – вид сценического искусства; спектакль, содержание которого воплощается в музыкально-хореографических образах. В основе классического балетного спектакля лежит определенный сюжет, драматургический замысел, либретто, в XX веке появился бессюжетный балет, драматургия которого основана на развитии, заложенном в музыке. Основными видами танца в балете являются классический танец и характерный танец (к характерным танцам относятся народные и национальные танцы, переработанные для исполнения в балетном спектакле). Немаловажную роль играет пантомима, с помощью которой актеры передают чувства героев, их «разговор» между собой, суть происходящего. В современном балете широко используются другие техники танца, а также элементы гимнастики, акробатики, восточных единоборств и т. п.

В начале – как объединенная единым действием или настроением танцевальная сценка, эпизод в музыкальном представлении, опере. Заимствованный из Италии, во Франции расцветает как пышное торжественное зрелище – придворный балет. Началом балетной эпохи во Франции и во всем мире следует считать 15 октября 1581 года, когда при французском дворе состоялось представление зрелища, которое принято считать

первым балетом – «Комедийный балет королевы» (или «Церцея»), поставленное итальянским скрипачом, «главным интендантом музыки» Бальтазарини де Бельджозо. Музыкальную основу первых балетов составляли придворные танцы, входившие в старинную сюиту. Во второй половине XVII века появляются новые театральные жанры, такие как комедия-балет, опера-балет, в которых значительное место отводится балетной музыке, и делаются попытки ее драматизировать. Но самостоятельным видом сценического искусства балет становится только во второй половине XVIII века благодаря реформам, осуществленным французским балетмейстером Жан Жоржем Новерром. Основываясь на эстетике французских просветителей, он создал спектакли, в которых содержание раскрывается в драматически выразительных образах *(Балет. Энциклопедия, 1981).*

4. Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову. Пісьмова складзіце перакладны слоўнічак тэрмінаў па сваёй спецыяльнасці. Растлумачце выпадкі граматычнай неадпаведнасці ў арыгінале і ў перакладзе.

4.1. ГУМАНИТАРНАЯ КУЛЬТУРА И ЕЕ ЗАКАТ

Термин «гуманитарный» («гуманитарная наука», «гуманитарное образование») был создан в XVII–XVIII вв. Он использовался, когда речь шла об образованном человеке, обладающем обширными познаниями почти во всех сферах человеческой деятельности и которому «ничто человеческое не чуждо». Предполагалось, что свои познания он приобретает, изучая «свободные искусства» и классические языки, в соответствии с подразумевавшейся в то время и подтверждаемой данными современной психологии гипотезой, что *слова усваиваются прежде, чем идеи,* и перекрывают их по содержанию. На Западе все еще по инерции доминирует эта гуманитарная концепция, под влиянием которой мы видим нашу культуру в искаженном свете. Если эта отжившая концепция все еще сохраняется в нашем сознании, то это объясняется смутно ощущаемой нами потребностью в таком типе культурного человека, который, не вдаваясь в технические частности (что лучше его сделают узкие специалисты), в полной мере и совершенстве умел бы применять на практике способности своего ума *(Н. Г. Багдасарьян).*

4.2. Жанры лирические – песенные жанры, в которых отношение к действительности выражается посредством передачи чувств, настроений, душевного состояния лирического героя.

Общепринятой жанровой классификации народной лирики нет. При классификации народных лирических песен на жанры учитываются их содержание, поэтические и музыкальные особенности, условия бытования и функции.

По условиям бытования лирические песни делятся на обрядовые и необрядовые *(К. П. Кабашников).*

4.3. Аукцион мечты. Вместо продажи вещей можно выставить на аукцион события, деятельность и возможности исполнять мечты людей: свидание со звездой кино или эстрады, охоту на рябчиков с местной знаменитостью, торжественный обед, партия в шахматы или в теннис с чемпионом, дирижирование увертюрой вместе с известным музыкантом… Участие известного аукционера, вечер с приличным угощением могут обеспечить успешное, одаренное воображением и в высшей степени прибыльное фандрейзинговое событие *(П. Г. Тульчинский).*

4.4. Содержание сферы долга раскрывается через ответственность взрослых и детей за характер жизни и нормальное функционирование семьи. Если нарушены отношения в этой сфере, то социальному педагогу следует оказать помощь в формировании нравственного сознания детей и родителей через бытовую требовательность, взаимную ответственность и уважение *(М. А. Галагузова).*

4.5. Через несколько месяцев занятий с беспризорными еврейскими детьми в Малаховке под Москвой Шагал покидает родину (в Париже его ждала мастерская с неоконченными работами, а в Берлине остались его полотна с выставки 1914 г.). Может быть, за это «благодарные» потомки в справочной литературе называют его французским художником. За границей Шагал остался самобытным художником, в творчестве которого продолжали встречаться мотивы покинутого Витебска – города детства. Он имел успех, много заказов (живописные полотна «Библейское послание» для музея в Ницце, плафон для Гранд-опера, панно для Метрополитен-опера в Нью-Йорке и театра во Франкфурте, а также грандиозные серии витражей для храмов и общественных зданий, керамическое панно, мозаики и гобелены) и постоянную тоску по родине *(С. В. Филимонова).*

4.6. В библиотечном общении важно учитывать особенности возрастных категорий читателей. В библиотеки идут и пожилые, и молодые люди. Они приходят не только за книгами, но и за общением. Нравственный долг библиотекаря – создать для людей атмосферу доброжелательности, приветливости, ласковости.

Хорошо, если каждый читатель унесет с собой тепло в душе и признательность не только за полученную информацию, но и за радость общения и понимания.

Искусству общения в библиотеке учат пока недостаточно и, как следствие этого, библиотекарь часто не умеет построить доверительный разговор, расположить к себе читателя *(Г. А. Алтухова)*.

4.7. Система классического танца складывалась путем отбора определенных положений и движений. Из множества движений человека – трудовых, бытовых и прочих – отобраны положения и движения, обладающие определенностью, законченностью, пластически раскрывающие духовный мир человека, т. е. положения и движения, представляющие эстетическую ценность благодаря своей выразительности – движения танцевального свойства. Этот процесс можно сравнить с тем, который при образовании музыкальной системы, когда из множества существующих в природе звуков были отобраны звуки особого свойства – музыкальные *(В. В. Лохенкова)*.

4.8. Подход к отбору предметов музейного значения во многом зависит от их возраста. Для предметов прошлого, давно ушедших из употребления, особенно важно определение времени их возникновения и подлинности, что позволяет судить о том, насколько они редки. Это требует знания истории видов предметов, истории применения материалов, стилистических особенностей эпох, а также знакомства с теми признаками предметов, которые удостоверяют их подлинность: с клеймами, фабричными знаками, надписями, эмблемами, монограммами, авторскими подписями – на вещественных и изобразительных предметах; с подписями, печатями, штампами, экслибрисами – на предметах *(К. Г. Левыкин, В. Хербст)*.

4.9. В 1895 г. во французском городе Бюссан был открыт Народный театр Морисом Потемером. Сценой в его театре служила открытая площадка в 15 метров шириной у склона горы, на краю луга, окруженного тремя крытыми трибунами. Две тысячи зрителей присутствовали на первом представлении. С тех пор ежегодно, в августе и сентябре, бюссанский театр устраивал по два драматических представления.

На рубеже XIX–XX вв. поиски и новации в освоении театрального пространства активно продолжаются *(Ю. М. Черняк)*.

5. Дайце азначэнне жарганізмаў як адзінак абмежаванага ўжытку, прывядзіце прыклады студэнцкага жаргону, прафесійнага, агульнанароднага жаргону. Як уплываюць жарганізмы на чысціню маўлення? У якім з функцыянальных стыляў і пры якой умове выкарыстанне дадзеных адзінак можна лічыць матываваным?

6. Прачытайце ўрывак з верша. Запішыце па-беларуску па 2–3 назвы карцін узгаданых мастакоў, выпішыце словы агульнаўжывальныя, вусна акрэсліце іх значэнне.

Я не стамляюся дзівіцца:
Эль Грэка, Рэмбрант, і Ван Гог,
І Сурыкаў, і наш Савіцкі,
Так, наш Міхась.
З іх кожны змог
Спасцігнуць сутнасць чалавека…

П. Панчанка

7. Выпішыце з тэксту запазычаныя словы і падкрэсліце ў іх прыметы запазычанасці. Адзначце, да якой лексікі (бытавой ці навуковай) адносяцца словы іншамоўнага паходжання.

7.2. Сучасны кларнет (сістэмы Бема) цалкам дасканалы інструмент, які валодае добрымі тэмбравымі якасцямі ва ўсіх рэгістрах і дастатковай інтанацыйнай дакладнасцю гукаў. Клапанны механізм гэтага інструмента сканструяваны вельмі мэтазгодна, дзякуючы чаму іграць на кларнеце сістэмы Бема (французская) больш зручна і лёгка, чым на кларнеце сістэмы Аелера (нямецкая). Кларнеты сістэмы Бема маюць істотныя адрозненні ў пабудове некаторых частак клапанна-рычажнага механізма, што звязана, перш за ўсё, з характэрным прынцыпам ігравога выкарыстання мезенцаў. Калі пры ігры на кларнеце сістэмы Аелера кожны з мезенцаў выканаўцы націскае звычайна два суседнія клапаны і робіць гэта пры дапамозе слізгальных рухаў па спецыяльных роліках, то ў кларнетаў сістэмы Бема замест «слізгальных» пераходаў выкарыстоўваецца прынцып пачарговага руху абодвух мезенцаў, кожны з якіх кіруе рухамі чатырох узаемазамяняльных клапанаў. Гэты прынцып руху з’яўляецца больш зручным і эфектыўным і забяспечвае выканаўцам найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця пальцавай тэхнікі *(паводле У. М. Гержава).*

7.3. Развіццё персаналу – гэта арганізаваны працэс вучобы супрацоўнікаў, які фінансуецца і кіруецца з мэтай змены іх асобасных патэнцыялаў, забеспячэння арганізацыйнага адзінства. Пры гэтым адукацыя супрацоўнікаў ёсць адначасова і працэс, і вынік. Адукацыя разглядаецца ва ўзаемасувязі з рэгулярнай структурызацыяй і рэструктурызацыяй арганізацыі, мэтамі навучэнцаў і станам кадравага патэнцыялу. Аб'ектамі і кірункамі развіцця персаналу з'яўляюцца тры прыярытэтныя галіны: а) персанальнае, у тым ліку кар'ера-арыентаванае развіццё (асобасны патэнцыял); б) групавое развіццё (фарміраванне кадравага патэнцыялу); в) арганізацыйнае развіццё (развіццё і рэалізацыя кадравага патэнцыялу). Калі першыя дзве галіны маюць відавочную сувязь з кар'ерай персаналу, то апошняя заслугоўвае асаблівай увагі ў кантэксце стратэгічнага кіравання персаналам *(паводле І. Бяляцкага)*.

7.4. У сацыяльнай педагогіцы паняцце «сацыялізацыя асобы», якое разглядаецца ў дыялектычнай сувязі з паняццем «выхаванне», набывае свой педагагічны змест. Некаторыя вучоныя гавораць аб выхаванні ў вузкім і шырокім сэнсе і сцвярджаюць, што ў другім выпадку яно тое самае, што і сацыялізацыя. У вузкім сэнсе выхаванне разумеецца як мэтанакіраваная дзейнасць, прызваная фарміраваць у дзяцей сістэму якасцей асобы, думак і перакананняў, як сацыяльны працэс, які складаецца з мэтанакіраваных уплываў на паводзіны і дзейнасць чалавека ўсіх выхаваўчых інстытутаў грамадства. У сацыяльнай педагогіцы пашырана разуменне выхавання як увасабленне катэгорыі «сацыяльнае выхаванне», якое разглядаецца як педагагічна арыентаваная і мэтазгодная сістэма грамадскай дапамогі, неабходная дзецям, падлеткам, моладзі ў перыяд іх уключэння ў сацыяльнае жыццё. У паняцці «сацыялізацыя асобы» знаходзіць сваё адлюстраванне катэгорыя «выхаванне», што звязана з выкарыстаннем агульнасацыялагічных падыходаў да сацыяльнай педагогікі. Пад уплывам сацыялагічных даследаванняў грамадскіх працэсаў змяняецца ўяўленне аб выхаваўчых уздзеяннях. Яны ўжо не разглядаюцца як аўтаномныя і ізаляваныя дзеянні, а як спецыфічная, але інтэгральная частка ўсёй сукупнасці сацыяльных уплываў на развіццё асобы. Паняцце «сацыялізацыя асобы» адлюстроўвае той факт, што ў любым выхаваўчым дзеянні свядомыя і мэтанакіраваныя кампаненты спалучаюцца з рознымі фактарамі сацыяльнага асяроддзя, якія ўплываюць на выхаваўчае ўздзеянне, але не з'яўляюцца самім гэтым дзеяннем. Адсюль вынікае, што ў сацыяльна-педагагічным

кантэксце суадносіны працэсаў сацыялізацыі і выхавання наступныя: выхаванне – кіруемая частка сацыялізацыі асобы *(Г. Бутрым)*.

7.5. Асноўныя якасці беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: глыбокая традыцыйнасць, яркая самабытнасць, выразнасць форм, спакойны, стрыманы дэкор, у якім пераважалі матывы сімвалічнага характару (ромб, круг, разетка, салярныя знакі, выявы раслін, жывёл і птушак). На працягу многіх стагоддзяў народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ўплывала на характар цэхавага і мануфактурнага рамяства, праца прыгонных майстроў выкарыстоўвалася ў майстэрнях і мануфактурах у гарадах, феадальных маёнтках і манастырах. Пэўныя змены ў яго характары выявіліся ў канцы XIX – пачатку XX ст. у сувязі з новымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі і адпаведнымі зменамі ў народным побыце. Развіццё капіталізму моцна паўплывала на тыя віды народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што бытавалі ў выглядзе промыслаў з выхадам на рынак. Адны з іх (набіванка, перпікарства, медніцтва) не вытрымалі канкурэнцыі з прамысловасцю і заняпалі, іншыя (ганчарства, пляценне) прыстасаваліся да новых патрабаванняў рынку і змянілі характар прадукцыі. Узрасла іх дэкаратыўнасць, у тых яго відаў, што развіваліся ў сферы хатняй вытворчасці *(Я. Сахута)*.

7.6. Пры ўмове пашырэння камп'ютарнай лабараторыі, набыцця больш сучаснай камп'ютарнай тэхнікі і перыферыі, разнастайнага і якаснага праграмнага забеспячэння, умацавання штату кафедры АБІС маладымі навукоўцамі-выкладчыкамі можна ставіць задачу стварэння рэспубліканскага міжведамаснага навукова-метадычнага і вучэбнага цэнтра па пытаннях аўтаматызацыі бібліятэчнай справы Беларусі. Гэты цэнтр мог бы таксама займацца павышэннем кваліфікацыі і перападрыхтоўкай бібліятэчных работнікаў.

Важнае месца ў падрыхтоўцы студэнтаў спецыялізацыі таксама займае вытворчая практыка ў найбуйнейшых бібліятэках Беларусі, якія маюць добрыя дасягненні ў аўтаматызацыі. Кафедрай для студэнтаў распрацавана скразная праграма вытворчай практыкі на ўвесь час навучання ва ўніверсітэце *(М. Яцэвіч)*.

7.7. Па характары размяшчэння і руху танцораў у прасторы можна выдзеліць наступныя тыпы беларускіх кадрыляў: простую, прамую, касую, крыжападобную, кругавую, лінейную, дыяганальную, у паўкруга, крывую (малюнак-дамінант руху выканаўцаў – па контуры лічбы 8). У некаторых мясцовасцях у залежнасці ад колькасці пар кадрылі называліся «тоўстымі» (8–16) і «тонкімі» (2–4). У аснове кожнай з кадрыльных разна-

віднасцей ляжаць малюнкі, характэрныя для беларускага танцавальнага фальклору: круг, крыж, весніцы, калона, зорачка і г. д. Незвычайнае багацце і хуткая змена малюнкаў і пераходаў – адна з асноўных асаблівасцей жанру. Выкананне іх патрабуе вялікай засяроджанасці ад танцора. Варта каму-небудзь наблытаць, як разбурыцца ўвесь малюнак. А калі ўлічыць, што кадрыля ў быце папярэдне не рэпеціруецца, то становіцца зразумелым: выкананне яе часам з'яўляецца выпрабаваннем на кемлівасць і лоўкасць *(паводле Ю. Чурко).*

7.8. У замку цяпер дамінаваў палац, вытрыманы ў стылі рэнесансу. На першым паверсе ён меў дзесяць скляпеністых памяшканняў, дзе размяшчаліся арсенал, канцылярыя, скарбніца і іншыя службы. Другі паверх займалі каралеўскія пакоі – парадныя і жылыя, аб'яднаныя ў тыповую палацавую анфіладу. У атыку знаходзіліся памяшканні трэцяга паверха.

Унутранай сувязі паміж паверхамі не было, кожны з іх меў асобныя ўваходы. У цэнтры галоўнага фасада знаходзілася парадная лесвіца, двух'ярусны рызаліт з аркадамі, якая вяла на другі паверх у каралеўскія пакоі. Астатнія ўваходы былі вельмі сціплыя. Уваход на першы паверх быў побач з параднай лесвіцай, а на трэці – у паўночным тарцы *(В. Царук).*

7.9. П'еса Ніла Саймана «Апошні палка закаханы» часта і парознаму іграецца на нашых сцэнах, часам – як нахабна-забаўляльная драбяза. Рэжысёр назваў свой спектакль «Час заняцца светлым бокам жыцця», каб адысці ад існуючых штампаў. Можна высечы іскру камізму з узаемаадносін мужчыны і жанчыны. Можна – іскру драматызму на грані трагедыі. Андрэй Гузій абраў іншы шлях і дамогся абсалютнай верагоднасці існавання выканаўцаў Алены Дудзіч і Рыгора Белацаркоўскага. Яны лёгка і нязмушана пераходзяць межы смешнага і сумнага, высокага і нізкага. Ён, стомлены доўгім шлюбам, шукае разнастайнасці. Яна – надзейнасці, радасці, вастрыні адчуванняў. Абое згубілі раўнавагу душы і цела. І знаходзяць яе не ў выпадковай сувязі, а ў вяртанні дадому. Рэжысёр ушчыльніў п'есу. Алена Дудзіч іграе чатырох асоб і не палохаецца рэзкіх фарбаў, бо валодае мастацтвам тэатральнай містыфікацыі. Дыяпазон яе карнавальных масак разнастайны. Рэжысёр і актрыса зыходзяць з таго, што адна жанчына можа ўтрымліваць у сабе некалькі розных асоб. Гузій дапамагае актрысе выявіць і паказаць нахабніцу, істэрычку-баязліўку, істэрычку-ханжу і, нарэшце, спакойную адданую жонку. У аснове ўчынкаў чатырох персанажаў – незадаволенасць, жаданне штосьці рэзка змяніць, паспытаць забароненае. Не атрымліваецца.

Усё ўладкоўваецца, калі аказваецца: няма жанчыны лепшай за тую, з якой пражыў многія гады. Рэжысёр ставіць спектакль аб тым, што заўсёды можна знайсці сэнс жыцця ў самім жыцці. У нашым досыць свабодным ад сямейнай адданасці свеце існуюць яшчэ свае табу і маральныя каштоўнасці *(паводле Т. Арловай).*

СІСТЭМА АРФАГРАФІЧНЫХ НОРМ У СФЕРЫ ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ

§ 5. Арфаграфія. Прынцыпы правапісу

1. Прачытайце выразна верш. Сачыце за правільным вымаўленнем галосных, зычных і іх спалучэнняў. Знайдзіце ў тэксце арфаграмы. Растлумачце, на якім прынцыпе правапісу яны заснаваны.

Белаю чаромхавай завеяй
Зноў пялёсткі бераг замялі,
Зноў у полі жыта палавее,
І Купала ходзіць па зямлі.

Ходзіць па снягах і па расе,
Заначуе ў полі або хаце, –
Ён такую спадчыну нясе,
Што не можна ні забыць, ні страціць.

Зноў Купала ходзіць па зямлі –
Па Маскве, Казані і Палессі,
То ляціць у зорным караблі,
То шукае папараць на ўзлессі.

А над полем звоняць жаўрукі,
Б’юцца ў бераг сонечныя хвалі,
І плывуць у белы свет вянкі,
Што сплялі дзяўчаты на Купалле.

Спадчына – адзіны запавет,
Спадчына – усіх асноў аснова,
І нясе цераз вякі паэт
Матчына няскоранае слова.

С. Грахоўскі

2. Спішыце тэкст. Падкрэсліце арфаграмы паводле фанетычнага прынцыпу адной рыскай, паводле марфалагічнага – дзвюма.

2.1. Прыгажосць беларускай прыроды выпрацоўвала ў беларусаў развітое эстэтычнае пачуццё, уменне адчуваць і бачыць харaство навакольнага асяроддзя. Таямнічы шум неабсяжных лясоў і бароў, загадкава-жахлівыя балоты, вялікія і малыя азёры, рэкі з цягам часу сфарміравалі ў беларусаў надзвычай багатую і дзіўную фантазію, развітую ўражлівасць, некаторую містычнасць светаўспрымання і схільнасць да абагаўлення неспасцігальных сіл прыроды. Бадай, па глыбіні пантэізму беларусы стаяць найбліжэй да асобных народаў Усходу (Індыі, Кітая, Японіі) *(Э. Дубянецкі).*

2.2. Прафесійная песня зарадзілася з развіццём музыкі, пісьмовай паэзіі. Паэтычныя тэксты песні вылучаюцца, як правіла, яснай, выразнай кампазіцыяй, супадзеннем сінтаксічных і структурных асаблівасцей, роўнасцю метрарытмічнага развіцця. Мелодыя і тэкст у большасці выпадкаў падобныя па структуры, складаюцца з роўных пабудоў – строф або куплетаў (нярэдка з рэфрэнам-прыпевам). Узаемадзеянне слова і музыкі ў песні скіравана на выяўленне агульнага характару верша, чым тлумачыцца адрозненне песеннай мелодыкі ад рамансавай. Мелодыя песні выступае як выніковае, абагульненае выяўленне вобразнага зместу, настрою верша, не звязанае з выяўленнем асобных паэтычных вобразаў, адценняў, дэталей тэксту *(Э. А. Нікалаева).*

2.3. Маркетынг – сістэма арганізацыі вытворчасці, рэалізацыі паслуг і збыту прадукцыі на аснове вынікаў інтэнсіўнага вывучэння і прагназавання попыту, цэн, шырокага выкарыстання рэкламы і стымулявання вытворчасці, прымянення сучасных спосабаў захавання і транспарціроўкі тавараў, тэхнічнага і іншага абслугоўвання спажыўцоў. Імпрэсарыа – асоба, якая арганізуе канцэрты, спектаклі, гастролі, заключае для артыстаў кантракты *(А. М. Булыка).*

2.4. Вазьміце прыказкі, прымаўкі, загадкі, успомніце прыпеўкі, абрады, традыцыі. Залатыя россыпы народнай мудрасці! Якая фантазія, трапнасць, псіхалагізм, эмацыянальнасць, выхаваўчая сіла! І гэта толькі частка народнай педагогікі, якая, як высветлілася, мае свае адметныя формы і метады выкарыстання. Мы, беларусы, ды і не толькі мы, забыліся на гэта. Што страцілі? Першааснову – азбуку душы, а з ёю – чуласць, непасрэднасць, эмацыянальную культуру і культуру пачуццяў. Адсюль – суцэльная разбэшчанасць,

прапалі цнатлівасць кахання, сорам, пасяліліся зло, гіперпрактыцызм, насілле... *(А. Сачанка).*

2.5. На Беларусі, як і ў іншых краінах, узнікненне гравюры звязана з рамёствамі, у якіх выкарыстоўваліся працэсы гравіравання: ксілаграфія з разьбой, у тым ліку на дошках для набіванкі, разцовая з ювелірнай справай, афорт з аздобай зброі. Кніжная гравюра на дрэве ўзнікла ў пачатку XVI стагоддзя ў выданнях Ф. Скарыны. У XVI–XVIII стагоддзях разам з кніжнай значнага развіцця дасягнула станковая падоўжаная («абразная») гравюра на дрэве: партрэт, пейзаж, гравюра-тэзіс, лубок. У тэхніцы ксілаграфіі працавалі П. Мсціславец, Грынь Іванавіч, Ф. Ангілейка, В. Вашчанка, П. Комар і інш. У 2-й палове XVI стагоддзя на Беларусі ўзнікла разцовая гравюра на метале (медзярыт), сярод першых твораў былі працы Т. Макоўскага. Найбольшага росквіту гравюра на дрэве і метале дасягнула ў сярэдзіне XVII стагоддзя *(В. Ф. Шматаў).*

2.6. Складанне паказальніка старадрукаванай беларускай кнігі было звязана з шэрагам цяжкасцей. Шматлікія войны на тэрыторыі Беларусі суправаджаліся свядомым ці стыхійным знішчэннем культурных каштоўнасцей і ў першую чаргу кніг. Асабліва моцна на фондах старадрукаванай кнігі ў Беларусі адбіліся вынікі дзвюх сусветных войнаў і часовай фашысцкай акупацыі. Большасць старажытных беларускіх кніг аказаліся практычна недаступнымі беларускім бібліёграфам для вывучэння іх de visu.

Акрамя цяжкасцей арганізацыйнага характару, меліся нявырашаныя навуковыя праблемы, звязаныя з беларускай кнігавыдавецкай справай XVI–XVIII стст. У прыватнасці, вельмі складана было знайсці агульны крытэрый для выдзялення беларускай кнігі з масы ўсходнеславянскіх выданняў XVI–XVIII стст. *(В. Лявончыкаў).*

2.7. Харэаграфія ўзнікла ў першабытнаабшчынным грамадстве, дзе танец выконваў шмат функцый у жыцці людзей, выяўляў эмацыянальныя пачуцці, быў цесна звязаны з абрадамі, меў магічнае, рытуальнае значэнне, служыў сродкам зносін і перадачы вопыту. Працэсы працы, рухі жывёл і птушак, падзеі рэчаіснасці, паводзіны чалавека перадаваліся з вялікім падабенствам. Паступова пластыка набывала ўмоўны характар, станавілася спецыфічным выяўленнем эстэтычных ідэалаў людзей. У харэаграфіі знаходзілі адлюстраванне пачуцці і думкі народа, асаблівасці яго нацыянальнага характару, эканамічныя ўмовы яго існавання *(паводле Ю. М. Чурко).*

2.8. Музеі ўзніклі ў той час, калі прадметы-арыгіналы, узятыя з прыроды і грамадскага жыцця, пачалі зберагаць як дакументальныя, мемарыяльныя пасведчанні і эстэтычныя каштоўнасці. Найбольш раннія сховішчы музейнага значэння – Кноскі палац на востраве Крыт (XVI ст. да н.э.). На Беларусі першыя музейныя калекцыі вядомы з шаснаццатага стагоддзя – сістэматызаваныя нумізматычныя зборы Радзівілаў у Нясвіжы, дзе была бібліятэка, карцінная галерэя, а з сямнаццатага стагоддзя – «збраёўня». У васямнаццатым стагоддзі створаны «сапежанскі збор» у Ружанах, музей і карцінная галерэя ў Полацкім езуіцкім калегіуме, шматлікія прыватныя музейныя калекцыі *(паводле Г. А. Каханоўскага).*

2.9. Першыя звесткі пра тэатральнае жыццё Мінска адносяцца да 1692 г., калі пры езуіцкім калегіуме існаваў школьны тэатр. На гарадскіх плошчах адбываліся паказы батлейкі. З канца 1770-х гг. Мінск пачалі наведваць гастрольныя тэатральныя калектывы з Польшчы. У канцы васямнаццатага стагоддзя ў Мінску сталі дзейнічаць першыя прафесійныя трупы – так званы «Камедыйны тэатр», трупа А. Жукоўскага і А. Главацкага. У 1802–1805 гг. працавала пастаянная оперна-драматычная трупа *(Энцыкл. літ. і маст. Беларусі).*

3. Перакладзіце тэкст з рускай мовы на беларускую. Знайдзіце ў перакладзеным тэксце арфаграмы. Якому прынцыпу падпарадкоўваецца напісанне гэтых арфаграм?

А. Магнатский частновладельческий театр возник в Белоруссии в середине восемнадцатого века. Функции ему придавались рекреативные и репрезентативные, а кое-где – на стадии любительской – и дидактические. В центрах магнатских латифундий он формировался всегда на основе нескольких трупп: оперной, балетной и драматической, а также капеллы, в состав которых на первых порах входили иностранные артисты, постепенно заменяемые крепостными (последних готовили собственные театральные и музыкальные школы). Одновременное выступление на магнатской сцене дворян-любителей, крепостных артистов и иностранцев (как правило, солистов) типично для последней четверти XVIII века. В отдельных придворных театрах (Несвиж, Шклов, Могилев) в конце столетия спектакли показывались артистами «вольных» коммерческих антреприз, с которыми владельцы заключали договоры на один или несколько

сезонов. Но и в этих случаях балетный состав театров, хор и основа оркестров оставались сформированными из местного белорусского населения, выходцев из крепостных крестьян и мещан.

Крупные театры в городах и местечках были близки по своему художественному уровню столичным, имели характер публичных; в Несвиже, Гродно, Слониме и Шклове на спектаклях присутствовали не только дворяне, но и представители разночинных кругов населения *(по Г. И. Барышеву)*.

Б. Издавна по всей Белоруссии бытуют разнообразные изделия, плетеные из соломы, лозы, камыша, корней. В первую очередь из этих материалов изготовляли всевозможную хозяйственную посуду для хранения зерна, муки и других продуктов. Такая утварь, хотя и предназначалась для конкретных хозяйственных целей, обращает внимание пластичностью и гармонией форм, а также ритмическим чередованием коричневых прутьев лозы или орешника с золотистым фоном соломы.

Однако наилучшим образом художественные качества этих простых и широкодоступных материалов проявились в изделиях декоративного характера. Из соломы для разной мелочи и рукоделия плели шкатулки и сундучки, украшенные традиционной витой плетенкой и выпуклыми ромбическими вставками. Плетенка обычно украшала изделие по краям или делила плоскость на прямоугольники и квадраты. Из нее же делали замок, ручки и другие детали, конфигурация которых могла быть любой, поскольку плетенка навивалась на мягкую проволоку. Свободные плоскости закрывались гладким фоном, образованным простым шахматным переплетением разглаженных соломенных лент. Гладкие поверхности приятно контрастировали с объемным спиральным рисунком плетенки. Такой же контраст образовывали выпуклые ромбические вставки *(по Е. М. Сахута)*.

§ 6. Правапіс галосных

Правапіс галосных *о, э, а*

1. Растлумачце правапіс літар *о, э, а* ў наступных словах:

1) голас–галасы, вучэнне–вучань, чорны–чарнець, поспех–паспяховы; гром–грымець, глотка–глытаць;

2) колер–каляровы, тон–танальнасць, тэма–тэматычны, акадэмія–акадэмічны; сэнс–асэнсаваць; *але:* літаратура, характар, далікатны, сакрэт; інжынер, цырымонія, канцылярыя;

3) адажыа, сальфеджыа, трыа.

2. Да наступных слоў падбярыце аднакаранёвыя так, каб літары *о, э* апынуліся не пад націскам. Растлумачце правапіс.

Хор, ачэрчваць, творчасць, крэсліць, выхоўваць, соцыум, алегорыя, конкупс, мелодыя, опера, харэограф, роспіс, жэмчуг, саломка, бяроза.

3. Устаўце замест кропак прапушчаныя галосныя, падкрэсліце арфаграмы, растлумачце правапіс.

3.1. Эст..тычны, р..дактар, т..атр, пант..он, ж..стыкуляцыя, поч..рк, Бакачы.., інт..лігенцыя, ч..рнавік, эпіт..т, майст..р, с..кр..тар, ар..шт, лат..рэя, д..макратыя, р..спубліка, кр..вавы, камп’ют..р, інт..рмецца, тэнд..нцыйны.

3.2. Піянін.., с..пран.., лібрэт.., кап..ла, палан..з, квінт..т, тры.., сальфеджы.., канц..ртмайстар, р..петыцыя, бандж.., р..зананс, д..таніраванне, к..нтрабас, постальт..рацыя, пр..содыя, трэм..л.., т..рцэт.

3.3. Імпр..сары.., менедж..р, акр..дытыў, мец..нат, д..бетаваны, кр..дытаваны, бухгалт..рскі, д..кларацыя, д..мпінгавыя, д..пазітны, інд..ксацыя, к..нсалтынг, ліц..нзійны, нер..нтабельны, р..зервовы, сам..акупнасць, т..варыства, ..квівалент, пр..зентацыя, д..намінацыя, лід..рства.

3.4. Ас..нсавана, ц..р..монія, д..лікатны, мет..далогія, д..градацыя, сіст..матычны, тр..вожнасць, д..прэсія, інд..ферэнтнасць, к..нтынгент, к..нфлікты, адр..сная дапамога, беж..нцы, інд..відуум, с..цыялізацыя, к..нстанта, р..гуляцыя, пед..гогіка, скепт..цызм, к..мунікатыўны, сл..хавы, пер..выхаванне, р..занёр, арт..даксальны, д..віянтны, р..флекс, ст..рэатып.

3.5. Ж..мчужны, р..тушаваць, д..каратыўны, партр..тыст, т..нальны, мад..ліроўка, архіт..ктура, гарм..нічны, т..ракота, бар..льеф, р..меснік, макрам.., д..кадэнцтва, к..мпаніла, Р..несанс, р..зьба, эксп..нат, барок.., м..льберт, р..како, р..стаўрацыя, мем..рыял, п’ед..стал, аквар..ліст, вер..цяно.

3.6. Абр..віятура, бібліят..казнаўства, інд..ксацыя, пр..дметны, канц..лярыя, р..ферыраванне, дайдж..ст, т..раж, хр..стаматыя,

..кслібрыс, ..підыяскоп, сіст..матызаваць, ..лемент, ..лігат, р..зервовы фонд, аўтар..ферат, бел..русіка, к..мунік..тыўны, мер..прыемства, д..кумент, ст..лаж, ф..рмат, к..р..шок, бр..шура.

3.7. Танц..вальны ..бутак, антр..ша, ар..беск, к..кошнік, б..леро, балет..манія, сц..нічны грым, выканаць ж..тэ, к..мбінаваць, кар..год, пас..добль, р..левэ, скок с..тэ, с..фіт, танц..ўшчык, тр..наж, чар..вікі, экарт.., эксп..зіцыя танца, жарт..ўлівы танец «пр..сцяк», зрабіць фу..тэ, стаць у позу эфас.., ..кзерсіс.

3.8. Ст..янкі і п..селішчы ж..лезнага веку, мат..рыяльная культура, тат..мізм, ..рнаментацыя керамікі, этн..графічны, ..кскурсіі, бер..сцяныя грам..ты, канц..выя скр..бкі, вер..цяно, пр..дметы, д..кументы.

3.9. Аўт..рская мова, аліт..рацыя, ан..нсаваць, антр..прыза, ап..феоз, буф..нада, в..дэвіль, двухс..нсоўны, д..бютант, ід..нтыфікацыя, інт..нацыя, кат..гарычны, канц..ртаваць, лак..нізм, лейтм..тыў, мел..драма, р..петыцыя, р..алістычны, р..жысёр, с..рдэчнасць.

Запомніце!

інтэлігенцыя, далікатэс, бухгалтар, рэжысёр, дырыжор, камп'ютар, экстранны

4. Запішыце словы і словазлучэнні па-беларуску, растлумачце іх правапіс. Пры неабходнасці карыстайцеся арфаграфічнымі і тлумачальнымі слоўнікамі.

4.1. Прогрессивный, режиссер, меценат, центральный, интерпретация, комедия, столица, романтизм, Реформация, проповедь, противопоставление, героический эпос, фольклор, хронология, жанровое обогащение поэзии, самоценность человека, монументальная фресковая живопись, основные представители, основоположник, особенность, предмет исследования, реальная действительность, теоретический.

4.2. Бельканто, мелодический, голосной, дрожащий звук, композитор, репертуар, дорийский лад, дополнительное проведение, концертный зал, подвижной контрапункт, контральто, новеллетта, ординарий, оратория, пикколо, побочный тон, серенада, сочинение, сопрано, многозначная тональность, попурри, хоровод, шестнадцатая пауза.

4.3. Корпоративная ответственность, предприниматель, мотивация, харизматический лидер, коммуникационный процесс,

формальные и неформальные организации, интеллектуальные и спортивные конкурсы, оповещение-анонс на телевидении, создание оптимальных условий, сценарий, литературно-художественный вечер, регулирование информационных потоков, личностные оценки руководителя, антреприза, демонополизация, компетентность, подсистемы, незапрограммированное решение, общественные отношения, конферансье, накопления, релевантная информация.

4.4. Оптимизм, коллектив, обряд, мероприятие, конфликт, компромисс, методология научного анализа социальных процессов, компетенция, депрессия, профилактика правонарушений, люди с ограниченными возможностями, зоны экологических бедствий, военные конфликты, регуляция правовых и экономических отношений человека с обществом, организация досуга молодежи, самоцель, холерик, богема, условный рефлекс, опека, вырождение, подопечный, позитивное влияние, моделирование ситуации, экстренные случаи, перевоспитание, бессердечность, поддержка, рекомендация, интерпретация.

4.5. Мольберт, офорт, горизонтальный, резчик, живопись, композиционный анализ, распространение, контрастный, акварелист, декоративно-прикладной, барокко, отображать, золотистый, эстетический, оригинал, колорист, экспонат, экспозиция, коллаж, колорит, гобелен, новатор, диссонанс, пастораль, гипостиль, черепица, горшок, переплетение, мозаика, тонкослойный, орнамент, объемный образ, ассоциация, чернение.

4.6. Картотека, книгообмен, докомплектование, рецензия, абонементная система, коэффициент соответствия фонда книговыдачи, национальная коллекция документов, классификационный каталог, выборочные указатели литературоведческих и литературно-критических работ, научно-вспомогательные указатели, выборочное аннотирование, диссертационное исследование, цензурная история текста, рукопись, критерии отбора.

4.7. Танцевальное па, адажио, аллегро, аплодисменты, болеро, балетмейстер, комбинация, композиция, гопак, диско, постановщик, подскок, реверанс, авансцена, танго, подтанцовка, тренаж, подъем на полупальцах, церемониальный марш, выбивать чечетку, экспозиция танца, координация движений, поставить балет, хоровод.

4.8. Городские укрепления, оборонительные сооружения, эллипсоподобная каменная булава, наконечники стрел, стремена и

шпоры, консервация, клиноподобный, консистенция, мозаика, шлифование, экспозиция, экспонаты, реконструировать, этнос.

4.9. Акробатический, ассонанс, бесконфликтность, браво, буффонада, водевиль, воплощение, выходная роль, гастролер, сценическое действие, жестикуляция, инсценировка, интеллектуал, исполнительское искусство, конферанс, координация, монодрама, обоснование, овация, персонаж, подъемное оборудование, театральное пространство, шутливый, эпизод.

5. Запішыце ўласныя імёны, устаўляючы замест кропак патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

Б..гатыроў, ..лоўнікаў, Ш..ўчэнка, Ш..пэн, Ш..кспір, Шч..дрын, М..льер, С..фокл, Ле..нард.. да Вінчы, Мікеланджело.. Бу..нароці, Каравадж.., Г..лсуорсі, Фіцдж..ральд, ..гюст Р..нуар, ..дгар Д..га, Генд..ль, Кальд..рон, Герц..н, Мер..жкоўскі, Гр..чанінаў.

6. Запішыце сказы, устаўляючы замест кропак патрэбныя літары. Растлумачце правапіс.

Мастацкая адукацыя ..похі Адр..джэння ў Беларусі ў гісторыка-мет..д..лагічным аспекце з’явілася пр..гр..сіўным крокам на шляху ф..рміравання цэласнай сістэмы. Р..несансная к..нцэпцыя вых..вання інт..лектуальнага ч..лавека канкр..тызавалася на нацыянальнай аснове. У рознак..нфесіянальных установах пр..гн..заваліся перспектывы новага р..зумення мастацкай адукацыі, прынцыпы ..рганізацыі якой адлюстроўвалі інт..рэсы нацыянальнай інт..лігенцыі. У эпоху Адр..джэння аказалася м..гчымым распрацаваць і абвясціць асноўныя гум..ністычныя і р..алістычныя к..нц..пцыі новай мастацка-адукацыйнай ..стэтыкі *(паводле В. П. Пракапцовай).*

Правапіс галосных *е, ё, я*

Кожнай літарай, гукам
Трапеча нязломная мова мая.
Возьмем «***е***», што мужнее
У першым пад націскам складзе.
Вырастае з яго
Наша кроўнае моцнае пруткае «***я***» –

І тады ўжо ніхто
Нас ніколі нідзе не абразіць.

У. Верамейчык

7. Да наступных слоў падбярыце аднакаранёвыя словы так, каб націскныя галосныя *е, ё* апынуліся ў першым складзе перад націскам. Растлумачце правапіс галосных.

1) спевы, веліч, апека, цёмны, вёска;
2) камедыя, элегія, метад, метр, балет.

8. Растлумачце правапіс падкрэсленых галосных у наступных словах:

1) пясняр – песняры, глядач – гледачы, зялёны – пазелянець – зеленаваты, святло – высветліць;
2) каляндар, дзяжурны, сяржант;
3) дзявяты, дзясяты, сямнаццаць, васямнаццаць;
4) келейны, кахецінскі, Герасім;
5) цяжкаваты, цягнікі, памяць, выгляд;
6) габелен, спектакль, абеліск, метровы.

9. Спішыце, устаўце прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс. Пастаўце словы ў алфавітным парадку.

9.1. Кал..ктыў, адсв..ткаваць, кал..ндары, вы..зны, суб'..ктыўны, с..рэдн..вяковы, с..нтэнцыя, абм..жаваны, ф..ерыя, ата..самліваць, зм..ншаць, л..г..ндарны, ..фрэйтар, г..ральдыка, ф..стываль, эл..менты, б..ларускі.

9.2. Сп..ваць, сп..вакі, м..лодыя, кларн..тыст, інструм..нтоўка, с..кстэт, ап..рэта, акампан..мент, голасав..дзенне, арк..строўка, пес..ннасць, інструм..нтоўка, песн..спевы, м..ламан, тэмп..рацыя, м..лізмы, пес..нная м..лодыя, с..квентнае паўтарэнне, гукавы..ўленчы, рэп..ртуар, бен..фіс.

9.3. Кам..рцыйны, заб..сп..чэнне, плац..жы, раздз..ржаўленне, рэз..рвовы фонд, цен..вая эканоміка, анк..таванне, прэз..нтацыя, інв..стыцыі, б..спрацоўе, бізн..смен, рэп..тыцыйная праца, в..чарына, персп..ктыўны, ажыцц..ўляць.

9.4. Б..схарактарны, камп..тэнцыя, індыф..рэнтнасць, фл..гматык, с..мейны, ас..роддзе, справ..длівасць, б..здапаможны, м..тодыка, ск..птыцызм, уза..мадзеянне, уздзе..нне, ас..родак, ап..кун,

св..домасць, імп..ратыўны асп..кт, м..ланхолік, хал..рычны, сентым..нтальны.

9.5. Манум..нтальны, іканапіс..ц, к..раміка, пл..нэр, пера-пл..ценне, мал..ўнічы, в..рнісаж, м..ланж, л..пніна, вы..ўленчы, дз..руга, Рэн..санс, рам..ство, дал..гляд, габ..лен, л..сіроўка, пл..ценне, персп..ктыва, медз..рыт, пас..рэбраны, зл..піць, абпал..ны, асім..трычны, п..йзаж.

9.6. Абан..мент, экз..мпляр, рэз..рвовы фонд, дыс..ртацыя, б..н..фіс чытача, б..стселер, п..раплёт, с..рвіс, г..ктограф, дз..с..тковая класіфікацыя, кал..ндар, кам..нтарый, кніга-заб..сп..чэнне, каталогав..дзенне, картатэка п..рсаналій, б..гучае кампл..ктаванне, в..дучае слова.

9.7. Бал..рына, п..рформанс, прам..над, св..тло рампы, рэв..ранс, рэп..тыцыя, трэн..р, в..нок, прыс..даць, выканаць экз..рсіс, тан..ц «Л..воніха».

9.8. Шмат в..коў, ..зычніцкі, крам..нёвы, ляднае земл..робства, п..чная кафля, раздробл..насць, ал..барда, антрапаг..нез, арнам..нтацыя к..рамікі, боны вайсковых каап..ратываў.

9.9. Арл..кін, ал..горыя, антыг..рой, аф..ктацыя, бен..фіс, в..рбальны, сп..ктакль, гл..дачы, Масл..ніца, м..лодыка, нап..рэдадні, н..праўда, н..ўдача, асв..тляльны, расчул..ны, рэв..ранс, св..домасць, трап..ткі, эф..ктыўны.

Запомніце!
абанемент, абеліск, акампанемент,
балерына, календары, навела, святкаваць

10. Запішыце прозвішчы па-беларуску.

Бетховен, Некрасов, Есенин, Микеланджело, Белыницкий-Бируля, Васнецов, Ефремов, Сервантес, Серов, Герасимов, Александров, Веласкес, Левицкий, Нежданова.

11. Перакладзіце словы і словазлучэнні з рускай мовы на беларускую, растлумачце правапіс літар *е, ё, я.*

11.1. Бесспорный, фестиваль, рекомендация, неудача, легендарный, сезон, герой, обелиск, Европа, тысяча, выяснить, поезда, праздновать, бескрайний, ненависть, щебетать, рассмеяться, спектакль, консерватория, Несвиж, архетип, любитель оперетты, оперный певец, комедийный, камерный.

11.2. Мелодика, кларнетист, увеличенное трезвучие, перспективный, песенность, инструментовка, оркестровый, дополнительное проведение, голосоведение, опера-оратория, симметричные лады.

11.3. Компетенция, распределение, мышление, релевантный, либеральный руководитель, делец, репетиция, легендарный, оповещение, бизнесмен, обменяться опытом, безработица, торговать, уровень жизни, интеллектуальная собственность.

11.4. Обязанность, беспризорник, стимулирование, обеспечение, попечитель, периферия, темперамент, методический, профессиональный, заседание, самопрезентация, проведение мероприятия, сознательное отношение, непривычный режим, успешность обучения.

11.5. Оттенить, разместить, веретено, ювелир, грифельный, ремесло, изобразительный, изображение, акварелист, световой, разрисовка, орнаментальный, стеклянный, элементы, пейзаж, эклектический.

11.6. Универсальная информация, содержательность, информирование, размежевание, подразделение, документация, комплектование, ретроспективный, полка, осуществить поиск, местные издания, книжечка, рекомендация.

11.7. Известный балетмейстер, талантливый, постановка спектакля, генеральная репетиция, современный репертуар, театральный сезон, оркестровая яма, приседать в реверансе.

11.8. Керамика, несвижский, совет попечителей музея, монументальный, инвентарный номер, музейная специфика, распределение предметов.

11.9. Сеанс, репетиция, бенуар, дивертисмент, менестрель, балерина, панегирик, трагедийный, комедийный, герой, певец, мечтатель, неблагодарный, перипетии, освещение.

12. Спішыце тэкст, устаўце замест кропак прапушчаныя літары.

А. Тэатр – адна з форм грамадскай св..домасці; мае в..лікае значэнне ў эст..тычным выхаванні. Тэатр – мастацтва сінт..тычнае, спалучае дзейсны і відовішчны пачаткі. Асноўны твор тэатральнага мастацтва – сп..ктакль. Тэатр – мастацтва кал..ктыўнае. У працэсе рэп..тыцый ствараецца сп..ктакль пад кіраўніцтвам р..жысёра намаганнямі ўсіх удзельнікаў – акцёраў, мастака-сц..нографа, к..мпазітара, харэографа, бал..тмайстра, асв..тляльнікаў,

к..сцюмераў і інш. Галоўны выразнік дзе..ння ў тэатры – акцёр, які ўвасабляе мастацкі вобраз-характ..р. Б..гучы тэатральны працэс асв..тляе тэатральная крытыка.

Беларускі народны тэатр узнік з кал..ндарных і с..мейна-бытавых абрадаў і свят. Да пачатку XX стагоддзя на Беларусі шырока бытаваў народны лял..чны тэатр батлейка, якому належыць в..лікая роля ў ф..рміраванні і станаўленні нацыянальных тэатральных традыцый *(паводле А. А. Лабовіча).*

Б. Музыцы б..ларускага к..мп..зітара, п..дагога і грамадскага дз..яча Яўгена Ал..ксандравіча Глебава ўласціва в..лікая сіла ..мацыянальнага ўздзе..ння, яскравасць і інт..нацыйнае б..гацце, зм..стоўнае напружанае развіццё, д..ск..наласць музычнай формы. К..мп..зітар самабытна пер..тварае ў творчасці народнапесенны мат..рыял. Знаўца ..ркестра, Глебаў часта карыстаецца свое..с..блівымі, нетрадыцыйнымі тэмбр..вымі сп..лучэннямі. Яго сімф..нічная музыка насычана востраха рakt..рнымі вобразамі шырокага эм..цыянальнага дыяпазону. Яго сімфоніі – творы складаных мастацкіх к..нцэпцый, якія н..суць на сабе адбітак гарм..нічнага светаўспрымання мастака. У балетах к..мп..зітар п..казаў сябе сталым драматургам, які валодае прынцыпамі сімф..нізму як мет..дам музычнага мыслення. Сп..лучэннем экспр..сіўнасці, напружанага драматызму з выт..нчанай лірыкай адзнач..на музыка для сп..ктакляў і кін..фільмаў, в..кальна-сімф..нічных твораў, уверцюр для ..ркестра б..ларускіх народных інструментаў, п’ес для ..страднага ..ркестра *(паводле Т. А. Дубковай).*

13. Падрыхтуйце вуснае паведамленне на адну з наступных тэм.

1. Першае ў жыцці наведванне тэатра.
2. Мой любімы акцёр (актрыса).
3. Тэатры майго горада.
4. Традыцыі і сучаснасць беларускіх народных рамёстваў.
5. Тэатральнае мастацтва маёй краіны.
6. Рэцэнзія на оперны спектакль.
7. Мой любімы замак Беларусі.
8. Апісанне карціны майго любімага беларускага мастака.
9. Сцэнарый да святкавання «Ночы музеяў».
10. Самы запамінальны помнік Беларусі.
11. Беларускі танцавальны фальклор на прафесійнай сцэне.
12. Сучаснае эстраднае мастацтва Беларусі.

13. Асобы і постаці беларускага балета.

Правапіс *ы, і, й* пасля прыставак

14. Прачытайце. Растлумачце правапіс *ы, і, й* пасля прыставак.

1) сыграць, абысці, безыдэйны; зайграць, прыйсці, прайгравальнік;
2) праінфармаваць, суіснаванне, заінелы, заікацца;
3) дэзынфармацыя, контрігра, панісламізм, субынспектар;
4) звышімклівы, міжінстытуцкі;
5) педінстытут, спецінстытут.

15. Запішыце словы, устаўце, дзе трэба, літары *ы, і, й.*

Раз..граць, за..нтрыгаваць, пра..снаваць, ня..начай, з..мправізаваць, контр..гра, без..ніцыятыўны, за..нець, пад..сці, вы..сце, не..снуючы, не..маверны, непр..мальны, за..мацца, аб..лгаць, без..нвентарны, звыш..ніцыятыўны, пад..граць.

16. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую.

Политинформация, проигрыватель, заискриться, сверхидейный, переиначить, сойтись, мединститут, заика, заинтриговать, поименный, наигрыш, сымпровизировать.

Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах

17. Карыстаючыся табліцай, назавіце правілы напісання спалучэнняў галосных у іншамоўных словах.

У рускай мове	У беларускай мове	Прыклады
ио	іё	бібліёграф, аксіёма, *але:* іон, Эфіопія
	ыё	патрыёт, грацыёзны, *але:* трыа
	ія	бібліятэка, віяланчэль, *але:* Іарданія
	ыя	патрыятызм, перыяд
иа	ія	піяніна, клавіятура
	ыя	варыянт, матэрыял
ие	іе	гігіена, кліентура, *але:* езуіт
	ые	арыентацыя, абітурыент
ео	ео	фразеолаг
	еа	фразеалогія, геаграфія
	эо	акардэон, ідэолаг
	эа	акардэаніст, ідэалогія
еа	еа	неандэрталец, неапалітанскі, *але:* акіян
	эа	рэалізм, ідэалізм, тэатр
йо	ё	раён, ёд, ётаваны
	я	раяніраванне, маянэз
йе	е	фае, феерверк, Емен
уа	уа	дуалізм, вуаль, візуальны

18. Растлумачце напісанне спалучэнняў галосных у наступных словах.

Ідэаграфія, сацыялагічны, геніяльны, перыёдыка, Токіа, чэмпіянат, фразеалогія, дыета, неалагізм, Нью-Ёрк, дыяменты, аксіёма, крэолка, мільярд, мільён, філіял, сітуацыя, аўдыякасета, відэазапіс, радыё, экспрэсіянізм, феерверк.

19. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

19.1. Індывіду..льны, рэ..лізм, патры..рх, І..рданія, стады..н, чэмпі..н, рэ..ліі, тры..лет, рады..цыя, бі..ніка, рады..ла, гені..льны, і..рданец, каэфіцы..нт, міль..н, зады..к, кі..скёр, фі..ска.

19.2. Рэкві..м, ві..ланчэль, вары..цыі, ню..нс, фартэпі..на, ды..пазон, гукаідэ..л, эмацы..нальны, стэрэ..тыпы, сальфеджы.., песенна-ары..зныя эпізоды, ды..тоніка, слыхавыя асацы..цыі,

узыходны тры..льны рух, капрычы.., вірту..з, спірычу..л, клаві..тура, тры.., акардэ..ніст, адажы...

19.3. Акцы..нернае таварыства, аўкцы..н, камерцы..лізацыя, ініцы..тыва, коміва..жор, негацы..нт, рэ..лізацыя, асацы..цыя, тэ..тральны калектыў, пры..рытэт, стварэнне аптымальных сацы..льна-псіхалагічных умоў, матэры..льны дабрабыт, рэперту..р, сіту..цыйны падыход, сацы..тэхнічныя падсістэмы.

19.4. Адрасная сацы..льная дапамога, ваенныя і нацы..нальныя канфлікты, ды..гностыка, індывіду..м, сацы..лізацыя, ініцы..тыва, сацы..льна-педагагічная дапамога, рэ..білітаваць, асацы..цыя, соцы..м, рэ..кцыя, змена паводзінаў клі..нта, прафары..нтацыя, рыту..л, ідэ..лізаваць, цырымані..л, інтэлекту..льны, альтру..зм, дэві..нтныя паводзіны.

19.5. Нацы..нальны мастацкі музей, ма..ліка, імпрэсі..нізм, ды..пазон танальных магчымасцей, міні..цюра, вірту..з, бідэме..р, за..фор, энкалпі..н, але..графія, кары..тыда, плагі..т, сюррэ..лізм, ню..нс, ды..грама, пале..графія, абстракцы..нізм.

19.6. Біблі..графічны, тэрытары..льна-змястоўная прымета, тэ..рэтычныя пытанні, рэгі..нальная біблі..графія, нацы..нальная прымета, функцы..нальная структура, спецы..льная тэрміналогія, індывіду..льныя асаблівасці, біблі..графазнаўства, ге..графічны каталог, біблі..тэчная паслуга, дзень спецы..ліста, дыферэнцы..цыя чытачоў, ды..пазітыў, ідэ..графічны слоўнік.

19.7. Харэ..графія, вары..цыі, фу..тэ, харэ..графічная міні..цюра, харэ..граф, ісці тварам у ды..ганаль, тры..мфальныя гастролі.

19.8. Архе..логія, архе..лагічныя знаходкі, матэры..льны, не..ндэртальцы, крамань..нцы, фе..далы, ды..дэма, маза..ка, ма..ліка.., не..літ.

19.9. Бенефіцы..нт, візу..льны, гігі..на голасу, ды..лектная мова, прэтэнцы..зны, ню..нсаваць, рады..тэатр, рэперту..р.

Запомніце!

абрэвіятура, акардэон, акардэаніст, віяланчэль, індывідуум, інтэлектуальны, нюанс, соцыум

20. Запішыце словы ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі, растлумачце правапіс спалучэнняў галосных.

1. Клавішны струнны музычны інструмент (10 літар). 2. Спіс літаратуры па якім-небудзь прадмеце, пытанні (12 літар). 3. Аматар, знаўца, збіральнік рэдкіх выданняў кніг (9 літар). 4. Літары *е, ё, ю,*

я, і, якія абазначаюць два гукі (8 літар). 5. Новае слова ці словазлучэнне, якое з’явілася ў мове для абазначэння новага паняцця (9 літар). 6. Поўны правал, няўдача (6 літар). 7. Адценне, ледзь прыкметнае адрозненне ў чым-небудзь (5 літар). 8. Спекулятыўная гарачка на біржах і рынках; моцнае ўзбуджэнне, хваляванне, барацьба інтарэсаў вакол якой-небудзь справы (7 літар). 9. Складанаскарочанае слова, утворанае з пачатковых літар; знакі скарачэння ў нотным пісьме (11 літар). 10. Храматычны гармонік з клавіятурай фартэпіяннага тыпу для правай рукі (8 літар).

Словы: абрэвіятура, ажыятаж, акардэон, бібліяграфія, бібліяфіл, ётаваныя, неалагізм, нюанс, фіяска, фартэпіяна.

21. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую, падкрэсліце спалучэнні галосных.

21.1. Материал, гениальный, радио, олимпиада, нотариат, стереотип, симбиоз, плагиат, радиоактивный, потенциал, пациент, теоретический, ассоциация, археология, диалект, приоритет, Ионическое море, спартакиада, фразеология, Неаполь, Йемен, майор, иероглифы, фейерверк, триллион, Токио, гладиатор, видеотехника, павильон.

21.2. Вариации, аэрофоны, разнообразие фортепианной техники, сольфеджио, трио, гемиолика, музыкальная историография, группа периодичностей, дуодецима, диафония, диагональная фактура, завуалированная тоника, идиофоны, интердименсиональность, коллегиум музикум, каприччио, канционалы, миксодиатоника, неофольклоризм, пианола.

21.3. Координация действий, индивидуальные способности, социальные факторы, этапы рационального решения проблемы, диагностика проблемы, региональные структуры, ситуативная модель, профессиональная ориентация и социальная адаптация в коллективе, труизм, приоритет, многонациональные корпорации, концептуальный подход, ориентации, планирование и организационное проектирование, специализация и разделение труда, клиентура.

21.4. Социальный контроль личности, реабилитационный центр, демиург, педагогическая диагностика, реагировать, проблемная ситуация, конфиденциальность, социализация, самореализация, реабилитация личности, инициативный, социокультурная сфера, стереотипное поведение, материальное благосостояние семьи, индивидуальность, диалог, ориентация, патриархально-общинная семья, эмоциональный, валеология.

21.5. Миниатюра, ионический ордер, фиолетовый, неоклассицизм, диарама, мемориальный комплекс, реалистически отображенный, мозаика, венецианская школа живописи, эмоциональное напряжение, чувство материальности, идеализированный пейзаж, традиционные направления, майолика, постимпрессионизм, абстракционизм, антиэстетизм, дадаизм.

21.6. Территориальные подразделения региональной библиографии, реализация, библиографический указатель, Национальная библиотека Беларуси, специализация, аббревиатура, библиотековедческие дисциплины, актуализация каталога, акционерная библиотека, классификационный индекс, аудиовизуальные материалы, библиографоведение, биографический словарь, информационные ресурсы, гигиена фонда.

21.7. Музыкально-ритмическая координация, застыть в позе круазе, поставить балет на сцене театра, приседать в плие, сделать фуэте, демиплие, пуанты, пируэт.

21.8. Палеолит, феодальный, визуальный, эмоциональная выразительность экспозиции, проектирование экспозиции, аудиовизуальные средства, музейные олимпиады и конкурсы.

21.9. Амплуа, апофеоз, бенуар, марионетка, гистрион, импрессарио, координация движений, неактуальный, просцениум, тривиальный.

22. Пры спісванні ўстаўце прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне спалучэнняў галосных.

А. 1. Рэнесансная канцэпцыя выхавання інтэлект..льнага чалавека, выяўлення яго індывід..льнасці праз хрысц..нска-гуманістычныя каштоўнасці і ід..лы канкрэтызавалася на нац..нальнай аснове. 2. У Віленскай ..зуіцкай акадэміі, дзе Сім..н Полацкі атрымліваў адукацыю, курсы п..тыкі і антычнай культуры грунтаваліся на фундаментальных працах М. Сарбеўскага. 3. Асновай фарміравання рэперт..ру маглі стаць музычныя нотныя зборнікі XVI–XVII стст. 4. Пэўную ролю ў распаўсюджванні мастацкіх ведаў адыгралі панс..ны, росквіт дзейнасці якіх прыпадае на 20–50 гады XIX ст. 5. Па ініц..тыве Габрыэля Грубера т..тральны і галоўны корпусы Полацкага ..зуіцкага калег..ма злучаюцца яшчэ адным корпусам, дзе размяшчаецца аздобленая фрэскамі карцінная галерэя *(В. П. Пракапцова).*

Б. У т..рэтычную распрацоўку пытанняў архітэктуры ўнёс істотны ўклад рымскі архітэктар і інжынер I ст. да н. э. Вітрувій. Узніклі новыя тыпы пабудоў, напрыклад базілікі, амфіт..тры,

тэрмы, тр..мфальныя аркі, акведукі. Амфіт..трамі называліся спец..льныя эліпсападобныя пабудовы, дзе арганізоўваліся глад..тарскія бойкі і іншыя масавыя відовішчы. Рымскія храмы нагадвалі грэчаскія сваёй прамавугольнай формай і выкарыстаннем порцікаў, аднак былі больш гранд..знымі і звычайна будаваліся на высокіх под..мах. У архітэктуры рымляне звычайна прымянялі тры грэчаскія архітэктурныя ордэры – дарычны, ..нічны і карынфскі *(Э. Дубянецкі)*.

23. Перакладзіце ўласныя імёны з рускай мовы на беларускую, растлумачце правапіс спалучэнняў галосных.

Берлиоз, Бокаччо, Иоланта, Венецианов, Анакреонт, Макиавелли, Фиораванти, Палладио, Леонардо да Винчи, Тициан, Рафаэль, Хиеронимус Босх, Делакруа, Шатобриан, Труайон, Леонкавалло, Голсуорси, Хемингуэй, Ларионов, Дионисий, Лоэнгрин.

Правапіс галосных у складаных словах

24. Назавіце асновы складаных слоў, растлумачце правапіс злучальных галосных.

-а-	Дабр**а**я́касны, крас**а**мо́ўны, салом**а**пляце́нне, ільн**а**тка́цкі, шкл**а**пла́стык
-о-	час**о́**піс, кур**о́**дым, святл**о̀**ўсто́йлівы, ільн**о̀**прадзе́нне, шкл**о̀**тканіна́
-я-	жыццяздо́льны, сярэдня**я**ве́чча, агня**я**ды́шны, земл**я**тру́с
-е-	жыццесцвярджа́льны, сярэдн**е**вяко́вы, вогн**е**ўсто́йлівы, земл**е**ўла́снік

25. Растлумачце правапіс літар *о* і *а* ў першай аснове складаных слоў.

О	А
выс**о̀**каадукава́ны шыр**о̀**кадасту́пны п**о̀**ўнагало́ссе	выс**а**каро́дны шыр**а**катва́ры п**а**ўнагу́чны
м**о̀**вазна́ўства, в**о̀**камгне́нна, ф**о̀**ндасхо́вішча, в**о̀**даўсто́йлівы, п**о̀**ўнаўла́дны	лапатападобны
ф̀отавыстаўка (але: фатагра́фія), **шт̀о**ра́ніцы, **м̀от**акро́с (але: матацы́кл), **свò**еасабліві, **прò**цілеглы, **кòнтр**ігра́, **грòс**ма́йстар, **дзевянòст**аго́ддзе, **пòст**рэалізм,	**аўдыя**касе́та, **вела**спо́рт, **відэа**матэрыя́лы, **ста**гадо́вы **кіна**фестыва́ль, **неа**рэалізм, **стэрэа**магнітафо́н, **электра**гіта́ра, **псеўда**навуко́вы,

словаўтварэнне, **мова**знаўства, **пост**мадэрнізм	**адна**галосна, **адзіна**ўладдзе
п**о́**ўдзень, п**о́**ўнач	п**а**ў**а́**ркуша, п**а**ў-М**і́**нска

26. Растлумачце правапіс галосных у першай аснове наступных складаных слоў:

1) Н**а**ваполацк – Н**о**валукомль,
п**а**літэхнікум – п**о**літэхнічны,
р**а**знапланавы – р**о**знабаковы;
2) мовазнаўца, фотастудыя, фатограф, мотагонкі, восемсот, старублёвы, своечасова, кінастужка, штогод, постсавецкі, процідзеянне, паўстагоддзя, паў-Беларусі, апоўначы;
3) сацыякультурны, палітагляд, гарана;
4) шэсцьсот, мэтазгодна, сэрцабіццё, шэравокі.

27. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

27.1. Ч..рнавокі, св..ечасова, р..знастайны, д..ўгавечны, д..ўгатэрміновы, шт..дзень, жыцц..сцвярджальны, мн..галюдны, мн..гавяковы, ст..тысячны, п..стмадэрнізм, стэрэ..фільм, відэ..тэлефон, в..камгненна, к..лерамузыка.

27.2. П..ўнагалоссе, аўды..касета, п..ліфанізацыя, п..лігармонія, г..ласавядзенне, м..натэматызм, інструм..нтазнаўца, к..нтрапункт, чатыр..хгалоссе, р..знагалоссе, песн..спевы, т..мпарытм, к..нтрскразное дзеянне, р..знастайнасць ф..ртэпіяннай тэхнікі, мн..гасастаўнасць, тр..хгучча, н..таграфія.

27.3. Сам..рэалізацыя, т..лекарпарацыя, рады..кампанія, м..тазгодны, ст..гадовы, кін..зорка, вол..выяўленне, ус..беларускі, Еўр..бачанне, к..міваяжор, выс..камастацкі, шт..тыднёвік, гр..смайстар, супр..цьдзейнічаць, сп..ртзала, неплац..жаздольнасць.

27.4. Д..бразычлівы, жыцц..дзейнасць, д..брасуседскія адносіны, ш..сцігодкі, п..ўнапраўны, жыцц..радасны, кін..сеанс, с..мігадовы, стэрэ..тыпы, д..брасумленны, сацы..культурны, пр..ціграмадскі, рады..пастаноўка, нап..ўкультурны, н..рвовахворы, шт..сутачна, выс..каўрачысты, в..льнадумства, д..брачынны, н..д..бранадзейнасць.

27.5. Р..знакаляровы, в..гнеўстойлівае шкло, д..ўгашэрсны, в..гнетрывалая гліна, кам..неапрацоўка, ільн..валакно, літ..графія, т..нкаслойныя заліўкі, пар..шкападобныя фарбы, ік..награфія, хр..малінаграфія, п..ўаркуша, святл..адчуванне, г..радабудаўнічы,

ф..тапейзаж, в..ўначасальны, в..ўначоска, т..нкапрадзенне, ф..таграв'юра, чырв..нагліністы, нап..ўільняны, бав..ўнапрадзільны.

27.6. Ф..ндасховішча, ф..таілюстрацыя, суп..рвокладка, гр..сбух, кал..нтытул, катал..гавядзенне, кін..ф..тадакумент, кніг..забеспячэнне, м..награфія, мікр..фільмавы селектар.

27.7. Балет..ман, бал..тмайстар, ф..ртэпіяна, харэ..графія, танцы лацін..амерыканскай праграмы, в..страсатырычны.

27.8. Помнікі ранняга Сяр..днявечча, ляднае (падсечнае) земл..робства, эліпс..падобная каменная булава, в..страканечнік, пацеркі лім..нападобныя, адн..тыпныя вырабы, рэшткі п..ціграннай вежы.

27.9. Ав..нсцэна, інт..рмедыя, т..атразнавец, міл..гучны, уза..маадносіны, нап..ўголаса, выс..камастацкі, гук..перайманне, к..снаязыкасць, м..надрама, рады..пастаноўка.

28. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую, растлумачце правапіс.

28.1. Разновидность, фотообъектив, ежечасно, мототурист, стомиллионный, девяностолетний, своевременно, контрмеры, целесообразно, телекамера, домовладелец, вольнодумец, долгожитель, многоопытный, новомодный, высокосортный, вольнолюбивый, нововведение, языковед, простонародье, столетие, политехнический, полиграфия.

28.2. Полифонический, метроритмично, темообразование, разнообразие, общенаучный, самореализация, общепрофессиональный, многосоставность, разнообразные приемы, своеобразие стиля, однотональный период, четырехголосный канон, жанровые контрапункты, микроинтервалика.

28.3. Законодательство, высокохужественные произведения, законопроект, короткометражка, долгосрочный кредит, многообещающий, остросюжетный, вольнонаемный, своекорыстный, киноконцерт, ежеминутно, столетний юбилей, контрагент, кинофотолаборатория, социотехнические подсистемы, художественная самодеятельность, неплатежеспособность, самоокупаемость, ценообразование.

28.4. Простодушие, домосед, острословить, нововведенный, законопослушный, новобранец, краткосрочный, ежевечерне, контрпропаганда, своевременная поддержка, полиглот, самоанализ, профилактика правонарушений, благотворительная деятельность, студенческое самоуправление, самоцель, красноречие,

жизнеутверждающая позиция, сурдопедагогика, самореализация, взаимосвязь индивидов.

28.5. Метод многослойных прописок, иконописцы, средневековая живопись, линогравюра, хромолинография, монохромия, разноцветные, светоощущение, фотопейзаж, градостроительный, высокохудожественные образцы, взаимосвязанные ансамбли.

28.6. Электрография, эпидиаскоп, транслитерация, суперэкслибрис, фонд звукозаписей, еженедельник, ежемесячный журнал, микрофильмирование, научная монография, книгообеспечение, кинофотодокумент, библиотековедение, библиографоведение, книгавыдача, полифункциональный, краеведение, вышеупомянутые, лев-толстовский стиль, нижеподписавшиеся, документоведение, великодержавный.

28.7. Балетомания, высокохудожественное исполнение, балетмейстер, концертмейстер, хореографическая миниатюра, одновременно, полифонический, остросовременная экспрессия, танцевать под фонограмму.

28.8. Первобытнообщинный строй, этноопределяющие предметы, полуполтинник, архивохранилище, серебряный бочечкообразный кубок, клинообразный, кремнеобрабатывающая мастерская, картографирование, пятигранная башня, остроконечник, однотипный, эллипсоподобный, раннее Средневековье.

28.9. Аванзал, красноречивый, кукловод, мелодекламация, мировоззрение, многоголосие, многозначительный, моноспектакль, самопожертвование, сценическое самочувствие, рукопожатие, шароподобный, перекати-поле, сорвиголова, благородный, косноязычие, фотосессия, благотворительность, метафарично-образный, зигзагообразный, легкомысленный образ, сценический полилог, широкоформатный фильм, «Белорусьфильм».

29. Ад наступных спалучэнняў слоў утварыце складаныя словы, падкрэсліце арфаграмы.

Сцвярджэнне самога сябе, роўныя правы, добрыя суседзі, сто галасоў, шырокі маштаб, падобны на шкло, будаваць дамы, многа жанраў, кароткі час, выстаўка фатаграфій, парушаць закон, сорак год, высокі даход, высокай пробы, высокага гатунку, вострая сатыра, высокая прадукцыйнасць, рэклама кіно, вытворчасць кінафільмаў, тонкія бровы, здольнасць да жыцця, тонкае валакно, часаць воўну, апрацоўваць воўну, тонкія сцены.

Правапіс прыстаўных і ўстаўных літар

30. Прачытайце словы. Растлумачце наяўнасць ці адсутнасць прыстаўных галосных.

Імкліва, ільняны, іржышча, аржаны, пад ільдом, білеты льготныя, адно імгненне, заржавець, памчацца, зардзецца, абылгаць.

31. Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс слоў.

Над ..ржаным полем, на ..льняным ручніку, рух і ..мкненне, тканіна ..рвецца, ..ржавы цвік, за..мшэлае дрэва, па..мчацца насустрач, ..мжэў дождж, лясныя ..мхі, адно ..мгненне.

32. Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс.

Льготы, львята, на льдине, мгновенный, заржавленный, рдеть, рваный, лжесвидетельство, мглистый, льноводство, рваться, стремительно.

33. Прачытайце словы. Растлумачце наяўнасць ці адсутнасць прыстаўных зычных. Назавіце формы слоў / словы, што прапушчаны ў круглых дужках.

1) вочы (памяншальна-ласкальная форма), вобраз (форма множнага ліку), воблака (форма множнага ліку), вучань (форма множнага ліку), навука (працэс авалодвання ведамі), вугал (адносны прыметнік), вожык (назва маладой істоты ў множным ліку), возера (адносны прыметнік), восень (адносны прыметнік), воспа (прыметнік у форме непаўнаты якасці), вуда (дзеяслоў);
2) учора, улада; умацоўваць, удвух; наогул; Орша, Вольга, Тадэвуш, чарнавокі, наваколле;
3) опера, уверцюра, універсітэт, оптыка, офіс, ода, одум, окаць, урна, вустрыца;
4) гэты, адгэтуль, гэй, гэтакі.

34. Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

1. На..учэнец – той, хто на..учаецца, ..учыцца ў старэйшых класах сярэдніх школ і ў сярэдніх спецыяльных на..учальных ..становах. 2. Упершыню ..уверцюра ўзнікла ў Італіі як ..уступ да ..оперы (..опера «Арфей» К. Мантэвердзі ў 1607 г.). 3. У архітэктуры барока і класіцызму ..окны былі прама..угольныя, арачныя, паўцыркулярныя, падковападобныя і г. д. 4. У адрозненне ад на..укі, якая адлюстроўвае рэчаіснасць пры дапамозе лагічных абагульненняў, мастацкі ..образ раскрывае яе ў канкрэтна-пачуццёвай форме. 5. Вялікую мастацкую каштоўнасць маюць малюнкі ..углём, зробленыя Мікеланджэла, Леанарда да Вінчы і іншымі майстрамі Адраджэння. 6. Прынцыпы ..урбанізму выкладзены ў горадабудаўнічай тэорыі французскага архітэктара Ле Карбюзье. 7. Мастакі часта выкарыстоўваюць прыродную мінеральную фарбу жоўтага або чырвонага колеру – ..охру. 8. Шматлікія дзеячы эпохі Адраджэння валодалі ..універсальнымі ведамі. 9. Вядомыя ..учоныя напісалі свае ..одзывы на новую на..уковую працу па культуралогіі. 10. У ліпені праводзяцца ..уступныя экзамены на за..очнае аддзяленне ..універсітэта.

35. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую, запішыце, растлумачце правапіс.

Ультрамарин, заострить, область, улица, угольник, ордер, униатство, заузить, оперетта, паук, уникальный, власть, утопический, умбра, убор, узел, оперный, орган, отблеск, этак, унисон, устойчивость, ударные инструменты, отзвук, вообще, эй, серьги, вокруг, ода, обложка, огненный, Ольга, Урал, Омск, Орёл, Родион, Люблинская уния, Оскар Уайльд, уния, универсальный.

§ 7. Правапіс зычных. Правапіс *ў* (у нескладовага)

1. Растлумачце правапіс літар *у* і *ў* у наступных словах і словазлучэннях:

1) настаўнік, вышыўка, танцаваў, маляваў, уздоўж і ўпоперак, працуе ў тэатры, паўночна-ўсходні, акварэль «Вясна» ўпрыгожыла выставу, каля ўнівермага, паўза, лаўрэат, аўдыенцыя, ва ўніверсітэце;

2) за Уралам, Галіна Уланава, каля Ушач;

3) Люблінская унія, кансіліумны, натарыус, калёквіум, баул, ток-шоу, Бернард Шоу, фрау, данеслася уханне, Штраус.

2. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс.

Слова «..ніверсітэт» .. перакладзе з лацінскай мовы азначае «сукупнасць». .. Рымскай імперыі ім называлі групу людзей, аб’яднаных па віду дзейнасці (карпарацыі майстро.., рамесніка..) з мэтай абароны сваіх інтарэса... У XI–XII стст. ..ніверсітэт прадста..ля.. інтарэсы навуко..ца.. перад гарадской і царко..най ..ладамі, дава.. навуко..цам пэ..ныя юрыдычныя і эканамічныя прывілеі. З часам слова «..ніверсітэт» замацавалася за гільдыяй выкладчыка.. і ст..дэнта... Сама ж навучальная ..станова .. XII–XV стст. пачала абазначацца тэрмінам «stadium generale». І толькі пачынаючы з XV ст. .. Германіі (а потым .. Францыі, Англіі, Італіі) ..ніверсітэтамі альбо alma mater пачалі называць не толькі аб’яднанні студэнта.. з выкладчыкамі, але і навучальныя ..становы.

Універсітэт бы.. незалежнай, а..таномнай ..становай, ме.. права вучыць ..сіх і ..сяму. ..ніверсітэты вучылі ..ніверсальным перадавым ведам і былі адкрыты для студэнта.. і навуко..ца.. ..сіх краін. Ст..пень бакала..ра давала магчымасць стаць асістэнтам магістра, а ст..пень магістра і доктара – права чытаць лекцыі ва ..ніверсітэце. Па-за ..становай акадэмічныя ступені не давалі ніякіх пераваг. Але з цягам часу ст..пень становіцца крытэрыем кваліфікацыі навуко..ца і ..лічваецца пры назначэннях на свецкія і духо..ныя пасады. ..ніверсітэцкая адукацыя становіцца адной з ..моў павышэння сацыяльнага стат..су чалавека і права займаць пэ..ную пасаду. .. сувязі з гэтым студэнты былі вельмі заціка..лены .. атрыманні веда.., яны самі выбіралі дысцыпліны, прафесара.., кантралявалі дзейнасць выкладчыка.. з дапамогай штрафа...

Ва ..сіх е..рапейскіх краінах ..ніверсітэт выконва.. аднолькавыя функцыі: забяспечва.. развіццё і перадачу веда..., а таксама навуча.. метадам іх атрымання. Навучанне вольным мастацтвам (спачатку вывуча..ся трыві..м: граматыка, рыторыка, логіка; потым квадры..м: арыфметыка, геаметрыя, астраномія, тэорыя музыкі) патрабавала значных высілка.., пэ..най арганізацыі працэсу навучання і ..я..ляла сабой падрыхто..чы курс (факультэт вольных мастацтва..) для авалодання .. будучым вучонай прафесіяй .. галіне права, рэлігіі і медыцыны на адпаведных трох факультэтах *(паводле М. Л. Кузьмініча).*

Запомніце!

аўдыторыя, аўкцыён, калёквіум, лаўрэат, ноу-хау,

паўднёва-ўсходні, паўза, шоу, шоумен

3. Перакладзіце словы і словазлучэнні з рускай мовы на беларускую, растлумачце правапіс. Пры неабходнасці карыстайцеся слоўнікамі.

3.1. Белорусский государственный университет культуры и искусств, аудитория, умышленно, наугад, аудиенция, журнал «Полымя» впервые опубликовал, триумф, аквариум, в Узбекистан, времена князя Всеслава Чародея, пошли в кино, мавзолей, лауреат, вакуум, радиус, фауна, контрольно-учетная комиссия, река Уса, белорусско-русский словарь, Брестская уния, коллоквиум, в «Избранные произведения» вошли все поэмы автора.

3.2. Соул, исполнитель, музыковед, трактовка, оркестровка, нюансировка, мотив, распев, инструментовка, пауза, симфоническая увертюра, запевное построение, квартово-октавная система, секвентное повторение, поет в тональности, субмотив, виртуоз, играет в стиле блюз, новый уникальный коллектив исполнителей, саундтрек, темообразование.

3.3. Аккредитив, аукцион, в учреждениях культуры, безналичный, бухгалтерский учет, котировка, ваучер, договоренность, коллективный, ноу-хау, ставка, ценообразование, безработица, руководитель, частная собственность, обслуживание, потребители в учреждениях культуры, создание условий, представитель, многоуровневая структура, распространитель, эффективность, корпоративная, авторитарный, во власти, адаптация в коллективе.

3.4. Душевное состояние, система отношений, тяжелые внутрисемейные отношения, индивидуум, социальные условия, охранять здоровье, детская аудитория, рецидив, социум, информационная взаимосвязь индивидов, красноречие, демиург, инсценировка, интерактивное обучение, позитивное влияние, воспитательный процесс, это условный рефлекс, классно-урочная система, коллоквиум, автоматизм.

3.5. Изобразительное искусство, декоративный, зарисовки, заливки, обесцвечивать, разрисовка, краска ультрамарин, автопортрет, вышивка, групповщина, пол-листа, реставрация, энкаустика, мгновенное впечатление, в урбанизме, таревтика, надо усовершенствовать, художники-умельцы, новая униформа.

3.6. Автограф автора книги, заинтересованность текстом, читательская аудитория, заполнять формуляр, обслуживать читателей, инкунабула, диспут в библиотеке, рубрика в газете, повесть «Дрыгва» взволновала юных читателей, в университете,

владеет уникальной коллекцией редких книг, газета «Звязда» в библиотеке.

3.7. Триумф отечественной балетной школы, лауреат международных конкурсов, виск вперед и назад, партнерша в бальных танцах, постановка балета, режиссер-постановщик, танцовщик, протанцовка, балетная увертюра, на полупальцах, застыла в позе арабеск, присели в реверансе, пуститься в пляс, участвовать в соревнованиях по бальным танцам, Галина Уланова, приняли участие в шоу.

3.8. Архивариус, симпозиум, инструментарий ремесленников, много музеев, расстановка экспонатов на стеллажах.

3.9. Вслух, инсценировка, монтировка декораций, нараспев, смысловая пауза, перевоплощаться, саундтрек, звукообразование, послесловие, припевка, речевой аппарат, речитатив, участвует в спектакле.

Напісанне спалучэнняў зычных

4. Запішыце словы, растлумачце напісанне спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса.

1) радасны, позна, сонца, шчаслівы, сэрца, міласэрны, баластны, кантрасны;
2) студэнцкі, выдавецтва, мастацтва, ткацкі;
3) беларускі, прыгоства, хараство, мноства;
4) Шміт, Рэмбрант, Шырвінт.

5. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Праяз..ны, ненавіс..ны, аблас..ны, постсаве..кі, вус..ны, аген..тва, чыта..кі, пос..ны, няшчас..ны, мно..ства, неміласэр..на, аванпос..ны, аспіран..кі, адэс..кі, карыс..ны, хіс..нуцца, браз..нуць, антыфашыс..кі.

6. Перакладзіце з рускай мовы на беларускую, растлумачце правапіс спалучэнняў зычных.

Капустник, комплектный, свистнуть, форпостный, контекстный, комплексно, компетентный, мстительный, корыстный, выездной, беспощадно, изъявительное наклонение, безвыездно, Кронштадт,

форштадт, собственность, застлать, художественный, качественно, количественный.

7. Ад прапанаваных слоў утварыце назоўнікі з дапамогай суфіксаў *-ств-* або *-чын-* , растлумачце правапіс спалучэнняў зычных.

Княжыць, Полацк, асветнік, хораша, Мінск, сваяк, птах, многа, Слуцк, таварыш, Брэст, настаўнік, чалавек, мастак.

8. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

Даследчы..кі, універсітэ..кі, юна..кі, намес..нік, рас..ліна, аванпос..ны, блі..часты месяц, ні..чымніца, праро..тва, чэс..на, ро..чына, у..чуваць, за..чабятаць, рамесні..кі, бескарыс..ны, пачэс..ны.

Запомніце!

кантактны, комплексны, ландшафт, маштаб, неміласэрны, помслівы, пяшчотны, расчодрыцца, ушчэнт

Правапіс прыставак на *-з (-с)*

9. Растлумачце напісанне літар *з* і *с* у прыстаўках.

1) с**к**азаць, ус**п**омніць, бес**с**мяротны, ус**х**од, цераса**п**алосіца, рас**т**рывожыць; з**б**ерагчы, уз**б**егчы, бязм**е**жны, раз**г**ледзець, празм**е**рны, уз**р**адавацца; сарганізаваць, сыходзіць (з ганка), сыграць, сэканоміць;

2) зымправізаваць, зыначыць, зыходзіць (з меркавання).

10. Утварыце новыя словы з дапамогай прыставак, растлумачце правапіс:

1) ***з/с:*** практыкаваць, вязаць, майстраваць, расходаваць, гуртаваць, фатаграфаваць, фарміраваць, чысціць;

2) ***раз/рас:*** глядзець, вучыць, крытыкаваць, маляваць, працаваць, пачаць, зброя, трывога;

3) ***без/бес:*** вынік, кампраміс, голас, дапамога, канец, сістэма, характар, аварыя, поспех, зварот, адказ, клопат, тэрмін.

11. Устаўце прапушчаныя літары ў прыстаўках, растлумачце правапіс.

11.1. Ра..сыпаць, ..ціхнуць, ра..кацісты, ..бліжаць, у..край, ра..кінуцца, ра..тупацца, ра..станне.

11.2. Ра..меркаванне інструментаў, ..мешаны хор, ..тварэнне, за..пяваць.

11.3. Бе..наяўны ра..лік, ра..дзяржаўленне, бе..працоўе, ..тварэнне ўмоў, узаема..вязанасць фактараў, у..нагароджанне, ра..меркаванне рэсурсаў.

11.4. Бе..характарны, бе..дапаможны, ..мена паводзінаў, у..прыманне, бе..ыніцыятыўны, ра..чараванасць.

11.5. Ра..маляваць, ..тварыць, ..лепак, ра..цяжка, ра..паўсюджванне, у..прыманне, ..мяшаць фарбы, ра..фарбаваць, абе..каляроўваць, ..чарніць.

11.6. ..фармуляваць, ..мешчаны, ра..працаваны, ..прошчаны, ..находзіцца.

11.7. У..дым на паўпальцах, ..рабіць фуэтэ, ..тварэнне вобраза.

11.8. Феадальная ра..дробленасць, ..найсці, ра..мяшчаць на стэндах.

11.9. Бе..канфліктнасць, бя..чулы, у..бадзёрыць, у..буджэнне, у..дзеянне на гледача, у..хапіцца, у..трывожыць, небе..падстаўны, небе..паспяховы, ра..вязка.

Правапіс *д – дз’, т – ц’*

12. Растлумачце напісанне *д – дз’, т – ц’* у наступных словах:

1) свята – на святе, сады – у садзе, глядзець, цёмны, дзіця, дзюба;

2) сцвярджаць, чацвёрты, дзверы, подзвіг, *але*: падвезці, у таварыстве;

3) тэматыка, дырыжор, тэатр, дэбют, латынь – лацінскі, камандзір, білецёр, індзейскі, апладзіраваць;

4) эцюд, дзюна, *але*: авантура.

13. Запішыце спрадвечна беларускія словы, устаўце прапушчаныя *д – дз’, т – ц’*.

На..ея, мола..ь, ..весце, на..вячорак, у мовазнаўс..ве, а..ведаць, пра..весне, ..веры, развод..е, пя..ьдзясят, сем..есят, ча..вер, у кля..ве, ..вёрдасць, а..вячоркам, ..ірван, асярод..е.

14. У словах іншамоўнага паходжання ўстаўце прапушчаныя літары, растлумачце правапіс *д – дз’, т – ц’*.

Ст..мул, д..зайн, д..канат, ак..ыўны, д..фіцыт, блакно..ік, д..ктафон, д..рэктар, ат..стацыя, від..акліп, бар..юр, сана..іна, гвар..ейскі, увер..юра, аплад..сменты.

Запомніце!
дзвесце, камандзіроўка, накцюрн,
пэндзаль, роўнядзь, цемрадзь

15. Перакладзіце словы спецыяльнай лексікі з рускай мовы на беларускую, растлумачце правапіс.

15.1. Дисплей, декабрист, студеный, театр, гвардеец, актер, пройти, мотив, ноктюрн, шедевр, омертвелый, где-нибудь, коллектив, тенденция, кисть, командировка, радикальный, митинг, листва, диплом, засветиться радостью, медь, телевизор, дирижер, титул, антипод, президент, теплеть.

15.2. Мелодия, аккордика, партитура, мелизматика, септима, прелюдия, монотематизм, хроматизм, скандирование, архитектоника, квинтет, динамика, тарантелла, терция, интерпретация, темпоритм, мелодика, диапазон, орнаментика, кантилена, декламация, музыка для телепостановок, каватина.

15.3. Акциз, платежи, котировка, дивиденды, дилер, демпинговые цены, депозит, инвестиции, консалдинг, лицензия, холдинг, рейтинг, хозяйственная деятельность, субсидия, принципы управления, политические факторы, ситуативная модель, лидер, продюсер.

15.4. Неординарность, диагностика проблем, деградация личности, компетенция, депрессия, индифферентность, контингент, трудности, профилактика, интуиция, инстинкт, флегматик, коммуникативный, девиантный, интерпретировать, позитивное влияние, тематическая программа, эмпатийность, рутина, стимулирование, инфантилизм, волонтер, императивный аспект, стереотипное поведение, компрометировать, мотивация, моделирование ситуации.

15.5. Темпера, техника, декоративность, диапазон, моделировка формы, картина, архитектура, композиция, терракота, мастихин, пастель, оттенок, примитивистские тенденции, декоратор, переплетение, интерьер, триптих, батик, диорама, пьедестал, дизайнер, портретист, растяжка, авангардист, этикетка, этюд.

15.6. Диспут, диктофон, дифференцированное обеспечение, диапозитив, дезидератор, дескриптор, заинтересованность текстом,

иллюстрация, инициал, инструкционно-методический лист, интерфейс.

15.7. Национальный балетный театр, пластика движений, концепция творчества, танцевальный квартет, квинтет, философско-эстетический, поэтика модерна, современные тенденции хореографии, сатирический, техника.

15.8. Теория музейного дела, взаимодействие, методика, научное документирование, периодизация, материальные ценности, систематизация, экспедиция, экспертиза, стеллажи, нумизматический.

15.9. Сценический костюм, аплодисменты, актер, актерский, акробатика, авансцена, амфитеатр, антигерой, античная драматургия, артикуляция, аффектация, билетер, динамика, дебютант, дебютировать, действо, сценическое действие, гротеск, действующее лицо, декламатор, декорационное искусство, дикция, жестикулировать, инсценировка, интерпретация, интермедия, натуралистический, пародировать.

Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных

16. Растлумачце напісанне падоўжаных і падвоеных зычных.

1) Палессе, стагоддзе, жыццё, палоззе, падарожжа, узвышша, аблічча, жаданне, вяселле, печчу, мышшу;

2) каменны, бяссонны, аддзяліць, даччына, насміхацца, разлавацца; *але:* ростань, расада, расол;

3) рэжысёр, гама, група, калега; Ганна, Жанна, ванна, мецца-сапрана, інтэрмецца; сюррэалізм.

17. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

17.1. Меркаван..е, натхнен..е, суд..я, рас..ыпаны, пакален..е, Еўрабачан..е, паэтэс..а, міс..іянеры, пан..а, крыл..е, клас.., эпіграм..а, прагрэс..іўны, аб..рэвіятура, Мек..а, абурэн..е, пяц..юдзесяц..ю, памяц..ю, асен..ія, ал..егорыя, клас..іцызм, з..янне, здаец..а, паўгод..е, лісц..е, Евангел..е.

17.2. Пераінтанаван..е, музычнае мыслен..е, мас..авасць, п’еса-папур..ы, песен..асць, пералажэн..е, рознагалос..е, стварэн..е тэмбравага каларыту, размеркаван..е інструментаў, выканальніцкі

ап..арат, ап..лікатура, струна бурдон..ая, гукавылічэн..е, змешан..ы хор, сугуч..ы, песен..ая мелодыя, ажыц..яўляць.

17.3. Накаплен..і, прагназаван..е, забеспячэн..е, цэнаўтварэн..е, анкетаван..е, дабрачын..ая акцыя, сфера абслугоўван..я, фінансаван..е, тэлебачан..е, стварэн..е ўмоў, кіраван..е, рэгуляван..е, рашэн..е, планаван..е, размеркаван..е паўнамоцтваў, узнікнен..е крызісных сітуацый, меркаван..е.

17.4. Кам..нікатыўны, здарэн..е, правапарушэн..е, асяроД..е, дабрачын..асць, узаемадзеян..е, узаемаразумен..е, уздзеян..е, стымуляван..е, самакіраван..е, экстран..ыя выпадкі, мадэліраван..е сітуацыі.

17.5. Іл..юзорнасць, адцен..е, перапляцен..е, кал..она, аздаблен..е, ціснен..е, клас..ічны, Сярэднявеч..а, эпоха Адраджэн..я, ап..лікацыя, філігран..ы, чарнен..е, пляцен..е, ільнопрадзен..е, святлоадчуван..е, каштоўн..ыя метал..ы, зярнен..е, натхнен..е.

17.6. Бібліяграфаван..е, зацікаўлен..асць тэкстам, забеспячэн..е, клас..іфікацыя, іл..юстрацыя, размяшчэн..е фонду, рэдагаван..е, каталогавядзен..е, монавыдан..е, кам..ентарый, стратэгія чытан..я, распрацаван..ы, спрошчан..ы.

17.7. Тарантэл..а, ал..егра, клас..ічны танец, пас..адобль, цырымон..ы, беларус..кія народныя танцы, танцавальная праграм..а, круціц..а ваўчком, трымац..а за станок, эф..ектны.

17.8. Камен..ы век, ран..яе Сярэднявеч..а, мураван..ыя палацы, курган..ы могільнік, феадальная раздроблен..асць, абарончыя збудаван..і, умацаван..і, пяцігран..ая вежа, калекцыяніраван..е, паўпалцін..ік, першабытнаабшчын..ы, шліфаван..е.

17.9. Аф..ект, бал..ада, бестсел..ер, летуцен..ік, трызнен..е, буф..анада, натхнен..е, вечары апавядан..я, увасаблен..е, уражан..е, народныя гулян..і, іл..юзія, мастацтва прадстаўлен..я, вобразнае бачан..е.

18. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую, растлумачце правапіс.

18.1. Управление, касса, радостью, затишье, программа, молодежью, чтение, сумма, третий, тридцать, приволье, мягко, осуществление, рассадный, интермеццо.

18.2. Меццо-сопрано, аллегро, трелью, варьирование, пиццикато, песенность, попурри, сопровождение, баллада, четырехголосие,

канцонетта, колористическое богатство, развитие, септаккорд, светское музицирование, секвентное повторение, слуховые ассоциации, диссонанс, звучание, либреттист, аккомпанировать, темообразование.

18.3. Ассигнование, обеспечение, банкротиться, накопление, администрирование, задолженность, баланс, коммерческий, прогнозирование, ограниченная ответственность, ценообразование, импрессарио, собственностью, творческий коллектив, дилер, взаимосвязанность, эффективность, стресс, подчиненный.

18.4. Уровень жизни, компромисс, вечера вопросов и ответов, дискуссии, жертвы военных конфликтов, моралью, чувственный, поколение, творчеством, жизнеутверждающий, перевоспитание, поддержать, массовик, восприятие, тематическая программа, ассоциация, пассивный.

18.5. Гуашью, акварелью, терракота, симметрия, барокко, иллюзорность, зернение, Возрождение, аппликация, импрессионизм, балюстрада, обрамление, светоощущение, соломоплетение.

18.6. Книгообеспечение, пресс-конференция, регистрационная картотека периодических изданий, стеллаж, экспресс-информация, систематизированный, обобщенный, периодические издания.

18.7. Классический балет, массовые сцены, ассоциации, основные коллизии, спектакль, либретто, стремление, экспрессивный.

18.8. Изучение предметов экспозиции, классификация, выявление, полевое исследование, выполнение, комплектование, старинные украшения, закупочная комиссия.

18.9. Классика, сценическое контактирование, обличье, оборудование сцены, освещение, оформление, режиссер, режиссура, сочувствие, воздействие, брависсимо.

Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных

19. Прачытайце правільна наступныя прыказкі і прымаўкі. Знайдзіце неадпаведнасці ў вымаўленні і напісанні. Растлумачце правапіс і значэнне прыказак і прымавак.

Лёгка сказаць, ды далёка дыбаць. Адклад не ідзе ў лад. За што добра бярэшся, канца даб’ешся. З кім павядзешся, ад таго і набярэшся. Колькі вяровачцы ні віцца, а канцу быць. З хараства вады не нап’ешся. Прагаладаешся – хлеба дастаць здагадаешся. Няпраўдаю свет пройдзеш, а назад не вернешся. Свая сярмяжка не цяжка. Каб ведаў, дзе павалішся, там саломкі падаслаў бы.

20. Растлумачце напісанне звонкіх – глухіх, свісцячых – шыпячых зычных на канцы і ў сярэдзіне наступных слоў. Падбярыце праверачныя словы.

1) працяг, фасад, блюз, фонд, імідж, шарж;
2) кніжка, стужка, падказка, лёгкі, наладка;
3) барацьба, просьба, жаніцьба, носьбіт;
4) перавозчык, рэзчык, разжаліць, пясчаны;
5) нарэшце, на кладачцы, нясвіжскі, рыхтуешся.

21. Змяніце або падбярыце роднасныя словы для праверкі напісання зычных.

Моладзь, перапісчык, трыкатаж, перасцерагчы, загадка, гладкі, краявід, белавежскі, вязка, уздоўж, нізка, бегчы, у хустцы, увачавідкі, рэзкі, складчына, прасцяг, цяжкасці, дзядзькаванне, сродкі.

22. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую, запішыце, падкрэсліце арфаграмы.

Лозунг, цифра, витраж, носитель, монтаж, подход, метод, аншлаг, платеж, рейтинг, дивиденд, средства, пользуешься, на обложке, пряжка, дробь, тренируешься.

Правапіс прыставак на *-б* і *-д*

23. Растлумачце напісанне літар *б* і *д* у прыстаўках.

Адкрыць, падтрымка, надпісаць, прадбачыць, прадстаць, перадплечча; абпалены, абступіць, абмежаваць, абстрэл.

24. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

А..бывацца, а..шар, а..сутнасць, а..крыццё, а..вечны, па..хапіцца, а..даляцца, спа..цішка, па..галоскі, а..метныя асаблівасці, а..ыграць праграму, пра..прыемства, таварыства з а..межаванай а..казнасцю, пра..прымальнік, а..бор, а..казнасць, а..межаваныя магчымасці, па..трымка, а..асобіцца, а..пачынак, па..свядомасць, а..лічча,

па..свечнік, а..цяніць, а..ценне, а..клад, па..піска, а..агульнены, па..танцоўка, па..скокваць, па..сечнае земляробства, на..брамная вежа, на..глазурныя эмалі, а..наўленне спектакля, неа..ступны, непа..купны, па..грыміраваць, па..светка, па..тэкст.

Правапіс мяккага знака і апострафа

25. Прачытайце словы, растлумачце правапіс змякчальнага мяккага знака. Адзначце, пасля якіх літар пішацца мяккі знак і калі ён не пішацца.

Ь пішацца:

1) боязь, хтось, моладзь, пяць, вучань, акварэль;
2) пісьмо, цьма, Вольга, ганьба, дзьмуць, вазьму;
3) пісьменнік, цьмяны, Вользе, ганьбіць, дзьме, возьме;
4) пяцьдзясят, дзевяцьсот;
5) людзьмі, слязьмі, дзецьмі;
6) сядзьма, будзьма; сядзьце, будзьце, завесься, агледзься;
7) кагосьці, штосьці, ледзьве;
8) агеньчык, каменьчык, *але:* качанчык;
9) вішань, соцень, вішанька, соценька, песенька.

Ь не пішацца:

1) свет, багацце, дзверы, радасцю; *але*: носьбіт, дзесьці, хрэсьбіны;
2) любанскі, казанскі, цянь-шанскі, *але:* восеньскі, студзеньскі;
3) голуб, насып, восем, восемсот.

26. Прачытайце сказы, знайдзіце словы з асіміляцыйнай мяккасцю, растлумачце іх правапіс.

Беларусы адрозніваюцца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. Яны звычайна мяккія, даверлівыя, пазбаўленыя помслівасці. Па агульных назіраннях, беларусам уласцівыя павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай *(У. Караткевіч)*.

27. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

27.1. Дз..вес..це, пес..ні, мален..кі, па прос..бе, вяз..мо, няма новых песен.., са сляз..мі, мядз..ведз.., навакол..ле, Сібір.., ц..віс..ці, каліс..ці, прыйс..ці, хатын..скі, кон..чык, мен..шы, нян..чыць, вішан.., восем.., шэсц..сот, сем.., дзец..мі, аген..чык, абедз..ве, чац..вёрты, прыгледз..ся, прыходз..це, агул..нанавуковы, прос..біт, соцен..ка, з..вес..ся.

27.2. Рас..пеў, трэл.., дз..ве актавы, мастацкія якас..ці, фал..клор, танал..нас..ць, з..мешаны хор, увес.. дыяпазон, аднатанал..ны перыяд, генерал..ная кул..мінацыя, гучан..не, вакал..ны стыл.., кіравац.., адаптавац.., трыёл.., шмат песен...

27.3. Фестывал.., прыватная ўласнас..ц.., эфектыўнас..ц.., узаемаз..вязанас..ць фактараў, сітуатыўная мадэл.., легал..ны, вэксал.., ілюзорнас..ць, прэм..ера, кар..ера, кул..турныя сувязі, інтэрв..ю, дзейнас..ц.., ранц..е, дас..е, лёсавызначал..ны, адлічэн..не з рахунка.

27.4. Здол..нас..ць, мыс..ленне, ас..пект узаемадзеян..ня, блюз..нерства, сц..вярджал..ны, гул..нявая дзейнас..ць, валан..цёр, чул..лівы, субкул..турныя супол..ніцтвы, канфідэнцыял..нас..ць, імператыўны ас..пект.

27.5. Раз..ба, раз..бяр, цэл..нас..ць кампазіцыі, жывапіс.., рос..піс.., скул..птура, ал..танка, жырандол.., с..ветлацен.., іл..наткацтва, рас..цяжка, забалац.., грабен..чык, з..лепак, мал..берт, пастэл.., гарызантал..ны, счарніц.., дэкаратыўнас..ць, акварэл.., ганчарная вытворчас..ць, падс..вечнік, рэл..ефны, ул..трамарын, рамес..нік, ціс..ненне, гіпастыл.., пастарал.., пос..цілка, грыфел.., асаблівас..ць, вапел..ня, залацістас..ць, філігран...

27.6. Мемарыял..нае выдан..не, мікрафіл..мавы, абарачал..нас..ць фонду, агул..надаступнас..ць, паказал..нік, ал..манах, бюлетэн.. новых паступленняў, воблас..ць выдання, дакладнас..ць пошуку, змяшчал..нас..ць, кансул..тант, мікрафіл..м, рэлевантнас..ць фонду, с..вята кнігі, факсіміл..нае выданне.

27.7. Павол..ны вал..с, танцавал..ны, медал..ён, рамен..чык, кас..цюм, кас..цюміраваны бал.., міл..ён, пасадобл.., фал..клор, с..вятло рампы, тэхнічнас..ць, балансавац.., іс..ці, пус..ціцца ў скокі, сес..ці на шпагат.

27.8. Рэчы матэрыял..най культуры, неандэртал..цы, крамянёвыя плас..ціны, могіл..нік, залатыя скроневыя кол..цы, феадал..ная раздробленас..ц.., этнічная прыналежнас..ц.., прадметы кул..ту, сакрал..ныя валуны, Княз..-камен.., некропал...

27.9. Партал..ная арка, бел..этаж, геніял..ны, вул..гарны, сцэнічнае піс..мо, бесканфліктнас..ц.., с..пектакль, ас..вятлял..ны

люк, камедыя дэл.. артэ, кал..е, непараўнал..ны, Казан..скі тэатр, вадэвіл..ны, Мал..ер, кул..мінацыя, «Беларус..філ..м».

Запомніце!
абедзве, булён, дзвесце, восем, ледзьве,
меніш, няньчыць, песень, разьбяр, хтосьці

28. Прачытайце словы, растлумачце правапіс раздзяляльнага мяккага знака. Пасля якіх зычных і перад якімі галоснымі пішацца раздзяляльны мяккі знак?

Медальён, каньён, канферансье, парцьеры, мадзьяр, Лавуазье, Савельеў, Касьян, лью, Нью-Ёрк, Ілья, Ульяна.

29. Прачытайце словы і растлумачце, калі пішацца апостраф.

1) аб'ёмны, з'ява, з'ехаць, між'ярусны;
2) вераб'і, сям'я, камп'ютар, верф'ю;
3) двух'ярусны, Лук'янаў;
4) мыш'як, звяр'ё, шыр'ю; ад'ютант.

❖ ***Пасля ў апостраф не пішацца:***
здароўе, салаўіныя, абаўю, Заслаўе, праваслаўе

30. Перапішыце, устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары.

30.1. Ад..ехаць, раз..юшаны, паштал..ён, міл..ярд, Марэс..еў, аб..ява, Арсен..евіч, чатырох..ярусны, салаў..іны, разал..ю, бязрыб..е, раз..езд, вал..ера, манпанс..е, іў..еўскі, Вікенц..евіч, пад..язджаць, уз..ехаць, фел..д..егер.., прымор..е, н..ю-ёркскі, п..яніць, надвор..е.

30.2. Вар..іраванне, музычная п..еса, пад..ём, прэм..ера песні, неад..емная, з..яўляцца.

30.3. Кар..ерыст, інтэрв..ю, кампан..ён, вар..етэ, суб..ектыўныя фактары, кан..юнктура, п..еса, павіл..ён, канферанс..е, ал..янс, аб..ядноўваць, беспрацоў..е, прэм..ера.

30.4. Сур..ёзны, ахова здароў..я, сем..янін, аб..ектыўны, аб..яднанне, з..явіцца, інтэрв..ю, саслоў..е, з..едлівы, з..ява, з любоў..ю, вар..яцкі, суб..ект, давер..е.

30.5. П..едэстал, інтэр..ер, саб..ю, барэл..еф, він..етка, аб..ёмны вобраз, пап..е-машэ, рэл..ефны, п..ета, рышэл..е, аб..ект.

30.6. Аб..яднаны бібліяграфічны запіс, аб..ект каталагізацыі, аб..ём фонду, інтэр..ер бібліятэкі, двукроп..е, камп..ютар.

30.7. Ар..ер, кастан..еты, він..етка, пасляслоў..е.

30.8. Краман..ёнцы, двух..ярусныя падлогі, інтэр..еры замкаў.

30.9. Прэм..ера, вар..етэ, ар..ерсцэна, брыл..янцін, уз..юшыцца, гін..ёль.

Запомніце!
інтэрв'ю, кан'юнктура, п'едэстал, п'еса, раз'юшаны

31. Перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую, пры неабходнасці карыстайцеся руска-беларускімі слоўнікамі. Растлумачце правапіс.

Появиться, барьер, Демьян, экстерьер, гильотина, шиньон, Приазовье, щавель, Рижское взморье, курьер, обындеветь, Ульянов, Ивье, Мольер, пятьюдесятью, Марьина Горка, восьмью, созвездие, предъявить, конъюнктурщик, досуг, индифферентность, помощь семьям, горельеф, вынянчить, многоступенчатый, Вьетнам, носитель.

32. Утварыце імёны па бацьку ад наступных розных форм уласных назоўнікаў.

Ігнат – Ігнацій, Яўген – Яўгеній, Арсень – Арсеній, Васіль – Васілій, Анатоль – Анатолій.

Правапіс каранёвых зычных перад суфіксальнымі *с, ч, ц*

33. У наступных словах растлумачце правапіс спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса.

1) гарадскі, грамадства, шведскі;
2) у лодцы, на вопратцы, матчын, сведчыць;
3) белавежскі, каўказскі, бугскі, цюрыхскі, латышскі, таджыкскі.

34. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

Грама..кі, узбе..кі, пасве..чанне, лё..чык, на вокла..цы, сусе..кі, пецярбур..кі, магдэбур..скае права, люксембур..скі, у ха..цы, старадаро..скі, чэ..скі, на лава..цы, разве..чык, перакла..чык.

35. Утварыце прыметнікі ад прыведзеных уласных назоўнікаў пры дапамозе суфікса *-ск-*. Падкрэсліце зычныя на стыку кораня і суфікса.

Белавежа, Глыбокае, Прага, Закаўказзе, Ліда, Пухавічы, Навагрудак, Нясвіж, Парычы, Рэчыца, Палессе, Кембрыдж, Брэст, Асіповічы, Галандыя, Цюрых, Грынвіч, Гарадок, Свіслач, Смалявічы, Сураж, Хойнікі, Парыж, Каўнас, Ірак.

36. Утварыце прыметнікі ад прыведзеных назоўнікаў з дапамогай суфіксаў *-ск-* ці *-ств-*. Запішыце іх і растлумачце правапіс.

Казах, выкладчык, Чыкага, агент, сусед, рамеснік, Каўказ, ткач, лабарант, Добруш, абстракцыяніст, Бялград, мецэнат, асветнік, камерсант, Бангкок, адвакат, дойлід, турыст, перакладчык, людзі, узбек, турак.

§ 8. Напісанне слоў разам, асобна і праз злучок

1. Растлумачце, чаму наступныя словы пішуцца разам:

педсавет, бібфак, сацыякультурны;
музыказнаўства, фондасховішча, сярэдневяковы, старажытны;
аўдыядакумент, аўтарэферат, кінастужка, фотахроніка;
першадрукаваны, дванаццаціступеньчатая;
іншамоўны, заходнееўрапейскі, двухмоўны;
высокаадукаваны, унутрысістэмны;
сарвігалава, прайдзісвет, пакацігарошак (але: перакаці-поле);
Слаўгарад, Салігорск, Пецярбург;
паўтона, паўаркуша (але: паў-Мінска);
ніжэйпадпісаны, вышэйадзначаны (але: сумесна створаны).

2. Растлумачце, чаму наступныя словы пішуцца праз злучок:

даўно-даўно, белы-белы, ледзь-ледзь;
сам-насам, дзе-нідзе;
жылі-былі, сяк-так, хіп-хоп;
жар-птушка, хата-чытальня, хард-рок;
сацыял-дэмакрат, хрысціянска-дэмакратычны;
віцэ-прэзідэнт, экс-чэмпіён, штаб-кватэра, прэс-канферэнцыя, гала-канцэрт;

горад-герой, гуслі-самаграі, кніжка-цацка;
залаціста-жоўты, шаравата-сіні, кісла-салодкі;
літаратурна-музычны, выдавецка-гандлёвы, навукова-папулярны;
Давыд-Гарадок, Усць-Каменагорск, давыд-гарадоцкі;
Дунін-Марцінкевіч, Бялыніцкі-Біруля, Жан-Жак Русо;
паўночна-ўсходні, норд-вест;
леў-талстоўскі (раман), рамэн-раланаўскі (стыль);
3-тысячны, 5-мільённы, 6-мільярдны;
два-тры (гады), праз 3-4 (месяцы);
па-святочнаму, па-майстэрску, па-дзіцячы, па-мойму;
абы-дзе, хто-небудзь, зрабіў-такі;
паў-Беларусі, паў-Мінска;
па-першае, па-другое;
ха-ха-ха, ай-яй-яй, ку-ку.

3. Растлумачце, чаму наступныя спалучэнні пішуцца асобна:

добра выкананы, прыгожа аформлены, юрыдычна самастойны;
Старыя Дарогі, Вялікае Падлессе;
красуня дзяўчына, волат дуб;
прачытаў бы, заспявай жа, толькі што;
на памяць, на жаль, усё роўна, як след, за мяжой, з вечара да ранку;
адзін на адзін, на бягу, з размаху.

4. Запішыце складаныя назоўнікі разам або праз злучок. Растлумачце іх правапіс.

Агіт/брыгада, адна/годак, акцёр/прафесіянал, аўдыя/запіс, васьмідзесяці/годдзе, Вялік/дзень, грамада/знаўства, гука/запіс, джаз/аркестр, дом/музей, жыва/пісец, канцэртна/тэатральны, кіна/індустрыя, колера/музыка, насцен/газета, неа/імпрэсіянізм, паэт/рамантык, пісьменнік/класік, кіна/акцёр, помнік/манумент, радыё/інтэрв'ю, рок/н/рол, сама/выхаванне, света/ўспрыманне, тавара/абмен, танц/зала, тысяча/годдзе, тэатр/студыя, узаема/давер'е, фота/рэклама, экскурса/вод.

5. Запішыце прозвішчы славутых людзей, растлумачце правапіс.

1. Беларускі пісьменнік, аўтар камедыі «Пінская шляхта». 2. Галандскі жывапісец 2-й паловы XIX стагоддзя, прадстаўнік постімпрэсіянізму. 3. Рускі пісьменнік-сатырык, аўтар «Гісторыі аднаго горада». 4. Іспанскі драматург, аўтар камедый «Настаўнік танцаў» і «Сабака на сене». 5. Рускі кампазітар, аўтар оперы «Снягурачка». 6. Тэатральны рэжысёр, які разам са К. С. Станіслаўскім заснаваў Маскоўскі Мастацкі тэатр. 7. Жывапісец-пейзажыст, беларускі Левітан (1872–1957).

6. Запішыце ўласныя імёны, раскрыўшы дужкі. Растлумачце правапіс, праверце па экцыклапедыі.

Бялыніцкі (Біруля), Старыя (Дарогі), (Нава)полацк, Кірыла (Тураўскі), Заходняя (Еўропа), Доўнар (Запольскі), Рамен (Ралан), Пятроў (Водкін), Буда (Кашалёва), Светла (горск), Памва (Бярында), Ван (Дэйк), Рэч (Паспалітая), Сімяон (Полацкі), Рыа (дэ) Жанэйра, Гі (дэ) Мапасан.

8. Спішыце тэкст, растлумачце напісанне складаных слоў.

Характар філасофска/этычных поглядаў Скарыны выявіўся ў свое/асаблівым сінтэзе хрысціянскіх, антычных і рэнесанса-ва/гуманістычных ідэй. Істотна паўплывала на яго света/погляд стара/жытная народна/этычная і эстэтычная, а таксама літаратурна/філасофская спадчына. Біблейская традыцыйна/хрысціянская этыка мадэрнізуецца і адаптуецца Скарынам у адпаведнасці з ідэйнымі запатрабаваннямі эпохі Адраджэння, актуальнымі сацыяльна/палітычнымі і нацыянальна/культурнымі задачамі беларускага народа. Скарына разглядаў і вырашаў пытанні сэнсу жыцця, годнасці чалавека, духоўна/маральнай свабоды, агульнага і індывідуальнага дабра. Ён зрабіў спробу перагледзець артадаксальна/сярэдневяковую трактоўку праблемы чалавечага існавання. Сцвярджаючы сама/каштоўнасць чалавечага жыцця, ён рэабілітаваў зямное быццё. Этыка Скарыны арыентуе чалавека на грамадска/карыснае зямное жыццё, служэнне «пожитку посполитому», пастаяннае інтэлектуальна/маральнае ўдасканаленне, «абы научившися мудрости» людзі «добре жили на свете» *(паводле энцыклапедыі «Асветнікі Беларусі»).*

§ 9. Ужыванне вялікай літары

1. Прачытайце верш, растлумачце ўжыванне вялікай літары ў словах.

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў.
Дзе на ўзвышшах Навагрудскіх дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,
Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам, як молат, заб'ецца,
Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе.

У. Караткевіч

2. Прачытайце словы і словазлучэнні, растлумачце ўжыванне вялікай літары.

А. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Акадэмія навук Беларусі, ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэн Айчыннай вайны I ступені, Вялікая Айчынная вайна, грамадзянская вайна, Першая сусветная вайна, Брэсцкі мір, Гродзенская вобласць, Уральскія горы, востраў Дыксан, Мінскае ўзвышша, газета «Літаратура і мастацтва», аповесць Васіля Быкава «Абеліск», Белавежская пушча, белавежскі зубр, коласаўскі стыль, Коласавы творы, Коласаўскія чытанні, беларускае мастацтва, Мележаў раман, ахілесава пята, Ахілесава пята, Людвіг ван Бетховен, Нініна маці, Скарынаўская стыпендыя.

Б. Дзень Незалежнасці; Сусветны дзень моладзі; Дзень друку; Першага мая; 1 Мая; 1 мая; Вялікдзень; Бог Айцец, Бог Сын, Бог Святы Дух, Усявышні, Святая Царыца Алена, Крыж Ефрасінні Полацкай, Курган Славы, Чырвоны Капялюшык, Плюшкін, плюшкін, Лебедзь, Шчупак і Рак, Дзед Мароз, дзед-мароз, бог яго ведае; Млечны Шлях, созўр'е Шалі.

3. Запішыце словы і словазлучэнні, раскрываючы дужкі.

(М,м)іністэрства (К,к)ультуры (Р,р)эспублікі (Б,б)еларусь, (Э,э)поха (А,а)драджэння, (М,м)іжнародны (Ж,ж)аночы (Д,д)зень, (С,с)онечная (С,с)істэма, (Б,б)еларускае (Б,б)арока, (П,п)лошча (П,п)ерамогі, (Ч,ч)асопіс «(В,в)ышэйшая (Ш,ш)кола»,

(Т,т)аварыства (Б,б)еларускай (М,м)овы (І,і)мя (Ф,ф)ранцішка (С,с)карыны, (М,м)іністр (А,а)дукацыі, (В,в)уліца (З,з)аслаўская, (Н,н)овы (Г,г)од, (С,с)карынаўская (С,с)тыпендыя, (М,м)іхасёў падручнік, (К,к)упалаўскія вершы, (Б,б)оская (М,м)аці, вядомы (М,м)ецэнат, (С,с)афійскі (С,с)абор, (Н,н)обелеўская (П,п)рэмія, (Н,н)ародны (А,а)ртыст, (В,в)озера (С,с)віцязь, (В,в)ялікае (К,к)няства (Л,л)ітоўскае, (З,з)аслужаны (Д,д)зеяч (М,м)астацтваў, (Д,д)зень (П,п)ерамогі, (Д,д)ом (Н,н)астаўніка, (П,п)алац (М,м)астацтваў, (С,с)карынаўская (Б,б)іблія, (Г,г)алерэя (П,п)амяці.

4. Раскрыйце дужкі, малыя літары замяніце, дзе трэба, вялікімі. Запішыце сказы.

1. Ян (б)аршчэўскі, адзін з пачынальнікаў новай (б)еларускай літаратуры, нарадзіўся ў (в)ёсцы (м)урагі (п)олацкага (п)авета (в)іцебскай (г)уберніі, вучыўся ў (п)олацкай (е)зуіцкай (к)алегіі. 2. Сымон (б)удны вучыўся на (ф)акультэце (с)вабодных (м)астацтваў (к)ракаўскага (у)ніверсітэта, дзе атрымаў грунтоўную гуманітарную і багаслоўскую адукацыю. 3. Яшчэ да прыходу (е)фрасінні (п)олацкай вядомая бібліятэка (с)афійскага (с)абора ператварылася ў буйны (к)ультурны цэнтр (п)олаччыны. 4. Беларускія майстры прыклалі свае рукі да ўзвядзення (к)аломенскага (п)алаца, афармлення іканастаса (с)маленскага (с)абора (н)овадзявочага (м)анастыра, (з)броевай (п)алаты (к)рамля, (в)алдайскага і (і)верскага (м)анастыроў. 6. Жодзінская (н)ародная (х)аравая (к)апэла (п)алаца (к)ультуры (б)еларускага (а)ўтамабільнага (з)авода была створана ў 1960 годзе. 7. Шмат добрых спраў для духоўнага развіцця нашага грамадства было зроблена (б)еларускім (ф)ондам (к)ультуры, (б)еларускай (а)сацыяцыяй (ф)алькларыстаў. 8. Плённа працуюць (н)ацыянальны (а)кадэмічны (т)эатр (і)мя (я)нкі (к)упалы, (б)еларускі (дз)яржаўны (а)кадэмічны (т)эатр (і)мя (я)куба (к)оласа, (н)нацыянальны (а)кадэмічны (в)ялікі (т)эатр (о)перы і (б)алета (р)эспублікі (б)еларусь, (б)еларускі (р)эспубліканскі (т)эатр (ю)нага (г)ледача, (дз)яржаўны (т)эатр (м)узычнай (к)амедыі, (дз)яржаўны (т)эатр (л)ялек і інш.

Запомніце!

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Вялікае Княства Літоўскае, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, грамадзянская вайна,

лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, народны мастак

5. Пісьмова перакладзіце на беларускую мову словы, а таксама імёны і прозвішчы знакамітых асоб і назоўнікі-тэрміны. Прачытайце ў адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення:

а) адажио, аккомпанемент, аллегория, балерина, вернисаж, виньетка, виолончель, гобелен, диорама, монолог, полилог, диалог, идиллия, идеализация, импресарио, иконопись, классицизм, клоун, коллаж, конферансье, кружево, лауреат, гала-представление, лейтмотив, либретто, менестрель, капелла, автопортрет, арпеджио, аттракцион, баллада, барельеф, бельэтаж, вариации, варьете, скетч, майолика, фойе, гамма, дебют, живописность, живопись, интерьер, неореализм, ноктюрн, рапсодия, опера-буффа, па-де-де, пауза, попурри, премьера, пьедестал, репетиция, рок-н-ролл, труппа, группа, режиссер;

б) Образцов, Венецианов, Алябьев, Андерсен, Гендель, Гауди, Брюсов, Белинский, Воскресенский, Куинджи, Боттичелли, Вернадский, Дебюсси, Дионисий, Довженко, Донателло, Домье, Караваджо, Клодт, Комиссаржевская, Мейерхольд, Ватто, Крамской, Кустодиев, Микеланджело, Мысливичек, Неизвестный (Эрнст), Немирович-Данченко, Палладио, Пикассо, Паустовский, Прокофьев, Пуччини, Рейнхардт, Даргомыжский, Кончаловский, Фасбиндер, Рембрандт, Репин, Тютчев, Есенин, Брюллов, Сибелиус, Тициан, Тьеполо, Фабрициус, Фаворский, Шёнберг, Штраус, Шекспир, Толстой, Ожегов, Бернард Шоу.

ГРАМАТЫЧНЫЯ НОРМЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ ВА ЎМОВАХ БІЛІНГВІЗМУ

§ 10. Нарматыўнае ўжыванне лексіка-граматычных разрадаў назоўнікаў

1. Вызначце род назоўнікаў і спалучыце з імі прыметнікі, займеннікі, парадкавыя лічэбнікі, дзеепрыметнікі. Запішыце.

а) (каляровы) жалюзі, (элегантны) фрау, (ружовы) фламінга, (свабодны) таксі, (англійскі) аташэ, (прасторны) фае, (драўляны) бюро, (любімы) кіно, (дзіцячы) фота, (сучасны) кабарэ, (маленькі)

ківі, (маладзёжны) кафэ, (спальны) купэ, (спартыўны) рэферы, (саламяны) пано, (гадавы) сальда, (навуковы) рэзюмэ, (малады) пратэжэ, (прафесійны) фіяска, (драўляны) лато, (вакальны) трыа, (каларатурны) сапрана, (назойлівы) цэцэ, (гастрольны) турнэ, (аўтарытэтны) журы, (розны) амплуа, (оперны) прымадонна, (старадаўні) піяніна, (оперны) лібрэта, (вясёлы) папуры, (вядомы) арыёза, (павольны) адажыа, (аргенцінскі) танга, (танцавальны) па, (запрошаны) імпрэсарыа;

б) (прыгожы) Сочы, (глыбокі) Антарыа, (маляўнічы) Хакайда, (высокі) Кіліманджара, (загадкавы) Конга, (доўгі) Ніл, (старажытны) Тбілісі, (вялізны) Гобі, (знакаміты) Дзюма;

в) (першы) ВНУ, (славуты) БДУ, (гарадскі) ДАІ, (змястоўны) ЛіМ, (наш) БелТА;

г) (легендарны) Нарач, (паўнаводны) Нёман, (шырокі) Дзвіна, (старажытны) Гродна, (любімы) Мінск, (намолены) Жыровічы;

д) (таленавіты) калега, (адказны) стараста, (прыватны) вядоўца, (знаёмы) сірата.

2. Падбярыце да назоўнікаў азначэнні (прыметнікі, займеннікі, парадкавыя лічэбнікі). Словазлучэнні запішыце, у дужках укажыце род назоўнікаў.

2.1. Прэса, неруш, вета, дэвіз, кворум, пратэжэ, педаль, жывапіс, менеджар, канферансье, журы, лідар, турнэ, выканаўца, амплуа, імпрэсарыа, летапіс, запіс, мадам, заняткі.

2.2. Лібрэта, сальфеджыа, рэвю, папуры, пантаміма, піяніна, трыа, алегра, музыказнаўца, скерца, ронда, пасакалія, бэнд-лідар, менестрэль, арыёза, піцыката, трэмала, тарантэла, цымбалы.

2.3. Шоу, прадпрыемства, ранцье, асігнаванні, ноу-хау, паблісіці, інвестыцыі, спаборніцтва, дылер, адміністратар Навіцкая, менеджар Пятрова, бард.

2.4. Індывідуум, асоба, супольнасць, вундэркінд Марына, дабрачынец, моладзь, інвалід, соцыум, кліент, педагог Смірнова, валанцёр Зарэцкая, псіхолаг, інтэрв'ю, макрафактары, праграма, равеснік, спадчына, альтэрнатыва, подпіс, прафілактыка.

2.5. Пап'е-машэ, гуаш, пастэль, пленэр, віртуоз, жырандоль, пастараль, барока, мастацтвазнаўца, ракако, філігрань, шпалеры, рышэлье, урбанізм, ткацтва, ансамбль, асацыяцыя, сіметрыя, трыпціх, разьба, калаж, кераміка, дэкадэнцтва, плеяда, інтэр'ер, фарбы, тэмпера, жывапіс.

2.6. Дысцыпліна, каталогі, нумар, фрагмент тэксту, клішэ, бібліятэкар Пятрова, рэсурсы, спецыфіка, аўтар, кваліфікацыя,

кадры, статыстыка, аматары, людзі, часопіс «Полымя», разнастайнасць, кнігалюбы, Белдзяржпатэнт, ЛіМ.

2.7. Танга, фуэтэ, скокі, па, рэверанс, самба, па-дэ-дэ, трэнаж, трэнер, выканаўца, харэограф, балет, харэограф Пятрова, пратанцоўка, авансцэна, кулісы, грым, абутак, арабеск, джаз, пуанты, пастаноўшчык, каардынацыя, клішэ.

2.8. Музеязнаўства, падмурак, летапіс, мур, насып, жвір, узровень, галіфэ, дывергенцыя, калекцыя, картаграфаванне, клінапіс, маёліка, летапіс, рэшткі, вензель, земляробства, палеаліт, пацеркі, кансервацыя, архівасховішча.

2.9. Інжэню, батлейка, вадэвіль, жабо, хвалько, прадстаўленне, травесці, вар’етэ, амплуа, кулісы, кабарэ, фальш.

3. Размяркуйце словы па трох групах:

а) назоўнікі, ужывальныя ў форме адзіночнага і множнага ліку;

б) назоўнікі, ужывальныя ў форме толькі адзіночнага ліку;

в) назоўнікі, ужывальныя ў форме толькі множнага ліку.

3.1. Заява, патрэбы, прысмакі, дзеці, інтуіцыя, рэабілітацыя, кпіны, паводзіны, падлеткі, рэзгіны, мастацтва, п’еса, чалавецтва, выбары, студэнцтва, дзверы, рамантызм, хлеб, канікулы, чарніла, суніцы, шпалеры, звычкі, узаемаадносіны, сітуацыі, інтэрв’ю, абставіны.

3.2. Дажынкі, флажалеты, куранты, паводзіны, веды, акампанемент, мелодыка, спевы, фанфары, тэматызм, інструментарый, вячоркі, барабаны, талеркі, літаўры, Каляды, фаршлагі, мелізмы, вакалісты, цымбалы, гамы.

3.3. Плацяжы, адаптацыя, калектыў, лідарства, структуры, камунікацыі, адказнасць, спажыўцы, ранцье, цэны, Дажынкі, дэманапалізацыя, падсістэмны, тэлебачанне, фірмы, канкурэнтаздольнасць.

3.4. Каляды, талент, лідарства, дыскусія, чалавек, кваліфікацыя, імідж, рытуал, перавыхаванне, альтруізм, выпадкі, здароўе, давер’е, руціна, працэс, панацэя, каханне, зло, вакацыі, экзамены, адносіны, умовы.

3.5. Іканаграфія, фарфор, дэкаратыўнасць, сацін, стылізацыя, плагіят, чарненне, кераміка, вітражы, вернісаж, эстэцтва, палеаграфія, урбанізм, карыятыда, дызайнер, бялілы, шпалеры, дэкор, майстэрства, кросны, выцінанкі, арнамент, шахматы, куфры, арэлі, ансамбль, пэндзаль.

3.6. Дакумент, забеспячэнне, чытачы, карыстальнік, бібліятэка, дублеты, функцыя, інфраструктура, абанемент, бібліятэказнаўства, дапаможнік, калектыў, нумарацыя, распрацоўкі, дыспут, дзеці, чытанні, інфармацыя, патрыётыка, кантэкст.

3.7. Танцоўшчык, абутак, танга, харэаграфія, поза, партнёр, танцзала, стылізацыя, балейтмайстар, балерына, артыст, пуанты, «Арэлі», скокі, батлейка, спектаклі, кулісы, тэхніка, майстэрства, вальс, дысгармонія, кардэбалет, румба, чаравікі, гастролі, пластыка.

3.8. Экзэмпляр, пілястры, будынак, царква, фрагмент, рэшткі, крыніцы, мур, замак, лінія, ландшафт, шахматы, сезон, мадэрн, веды, Дзяды, выцінанкі, дойлідства, неакласіцызм.

3.9. Тэатр, заснавальнік, прапаганда, драматургія, тэкст, спектакль, п'еса, асоба, кантрамарка, завязка, рэчаіснасць, канфлікт, драма, персанаж, кульмінацыя, сутыкненне, сатыра, капуснік, прэм'ера, гледачы, сцэна, карціна, антрэпрыза, падмосткі, жыццё.

4. Запішыце беларускія адпаведнікі да наступных рускіх слоў. Параўнайце формы роду і ліку назоўнікаў у абедзвюх мовах.

Поведение, сумерки, грудь, хитрость, земляника, знание, дверь, губы, занятие, пение, цымбалы, аплодисменты, обои, юность, бессердечие, большинство, неудовольствие, рукопись, средство, жаль, медаль, мать, чернила, зал, шкаф, лекарство, салат, новость, отсутствие, детство, жизнь, объявление, уважение, степь, единодушие, свет, яблоко, подпись, живопись, средство, кисть, роспись, кафель, летопись, пыль, насыпь, дробь.

5. Пастаўце назоўнікі ў форме роднага, давальнага і меснага склонаў адзіночнага ліку. Правапіс канчаткаў растлумачце.

5.1. Роля, акадэмія, птушка, просьба, пяцёрка, граматыка, ружа, дабрата, вайна, вясёлка, павага, навука, дапамога, эпоха, кніга, эканоміка.

5.2. Арыёза, апрацоўка, аснова, партытура, санаціна, тоніка, партыя, цэзура, п'еса, першакрыніца, мелодыка, уверцюра, дэка, басэтля, асацыяцыя, тэхніка, музыка, клавіша.

5.3. Крама, адміністрацыя, акцыя, цана, каціроўка, прыватызацыя, стаўка, асацыяцыя, кар'ера, здзелка, сфера, арганізацыя, фірма, структура, улада, асоба, прапаганда.

5.4. Бяда, рыса, вечарына, праблема, структура, група, дапамога, змена, аснова, самамэта, сістэматызацыя, паўза, віктарына, рэакцыя, педагогіка.

5.5. Прастора, замалёўка, пабудова, культура, пластыка, бронза, этыка, парсуна, эпоха, тканіна, саломка, праблема, выцінанка, карыятыда, фарба, статуэтка.

5.6. Газета, бібліятэка, выстава, вокладка, фанаграма, рубрыка, беларусістыка, марка, статыстыка, аргтэхніка, інфармацыя, літаратура, застаўка, картатэка, рэцэнзія, прапаганда.

5.7. Балетка, пачка, балетаманія, нага, пара, зала, дынаміка, кампазіцыя, куліса, міміка, партнёрка, пластыка, авансцэна, мініяцюра.

5.8. Даўніна, метрыка, крыніца, археалогія, нумізматыка, праца, кераміка, грамата, рэканструкцыя, пацерка, капліца, майстэрня, Вільня, арка.

5.9. Эстрада, дэкламацыя, інтрыга, антрэпрыза, роля, рэжысура, сцэна, кінакарціна, студыя, аўдыторыя, прэм’ера, п’еса.

6. Пастаўце назоўнікі ў патрэбнай форме і вусна растлумачце правапіс канчаткаў.

6.1. Вуліцы (горад), шмат (час), копія (дакумент), нумар (канцэрт), сіла (удар), пачуццё (гумар), для фарміравання (імідж), прымяненне (менеджмент) у (практыка), перабудова гаспадарчага (механізм), кансультатыўная дапамога па (тэлефон), апрацоўкі беларускага (фальклор), пасля веснавога (дождж), недалёка ад (музей), з боку (горад), арганізацыя навуковага (матэрыял).

6.2. Песня з (цыкл), развучванне з (ліст), ноты натуральнага (гукарад), у дачыненні да (жанр) оперы, старонкі (клавір), прафесійны рост (баяніст-акампаніятар), у мастацтве (акампанемент), у выкананні (хор), на ўсіх ступенях (лад), сродкі рытмічнага (малюнак), прыярытэт (тэмпарытм), гарманізацыя (скачок) у мелодыі, роля раўнамерна-тэмпераванага (строй), акордыка дыятанічных варыянтаў (мажор), прадстаўнік (неаджаз).

6.3. Напісанне (сценарый), індэкс (узровень) жыцця, тып (прадпрымальнік), паводзіны (лідар), тэатральнага (калектыў), правы (акцыянер), задачы (маркетынг), падпісанне (дагавор), складанне (бізнес-план), набыццё жыццёвага (вопыт), павышэнне (рэйтынг).

6.4. Выхаванне (рытуал), залежыць ад асобы кожнага (індывід), рэцыдыў (страх), новага (клуб), праяўленне (талент), педагагічнага (такт), адаптацыя да знешняга (асяроддзе), дапамога (мецэнат), у выніку (эксперымент), арганізацыя (лекторый).

6.5. Твор (жывапіс), наведванне (музей), эпоха (Рэнесанс), мастацкага (вобраз), рысы (футурызм), прозвішча (мастак), нямя (эскіз), прадстаўнік (сюррэалізм), крытыка (плагіят), прыгожага (ландшафт), ткацтва (ручнік).

6.6. Павышэнне (прэстыж) бібліятэкі, ажыццяўленне (інтэграцыя), аналіз (попыт) карыстальнікаў, стварэнне (сектар) (маркетынг), месца на інфармацыйным (рынак), пытанні (выхад) на рынак паслуг, даведнік па (бізнес), фінансавая дапамога (бібліятэка), новая экспазіцыя на (выстаўка) не павінна быць (арганізацыя) закрытага (тып), адаптацыя да знешняга (асяроддзе), базіруецца на (перапрацоўка інфармацыі), залежыць ад асобы кожнага (індывід), рэалізацыя стратэгічнага (план), ажыццяўленне патэнтнага (пошук), у тэксце першаснага (дакумент), патэнтнае заканадаўства краін (свет).

6.7. Кампазіцыя фальклорнага (твор), сістэма народнай музыкі і (танец), частка адзінага (комплекс) народнай культуры, фарміраванне прафесійных якасцей (харэограф), з харэаграфічнага (пункт) гледжання, сімбіёз музыкі і танцавальнага (рух), мелодыі канкрэтных (жанр) і (метр), сумесная праца (пастаноўшчык) і (музыкант), увядзенне кантраснага (тэматызм), у аснове танцавальнага (нумар), распрацоўка музычнага (матэрыял), адчуванне добрага (густ) і (стыль), аранжыроўка з выкарыстаннем (сінтэзатар), размяшчэнне ў прасторы элементаў (малюнак), для раскрыцця вобразнага (сэнс) харэаграфічнага (твор), вычляненне асобнага (матыў), напісаны для (хор), (голас) і фартэпіяна, пры падрыхтоўцы фальклорнага (вечар), (спектакль), фальклорнага (канцэрт).

6.8. Вежы і муры (замак), аснова (дэкор), вырабы ўтылітарна-мастацкага (характар), рэшткі фрэскавага (роспіс), ілюзія (аб’ём), фартухі з палатна ці (паркаль), прычыны (росквіт) і (заняпад), спыніць нечакана (вораг), пластыка галоўнага (фасад), верхняя частка (інтэр’ер) Нясвіжскага (касцёл), аналаг (комплекс) бенедыкцінскага (кляштар), раскопкі замкавага (двор), будынак спланаваны па рымска-каталіцкім (канон), на галоўным фасадзе

(будынак), дэкор (фрыз), партал галоўнага (уваход) у касцёл, помнік архітэктуры перыяду (рэнесанс), велічнае аблічча (храм).

6.9. Для новага (спектакль), у канцы першага (акт), тонкага (падтэкст), напісанне (сценарый), пастаноўка знакамітага (рэжысёр), для раскрыцця вобразнага (сэнс) мастацкага (твор), тэатральнага (калектыў), у мове (персанаж), кіраўнік (тэатр), у драматычным (маналог), разнастайнага (рэквізіт), раскрыццё (светапогляд), восеньскага (рэпертуар).

7. Складзіце словазлучэнні з наступнымі словамі, памятаючы, што ў залежнасці ад семантыкі слова, якую яно набывае ў кантэксце, некаторыя назоўнікі маюць паралельныя канчаткі *-а(-я)* і *-у(-ю)*.

Параўнайце: лісце маладога дуба – паркет з дубу…

Выхад → ***а*** дзверы, вароты;
у дзеянне.

Аўтарытэт → ***а*** асоба, якая карыстаецца заслужанай павагай, мае ўплыў;
у агульнапрызнанае значэнне, уплыў.

Гук → ***а*** найменшы членараздзельны элемент чалавечай мовы;
у ваганні паветра, якія мы ўспрымаем слыхам.

Інструмент → ***а*** усякая прылада для выканання якой-небудзь работы;
у сукупнасць прылад для якой-небудзь работы.

Лістапад → ***а*** назва месяца;
у ападанне лісця восенню.

Пропуск → ***а*** дакумент на права ўваходу, уезду і г. д.;
у дзеянне паводле дзеясловаў прапускаць – прапусціць.

Талент → ***а*** таленавіты чалавек;
у прыродныя здольнасці.

Загад → ***а*** дакумент;
у дзеянне.

Клён → ***а*** назва асобнага дрэва;
у матэрыял, драўніна.

Пасаж → ***а*** крытая галерэя;
у музычны прыём.

Дагавор → ***а*** дакумент; ***у*** дзеянне.

Пейзаж → ***а*** тэрмін; ***у*** краявід.

Антракт → ***а*** невялікі музычны твор; ***у*** перапынак паміж дзеяннем.

Курс → ***а*** у іншых значэннях; ***у*** напрамак.

Дом → ***а*** будынак; ***у*** ачаг, жыллё.

8. Пастаўце назоўнікі ў форме давальнага і меснага склонаў адзіночнага ліку.

8.1. Кіраўнік, фестываль, калектыў, асяроддзе, герой, прынцып, клуб, прадстаўнік, вечар, разгляд, рэдактар, кампраміс, педагог, фактар, этап.

8.2. Меламан, паланэз, каларыт, тэмбр, дырыжор, строй, палец, стэрэатып, хор, падгалосак, кантрапункт, інструмент, ансамбль, клавір, матыў, вальс, акампаніятар, развіццё, музіцыраванне, рознагалоссе, голас.

8.3. Менеджмент, дагавор, бюджэт, спажывец, калектыў, лідар, распаўсюджвальнік, акцыянер, улік, аўкцыён, акцыз, фактар, абслугоўванне, сцэнарый, адказ, дабрабыт.

8.4. Сангвінік, адпачынак, эксперымент, клуб, лекторый, абавязак, равеснік, канфлікт, дабрадзей, цэнтр, гуманізм, кліент, валанцёр, талент, беспрытульнік, здароўе,

8.5. Партрэтыст, барэльеф, акварыст, жывапіс, аналіз, экспанат, арнамент, іканапіс, пленэр, далягляд, пейзаж, ювелір, музей, мастак, трыпціх.

8.6. Дапаможнік, чытач, фонд, маркетынг, філіял, менеджар, цыкл, фармуляр, архіварыус, штотыднёвік, улік, часопіс, бібліятэкар, аўтар, дакумент.

8.7. Паклон, танец, марш, крыжачок, мастацтва, харэограф, рэверанс, партнёр, крок, баль, абцас, артыст, факстрот, твар, танцоўшчык, грым.

8.8. Посуд, рэстаўратар, культ, аналіз, збудаванне, храм, век, скарб, кляштар, замак, дзядзінец, музей, некропаль, інтэр’ер, экскурсавод, умацаванне, посуд, архівасховішча.

8.9. Дзеянне, каларыт, герой, антракт, спектакль, рэжысёр, гурток, глядач, аўтар, рэквізіт, узровень, водгук, пастаноўшчык, падтэкст, рэпертуар, персанаж, монаспектакль, маналог.

9. Запішыце наступныя назоўнікі ў назоўным і родным склонах множнага ліку. Ці ад усіх слоў можна ўтварыць гэтыя формы? Вусна растлумачце склонавыя канчаткі.

9.1. Размова, зубраня, чалавек, грамадзянін, беларус, таварыш, песня, дзіця, натхненне, камп'ютар, рэспубліка, мецэнат, каляндар, калектыў.

9.2. Гама, рэпетыцыя, кантрабас, спявак, аркестроўка, рэпертуар, бенефіс, эпізод, віртуоз, стэрэатып, спевы, тэхніка, трохгучча.

9.3. Маркетынг, менеджар, дэкларацыя, кантынгент, бежанец, рэфлекс, эканоміка, бізнесмен, беспрацоўе, умова, ініцыятыва, калектыў, дабрабыт, таварыства.

9.4. Флегматык, асяроддзе, апякун, паводзіны, рытуал, соцыум, кліент, раўнапраўе, кінасеанс, стэрэатып, шасцігодка.

9.5. Барэльеф, рамеснік, экспанат, мемарыял, габелен, далягляд, пейзаж, музей, дыяпазон, абстракцыянізм, фарба, шкло, іканаграфія.

9.6. Тыраж, фонд, аўтарэферат, дакумент, брашура, абанемент, пераплёт, класіфікацыя, персаналіі, чытач, дыяпазітыў, слоўнік.

9.7. Грым, танцоўшчык, рампа, рэверанс, прысяданне, варыяцыя, гастролі, танец, праграма, балетмайстар.

9.8. Экскурсія, век, грамата, кафля, кераміка, неаліт, феадал, знаходка, сярэднявечча, помнік, пацерка, рэшткі,

9.9. Вадэвіль, дэбютант, лейтматыў, рэпетыцыя, антыгерой, асвятленне, радыётэатр, інтэрмедыя, радыёпастаноўка, тэатразнавец.

10. Пастаўце назоўнікі ў форме творнага і меснага склонаў адзіночнага ліку. Растлумачце падаўжэнне канцавых зычных ці яго адсутнасць у творным склоне.

10.1. Радасць, Нарач, творчасць, моладзь, даль, медзь, соль, памяць, верф, глуш, дзейнасць, любоў, шыр, глыб, ноч, рацыянальнасць.

10.2. Танальнасць, віяланчэль, разнастайнасць, варыяцыйнасць, неардынарнасць, імітацыйнасць.

10.3. Мэтазгоднасць, эмацыянальнасць, дзейнасць, рэгулярнасць, запазычанасць, неплацежаздольнасць, канкурэнтаздольнасць.

10.4. Цэльнасць, уласцівасць, зацікаўленасць, бездапаможнасць, кансультатыўнасць, трывожнасць, справядлівасць.

10.5. Гарызанталь, гуаш, вытворчасць, акварэль, дэкаратыўнасць, рознакаляровасць, эмаль, здольнасць.

10.6. Начытанасць, вобласць, колькасць, выбарачнасць, аб'ектыўнасць, пераемнасць, адказнасць.

10.7. Тэхнічнасць, цырыманіяльнасць, выварatнасць, танцавальнасць, філіграннасць.

10.8. Кампанентнасць, адкрытасць, узаемазалежнасць, аповесць, напоўненасць, медзь.

10.9. Дэкламацыйнасць, здольнасць, прыдатнасць, наяўнасць, годнасць, моладзь.

11. Запішыце наступныя назоўнікі ў назоўным і родным склонах множнага ліку. Вусна растлумачце пастаноўку склонавых канчаткаў.

11.1. Размова, зубраня, чалавек, грамадзянін, беларус, таварыш, песня, дзіця, натхненне, камп'ютар, рэспубліка, мецэнат, каляндар, калектыў.

11.2. Гама, рэпетыцыя, кантрабас, спявак, аркестроўка, рэпертуар, бенефіс, эпізод, віртуоз, стэрэатып, спевы, тэхніка, трохгучча.

11.3. Маркетынг, менеджар, дэкларацыя, кантынгент, бежанец, рэфлекс, эканоміка, бізнесмен, беспрацоўе, умова, ініцыятыва, калектыў, дабрабыт, таварыства.

11.4. Флегматык, асяроддзе, апякун, паводзіны, рытуал, соцыум, кліент, раўнапраўе, кінасеанс, стэрэатып, шасцігодка.

11.5. Барэльеф, рамеснік, экспанат, мемарыял, габелен, далягляд, пейзаж, музей, дыяпазон, абстракцыянізм, фарба, шкло, іканаграфія.

11.6. Тыраж, фонд, аўтарэферат, дакумент, брашура, абанемент, пераплёт, класіфікацыя, персаналіі, чытач, дыяпазітыў, слоўнік.

11.7. Грым, танцоўшчык, рампа, рэверанс, прысяданне, варыяцыя, гастролі, танец, праграма, балетмайстар.

11.8. Экскурсія, век, грамата, кафля, кераміка, неаліт, феадал, знаходка, сярэднявечча, помнік, пацерка, рэштка, музей, герой.

11.9. Вадэвіль, дэбютант, лейтматыў, рэпетыцыя, антыгерой, асвятленне, радыётэатр, інтэрмедыя, радыёпастаноўка, тэатразнавец.

12. Раскрыйце дужкі, паставіўшы назоўнікі ў патрэбных склонах.

1. У Заходняй Беларусі таксама былі краязнаўчыя аб’яднанні і краязнаўчыя выданні ў (Ліда), (Глыбокае), (Вільня), (Гродна) *(Г. Каханоўскі).* 2. Цудоўны ансамбль Будайскай крапасной гары, што ўзвышаецца над (Дунай) у (Будапешт), нядаўна занесены ў спіс ЮНЕСКА, дзе рэгіструюцца найбольш выдатныя культурныя каштоўнасці свету *(А. Гарэлік).* 3. Гліняныя цацкі (Міхал Ржэвуцкі) з (Неманіца) Браслаўскага раёна і іншых майстроў мастацкага фонду не залежваюцца ў магазінах, іх ахвотна раскупляюць на розных кірмашах і святах як арыгінальныя мастацкія творы і сувеніры *(Я. Сахута).* 4. Была і беларуская вобласць Падляшша з гарадамі (Драгічын), (Бельск), (Мельнік), (Бранск), (Сураж) *(Э. Зайкоўскі).*

13. Перакладзіце на беларускую мову словазлучэнні.

13.1. Говорить по телефону, рассказывает о случае, специалист по денежным расчетам в учреждениях, на предприятии; продавать товары на зарубежном рынке по сниженным ценам; услуги по изучению и прогнозированию рынка; по проведению комплекса мариторинговых исследований.

13.2. Существуют определенные правила интонирования, взаимоотношения интервала и лада, высокие звуки натурального звукоряда, разные по своей темброво-звуковой окраске; открывает для исполнителя возможность извлечения основного тона; по своему натуральному звукоряду, объему и аппликатуре имеет сходство с корнетом, нотируется в скрипичном ключе; мелодии танцевального характера; сольная партия на французском габое, необходимость использования в оркестровой практике; наличие хорошего музыкального вкуса.

13.3. Получить необходимую сумму денег в банке; государственная деятельность по купле и продаже; долгосрочное вложение капитала в какое-нибудь дело; управление долговременными и текущими культуротворческими процессами; многоуровневый подход к регуляции социокультурных процессов; приобщение людей к знаниям и интересам; свидетельствует о значении современного менеджмента в управлении процессами стратегического, тактического и оперативного развития; в оценке менеджмента как науки; изучает экономические отношения в сфере

производства, распределения и обмена материальных и нематериальных благ; исследует возможности подготовки человеческого капитала; создание культурного продукта.

13.4. Деятельность в сфере оказания социальных услуг населению; необходимо принимать меры по выявленным социальным проблемам; действовать в соответствии с конкретными обстоятельствами; право каждого человека на самореализацию; отвечать на вопросы об авторе и цели создания документов; открытие нового реабилитационного центра; развитие таланта человека; воспитание ребенка в семье.

13.5. Рисунок вышивки геометрического характера; образцы белорусского народного исскуства; насыщеный колорит узора рушника; заслуживает пристального внимания искусствоведов; скромность декоративных мотивов не оттеняет мужественных качеств гончарной посуды; эстэтика реалистического пейзажа; два основных творческих направления в резьбе по дереву, живописи и графике.

13.6. Основа справочного аппарата библиотеки; доукомплектование фонда; свобода доступа к любому документу; участвует в подготовке специалистов; фонды краеведческого содержания; с учетом читательского спроса; опыт издания малотиражной литературы; падение социального престижа профессии библиотекаря; внимания к себе как профессионалу; расширение кругозора; деятельность интернет-клуба; число занятий в читальном зале библиотекарей сократилось до минимума; пути поиска и метода оценки документов; дисциплины экономического цикла; организация документального потока; играть роль отвлекающего фактора; руководство чтением конкретного читателя; фонд абонемента; перенос центра «тяжести» с «общественно значительных на частные» проблемы.

13.7. Процесс художественной обработки народного танца; включались в ткань балета; народные танцы как средство характеристики места и времени действия; коллективная сценическая трансформация фольклора; четкая драматургическая основа сюжетного типа; покоряла своей стремительной силой; богатством рисунка и стройностью композиции; расположение по углам квадрата; участие в подготовке и проведении серьезных и ответственных профессиональных мероприятий; с точки зрения профессионального роста; по ходу рассмотрения лексики танца.

13.8. Информационное обеспечение музейного дела; образцы белорусского народного исскуства; развитие ремесла и зодчества; получил художественное образование в студии мастера

архитектурного пейзажа; лишили права аренды и проживания в родовом имении; началось создание третьего у восточных славян Софийского собора; являются одним из ранних образцов монументальной живописи; после раскола христианства; квадрат является частью архаичного орнамента.

13.9. Повышение профессионального уровня; в фрагменте текста; приглашение артистов для участия в спектаклях или концертах; представители театра абсурда; воспроизвести напряжение боя; в условиях локальной площадки мемориала; постижение языка массового действа; раскрытие творческого потенциала; выявление духовных и физических способностей индивида; воспитание чувства коллективизма; не принимал режиссерского деспотизма; работа на протяжении репетиционного периода.

14. Прачытайце словазлучэнні. Вусна растлумачце склонавыя канчаткі ўласных назоўнікаў.

З мастаком Шышкіным; пры Алегу Шэлегу; напісаць Цімоху Ворчыку; ганарыцца Беларуссю; са скнарам Мішам; сустрэцца пад Барнавулам; сябраваць з Алесяй Гурыновіч, Янкам Сіпаковым; прыгожым Кіевам; пры Васілю; з Янкам Купалам; Алегам Лойкам; з Віцем; зімаваць пад Туравам; палатно, напісанае Янкам Матэйкам; замацаваць іншую назву за Койданавым; лецішча пад Рагачовам; кніга, напісаная Куляшовым; прыпынак цягніка пад Коласавам; сюіта, напісаная кампазітарам Глебавым; касмічная сувязь з Лонданам; гістарычныя падзеі пад Шчучынам.

15. Запішыце па памяці.

1) імёны і прозвішчы выдатных беларускіх мастакоў, кампазітараў, паставіўшы іх у творным склоне адз. ліку;

2) назвы рэспубліканскіх газет і часопісаў, паставіўшы іх у родным склоне адз. ліку;

3) назвы сталіц краін, паставіўшы іх у творным склоне адз. ліку.

16. Вызначце ролю назоўніка ва ўтварэнні іменных тэрміналагічных мадэляў.

16.1. Крытыка розуму; творчасць чалавецтва; культура чалавечых адносін; канцэпцыя культурнага развіцця; элітарная культура; фарміраванне асобы; барацьба з язычніцтвам; умацаванне

беларускай дзяржаўнасці; ліквідацыя мяжы паміж мастаком і гледачом; далучэнне да літаратуры, музыкі, тэатральнага мастацтва; апора на нацыянальныя традыцыі; узровень выканання; фестываль песні; патрыятычнае выхаванне моладзі.

16.2. Дубль-бемоль; спевакі-кампазітары; мюзік-хол; спецін-струмент; на тэмы народных песень; альты і басы ў ролі акам-панементу; знакі альтэрацыі; чаргаванне двух гукаў ці сугуччаў; знак легата; элементы джазавай музыкі; тэорыя і практыка вакалу; падрыхтоўка дырыжора-прафесіянала; выканаўца народных песень; фрагмент твора; стварэнне песенных кампазіцый; планаванне рэпетыцый; чытанне нотнага тэксту з ліста; характар твора; партыя на габоі; баяніст-акампаніятар; выхаванне музычнага густу; натуецца ў скрыпічным ключы.

16.3. Асобасныя ацэнкі кіраўніка; індэкс узроўню жыцця; арганізацыя размеркавання паўнамоцтваў; узнікненне крызісных сітуацый; кіраванне канфліктамі і стрэсамі; карпаратыўная адказнасць; распаўсюджвальнік інфармацыі; установа культуры; канкурэнтаздольнасць; прадстаўнік фірмы; таварыства з абмежаванай адказнасцю; сфера абслугоўвання; сацыякультурныя фактары.

16.4. Зносіны паміж людзьмі; сістэма гуманітарных паслуг; рэцыдыў страху; дзіцячая аўдыторыя; стэрэатып; узаемасувязь індывідаў; арганізацыя вольнага часу моладзі; лінія паводзін; дапамога асобным людзям; сацыяльны кантроль асобы; дзеці груп рызыкі; прафілактыка правапарушэнняў; аналіз сацыяльных працэсаў; дэградацыя асобы; унутрысямейныя цяжкасці і канфлікты; рэгуляцыя адносін чалавека з грамадствам; адасобіцца ад людзей; лад жыцця; сурдапедагогіка; клуб па інтарэсах; інтэрактыўнае навучанне; мадэляванне сітуацыі; макрафактары; нядобранадзейнасць; канфідэнцыяльнасць інфармацыі.

16.5. Гарманічнае спалучэнне фарбаў; лозапляценне; жывапіс; скульптурная кампазіцыя; вышыўка арнаменту; узоры клетак і паскаў; дэкаратыўныя тканіны; майстэрня па вырабе абрусаў; асаблівасць ручнікоў; для аздобы адзення; маюць кампазіцыю з каймой; від народнай творчасці; якасці матэрыялу; кафля з малюнкамі; вытворчасць керамічнага посуду; попельніцы з ляпнінай; у стылі мадэрн; пад уплывам класіцызму; упрыгожанні ў выглядзе чалавечага твару або галавы жывёлы; мэбля для палацаў і храмаў; колькасць нітак і асновы; саломапляцельшчык; вырабы народных майстроў; раслінны дэкор; навыкі апрацоўкі матэрыялаў; музей на грамадскіх пачатках.

16.6. Кантынгент карыстальнікаў; апасродкаваныя функцыі бібліятэк; помнікі матэрыяльнай культуры; кнігадрукаванне; гістарыяграфія; кнігі; структура ЦБС; бібліятэка-філіял; аддзел бібліятэкі; бібліяграфія беларусазнаўства; каталог на мікраносьбітах; інтэр'ер бібліятэкі; статычны ўлік у бібліятэцы; платныя паслугі; запрашэнне да ўдзелу ў вечарах; у дар ад чытачоў; доступ да фондаў; звесткі аб сацыяльна-псіхалагічных службах; сустрэчы з народнымі лекарамі; у дапамогу самаадукацыі; крыніцы масавай бібліяграфіі; дапамога ў падборы літаратуры; патрабаванні да буклета; план размяшчэння аддзелаў; выданні ў выглядзе брашуры; работа на камп'ютары; забеспячэнне доступу да інфармацыі; уплыў на якасць інфармацыйных паслуг.

16.7. Экзерсіс па класічным танцы; лацінаамерыканскай праграмы; на сцэне тэатра; глыбокі рэверанс; абутак для танца; атрыбутыка танца; балетмайстар; танцзала; выкананне парамі па крузе; блок рухаў; полька-вальс; удзельнікі карагода; падскокі на месцы; харэаграфія беларусаў; варыянт танца; карагод-гульня; святкаванне зімовага сонцавароту; удзельнікі гульні; пара танцораў; танец з прыпеўкамі; прыпеўкі на калядны напеў; крок з прыступам ці прыстаўленнем нагі; у такт музыкі; фігура кадрылі; танец разам з моладдзю; вальс для маладых; імітацыя рухаў вераб'я; трансфармацыя асобных нацыянальных танцаў іншых народаў.

16.8. Арэал распаўсюджвання; уплыў хрысціянскай ідэалогіі; вышыўка золатам; калекцыя крыжоў; упрыгожанне разьбой і інкрустацыяй; часткі іканапісаў; матэрыялы археалагічных раскопак; экспанаты асноўнага фонду; разьба па дрэве; прадметы побыту беларусаў; пантэон багоў; дэкор з ангобу; майстра-самавучка; цацкі ў выглядзе птушак; базіліка касцёла; бажніца з адной апсідай; пластыка галоўнага фасада; перыяд барока; выявы святых; карнізы алтароў; паслужыў аналагам для навакольных культавых будынкаў; кампазіцыя ў выглядзе трохнефавай крыжова-купальнай базілікі з трыма алтарамі і апсідамі; разьба па дрэве з пазалотай.

16.9. Фестываль тэатраў лялек; асацыяцыя тэатральных менеджараў; зрухі ў жыцці тэатра; людзі тэатра; спектакль па п'есе; калектыў аднадумцаў; на ўзроўні самадзейнага тэатра; выносіць на суд гледача; эксперымент дзеля эксперымента; касцюмы персанажаў; сцэнаграфія і касцюмы; жанр спектакля; мастацкае афармленне спектакля; змяненне пластычнага малюнка вобраза;

акцёры-аднадумцы; спектакль з сінхронным перакладам; драматургія абсурду; дамінанта ў характары.

§ 11. Нарматыўнае ўжыванне лексіка-граматычных разрадаў прыметнікаў, займеннікаў і прыслоўяў

Разрады прыметнікаў

Разрады	Пытанні	Абазначаюць	Форма	Ступені параўнання
ЯКАСНЫЯ	ЯКІ? ЯКАЯ? ЯКОЕ? ЯКІЯ?	Прыметы прадметаў паводле: 1) формы і памеру: *доўгі*, *шырокі*; 2) смаку і паху: *кіслы*, *салодкі*, *духмяны*; 3) знешніх фізічных і душэўных уласцівасцей: *смелы*, *высокі*	ПОЎНАЯ І КАРОТКАЯ	УТВАРАЮЦЬ
АДНОСНЫЯ	ЯКІ? ЯКАЯ? ЯКОЕ? ЯКІЯ?	Прыметы прадметаў паводле адносін да: 1) матэрыялу: *пшанічны*, *медны, замшавы,каменны*; 2) месца яго знаходжання: *вясковы*, *лугавы, віцебскі*; 3) часу: *веснавы*, *учарашні, вячэрні*; 4) дзеяння: *вылічальны*, *будаўнічы*; 5) жанру, прызначэння і інш.: *драматургічны, культуралагічны, музычны, рамесніцкі*	ПОЎНАЯ	НЕ ЎТВАРАЮЦЬ
ПРЫНАЛЕЖНЫ	ЧЫЙ? ЧЫЯ? ЧЫЁ? ЧЫЕ?	Прыметы прад-метаў паводле іх прыналежнасці: 1) чалавеку: *бацькаў, Аленчын*; 2) жывёлам: *жураўліны*, *вавёрчын*	ПОЎНАЯ І КАРОТКАЯ	НЕ ЎТВАРАЮЦЬ

Я				

1. Выпішыце з тэксту прыметнікі і вызначце іх разрады. Вусна адкажыце, прыметнікі якіх разрадаў у тэкстах адсутнічаюць і чаму?

1.1. Архетыпы – культурна-базісны элемент, які фарміруе кантактныя мадэлі духоўнага жыцця. Змест культурнага архетыпа складае найбольш тыповае ў культуры. Яго фарміраванне адбываецца на ўзроўні культуры ўсяго чалавецтва або культур буйных культурных гістарычных супольнасцей у працэсе сістэматызацыі і спецыялізацыі… Культурныя архетыпы выступаюць у якасці ўстойлівых структур апрацоўкі, захавання і рэпрэзентацыі калектыўнага вопыту. Існуюць універсальныя і этнічныя архетыпы. Сярод пашыраных універсальных архетыпаў – утаймаванага агню, хаосу, тварэння, шлюбнага саюзу, мужчынскага і жаночага пачатку, змены пакалення, залатога веку, сусветнага дрэва і інш. Этнічныя (этнакультурныя) архетыпы адлюстроўваюць і адначасова ў пэўным сэнсе вызначаюць адметныя рысы ментальнасці, характару, гістарычнага лёсу таго ці іншага народа. Паводле К. Юнга, этнічныя архетыпы выяўляюць не толькі народны вопыт мінулых часоў, яго ўяўленні пра сваю будучыню. Да іх ліку можна аднесці беларускія вобразы «роднай зямелькі», «роднай хаткі». Актыўная прысутнасць разглядаецца як важная ўмова захавання самабытнасці і цэласнасці нацыянальнай культуры. Культурныя архетыпы застаюцца практычна нязменнымі па сваёй сутнасці, аднак у прасторава-часавай перспектыве праяўляюцца ў самых разнастайных формах: міфалагічных сюжэтах і вобразах, рэлігійных вучэннях і рытуалах, нацыянальных ідэалах і інш. *(Э. Дубянецкі)*.

1.2. Кароль піяністаў Еўропы, віртуоз і кампазітар, педагог, публіцыст і грамадскі дзеяч Ферэнц Ліст так сфармуляваў сваё эстэтычнае крэда: «…Разглядаюць мастацтва не як зручны сродак для дасягнення эгаістычных мэт і бясплоднай славы, але як сілу, якая аб’ядноўвае і згуртоўвае людзей адзін з адным… запаліць і падтрымае ў думках такое роднаснае дабру захапленне прыгожым, – вось задачы, якія павінен паставіць перад сабой мастак…». Ліст адыграў вялікую ролю ў развіцці сусветнага музычнага мастацтва. Ён аднавіў змест музыкі, зыходзячы з ідэалаў гуманізму і асветніцтва, яго наватарскія пошукі і дасягненні ў галіне формы і гармоніі, рытму, ладу аказалі моцнае ўздзеянне на далейшае музычнае развіццё многіх краін. Характэрныя рысы музыкі Ліста – гераічнасць і вытанчаная лірыка, буйны пафас і філасофская

сузіральнасць, імправізацыйнасць… Фартэпіяна ўспрымалася як цэлы аркестр не толькі па магутнасці гучання, але і шматфарбнай гукавой палітры (*І. Шыбаева).*

1.3. Спецыфіка культуралагічнай адукацыі ў тым, што яна павінна не толькі адлюстроўваць, але і апераджаць сацыякультурнае развіццё грамадства, каб апошняе праз культуру мела магчымасць лепш падрыхтавацца да ўспрымання новых ідэй і грамадскіх адносін. Сучаснае пакаленне ў трэцім тысячагоддзі арыентуецца на тыя каштоўнасці, якія навучальная ўстанова ў іх выхоўвае.

Па гэтай прычыне падрыхтоўка спецыялістаў у галіне культуры павінна прадугледжваць:

1) веданне імі гісторыі і этапаў развіцця прафесіі, звязанай з арганізацыяй вольнага часу і адпачынку;

2) авалоданне тэорыяй і філасофіяй культуры, асаблівасцямі арганізацыі вольнага часу;

3) веданне чалавечых і прыродных рэсурсаў, іх суаднесенасці з вопытам арганізацыі вольнага часу… (*М. Каралёў).*

1.4. Светапогляд – абагульненая сістэма поглядаў на навакольны свет, месца і ролю ў ім чалавека, а таксама на адносіны людзей да аб’ектыўнай рэчаіснасці і адзін да аднаго; адпаведныя гэтаму ідэалы і перакананні. Светапогляд – гэта базавыя ўяўленні, каштоўнасці, маральныя прынцыпы, вераванні, установкі, ідэалы, якія ўласцівы індывіду або падзяляюцца членамі грамадства і выкарыстоўваюцца ў якасці крытэрыяў у адносінах да навакольнага асяроддзя. Суб’ектам (носьбітам) светапогляду з’яўляецца і асобны чалавек, і сацыяльныя, прафесійныя групы, а таксама этнанацыянальныя, рэлігійныя супольнасці, і нават грамадства ў цэлым. Светапогляд асобнага індывіда фарміруецца пад уздзеяннем – спантанным ці мэтанакіраваным – светапогляду грамадства і тых сацыяльных супольнасцей, у якія ён уваходзіць. У складзе светапогляду выдзяляюцца такія якасна адрозныя элементы, як веды і перакананні. У тых выпадках, калі хочуць падкрэсліць эмацыянальны бок светапогляду, часта выкарыстоўваюць тэрмін «светаўспрыманне» (напрыклад, аптымістычнае, трагічнае светаўспрыманне і да т. п.). Гістарычна першай формай светапогляду з’яўляецца міфалагічны светапогляд, характэрны для дакласавых і раннекласавых грамадстваў. Асаблівую светапоглядную нагрузку бяруць на сябе рэлігія і філасофія. Пачынаючы з 17 стагоддзя істотнае значэнне ў фарміраванні светапогляду набывае навука *(Э. С. Дубянецкі).*

1.5. На Беларусі найбольш пашыраны аднаколерныя выцінанкі, часам іх рабілі ў некалькі слаёў рознага колеру. Узоры геаметрычныя, раслінныя, радзей зааморфныя і антрапаморфныя. Паводле кампазіцыі выцінанкі падзяляюцца на замкнёныя (у квадраце, многавугольніку, крузе выразаліся з веерападобна складзенага ў 4–8 разоў аркуша паперы), рапортныя (паперу складвалі гармонікам) і сіметрычныя (аркуш паперы перагіналі папалам). На Захадзе Беларусі горнымі ці поліхромнымі выцінанкамі аздаблялі беленыя сцены жылля. Узоры выцінанкі падобныя на ўзоры вышыўкі, ткацтва, размалёўкі і іншых відаў мастацтва, у некаторых з іх заўважалася імітацыя ажурных гардзінных тканін. У наш час круглымі выцінанкамі-сняжынкамі аздабляюць аконныя шыбы ў навагоднія святы. Калекцыя выцінанак зберагаецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры АН БССР (*Я. М. Сахута).*

1.6. Два асноўныя класы бібліятэк (спецыяльныя і публіцыстычныя) падзяляюцца на падкласы на аснове характарыстыкі запросаў чытачоў, якія і вызначаюць чытацкае прызначэнне яе. У сукупнасці запросаў, аб'яднаных агульнакультурнай патрэбай, выдзяляюцца запросы павышанага ўзроўню і стандартызаваныя. Патрэбы чытачоў як стандартызаванага, так і больш высокага ўзроўню, агульнакультурнага і спецыяльнага характару здольны задаволіць універсальныя навуковыя бібліятэкі, якія валодаюць вялікімі па аб'ёме і разнастайнымі па тэматыцы фондамі. Да іх у першую чаргу адносяцца нацыянальныя бібліятэкі (НБ), якія згодна з «Міжнароднай стандартызацыяй бібліятэчнай статыстыкі», зацверджанай на 16-й Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА, узначальваюць класіфікацыю бібліятэк і з'яўляюцца галоўнымі ўніверсальнымі навуковымі бібліятэкамі сваіх краін (*Л. І. Ракавецкая).*

1.7. Балетмайстарскі аналіз музычнага твора павінен, на наш погляд, уключаць наступныя этапы:

– актыўнае шматразовае праслухоўванне музычнага твора з мэтамі вызначэння мастацкага вобраза і спробы яго слоўнага апісання;

– аналіз сродкаў выразнасці твора, у які ўваходзіць высвятленне асаблівасцей яго мелодыкі ў мэтах цэласнага ўспрымання і яе найдрабнейшых адзінак (фраз, матываў): акрамя мелодыі, звяртаецца ўвага на рытм, метр, лад, танальнасць, гармонію, фактуру.

Вядома, што музыка шматзначная ў сваім адлюстраванні навакольнага свету: адна і тая ж мелодыя дапускае розныя варыянты мастацкай інтэрпрэтацыі. Яны правамерныя ў дачыненні выяўленчага значэння музыкі, г. зн. тых зрокавых вобразаў, якія яна можа выклікаць у розных людзей *(С. В. Гуткоўская, Н. М. Хадзінская).*

1.8. На Беларусі першыя музейныя калекцыі, дзе былі краязнаўчыя і этнаграфічныя матэрыялы, вядомы з XVIII ст. У 1920 г. заснаваны Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Багатыя беларускія археалагічныя, этнаграфічныя і мастацкія калекцыі меў Беларускі музей у Вільні. У краязнаўчых музеях праводзіцца работа па выяўленні і вывучэнні новых матэрыялаў музейнага значэння. Музеям, што працуюць на грамадскіх пачатках, аказваецца метадычная дапамога. Супрацоўнікі музеяў удзельнічаюць у напісанні гісторыі свайго краю, у распрацоўках тэматычных экскурсій, у выяўленні і ахове помнікаў прыроды, гісторыі і культуры Беларусі, асаблівую ўвагу аддаюць патрыятычнаму выхаванню моладзі *(Г. А. Каханоўскі).*

1.9. Ці ёсць у тэатра свая мова? Відавочна, што гэтае пытанне мае адназначны адказ: калі людзі ў тэатральнай зале ўспрымаюць тое, што адбываецца на сцэне, то ім зразумела і сцэнічная мова. Тэатральная мова змяняецца і ўзбагачаецца як і ўсякая жывая мова, аднак яна і адносна ўстойлівая. Апісаць мову тэатра – значыць даць пералік знакаў (ці алфавіт) і назваць усе правілы дзеянняў над ім. Але тэатр, як вядома, – мастацтва сінтэтычнае, якое канцэнтруе элементы многіх іншых відаў мастацтва. Відавочна, знакі мовы іншых мастацтваў уваходзяць у алфавіт тэатральнай, хаця і не вычэрпваюць яго спаўна, пакідаючы месца для ўласных сцэнічных знакаў. Таму, магчыма, не так важна даць пералік знакаў мовы, а больш важна выявіць структурныя асаблівасці знакавых сістэм тэатра, прыметы і ўласцівасці яго мовы.

Уявім, што мы ўваходзім у глядзельную залу. На сцэну выходзіць акцёр. Ён жывы чалавек, але будзе на сцэне «прадстаўніком» іншага чалавека. Усе асаблівасці яго знешняга выгляду, яго тыпажнасць засталіся з ім і будуць выклікаць у гледача асацыяцыі не з уласцівасцямі дадзенага канкрэтнага чалавека (якога глядач, як правіла, не ведае), а з уласцівасцямі чалавека пэўнага тыпу, інакш кажучы, ён як бы з’явіцца знакам самога сябе (*Р. Л. Бузук).*

2. Прачытайце, вусна пастаўце прыметнікі ў патрэбных ускосных склонах, вызначце род, лік, склон.

2.1. (Глыбокі эстэтычны) аналіз мастацкіх твораў; у (рэпертуарны) зборніку; (фальклорны) крыніцы; рысы (асноўны мастацкі) стыляў і плыняў; дзеячы (выяўленчы і тэатральны) мастацтва; (асноўны культуралагічны) паняцці і тэрміны; разам з (агульны і тэатральны) матэрыяламі; фарміраванне (гуманістычны культурны) каштоўнасцей; тыпы субкультуры (масавы, элітарны, народны, маладзёжны); звесткі пра найбольш (важны) творы; уклад у скарбонку (айчынны і сусветны) культуры; выданне ілюстравана (каляровы і чорна-белы) фотаздымкамі; уздзеянне на (чалавечы) эмоцыі; (маральны і эстэтычны) каштоўнасці розных народаў свету; (перадавы грамадскі і палітычны) дзеячы; прыярытэт (агульначалавечы) каштоўнасцей; у (розны гістарычны) эпохі; (моцны эмацыянальны) уздзеянне вобразаў; перадае (інтэлектуальны і эмацыянальны) інфармацыю.

2.2. Развіццё (музыкальны) слыху; (разнастайны інтанацыйны) і (пеўчы) практыкаванні; у (метрарытмічны) адносінах; работа над (акордавы) паслядоўнасцямі; разбор (музычны) матэрыялаў; будова (беларускі народны) песні; у (сярэдні музычны) установах; не маюць (належны слыхавы) падрыхтоўкі; поліфанія ў (беларускі і рускі) фальклоры; (гарызантальны і вертыкальны) паказчыкі імітацыі; пашырэнне тэматызму за кошт (песенны, рамансавы, жанрава-танцавальны, фальклорны) тэм; (старадаўні санетны) форма; кантраст паміж (галоўны і пабочны) тэмамі; у (буйны цыклічны вакальна-інструментальны) творы; (рускі вакальны песенны) ронда.

2.3. (Шырокі міжнародны) прызнанне; (інфармацыйны) працэс; шэраг (састаўны упарадкаваны) частак; у адпаведнасці (этычны) нормамі; парушэнне (аўтарскі) права, па (штогадовы актуальны) тэме канферэнцыі, (змястоўны адкрыты) праграма для супрацоўніцтва, у (неафіцыйны) абстаноўцы.

2.4. Вылучаюць узроўні (індывідуальны і калектыўны) і разнавіднасці (нацыянальны, рэлігійны, бюракратычны, таталітарны, першабытны, дзіцячы, афрыканскі, еўрапейскі і г. д.); прыстасаваць да (пэўны прыродна-сезонны) цыклаў; у (сацыяльна-бытавы) песеннай творчасці; падчас (цікавы песенны) вячорак; у (афіцыйны) абстаноўцы; да (шматтомны) выдання; абапіраўся на (літаратурны і драматургічны) узоры.

2.5. У (самабытны беларускі іканапісны) школе; аналізуюцца (гістарычны, музейны, архіўны, фальклорны) крыніцы; вырабы (гаспадарчы) прызначэння; у (гранёны віты) пляцёнках; вырабы (сучасны) саломапляцення; звычайна пакрывалі (зялёны ці каляровы) палівай; з іншымі відамі (народны) мастацтва; майстар карыстаецца (яркі лакальны) колерам; (утылітарна-дэкаратыўны) вырабы; (раслінны і звярыны) арнаментыка; (керамічны) посуд; (белацагляны, ёмкі, устойлівы, шыракагорлы) глякі; аздаблялі (прамы і хвалісты) паяскамі; на (верхні) частцы керамікі; творы (дэкаратыўна-прыкладны) мастацтва; у (арнаментальны прасторавы) малюнках; (геаметрычны) пабудовы.

2.6. У (неафіцыйны) абстаноўцы; (аўдыявізуальны і выяўленчы) дакументы; з'яўляюцца (першасны) дакументамі; (бібліяграфічны пошукавы) апарат; сукупнасць (тыпалагічны) функцый (нацыянальны) бібліятэкі; (дапаможны) паказчык; у (алфавітны) каталогу (гуманістычны) арыентацыя на карыстальнікаў; (інфармацыйны) інфраструктура; (інвентарны) нумары; у выніку (навукова-тэхнічны) прагрэсу; пра (перспектыўны бібліяграфічны) дапаможнік; (шматтомны) выданне; у (дадатковы) тыражы; (каталожны) карткі.

2.7. Крок у (шахматны) парадку; уздоўж (правы) куліс; (дробны) пераступы ў VI пазіцыі; у (імправізацыйны) танцы; па ходу (гадзіннікавы) стрэлкі; (яркі пластычны) інтанацыі; пры стварэнні (буйны сцэнічны) кампазіцый; у (эцюдны) рабоце; мелодыя (беларускі традыцыйны) танцы; (светлы, рамантычны вобразны) змест танца; адзін з (балетмайстарскі) прыёмаў; выкарыстоўваюцца (устойлівы структурны) элементы танца; паслядоўнасць (узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены) рухаў; своеасаблівасць (канкрэтны танцавальны) узораў; адна з найбольш (цікавы, арыгінальны полечны) мелодый; выкарыстаць магчымасці (ладагарманічны, фактурны, тэмбравы) вар'іраванняў; (цесны, сумесны) праца харэографа і музыканта.

2.8. Абгортвалі (рознаколерны) тканінай; (папяровы) кветкі і (шкляны) пацеркі; надавалі (святочны і ўрачысты) выгляд; асаблівасці (драўляны і мураваны сядзібны) дамоў; (шмат'ярусны) галерэя; прадметы (дэкаратыўна-прыкладны) мастацтва; з улікам (полаўзроставы, расавы і індывідуальны) асаблівасцей; сутыкненне (эканамічны і палітычны) інтарэсаў (розны сацыяльны) груп; (каменны) прылады працы; у (народны дэкаратыўна-прыкладны)

мастацтве; займалі (вышэйшы дзяржаўны, адміністрацыйны і вайсковы) пасады; назва ў (сярэдневяковы заходнееўрапейскі) крыніцах; у сувязі з (крыжовы) паходамі; усхваляваліся (патрыярхальны) адносіны на вёсцы; вылучаецца (вялікі) памерамі і (магутны абарончы) збудаваннямі, была аддзелена (шырокі і дугападобны) равамі; знаходзіліся (земляны) вал з брамай і (абарончы) роў; (бронзавы ювелірны) вырабы.

2.9. Пачаў (літаратурна-крытычны) дзейнасць; аўтар (аднаактавы і шматактавы) п’ес; у спектаклях (эксперыментальны амарскі) тэатра; (цікавы сцэнічны) вырашэнне; з (багаты жыццёвы) вопытам; лаўрэат конкурсу (малады тэатральны) спевакоў; пераважалі драмы на (рэлігійны, міфалагічны і гістарычны) сюжэты; стварыў (яркі, эмацыянальны, арыёзна-меладычны) стыль; асновы (акцёрскі) майстэрства; абапіраўся на (літаратурны і драматургічны) узоры; наладжваюцца звычайна ў (выхадны і святочны) дні; дасягалася (жыццёвы і побытавы) верагоднасць вобразаў; пад уплывам (рускі, тэатральны) традыцый; імкнуліся да больш (глыбокі псіхалачічны) распрацоўкі вобразаў; сродкі (візуальны сцэнічны) відовішча; шэраг твораў, аб’яднаных па (храналагічны, тэматычны) ці іншых прыкметах; звязаны з (пэўны гульнявы народны) традыцыямі.

Поўныя і кароткія якасныя прыметнікі

Формы	Змяняюцца			Маюць канчаткі			
				Адзіночны лік			Множны лік
	род	лік	склон	м. р.	ж. р.	н. р.	
ПОЎНАЯ	+ у адз. л.	+	+	**-ы, -і** вольны, ранні, шырокі, добры	**-ая, -яя** вольная, ранняя, добрая	**-ае, -ое, -яе** ранняе, дарагое	**-ыя, - ія** вольныя, дарагія
КАРОТКАЯ	+ у адз. л.	+	толькі ў Н. скл.	народ волен, учынак дораг	-а зямля міл**а**	-а, -о поле шырок**а,** добрае чутн**о**	-ы сны дзявоч**ы**

3. Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Знайдзіце прыметнікі і вусна вызначце іх форму – поўная ці кароткая.

1. Славен бубен за гарамі.
2. Чуткамі зямля поўна.
3. Як п’ян, што мне пан? Я як прасплюся, і свінні баюся.
4. Рабіць, каб і воўк быў сыты і каза цэла.
5. Для яго ўсё роўна: чорнае ці белае.
6. Хто скуп, той не глуп.
7. Ты і сабе рад у год раз.
8. Затым казак гладак, што пад’еў ды набак.
9. Санлівага не дабудзішся, лянівага не дашлешся.
10. Чужым розумам сыты не будзеш.
11. Не варт добрага слова.
12. Зміцер хіцёр, дый Саўка не дурань.
13. З вялікага грому малы дождж.
14. Калі суніца красна, не сей аўса напрасна.
15. Навошта мне грошы, калі сам я харошы.
16. Чым госць радзейшы, тым мілейшы.
17. Калі год сухі, купляй пчолку, а калі мокры – купляй кароўку.

Утварэнне ступеняў параўнання якасных прыметнікаў

	ПРОСТАЯ	СКЛАДАНАЯ
Вышэйшая ступень	Аснова прыметніка + суфіксы: весялейшы, прыгажэйшы, **АЛЕ:** вялікі – большы, добры – лепшы	Прыслоўе + **больш (болей), менш (меней):** больш (менш) чысты, больш (менш) прыгожы, **АЛЕ:** больш (менш) вялікі
Найвышэйшая ступень	Прыстаўка **най-** + простая вышэйшая ступень: найчысцейшы, найпрыгажэйшы, найбольшы, найлепшы	**Самы, найбольш, найменш** + якасны прыметнік: найбольш (найменш) чысты, самы разумны, найбольш (найменш) прыгожы

4. Ад наступных прыметнікаў утварыце формы ступеняў параўнання і запішыце іх. Асобна запішыце прыметнікі, ад якіх ступені параўнання не

ўтвараюцца ці ўтвараюцца толькі складаныя формы, і вусна растлумачце, чаму.

4.1. Дзяржаўны, навуковы, актуальны, айчынны, навукова-метадычны, фальклорны, новы, славянскі, разнастайны, чысты, зялёны, шырокі, прынцыповы, шматвяковы, блізкі, добры, маральны, нацыянальны, грамадска-палітычны, сацыякультурны.

4.2. Музычны, вакальны, гукавыяўленчы, багаты, унісонны, мастацкі, вобразны, гарадскі, мажорны, добры, спецыфічны, кампазітарскі, безнаяўны, аднатанальны, слыхавы, глухі, фальклорны, нізкі, пазатанальны, унікальны.

4.3. Карпаратыўны, безнаяўны, беспрацоўны, узаемазвязаны, прыватны, шырокі, галоўны, творчы, масавы, грамадскі, індывідуальны, працэнтны, эфектыўны, рэгіянальны, прыярытэтны, рэнтабельны, дабрачынны, аптымальны, спартыўны.

4.4. Самакрытычны, тэматычны, жыццесцвярджальны, пачуццёвы, інфантыльны, чысты, эфектыўны, інтэрактыўны, трывожны, цяжкі, грамадскі, бездапаможны, вольны, далікатны, культурна-масавы, слыхавы, педагагічны, вучэбна-выхаваўчы, своеасаблівы.

4.5. Фіялетавы, сіметрычны, дызайнерскі, багаты, керамічны, прымітыўны, залацісты, аб’ёмны, ювелірны, рознакаляровы, жанрава-кампазіцыйны, рэалістычны, машынны, алейны, дэкаратыўны, жывапісны, рэльефны, аб’ёмісты, самабытны, нацыянальны, танальны.

4.6. Тытульны, аўдыявізуальны, дакументальны, камунікатыўны, новы, літаратурны, вучэбны, гандлёвы, высокі, энцыклапедычны, архіўны, бібліятэчны, альтэрнатыўны, выдавецкі, двухмоўны, практычны, дублетны, пазапраграмны, мемарыяльны, штотыднёвы, картатэчны.

4.7. Жартаўлівы, лацінаамерыканскі, глыбокі, класічны, павольны, сцэнічны, трайны, маскарадны, музычны, тэхнічны, хуткі, эфектны, масавы, харэаграфічны, джазавы, артыстычны, цырыманіяльны, беларускі, народны, танцавальны.

4.8. Сярэбраны, курганны, каменны, нумізматычны, язычніцкі, сярэдневяковы, археалагічны, матэрыяльны, музейны, мазаічны, глыбокі, вішнёвы, чысты, феадальны, этнічны, верхні, аднатыпны, пяцігранны, першабытнаабшчынны.

4.9. Сцэнічны, дэкарацыйны, умоўны, трагедыйны, няўдзячны, асвятляльны, эфектыўны, гумарыстычны, бесканфліктны, двухсэнсоўны, інтанацыйны, рэалістычны, сімвалічны, тэатральны, лёгкі, светлы, спецыяльны, публічны, двух’ярусны, вялікі.

Вымаўленне і правапіс прыметнікаў з суфіксам *-ск-*

Т **Ч** **Ц** **К** + **СК=ЦК**	Пішы	Вымаўляй
	дэлегат + **ск** = дэлегацкі	[дэл’эгацк’і]
	Свіслач + **ск** = свіслацкі	[с’в’іслацк’і]
	немец + **ск** = нямецкі	[н’ам’эцк’і]
	Налібокі + **ск** = налібоцкі	[нал’ібоцк’і]

С **Ш** + **СК=С**	Пішы адно -ск-	Вымаўляй
	таварыш + **ск** = таварыскі	[таварыск’і]
	Адэса + **ск** = адэскі	[адэск’і]
	беларус + **ск** = беларускі	[б’эларуск’і]
СК+СК=СК	Віцебск + **ск** = віцебскі	[в’іц’эпск’і]
	Мінск + **ск** = мінскі	[м’інск’і]
	Ваўкавыск + **ск** = ваўкавыскі	[ваўкавыск’і]

Д+СК=ДСК	Пішы нязменна	Вымаўляй
	Ліда+**ск** = лідскі	[л’іцк’і]
	сусед+**ск** = суседскі	[сус’эцк’і]
	Ноўгарад+**ск** = наўгародскі	[наўгароцк’і]

5. Ад прапанаваных назоўнікаў пры дапамозе суфікса *-ск- (-к-)* утварыце і запішыце прыметнікі.

1) Маларыта, восень, жнівень, Палессе, Любань, Мазыр, дэпутат, латыш, француз, Асіповічы, сусед, Свіслач, турыст, юнак, настаўнік, Івацэвічы, абхаз, інстытут, Хатынь, Закаўказзе, Гарадок, Рэчыца, Добруш;

2) Брэст, чэрвень, Гродна, Глыбокае, салдат, кіргіз, брат, Слаўгарад, Ушачы, сакавік, Ліда, Беласток, Цюрых, Нясвіж, рыбак, студзень, Чыкага, Віцебск, Ірак, Хойнікі, Галандыя, Кембрыдж;

3) мастак, рэжысёр, агент, акцёр, менеджар, дыстрыб’ютар, сцэнарыст, скрыпач, дырыжор, спявак, гітарыст, танцор, балет-майстар, студэнт, загадчык, дырэктар, тэнар.

6. Запішыце па-беларуску.

Барановичский, соседний, институтский, парижский, чешский, январьский, студенческий, краеведческий, библиографический, биографический.

7. Выпішыце прыметнікі, вусна ахарактарызуйце іх структуру, акрэсліце разрад. Ад якасных прыметнікаў утварыце формы ступеняў параўнання. Знайдзіце ў тэксце таўталогію. Паразважайце, ці можна яе кваліфікаваць як стылістычную памылку. Прывядзіце прыклады сінанімічных з'яў.

Вячоркі – даўні звычай вясковых дзяўчат збірацца асеннімі і зімовымі вечарамі з работай у адной хаце. На вячоркі звычайна пралі (таму часам іх называлі попрадкі, супрадкі), вышывалі. Прыходзілі і хлопцы, якія плялі лапці, вырэзвалі лыжкі, рамантавалі калаўроты для дзяўчат. На вячоркі жартавалі, расказвалі цікавыя здарэнні, казкі, паданні, былічкі, загадвалі загадкі. У перадсвяточныя вечары дзяўчаты прыносілі невялікі пачастунак, пасля якога моладзь спявала песні, танцавала пад гармонік ці скрыпку. Вячоркі былі адметнай з'явай грамадскага побыту сялянскай моладзі шлюбнага ўзросту і служылі сродкам працоўнага і эстэтычнага выхавання. У наш час звычай збірацца на вячоркі знік *(Л. І. Мінько)*.

8. Перакладзіце на беларускую мову словазлучэнні з прыметнікамі *музычны/музыкальны*.

Музыкальный ребенок, музыкальный сигнал, музыкальная тема, музыкальное образование, музыкальная игрушка, музыкальное мышление, музыкальное воспитание, специальное музыкальное заведение, музыкальная грамота, музыкальная репетиция, музыкальный материал, музыкальный слух.

10. Прачытайце, вусна складзіце план, напішыце пераказ (тэкст на выбар студэнта).

А. Прамыя метады вывучэння прэстыжу бібліятэкі могуць быць дапоўнены ўскоснымі, якія прадугледжваюць аналіз статыстычных даных: чытацкага саставу бібліятэкі і кнігавыдачы, кніжных і чытацкіх фармуляраў і г. д.

Выявіць адносіны да бібліятэкі можна пры дапамозе кантрольных спісаў, што ўяўляюць сабой пералік напрамкаў дзейнасці, якія чытачу прапануецца ацаніць па балавай шкале ад «выдатна» да «дрэнна» або выбраць адну ці некалькі з пералічаных пазіцый.

Па выніках даследавання можна зрабіць аналіз чытацкіх меркаванняў па шэрагу пытанняў бібліятэчнай практыкі. Вынікі аналізу мэтазгодна падаць у выглядзе пашпарту бібліятэкі, які

павінен уключаць у першую чаргу яе апісанне (пры неабходнасці – кароткую гісторыю) і адлюстроўваць тыя факты, што ўплываюць на стратэгію яе дзейнасці (*Л. І. Ракавецкая).*

Б. «Жабка» – гэта традыцыйны танец. Музычны памер 2/4. Бытаваў у асноўным на поўдні Беларускага Палесся і Віцебшчыне і выконваўся мужчынамі. Асноўная тэма танца – жартоўнае перайманне рухаў і скокаў жаб, часта з прымяненнем трукавых рухаў. «Жабка» выконвалася часцей за ўсё сола, адным ці двума мужчынамі: абапіраючыся аб падлогу рукамі, сагнутымі ў локцях, і пальцамі выцягнутых ног, адзін з іх падскокамі рухаўся па падлозе, другі, расставіўшы ногі, скакаў за ім. Сярод шматлікіх варыянтаў рухаў «Жабкі» – скокі на руках з выцягнутымі ўперад нагамі, скокі адзін цераз аднаго ў гарызантальным становішчы, кулянне праз галаву і інш.

«Жаніцьба Цярэшкі» – гэта старажытная народная гульня, прымеркаваная да каляд, папулярная на поўначы Беларусі. Выбраныя са старэйшых удзельнікаў «маці» і «бацька» злучаюць хлопцаў і дзяўчат, якія стаялі ў двух процілеглых радах, у пары («жэняць» іх). Гульня спалучаецца з рознымі танцамі («бычок», «бярозка», «полька»), вясёлай мітуснёй *(Беларускія народныя танцы, карагоды, гульні, склад. В. С. Семенякоў).*

В. Віды сацыяльнай інфармацыі. Інфармацыя, успрымаемая, ствараемая, захоўваемая і распаўсюджваемая ў соцыуме (сацыяльная інфармацыя), надзвычай разнастайная па знакавай прыродзе, спосабах успрымання, сродках фіксацыі і ўзнаўлення. Яна мае форму і змест. Змест адлюстроўвае асаблівасці фрагменаў рэчаіснасці, на якія накіравана пазнавальная дзейнасць суб'екта. Форма адпавядае псіхолага-фізічным асаблівасцям яе трансляцыі і ўспрымання *(Т. В. Кузьмініч).*

Г. У сучасных умовах значнага ўскладнення грамадскіх адносін, з аднаго боку; росту аб'ёму інфармацыі, якую нядрэнна было б засвоіць, з другога; сусветнай глабалізацыі і ўзнікнення новых тыпаў рэальнасці, напрыклад сусветнай «павуціны», з трэцяга, развіццё і сацыялізацыя асобы практычна працягваюцца ўсё жыццё. Прычым дзяцінства і юнацтва не з'яўляюцца падрыхтоўчымі этапамі да спасціжэння культуры: з самага ранняга ўзросту дзіця не толькі аб'ект, але і суб'ект функцыянавання культуры. Таму эфектыўнасць гэтага працэсу ў многім залежыць ад таго, наколькі ён педагагічна мэтанакіравана арганізаваны, карэктна скіраваны, метадычна прадуманы, наколькі ўплывае на развіццё асобы дзіцяці, фарміраванне яе светапогляду і сацыяльнага вопыту.

Складанасць працэсу выхавання, яго значная працягласць у часе, варыятыўнасць і разнастайнасць магчымых уздзеянняў, непаўторнасць індывідуальных псіхалагічных асаблівасцей суб'ектаў уздзеяння не могуць быць ускладзены хаця і ў прыкладны, але адзіны змест. Арыентацыя на калектыўнае выхаванне класа, групы, аб'яднання звужае магчымасці выхаваўчага ўздзеяння на канкрэтную асобу, не дазваляе знайсці адэкватныя метады і спосабы выхавання *(Я. Д. Грыгаровіч).*

Д. Ведаючы сенсорныя і псіхафізічныя магчымасці дзяцей і дарослых карыстальнікаў – інвалідаў па зроку, бібліятэчныя супрацоўнікі выкарыстоўваюць разнастайныя формы і метады бібліятэчнага абслугоўвання, якія садзейнічаюць развіццю асобы, карэкцыі псіхалагічных якасцей. Пры гэтым, выкарыстоўваючы метады дыферэнцыраванага і індывідуальнага падыходу да інвалідаў па зроку шляхам сістэматычнага выяўлення іх чытацкага попыту і арганізацыі стасункаў на фарміраванне чытацкіх інтарэсаў, густаў. Пры разнастайнай індывідуальнай і масавай рабоце ў бібліятэцы для сляпых (гутаркі, літаратурна-музычныя вечарыны, дыспуты, чытанне ўголас, прэм'ера кнігі, агляды, конкурсы і інш.) павышаюцца бібліятэчна-бібліяграфічная кампетэнцыя карыстальнікаў – інвалідаў па зроку, самастойнасць адбору і выкарыстання імі інфармацыйнага патэнцыялу бібліятэкі ў сваіх адукацыйных і прафесійных мэтах. Такім чынам павышаецца і ўзровень іх сацыяльнай рэабілітацыі.

У выніку сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі для сляпых заснавана на ўзаемным супрацоўніцтве, этычных адносінах бібліятэкара і карыстальніка (*Н. Я. Петушка).*

11. Запоўніце табліцу. Размяркуйце наступныя назоўнікі і прыметнікі ў адпаведнасці з нарматыўным правапісам.

Узор табліцы

РАЗАМ	АСОБНА	ПРАЗ ДЭФІС

(Пякуча)трывожны, (вішнёва)чорны, (ясна)вокі, (бледна)зялёны, глыбока(запалыя), сіня(вокі), (залата)косы, праца(здольны), вышэй(сказаны), цёмна(шэры), мутна(жоўты), агульна(народны), высока(кваліфікаваны), адкрыта(здзеклівы), паўднёва(ўсходні), трывожна(насцярожаны), шмат(колерны), глыбока(змястоўны), шырока(экранны), трох(кілаграмовы), сама(робны), брудна(чырвоны), нава(годні), дзесяці(гадовы), жыцця(радасны),

густа(населены), інфармацыйна(аналітычны), далёка(ўсходні), народна(вызваленчы), аб’ектыўна(абумоўлены), авія(мадэльны), амаль(сляпы), мнага(значна), аўдыя(касетны), сярэдне(вяковы), (вясенне)летняя, (ліберальна)дэмакратычны, народна(гаспадарчы), абсалютна(спакойна), чырвона(бокі), вечна(зялёны), высока(эфектыўны), непаўторна(прыгожы), грамадска(палітычны), дэкаратыўна(прыкладны), кантрольна(ўліковы), навукова(тэхнічны), мангола(татарскі), грашова(рэчавая), агульна(даступны), горка(кіслы), абсалютна(празрысты), навукова(папулярны), (добра)суседскія, вакальна(сімфанічны), інша(моўная), дзесяці(хвілінны), біблія(графічны), заходне(беларускі), нацыянальна(вызваленчы), усе(баковы).

§ 12. Нарматыўнае ўжыванне лексіка-граматычных разрадаў лічэбнікаў

1. Азнаёмцеся з табліцай і адкажыце: а) паводле якіх паказчыкаў лічэбнікі падзяляюцца на разрады; б) на якія разрады падзяляюцца лічэбнікі паводле структуры?

Паводле значэння	
КОЛЬКАСНЫЯ:	ПАРАДКАВЫЯ:
1) пэўны лік: *адзін, адно, адна, адны акуляры, але: адны вершы; пяць; сто трыццаць восем; тысяча экзэмпляраў, мільён, мільярд, трыльён, секстыльён, але: тысячы экзэмпляраў, мільёны ўдзельнікаў;* **2) сукупнасць:** *двое акуляраў; чацвёра вашых; пяцёра чужых; дзевяцера выбраных; трое дзяцей, людзей, коней, гусей, свіней; сямёра шчанят; абодва спевакі, абедзве спявачкі, абое – спявак і спявачка;* **3) пэўная частка цэлага:** *паўтара аркуша, паўтары старонкі, адна дзясятая, чатыры дзясятыя, тры цэлыя тры дзясятыя, пяць і адна дзясятая;* **4) словы са значэннем няпэўнага ліку:** *некалькі паасобнікаў, столькі, гэтулькі, колькі, мала, многа,*	**парадак адзінак:** *першы, другі, восемдзесят шосты, дзевяцісоты, пяцьдзясят пяты, двухтысячны год, мільярдны, васьмідзясяты, мільённы карыстальнік*

шмат артыстаў, але: шмат, многа, мала пісаў	

Паводле структуры		
Простыя: *адзін, два, шасцю, сто, сорак, соты, адзінаццаць, сямнаццаць, дзявяты, дваццаць, трыццаць*	**Складаныя:** *пяцьдзясят, пяцьсот, дзвесце, дзевяцьсот*	**Састаўныя:** *тры шостыя, дзве дзясятыя, сем цэлых і тры дзясятыя, трыццаць восьмы, тысяча дзвесце шэсцьдзясят пяць*

2. Адкажыце, якой часцінай мовы з’яўляюцца наступныя словы.

Два, двое, двайны, падвоіць, удваіх, другі, абодва, двойчы, двойка, абедзве, дзве, двудушны, двума, двухдзённы, дзвесце, другагоднік, дваісты, дваіцца, двайняты, двухрадка, двухмільённы.

Чатыры, чацвёрка, чатырма, чацвёра, чвэрць, чацвёрты, учатырох, чацвяртак, адна чацвёртая, чвэртка, чатырохгалосы, чацвер, чатырохсотмільённы.

Пяцёрка, пяцёра, пяцярня, пяты, пятак, пяцьсот, пяцьдзясят, упяцёх, пяць, пяцёрачнік, пяццюдзесяццю пяццю, пяцітысячны.

Восем, восьмы, васьмёрка, васьмёра, васьмюдзесяццю, увасьмярых, восемсот, восьмага.

Некалькі (спевакоў), столькі (кніг), многа (артыстаў), шмат (слоў), мала (удзельнікаў), колькі (вершаў), колькі (перачытаў), многа (выступаў), шмат (танцаваў), столькі (напісаў), некалькі (п’ес), мала (рэпеціраваў), нямала (намаганняў).

Нуль, тысяча (экзэмпляраў), тысячы (выпускнікоў), мільён (здымкаў), мільёны (жыхароў), тысячны (наведвальнік), дзве тысячы сорак пяць, шэсць мільёнаў пяцьсот тысяч.

3. Назавіце тэрміны, у склад якіх уваходзіць лічэбнік.

Узор: сяміструнная гітара, трыпціх, васьмітакт, трохдольны памер.

4. Дайце вуснае тлумачэнне іншамоўным тэрмінам. Выпішыце тыя, у склад якіх уваходзяць лічэбнікі. З трыма, на выбар, складзіце сказы. Па дапамогу звяртайцеся да слоўніка іншамоўных слоў.

Актава, актэт, амфара;

бінокль, біс;

гептахорд, групета;

дуадэцыма, дублёр, дублікат, дуэль, дуэт, дэбют, джада, дэкалог, дэцыма, дыялогія, дыптых, дыфтонг, дыялог, дыярама;

квадра, квартэт, квінта, квінтэт;

манаграфія, маналог;
нанет, нона;
пентаграма, пенталогія, пентатоніка, плеяда, прататып, прыма;
секста, секстэт, секунда, сэптыма;
тэтрахорд, трыа, трылогія, трыпціх, трыяда;
унісон.

5. Адгадайце загадкі. Вызначце колькасныя, зборныя і парадкавыя лічэбнікі.

1. Чатыры хлопцы, тры дзяўчаці. Ды бацька з дзядзькам, трэцця маці (паводле Я. Коласа). Колькі ўсіх?
2. Дваццаць без пятнаццаці, трох не далажыўшы, двух не далічыўшы. Колькі ўсяго?
3. Адзін кажа: мне зіма лепей, другі кажа: мне лета лепей, а трэці кажа: мне ўсё роўна.
4. Выходзілі дванаццаць малайцоў, выносілі пяцьдзясят два сокалы, выпускалі трыста шэсцьдзясят пяць лебедзяў.
5. Тры браты пайшлі на раку купацца, двое купаюцца, а трэці на беразе валяецца.
6. Дваццаць два чалавекі забіць мяне хочуць; як заб'юць, адзінаццаць радуюцца, адзінаццаць сумуюць, а я жывы застаюся.
7. Сем семярэй, сямёра свіней, свінка, свінчын брат і сямёра парасят. Колькі ўсяго?
8. Дзесяць братоў у дзве шкуры адзеты.
9. Семсот муляроў збудавалі дом без вуглоў.
10. У дзвюх матак па пяць хлапчанятак, на кожнага адно імя.
11. Хто ходзіць зранку на чатырох, днём – на дзвюх, а вечарам – на трох нагах?
12. Стаіць дуб, на дубе дванаццаць гнёздаў, у кожным гняздзе па чатыры сініцы, у кожнай сініцы па чатырнаццаць яек, сем чорных і сем белых.
13. Адзін дзед, два бацькі і два сыны. Колькі ўсіх?
14. Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзіць, шосты водзіць, сёмы пяе.

А д г а д к і: пчолы і соты; нічога; каромысел і вёдры; сані, калёсы, конь; пальцы на руках; год, месяцы, тыдні і дні; шэсцьдзясят пяць; футбольны мяч; месяцы, тыдні, дні; пальцы і ручка; рукі ў рукавіцах; чалавек у розным узросце; дзесяць; чалавек і дзверы; тры.

6. Прачытайце лічэбнікі і запомніце нарматыўны націск. Параўнайце іх з рускімі эквівалентамі.

Шэ́сць, шо́сты, шасці́, се́мы, во́сьмы, адзіна́ццаць, адзіна́ццаты, чатырна́ццаць, чатырна́ццаты, шасна́ццаць, васямна́ццаць, дзевятна́ццаць, пяцьдзяся́т, шэсцьдзяся́т, се́мдзесят, во́семдзесят, пяці́дзесяці, сямю́дзесяццю, пяцё́ра, чацвё́ра, шасцё́ра, сямё́ра, васьмё́ра, дзявя́цера, дзяся́цера, во̀семсо́т, дзве́сце, мільён, трыльён, абое, абаі́х.

7. Утварыце парадкавыя лічэбнікі ад колькасных і праскланяйце іх.

Дзевяць, адзін, два, адзінаццаць, два мільёны, дзевяноста, сто, дзвесце шэсцьдзясят шэсць, семсот сямнаццаць, восемсот, восемдзесят восем, дваццаць пяць тысяч.

8. Праскланяйце вусна спалучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі.

Сем струн; дзве актавы; сто год; шэсцьдзясят пяць; дзве тысячы трэці год; дзевяноста экзэмпляраў; першы курс; чатыры цэлыя і адна восьмая працэнта; сорак тры вучні; двое слухачоў; паўтара дня; трыста сорак адзін чалавек.

9. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары і растлумачце правапіс лічэбнікаў.

Дз...вяты, дз...сяты, с...мнаццаць, вас...мнаццаты, абе...ве, ш...сцьсот, ш...сцісот, в...семсот, вас...мі, міл...ярд, міл..ён, паўтар... актавы, дзвес...ц..., трым...стамі, дз...вяност..., пяц...юдзесяц...ю, пяц...дзесяці, дзв...м сяброўкам, дв..м сябрам, паўтар... месяца, п...тнац..ац...ю, ст... трох, с...рак дз...вяты, пяц...ра, сям...ра, дзявяц...ра, дзве цэл... і тры дзесят.., с...містам, восем цел... і чатыры дзесят.., тры восьм..., паўтар... дня, паўтар... долі, ш...сцюдзесяц...ю вас...мю, сям...юдзесяц..ю адным.

10. Прачытайце сказы. Вызначце разрад лічэбнікаў паводле значэння і структуры.

1. Згодна з дадзенымі дзяржаўнай кніжнай статыстыкі за 1918–1992 гг., найбольшыя тыражы маюць выданні А. Якімовіча (11 447,9 тыс. экз.), Я. Коласа (5 720,8 тыс. экз.), А. Вольскага (4 879,11

тыс. экз.), М. Танка (4 409,5 тыс. экз.), В. Зуёнка (4 156,6 тыс. экз.) (*БЭ)*.

2. У 1930 годзе на Беларусі 88,4 % кніг (1 170 назваў тыражом 7 842,4 тыс. экз.) выдадзена на беларускай мове, 5 % (66 назваў тыражом 307,8 тыс. экз.) – на яўрэйскай мове, 4,2 % (56 назваў тыражом 147,1 тыс. экз.) – на рускай мове, 2,4 % (31 назва тыражом 131 тыс. экз.) – на іншых мовах, то ў 1990 на рускай мове выдадзена 81,7 % (2 307 назваў тыражом 44 793,6 тыс. экз.), на беларускай мове – 15,4 % (435 назваў тыражом 9 238,3 тыс. экз.), на іншых мовах – 2,9 % (81 назва тыражом 877,5 тыс. экз.) *(БЭ)*.

3. Згодна з перапісам 1897 года, колькасць беларусаў (у сучасных межах Беларусі) склала каля 4,8 млн чалавек – 74 % насельніцтва, у тым ліку 13,6 % з іх (650 тыс. чалавек) былі пісьменнымі і свядома ўказалі роднай мовай беларускую. Роднай мовай беларускую лічылі 40 % чыноўнікаў, 10 % юрыстаў, 20 % дактароў, 29 % паштова-тэлеграфных служачых, 60 % настаўнікаў *(БЭ)*.

4. 14 верасня 1920 года адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага тэатра (з 1944 года – тэатр імя Я. Купалы). У 1921 годзе мастацкім кіраўніком БДТ становіцца Еўсцігней Афінагенавіч Міровіч – вядомы рускі акцёр, драматург, рэжысёр. Е. Міровіч кіраваў тэатрам да 1930 года *(Р. Смольскі)*.

5. У 1926 годзе ў Віцебску распачаў дзейнасць 2-гі Беларускі драматычны тэатр (у 1944 годзе атрымаў імя Я. Коласа), у 1928 годзе ў Магілёве адкрыўся тэатр пад кіраўніцтвам У. Кумельскага, з 1932 года ператвораны ў Рускі тэатр БССР, з 1955 года – тэатр імя М. Горкага. Наогул, 20–30 гады былі плённымі ў развіцці беларускага сцэнічнага мастацтва *(Р. Смольскі)*.

6. Для Свіслацкага тэатра, які заснаваны В. Тышкевічам у 1788 годзе, у пачатку XIX ст. быў узведзены спецыяльны будынак, які меў вялікую тэатральную залу (212 кв. м), 2 танцавальныя залы (па 83,5 кв. м), 4 артыстычныя прыбіральні, агульную прыхожую і кухню *(В. Пракапцова)*.

7. У кастрычніку 1781 г. балетная трупа з Гродна была перавезена ў Паставы, дзе харэаграфічная адукацыя актыўна распачалася ў 1782 г. з прыездам Ф. Г. Ле Ду. У «Табелі штодзённых урокаў і забаў для тэатральных дзяцей абодвух палоў» адзначалася, што выхаванцы школы займаліся на працягу 3 гадоў: у трэцім (самым малодшым) класе вучыліся хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце ад 8 да 10 гадоў, у другім – ад 11 да 14, у першым – ад 14 да 18 гадоў. Усе займаліся на ўроках балета не менш за 5–6 гадзін у

дзень. Працоўны дзень працягваўся з 5 гадзін раніцы да 9 гадзін вечара і, такім чынам, доўжыўся ад 12 да 15 гадзін (*В. Пракапцова).*

8. Па статыстычных даных за 1997 год на Беларусі існуе 32 дамы (цэнтры) рамёстваў, з іх 14 сельскіх; працуе 30 дамоў (цэнтраў) фальклору, з іх на сяле – 25; ёсць 40 школ народнай творчасці, з іх сельскіх – 39, гарадскіх – 1 *(А. Боганева).*

9. У Маладзечне ў верасні 1991 года створаны Гарадскі цэнтр эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў. На сённяшні дзень у цэнтры налічваецца 1 410 навучэнцаў, з іх на ўроках эстэтычнага цыкла займаецца 784 вучні 31 класа 6 гарадскіх школ. Астатнія займаюцца ў 9 аматарскіх аб’яднаннях па інтарэсах. Цэнтр займае 4 будынкі агульнай плошчай 723 кв. м з добраўпарадкаванай тэрыторыяй у 1,2 га з зялёнымі пасадкамі і дапаможнымі пабудовамі *(Л. Раманенка).*

10. Наведванне бібліятэк залежыць ад узроставых асаблівасцей людзей. У групе да 20 год кожны другі рэгулярна карыстаецца чытальнымі заламі і абанементамі і толькі кожны сёмы іх наведвае. Сярод 20–24-гадовых ужо кожны пяты не бярэ кнігі ў бібліятэцы, сярод 25–29-гадовых – кожны чацвёрты, 30–39-гадовых – кожны трэці *(В. К. Бандарчык).*

11. Запішыце лічэбнікі словамі.

200; 0,4 %; 1693-і; 7½; 0,03; 1⅜; 6,12; 2,83; 1,5 года; 1,5 тысячы; 900; каля 800; 17; 14-му; 18; 5,9; 9-ы; 31-тысячны; 6-соты; 79; 1711; 100 год; 3 і 3/5; 10-мільённы; 50-гадовы; 1-ы; 2 + 3 = 5; 7 × 5 = 35; 4 × 4 = 16; 20-мільярдны; 50; 60; 70; 80; да 156,7 + 33,3 = 190,0; 35 : 5 = 7; ад 80 – 12 = 68.

12. Пры спісванні раскрыйце дужкі, дапішыце патрэбныя канчаткі.

Выступаць з 2 (народн… артыст…), 2 (нов… сюіт…), 3 (вядом… мастак…), 8 (нов… нумар…), 4 (малад… спевак…), 5 (лепш… дакладчык…), паўтар…(суткі), праз паўтар… (інтэрвал), (абедзве) рукамі, (абодва) заданняў, паўтар...(старонкамі).

13. Перакладзіце на беларускую мову наступныя словазлучэнні. Раскажыце пра асаблівасці дапасавання ў беларускіх колькасна-іменных спалучэннях.

1) драма в трех действиях; тысяча и одна ночь; комедия в двух актах; четыре духовых инструмента; пять известных исполнителей;

петь на два голоса; первая пьеса; два знаменитых актера; три белорусских артиста; около трех тысяч посетителей; не менее тридцати пяти музыкально-театральных сочинений; антракт после первого отделения; второй акт трагедии; два ярких мазка; второе творческое объединение; несколько солистов; трио-соната в четырех частях; партия для трех голосов; четыре двухголосных канона; с тремя билетами; «балладная опера» XVIII столетия; четыре крупных произведения; три сложные партитуры; концерт для двух скрипок; шестнадцать концертов Вивальди; четыре дуэта; три акта; ария с тридцатью вариациями; двадцать четыре хоральные обработки; песня с восемью куплетами; свыше двухсот сорока пьес для клавесина; альт и три сопрано; двадцать две хоральные прелюдии; в первом ансамбле; два места в партере; 5,3 %; в пяти шагах от микрофона;

2) пятьдесят три класса художественного ремесла; два районных центра народного творчества; двадцать три потомственных гончара; в сорока пяти классах традиционного ремесла; три кружка современного рукоделия; в сорока восьми студиях; восемьсот участников карнавала; пятьдесят четыре экспоната; характеризуется двумя моделями социального поведения; два вида учебной деятельности; четырнадцать культурно-массовых мероприятий; с одиннадцатью номерами художественной программы; общаться с тысячью почитателей, разделить второе призовое место; подготовить две сюжетно-игровые программы, много акцентов, четыре конкурса, два театрализованных мероприятия и две народные игры; одна игра развивает, вторая тренирует память, третья расширяет кругозор; два вида эмоций; различать три слоя культуры; две части структурированного занятия; от трех до пяти участников арт-терапевтической группы; о восьми функциях социокультурной деятельности; в двадцати двух домах отдыха; около одиннадцати спектаклей; несколько обрядов; много людей среднего возраста; 3,5 %; в трех шагах от партнера;

3) двумя коммерческими фирмами; один долгосрочный кредит; шестьдесят пять процентов сбыта; двадцать четыре варианта; шесть этапов ревизии; пятьдесят миллионов долларов; от десяти до пятнадцати подразделений; четырнадцать различных маркетинговых компаний; одиннадцать производственных организаций; три подхода при определении ценовой стратегии; продавать в два раза дешевле; двенадцать маркетинговых факторов; сто тысяч компаний; ста пятидесяти двух крупнейших выставок; около трех миллионов человек; семь шагов разработки плана

персональной продажи; продолжительность общения составляет от пятнадцати минут до получаса; численность персонала сокращена со ста сорока четырех до девяноста семи человек; коммерческие отделения подключены к двумстам компьютерным терминалам; доля издержек упала примерно в полтора раза; кредит до одного года; не менее двадцати моделей; несколько рублей минимальной зарплаты; вторая группа оплаты труда; около миллиона затрат; с 15 % прибыли; в двух шагах от успеха;

4) три экспозиционных зала; девятое столетие; выставка представлена тысячью экспонатами; двадцать два памятника культуры; заполнить четыре требования; один обязательный экземпляр; два репринтных издания; четыре каталога; одиннадцать аналитических аннотаций; около двадцати пяти афиш; два атласа; шести библиотекарей; восемьсот записей; более семидесяти плакатов; от сорока до девяноста посетителей; библиография первой, третьей степени; более двухсот шестидесяти семи библиотечных подразделений; оформить четыре буклета; два временных сотрудника; библиотека работает с восьми до тринадцати, а после обеда – с четырнадцати до девятнадцати; около двадцати пяти словарей; в двухстах девяносто двух зональных библиотеках; с тремя иллюстрациями; читальный зал рассчитан на двадцать два места; третье книжное издание; работать с двумя микрокопиями; отражать в двух миниатюрных изданиях; прирост фонда на 1,5 %; четырнадцать библиотечных объединений; двенадцать целых и три десятых условных печатных листов; формат издания 84×108/32; собрание сочинений в шести томах; несколько тиражей; мало клубов; в десяти метрах от рекламы.

14. У наступных сітуацыях выкарыстайце лічэбнікі з прыназоўнікамі *пад, з, за, каля,* якія абазначаюць прыблізную колькасць.

Адкажыце, колькі чалавек навучаецца на першым курсе?

Адкажыце, колькі часу займае ў вас дарога да ўніверсітэта?

Адкажыце, колькі гадоў Вашаму сябру?

Адкажыце, колькі старонак у падручніку?

Адкажыце, колькі жыхароў у Беларусі?

Адкажыце, колькі аперацый можа выконваць камп’ютар?

Адкажыце, колькі абітурыентаў паступала на вашу спецыяльнасць?

Адкажыце, колькі творчых праграм рыхтуе ваша група за год?

Адкажыце, колькі чытачоў налічвае бібліятэка ўніверсітэта?

Адкажыце, колькі музеяў у Мінску?

15. Пры спісванні замяніце лічбы словамі, ужываючы патрэбную форму. Звярніце ўвагу на склонавую форму назоўніка ў колькасна-іменных спалучэннях.

А. 1. Агоўскія куфры – прамавугольная скрыня памерам прыкладна 110×80×60 см з пукатым векам, на (чатыры) металічных ці драўляных кольцах, з (два) ручкамі па баках *(Этнаграфія Беларусі)*. 2. Абрус (даўжынёю 1,5–2 м, шырынёю 1–1,5 м) звычайна складаўся з (адзін) або (два) сшытых полак ільняной даматканіны, вытканай у тэхніцы двух-шматнітовага бранага, ажупнага, пераборнага ткацтва *(Этнаграфія Беларусі)*. 3. Ткалі слуцкія паясы аднабаковыя (з адваротным бокам), двухбаковыя (2 бакі правыя ці 1 двухбаковы і 1 адваротны) і чатырохбаковыя *(І. Паньшына)*. 4. Усяго па Мінскай вобласці ўзята пад ахову 280 уцалелых помнікаў дойлідства *(А. Бураўкін)*. 5. І. І. Левітан нарадзіўся ў 1860 годзе, а памёр у 1900 годзе 22 ліпеня ў 8 гадзін 35 мінут (*Т. Чылік).* 6. Бешанковіцкая кераміка вызначалася рознымі памерамі, у залежнасці ад якіх вырабы мелі розныя назвы: штука (гаршчок на 10 л), пугар (5 л), пецярык (2,5 л), семярык (1 л) і інш. *(У. Угрыновіч).* 7. У XIX – 1-й палавіне XX ст. выцінанкі выкарыстоўвалі для аздаблення інтэр’ера народнага жылля *(Я. Сахута).* 8. У некаторых мясцовасцях заручынамі называлі 1-ы дзень вяселля, у другіх – суборную суботу (*Л. Малаш).* 9. У дакументах 2-й палавіны XVII–XIX ст. ёсць звесткі пра карпарацыі жабракоў, у якія ўваходзілі лірнікі *(І. Назіна)*. 10. Сёмуха (Троіца) – старажытнае земляробчае свята ў беларусаў святкавалася на 7 (русальны) тыдзень пасля Вялікадня (*А. Цітавец).*

Б. 1. Танец вальс узнік у 2-й палавіне XVIII стагоддзя, на Беларусі вядомы з 2-й палавіны XIX стагоддзя *(Этнаграфія Беларусі)*. 2. Танец «Венгерка» (лакальныя назвы «Сямёрка», «Сто адзін») суправаджаецца своеасаблівай прыпеўкай: «Раз, 2, 3, 4, 5, 6, 7», «101» – «50, 20, 40, 11 – гэта будзе 101» *(Этнаграфія Беларусі)*. 3. Танец «Верабей» складаецца з (два) частак: 1-я – ва ўмераным тэмпе, музычны памер трохдольны, 2-я – у хуткім тэмпе, музычны памер 2/4 *(Этнаграфія Беларусі)*. 4. У 1971 г. быў адкрыты 2-і музычны тэатр Беларусі – Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі, які хутка стаў папулярным у жыхароў Мінска і іншых гарадоў *(А. Бураўкін)*. 5. Нацыянальныя тэатры пры іх даволі невялікай колькасці абслугоўваюць на працягу года амаль 1,7 млн чалавек, ці

кожнага (6) жыхара рэспублікі (*А. Бураўкін).* 6. 60 санат Карэлі раздзяляюцца на некалькі груп па розных жанравых і структурных прыкметах: 48 з іх – трыа, 12 – сольных, 30 – da camera *(І. Несцьеў)*. 7. У 2-й палавіне 30-х гадоў у Лейпцыгу Бах напісаў не менш за 5 «Лацінскіх мес» *(І. Несцьеў)*. 8. У месе 15 хароў, 3 дуэты і 6 арый. Склад выканаўцаў: змешаны хор (ад 4 і да 8 галасоў), салісты (сапрана I і II, альт, тэнар, бас), аркестр (2 флейты, 3 габоі, 2 фаготы, 3 трубы, валторна, літаўры, струнныя), арган і continuo *(І. Несцьеў)*. 9. Бах далёка адышоў ад абрадавай традыцыі і разгарнуў шасцічасткавы цыкл у манументальную кампазіцыю з 24 нумарамі, якія аб'ядналіся ў 4 вялікія часткі *(І. Несцьеў)*. 10. У спадчыне Вівальдзі налічваецца 39 опер, 23 свецкія кантаты, культавыя сачыненні, 43 арыі, 23 сімфоніі, 73 санаты (з іх 12 трыа-санат; апошняя – на тэму Фоліі) *(І. Несцьеў).* 11. Каб надаць сваёй мелодыцы як мага больш гнуткую выразнасць, Люлі часта звяртаўся да пераменных памераў, чаргуючы 4/4, 3/4, 2/4 і г.д. *(І. Несцьеў).*

В. 1. Паказ на тэлебачанні 1 рэкламнай аб'явы можа абысціся ў 150 тысяч долара і выйдзе на 30 млн тэлегледачоў пры цане 0,005 долара на 1 гледача *(Дж. Эванс)*. 2. У 1981 годзе А. Дудараў напісаў драматычную аповесць у (два) дзеях «Узлёт», якую прысвяціў мінулай вайне *(Р. Смольскі). 3*. Сучасная сетка культустаноў Маладзечненскага раёна налічвае 4 музычныя школы, 2 школы мастацтваў, 40 масавых бібліятэк, 36 клубных устаноў, у тым ліку 20 сельскіх дамоў культуры, 16 сельскіх клубаў, у якіх функцыянуе 229 клубных фарміраванняў і калектываў мастацкай самадзейнасці *(Л. Раманенка).* 4. Пры Доме народнай творчасці працуюць 12 клубных фарміраванняў (сярод іх 8 дарослых і 4 дзіцячыя), 8 гурткоў мастацкай самадзейнасці, 4 клубы па інтарэсах *(Л. Раманенка)*. 5. Больш як палавіна вольнага часу насельніцтва звязана з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі, перш за ўсё тэлебачання, – 74,7 % апытаных рэгулярна глядзяць тэлеперадачы; 56,6 % заняты чытаннем газет і часопісаў; 51,1 % пастаянна слухаюць радыё; 50,6 % чытаюць мастацкую літаратуру *(Л. Качаргіна).* 6. Сярод рэспандэнтаў 68,5 % маюць уласныя бібліятэкі, з іх больш за 100 кніг маюць толькі 9,7 % *(В. Бандарчык).* 7. Сельскім установам культуры аказвалі непасрэдную дапамогу каля 400 настаўнікаў музычных вучылішчаў, школьных філіялаў, у Гродзенскай – больш за 300 *(В. Бандарчык).* 8. У Беларусі на пачатак 1989 г. выдавалася 220 газет, 131 з іх на беларускай мове *(В. Бандарчык)*. 9. У канцы XIX – пачатку XX ст.

пачалі ствараццa двухкласныя народныя вучылішчы з тэрмінам навучання 5–6 гадоў *(В. Бандарчык)*.

16. Перакладзіце на беларускую мову наступныя словазлучэнні.

Дом в пять этажей; библиотека находилась в двадцати метрах от остановки; дважды два четыре; трижды шесть; четырежды восемь; пятью пять; шестью девять; восемью семь будет пятьдесят шесть; оба (отец с сыном) сделали модель; оба, отец с дочерью подписали поздравительную открытку; обе (мать и бабушка) шили новогодний костюм; три маленькие девочки; оба старика; обоих стариков; два больших круга; четыре удачных номера; двух серебряных колец; четыре человека; держать обеими руками; два раза; пять раз; тысячу раз; два раза в год; концерт состоится в восемнадцать часов (в полдень, после полудня); сегодня – одиннадцатое ноября; четырнадцатого октября – твой день рождения; 9 Мая – праздник Победы; День знаний – 1 сентября; 2006 год; на праздник 8 Марта; в день 1 Мая; конец XIX – начало XX века; ему около пятидесяти лет.

17. Прааналізуйце табліцу і адкажыце, калі ўжываецца адзіночны лік дзеяслова, а калі множны лік?

Адзіночны лік	Множны лік
1. Пэўны лік (няпэўны лік) + словы з абазначэннем адрэзку часу: *мінут, гадзін, дзён, тыдняў, месяцаў, гадоў, стагоддзяў, зім, вёснаў.* *Прайшл**о** **пяць гадоў** пасля заканчэння ўніверсітэта. З таго часу мінул**а** **два стагоддзі. Тысяча гадзін** адліча**на** гадзіннікам.* ***Некалькі зім** прайшл**о** з той пары. Трэба **было шмат гадоў**, каб упэўніцца ў правільнасці выбару.*	**1. Пэўны лік** + асабовыя, неасабовыя і неадушаўлёныя. ***Два мастакі** сталі пераможцамі конкурсу. **Тры птушкі** ўпрыгожылі сурвэтку. **Дзве карціны** атрымал**і** першую прэмію. **Тры браты** на адным кані па белым полі ед**уць. Усе (гэтыя) дзесяць кніг** купле**ны** нядаўна. **Лепшыя пяць работ** прэміра**ваны. Усе дваццаць адзін студэнт** удзельнічал**і** ў конкурсе.*
Але: *Гэтыя **некалькі мінут** кашт**авалі** яму жыцця. Тыя **сем гадоў** не прайшл**і** дарма.*	**Але:** у значэнні колькаснага абмежавання. *Толькі **тры чалавекі** прыйшл**о** на кансультуцыю. Толькі **пяць студэнтаў** атрымал**а** павышаную стыпендыю.* З а ў в а г а: ***два, тры, чатыры (браты, кнігі, раманы)** + мн. лік*

	дзеяслова.
2. Няпэўна-колькасныя словы: *шмат, многа, мала, няшмат, некалькі + неасабовыя назоўнікі і неадушаўлёныя.* ***Некалькі арый*** *прагучала ў нашым канцэрце.* ***Шмат народу*** *выйшла на плошчу.* ***Шмат*** *цудоўных* ***песень*** *складзе****на*** *пра каханне.* ***Многа птушак*** *ужо прыляце****ла.***	**2. Няпэўна-колькасныя словы:** *шмат, многа, мала, няшмат, некалькі + асабовыя назоўнікі.* ***Некалькі скрыпачак*** *выканалі мелодыю Баха.* ***Многа гледачоў*** *пакінулі залу ў добрым настроі.*
3. Словы: *большасць, меншасць, большая частка, рад, шэраг, мноства + неасабовыя назоўнікі і неадушаўлёныя.* ***Большасць кніг*** *сапсавала****ся*** *праз вільготнасць. Узнік* ***шэраг пытанняў.*** ***Большая частка заняткаў*** *адбыва****ецца*** *ў камп'ютарным класе.*	**3. Словы:** *большасць, меншасць, большая частка, рад, шэраг, мноства + асабовыя назоўнікі.* ***Большасць чытачоў*** *здаю****ць*** *літаратуру своечасова.* ***Шэраг студэнтаў*** *факультэта атрымалі падзяку дэкана.* ***Большая частка*** *ўдзельнікаў аркестра сталі лаўрэатамі конкурсу.*
4. Зборныя лічэбнікі ***Трое сутак*** *хутка праляце****ла.*** *У кабінеце* ***было двое дзвярэй***. ***Было*** *іх* ***пяцёра.***	**4. Зборныя лічэбнікі** ***Трое юнакоў*** *праспявалі прыпеўкі.* ***Сямёра*** *аднаго не чака****юць.*** ***Двое нашых*** *паехалі на спаборніцтвы.* ***Абодва (абедзве, абое) ветэраны*** *прысутнічалі на свяце.*
5. Прыблізная колькасць ***Чалавек з дваццаць*** *прыйшло на сустрэчу выпускнікоў.* ***Каля трохсот кніг*** *знаходзі****ццa*** *ў бібліятэцы інтэрната. У гуртку збіра****лася*** ***чалавек пад дваццаць.***	**5. Прыблізная колькасць –** няма
6. Словы: *тысяча, мільён, мільярд* + асабовыя, неасабовыя і неадушаўлёныя назоўнікі. ***Сто тысяч*** *картачак налічва****ецца*** *ў музычным каталогу.* ***Мільён агнёў*** *асвяці****ў*** *наш горад. Дадаткова выдадзе****на адзін мільён рублёў.***	**6. Словы:** *тысяча, мільён, мільярд* + асабовыя назоўнікі. ***Мільён жыхароў*** *планеты паку****тую****ць*** *ад экалагічных праблем.* ***Тысяча студэнтаў*** *з'явілі****ся*** *на фестываль моладзі.*

18. Раскрыйце дужкі, пастаўце дзеясловы ў патрэбнай форме.

1. Да 1795 года (існаваць) два будынкі. 2. З адзнакі 200 см і да 400 см (выявіць) два завалы чалавечых касцей і асабліва чарапоў. 3. У трэцім і чацвёртым пластах культурнага слоя, які з'явіўся пасля

вырастить – дерево / детей; перевести – текст / человека через дорогу; исполнилась/ исполнилось – мечта / 18 лет; открывать / открыть – дверь / собрание / глаза / книгу / душу; день открытых дверей; планировать – в воздухе / мероприятие; добавлять – несколько слов по насущному вопросу / сахар в кофе; играть – в театре / в шахматы / красками / вальс / роль в пьесе / с детьми / в куклы.

7.Перакладзіце на беларускую мову сказы з дзеепрыслоўнымі і дзеепрыметнымі зваротамі. Ахарактарызуйце ўмовы дакладнага перакладу, назавіце яго спосабы.

Л. Н. Толстой, **описывая** танец Денисова и Наташи: «**Выждав** такт, он сбоку, победоносно и шутливо, взглянул на свою даму, неожиданно пристукнул одною ногой и, как мячик, упруго отскочил от пола и полетел вдоль по кругу, **увлекая** за собой свою даму. Он... не видел **стоявших** перед ним стульев и прямо несся на них; но вдруг, **прищелкнув** шпорами и **расставив** ноги, останавливался на каблуках, стоял так секунду, с грохотом шпор стучал на одном месте ногами, быстро вертелся и, левою ногой **подщелкивая** правую, опять летел по кругу. Наташа чутьем угадывала то, что он намерен был сделать, и, сама **не зная** как, следила за ним – **отдаваясь** ему. То он кружил ее на правой, то на левой руке, то, **падая** на колена, обводил ее вокруг себя и опять вскакивал и пускался вперед с такой стремительностью, как будто он намерен был, **не переводя** духа, перебежать через все комнаты... ».

8. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Звярніце ўвагу на пераклад форм дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў.

О замысле «Руслана» Глинка в «Записках» говорит, как обычно, очень скупо, ссылаясь на то, что мысль обратиться к поэме Пушкина ему подал А. Шаховской; упоминает он и о своих беседах с великим поэтом. Задумав оперу при жизни Пушкина и рассчитывая на его помощь (конечно, советчика, а не либреттиста), композитор приступил к сочинению уже после трагической гибели великого поэта. Работа растянулась на пять лет, концепция все более углублялась, обогащалась. Содержание и образы юношеской поэмы Пушкина существенно видоизменились. Это естественно, так как Глинка воспринимал поэму в контексте творчества Пушкина и всего пути, пройденного русским искусством с 1820 г., когда «Руслан» появился в печати. Глинка перевел поэму в иной стилистический и идейный план. В центре оказались не приключения героев, а поиски смысла жизни, этическое начало, утверждение активного деяния, служащего торжеству добра. Глинка близок Пушкину жизнеутверждающим оптимизмом. Первая песня Баяна по образному содержанию – ключ к пониманию жизни

как чередования и борьбы светлого и темного начал: «За благом вслед идут печали, печаль же радости залог». Песня Баяна не только предваряет грядущее течение событий, но и провозглашает победу добра. Значит ли это, что оно победит само собой, без борьбы? Музыка утверждает необходимость активного сопротивления. Зерно музыкальной драматургии – баллада Финна, утверждающая деяние как смысл жизни. Перед героями разные дороги, им предстоит сделать выбор. Одни, подобно Руслану, избирают путь добра, другие становятся, пусть пассивно, слугами зла (Фарлаф); третьи отказываются от борьбы во имя бездумного наслаждения (Ратмир). Очищенный в купели любви Гориславы, освобожденный мудрым Финном от чар Наины, Ратмир возвращается на путь света, Фарлаф посрамлен и обманут в своих надеждах. Козни темных сил побеждены *(А. Гозеппуд).*

8. Складзіце сказы з наступнымі словазлучэннямі так, каб словазлучэнні выступалі ў ролі дзейніка, а ў ролі выказніка выступаў дзеяслоў у форме прошлага часу. Растлумачце правапіс канчаткаў дзеясловаў.

Шэсць дзён, брат з сястрой, большая частка насельніцтва, некалькі слухачоў, шмат абітурыентаў, тысяча гараджан, пяцёра студэнтаў, безліч дзівосаў, процьма грыбоў, тройка коней, усе дзяўчаты, усяго пяць выпускнікоў, багата брусніц, каля дзесяці кніг, каля ста супрацоўнікаў.

9. Перакладзіце на беларускую мову, з сямю прыкладамі (на выбар) складзіце сказы, каб атрымаўся звязны тэкст, вытрыманы ў пэўным стылі. Назавіце стыль, падстыль і жанр тэксту. Адказ аргументуйце.

1) дважды три шесть, всей душой, будьте счастливы, поверите ли, отказаться от обещания, оба старика, обеими руками, падающая звезда, стать ласковее, протянуть руку, ударил ногу, за обе щеки, впасть в немилость, пришли вдвоем, в другой раз, дом в пять этажей, трехкомнатная квартира, вода по колено, ходить под окнами, несколько раз в неделю, становиться тише, выше отца, в трёх шагах от микрофона;

2) писать по адресу, послать за яблоками, жениться на подруге, слышать своими ушами, идти за отцом, смотреть за собой, говорить по телефону, определить по вкусу, не сделать из-за лени, видеть своими глазами, благодарить маму, смеяться над собой, жить с

детьми, выехать за черникой, выше дерева, больше года, читать про себя, показаться слишком долгим, палка о двух концах, стать на колени, забыть о сне;

3) рассказать о себе, отправить за чаем, думать о детях, отблагодарить друзей, шутить над братом, жениться на Ольге, послать в аптеку за лекарством, заболеть коклюшем, извините меня, расспрашивать о новостях, смеяться над недостатками, пойти в магазин за рыбой, поехать за грибами, заботиться о родителях, простите его, больной ангиной, съездить за цветами, заведующий библиотекой, слышал своими ушами, опоздали из-за твоих друзей, парк в пятистах метрах от озера, она выглядит моложе своего возраста, три раза в неделю, согласно договоренности, увидимся на днях.

ДЛЯ ДАВЕДКІ:

У беларускай мове	У рускай мове
Чытаць сам сабе	Читать про себя
Пісаць (звярнуцца) на адрас	Писать (обратиться) по адресу
Загадчык кафедры (бібліятэкі)	Заведующий кафедрой (библиотекой)
Зайду (убачымся) днямі	Зайду (увидимся) на днях
Два разы на тыдзень	Два раза в неделю
Згодна з дамоўленасцю (з правілам)	Согласно договоренности (правилу)
Гаварыць на карысць каго-небудзь	Говорить в пользу кого-нибудь
Будынак на пяць паверхаў	Строение в пять этажей
Бачыць на свае вочы	Видеть своими глазами
Чуць на свае вушы	Слышать своими ушами
Смяяцца праз сон, гаварыць праз смех (слёзы)	Смеяться сквозь сон, говорить сквозь смех (слезы)
Спазніцца праз яго	Опоздать из-за него
Глядзець сябе (клапаціцца пра сваё здароўе, берагчы сябе)	Смотреть за собой
Спяваць на два галасы	Петь в два голоса
Сачыненне паводле рамана	Сочинение по роману
Град па гарошыне	Град с горошину
Што да мяне, то…; калі зайшла гаворка пра мяне, то…	Что касается меня, то…

10. Вызначце, у якіх сказах дапушчаны памылкі, звязаныя з каардынацыяй дзейніка і выказніка. Запішыце гэтыя сказы ў выпраўленым выглядзе.

1. Вядомы ўрач Вольга Залеская дапамог многім людзям пазбавіцца хранічных захворванняў.

2. У беларускіх лясах растуць сосны, бярозы, дубы.

3. ДАІ ў верасні пачала асабліва сачыць за рухам транспарту на гарадскіх вуліцах.

4. На канферэнцыі выступаў вядомы прафесар Ганна Мезенка.

5. Да экзамену засталося два дні.

6. Значная частка буслоў жыве на тэрыторыі Беларусі.

7. Алесь з Міколам добра напісалі сцэнарый да навагодніх і калядных свят.

8. З дня апошняй маёй сустрэчы з бацькамі прайшло сем месяцаў.

9. Андрэй з Віктарам вырашылі схадзіць у бібліятэку разам.

10. Музыку напісаў вядомы кампазітар Ірына Грыбуліна.

11. Большая частка студэнтаў удзельнічалі ў спектаклі.

12. Галоўны рэдактар Святлана Пятроўна Каралёва правяла чарговы сход, прысвечаны тэхніцы бяспекі.

13. Большая частка азімых былі засеяны своечасова.

14. Удзельнікаў нарады сустракаў дырэктар ліцэя Ніна Іванаўна Коласава.

15. З дзясятага класа на суботнік прыйшлі адзінаццаць вучняў.

16. Пяць дзён засталося да канікулаў.

11. Перакладзіце тэксты, вызначце, да якога стылю маўлення яны адносяцца. Абгрунтуйце свой выбар, звярніце ўвагу на дакладнасць і выразнасць маўлення прыведзеных тэкстаў.

ЮРИДИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ИНТЕРНЕТА

У Интернета нет собственника, так как он является совокупностью сетей, которые имеют различную географическую принадлежность. Интернет нельзя выключить целиком, поскольку маршрутизаторы сетей не имеют единого внешнего управления. Интернет стал достоянием всего человечества. В Интернете имеется много полезных и не очень свойств, эксплуатируемых заинтересованными лицами. Это, прежде всего, средство открытого хранения и распространения информации. По маршруту транспортировки незашифрованная информация может быть перехвачена и прочитана. Интернет может связать каждый компьютер с любым другим, подключенным к Сети, так же, как и телефонная сеть. Если телефон имеет автоответчик, он способен распространять информацию, записанную в него, любому

позвонившему. Сайты в Интернете распространяют информацию по такому же принципу: индивидуально по инициативе читателя. Распространение информации в Интернете имеет такую же природу, что и слухи в социальной среде. Если к информации есть большой интерес, она распространяется широко и быстро, нет интереса – нет распространения. Чтение информации, полученной из Интернета или любой другой сети ЭВМ, относится, как правило, к непубличному воспроизведению произведения. За распространение информации в Интернете (разглашение), если это государственная или иная тайна, клевета, другие запрещенные законом к распространению сведения, вполне реальна юридическая ответственность по законам того места, откуда информация введена *(В. Карасева).*

НОКТЮРН

В переводе это слово означает «ночная музыка». Ноктюрн появился в XVIII веке. Его предшественниками и современниками являются серенады, дивертисменты – инструментальные пьесы, которые состоят из нескольких небольших частей. Эти произведения исполнялись на открытом воздухе, преимущественно в ночное время, маленькими оркестрами, которые иногда аккомпанировали певцу.

В XIX веке ноктюрн превращается в пьесу для одного инструмента, обычно фортепьяно. Ноктюрн раскрывает картину спокойной ночной природы. Поэтому он окрашивается в лирико-созерцательные тона *(И. Барсова).*

ГОБОЙ

Перед началом симфонического концерта, когда музыканты рассаживаются по своим местам, раздается протяжный звук духового инструмента, по которому настраивается весь оркестр. Это – ля гобоя, который почти не меняет строя и служит в оркестре своего рода камертоном. К предшественникам гобоя относится также среднеазиатская зурна. В Европу прародители гобоя попали вместе с арабами в VIII веке. Это были инструменты свирельного типа. Современный гобой был сконструирован французскими мастерами в начале XVII века. Его изготовляют из черного дерева или бука. Едва только гобой вошел в первые оркестры, он завладел сердцами современников. В XIX веке к гобою применили

усовершенствованный клапанный механизм. Это повысило его виртуозные возможности *(И. Барсова).*

БЕСЕДЫ ХУДОЖНИКА

Что такое художественность?

Если перед художником оказалась случайно на его столе забытая группа вещей, то тут он может открыть таинственную вещь – пространство (причем это пространство никакими перспективами не покроется и не исчерпается).

Если он начинает эту группу рисовать или писать и его задачей будет цельно видеть все это, то он увидит, как вещи будут разговаривать друг с другом, сложно относиться друг к другу, уступать друг другу, строить глубину, влиять друг на друга и т. д. Он как бы услышит тихий разговор, и его натюрморт, то есть мертвая натура, представится ему как штильлебен, то есть как тихая жизнь. И если он сумеет действительно цельно изобразить эту группу предметов, то художник откроет ритм, ритмическое отношение вещей друг к другу, причем вещи будут сами еще меняться в зависимости от того, какую с какой мы будем соотносить. Словом, мы получим в результате что-то несказанное, что-то, о чем рассказать можно только очень приблизительно, но что искушенный зритель переживает и доподлинно видит, когда стоит перед вашим произведением.

За примером недолго ходить. Хотя бы натюрморт Шардена. Перед ним каждый раз останавливаешься в восхищении, а рассказать, чем он так уж хорош, едва ли до конца возможно.

Вот это и есть художественность, и она не привнесена в натуру. Ее породила сама натура, и мое стремление – цельно ее воспринять во всей ее сложности *(В.Фаворский).*

ТЕАТРАЛЬНОЕ ИСКУССТВО БЕЛАРУСИ

Белорусский театр уходит своими корнями в народные игры, обряды. Большинство обрядов было богато театрализовано. Народное искусство отличалось свободной импровизацией, легкостью перехода от серьезного к смешному, часто ярко проявлялось и в искусстве бродячих актеров – скоморохов. Со временем в их представлениях появились сюжетные драматические и комические сценки – интермедии, затем – народная драма.

В XVI–XVIII вв. в православных академиях и братских школах культивировался школьный театр. Представления проходили сначала на библейские сюжеты, а позднее – на исторические и бытовые. В этот же период появился один из наиболее социально острых и популярных видов народного творчества кукольный театр – батлейка, который широко использовал интермедии, шуточные и сатирические песни, фольклорные сценки. С начала XIX в. батлеечные сценки иногда разыгрывались живыми актерами, которые заменяли кукол.

В XVIII–XIX вв. в Беларуси существовали крепостные театры. Самым известным среди них был театр князей Радзивиллов в Несвиже. Театры были центрами культуры, имели балетно-оперно-драматические труппы, оркестры и капеллы, театральные здания с хорошо оборудованной сценой. В них ставились оперы, балеты, комедии и драмы, работали известные в то время композиторы и балетмейстеры *(В. Нефед)*.

МАРКЕТИНГОВАЯ РЕВИЗИЯ

Цель маркетинговой ревизии – сформировать вопросы, которые нужно обсудить для будущего планирования фирмы; выявить области, в которых организация должна исправить недостатки. Это включает изучение маркетинговых целей фирмы, стратегии, ее реализации и организации. Эффективная маркетинговая ревизия осуществляется регулярно, на принципах независимости, носит комплексный и систематизированный характер.

Процесс маркетинговой ревизии включает шесть этапов:

1. Определить, кто осуществляет ревизию.

2. Определить, когда и как часто проводить ревизию. Она может проводиться в конце календарного года, отчетного года компании или одновременно с инвентаризацией. Ревизия должна завершаться в одинаковые периоды каждый год, чтобы позволять делать сравнения.

3. Определить области ревизии (горизонтальную и вертикальную). Эти две ревизии должны использоваться во взаимоувязке, поскольку горизонтальная ревизия часто выявляет вопросы, которые требуют дальнейшего изучения.

4. Разработать бланки ревизий. Они обычно напоминают вопросники и заполняются ревизором.

5. Провести ревизию. На этом этапе необходимо решить, должны ли сотрудники знать о ней, проводить ее в рабочее время или нерабочее время и как готовить окончательное сообщение.

6. Представить результаты руководству. Это последний этап, на котором представляются результаты и рекомендации. Однако процесс ревизии завершается только после соответствующей реакции руководства *(Дж.Эванс)*.

ПРОБЛЕМА СВОБОДНОГО ВРЕМЕНИ

Проблема свободного времени имеет свою историю. Эта история – осмысление фактора времени в нашей деятельности, в нашей жизни, в нашем земном существовании. Напомним же несколько попыток такого осмысления, будет ли это глубоким размышлением или просто афоризмом, рожденным пытливым умом. Завет библейского декалога: «Уважай субботу!» – это ли не призыв к напряженной духовной жизни в свободное от работы время? Об этом же говорил Цицерон: «Никогда не был я так занят, как в свободное время». «Человек потребляет, чтобы жить, а не живет, чтобы употреблять», – так считал Аристотель. Знал цену времени и Наполеон: «Я могу проиграть битву, но не могу потерять минуту». Сатирик Э. Кроткий – грустно: «Мы убиваем время, а время убивает нас». Философский вопрос задавала украинская писательница Ирина Вильде: «Что больше вредит человеку – нехватка свободного времени или чрезмерность его?» И наконец – неизвестный автор: «Люди теряют все свободное время, чтобы добыть деньги. А нужно было бы тратить все деньги, чтобы добыть время» *(А. Михневич)*.

12. Прачытайце тэкст, складзіце яго план, а затым анатаванне.

А. Што прыгажэй ад лета? Грымлівага, духмянага, залатога. Ступіш на луг і хочацца разуцца, асцярожна прайсці па цуда-кіліме басанож. Божа, прыгажосць адбірае вочы. А ў лесе, а ў бары дораць водар цар-кветка ландыш, лясная цыбуля – чарамша, і шумяць-гамоняць, хваляцца зялёнымі сукенкамі бярозы-беланожкі, трапяткія асіны. А дзесьці ў гушчары-бары распускаецца папараць-кветка. На зямлі беларускай Купалле, на зямлі Яго Вялікасць лета: чэрвень, ліпень, жнівень. І параўнаць гэту званкарэхую, шчымлівую і ясную пару можна хіба з грацыёзнай, дзіўна-ласкавай і шчодра-руплівай жанчынай. Як светла і хораша напісаў пра яе ці не лепшы празаік маёй Беларусі Іван Мележ: «Усё лета перад хатай Чарнушкаў ціха грэлася на сонцы маладзенькая, з тонкім, як дубец, камлём рабіна. Ніхто ў Куранях,

бадай, не заўважаў, калі і хто пасадзіў яе, не бачылі як трэба яе і тады, калі яна красавіцкай раніцай апранулася ў лёгкае празрыста-зялёнае плацце з кволых, разных лісточкаў. Дні за днямі цікаўна, але нясмела, глядзела яна на вуліцу, на ўсіх, хто праходзіў міма, сціплая, непрыкметная, за нязграбным плотам, блізка ад вялікіх дрэў. Ніхто не даваў ёй ніякай увагі, мылі яе, песцілі толькі цёплыя дажджы, ды любілі шумець маладым лісцем вятры. Людзі ж яе як бы не заўважалі, спачатку таму, што проста не прыкмецілі, а потым таму, што непрыкметна прывыклі.

І неспадзявана адбылося незвычайнае: ціхая, нявідная, у жнівеньскім росквіце рабіна заружавела, зазырчэла яркім, кідкім харaством, гарачым полымем агністых гронак.

Як тая рабіна, цвіла ў гэта лета Ганна. Яшчэ, здаецца, учора была гарэза, падлетак, а вось ужо, глядзіце, – у самай добрай пары дзяўчына, у самай красе сваёй! Калі толькі вырасла!»

Заўваж, чытач, на невялікую дэталь: прыгажосць могуць убачыць толькі людзі «не ачарсцвелыя ў жыццёвых пакутах да хараства». І такіх на нашай слыннай зямельцы тысячы. Як бы іх ні дапякала работа, як бы ні мучыў клопат за заўтрашні дзень, душы іх цягнуцца да светлага і чыстага *(В. Жывіца)*.

Б. Якая яна, мая зямля? Гэта ў мінулым гераічная і шматпакутная зямля. Безліч разоў грукаталі па ёй калясніцы вайны. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі не была агрэсарам. Іншая справа, што яна заўсёды мужна і да канца бараніла свой дом, сваю праўду і веру.

Памяць маёй зямлі пра гэта і ў старадаўніх гарадзішчах, і ў курганах, пад якімі спяць яе абаронцы, і ў барвовых, быццам ад крыві, мурах замкаў, на палетках, дзе працавіты плуг часам выворвае каменную сякеру, меч або гільзу часоў апошняй вайны, і ў вечных агнях перад помнікамі салдатам.

І перш за ўсё, памяць маёй зямлі – гэта людзі і іх вечная, неўміручая праца. Араць палі, біць студні, расціць сады, плесці з каменю і дрэва карункі дзівосных будынкаў, спяваць песні, складаць вершы.

Таксама якасць нашай памяці: ніколі не аддзяляць сябе ад культуры і самаахвярна ствараць яе, якія б перашкоды не ўставалі на шляху. Стварыць непаўторны фальклор, першымі ў свеце сярод усходніх славян надрукаваць Біблію ў перакладзе на родную, беларускую мову. І не перарываць ані на год той стыхіі, плыні той

вялікай ракі, якая валадарыць чалавечым сумленнем і душамі і імя якой – літаратура. Шанаваць памяць яе дзеячаў, ствараць на месцах, дзе яны нарадзіліся і дзе паэзія нарадзілася ў іх душах, запаведнікі. І там калыска можа нарадзіць Песню і Неўміручасць *(У. Караткевіч).*

В.АБСТАЛЯВАННЕ СЦЭНЫ

Сучасны тэатр складаецца з дзвюх частак – сцэны і глядзельнай залы, якія аддзелены адна ад другой капітальнай сцяною са спецыяльным праёмам – партальнай аркаю, верхняя частка якой пакрываецца рамай-«арлекінам», за якім знаходзіцца спецыяльная супрацьпажарная «сцяна» – заслона. Апушчаная ўніз, яна герметычна падзяляе глядзельную залу і сцэну. Адным з найбольш важных механізмаў абсталявання партальнай аркі з'яўляецца антрактавая заслона. За супрацьпажарнай заслонаю знаходзіцца пад'ёмна-апускная заслона. Для змены памераў люстра сцэны па вертыкалі служыць партальная падуга, за якой, з правага і левага бакоў сцэны, прымацаваны партальныя кулісы, якія могуць мянаць люстра сцэны па гарызанталі. Абсталяванне сцэны зманціравана ў розных кутках і частках сцэны (ад каласнікоў да ніжняга трума). На кожным плане сцэны паралельна партальнай арцы замацаваны сафіты, што служаць для асвятлення дэкарацый кожнага плана. Планшэт сучаснай сцэны драматычнага тэатра абсталяваны рознымі механізмамі, найбольш распаўсюджаным з якіх з'яўляецца паваротны круг. У оперна-балетным тэатры вялікае значэнне мае пад'ёмна-апускны планшэт з асобнымі пляцоўкамі, у якіх умайстраваны люкі правалу. На сцэнах, дзе ёсць вялікія бакавыя запаснікі, знайшла прымяненне сістэма фурак (невысокіх пляцовак на калёсах, на якіх загадзя манціруюцца дэкарацыі трох бліжэйшых карцін) (*А. Каляда).*

Г. Каляды (ад лац. calendae «календы» – назва першага дня кожнага месяца ў старажытных рымлян), народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання. Святкаванне К. звязана з перыядам зімовага сонцастаяння і адпаведна з першым павелічэннем самага кароткага дня ў годзе. У гадавым коле народных аграрных абрадаў і святкаванняў займала 1-е месца. З усталяваннем хрысціянства К. былі прымеркаваны да свят Раства Хрыстова і Вадохрышча. На Беларусі рытуал святкавання К. цесна пераплецены з народнай

святочнай традыцыяй. К. працягваюцца з 24 снежня па 6 студзеня (па старому стылю). У аснове К. – старажытная аграрная абраднасць, агульным прызначэннем якой было паскарэнне надыходу цяпла (паводле народнага выказвання «Ад Каляд сонца паварочвала на лета») і забеспячэнне добрага ўраджаю ў новым гаспадарчым годзе пры дапамозе магічных дзеянняў. Для К. характэрны тры абрадавыя вячэры (куцці): посная (вялікая) спраўляецца перад першым святочным днём; багатая (тоўстая, шчодрая) з мяснымі стравамі – у вечар перад Новым годам; посная (галодная, вадзяная) – перад Вадохрышчам. У час К. наладжвалі варажбу, шматлікія забавы, гульні, а таксама т. зв. «калядаванне» – хаджэнне калядоўшчыкаў па хатах з выкананнем велічальных песень, тэатралізаваных сцэнак, пераапранаццем у «казу», «мядзведзя», «кабылу» і да т. п. Калядоўшчыкі спявалі калядныя песні, у якіх віншавалі гаспадароў хаты, жадалі ім дабра і заможнасці, услаўлялі іх працавітасць і шчодрасць, дабрадушна кпілі з малалеткаў, дзеда ці бабулі. За гэта гаспадары хаты давалі ім розныя падарункі (сала, каўбасы і інш.) *(Э. Дубянецкі)*.

КУЛЬТУРА ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ

§ 16. Жанрава-маўленчая адметнасць функцыянальных стыляў мовы

1. Прачытайце тэксты. Акрэсліце іх стыль, сферу выкарыстання. Якім тэкстам і чаму найбольш уласціва: 1) афіцыйнасць, дакладнасць, аб'ектыўнасць; 2) суб'ектыўнасць, аб'ектыўнасць; 3) суб'ектыўнасць, эмацыянальнасць? Прааналізуйце мову ўрыўкаў, звяртаючы ўвагу на стылістычную афарбоўку слоў, наяўнасць/адсутнасць вобразных сродкаў, будову сінтаксічных канструкцый. Дакажыце, што змест і мэтанакіраванасць выказвання ўплываюць на выбар моўных сродкаў.

А. КОДЭКС ПРАФЕСІЙНАЙ ЭТЫКІ БІБЛІЯТЭКАРА

Усведамляючы важнасць прафесійнай дзейнасці ў сферы стварэння, захавання і распаўсюджвання ў грамадстве інфармацыі, члены Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі прапануюць усім бібліятэкарам і спецыялістам, якія працуюць у гэтай сферы, у сваёй прафесійнай дзейнасці прытрымлівацца «Кодэкса прафесійнай этыкі бібліятэкара Беларусі»:

– забяспечваць высокі ўзровень абслугоўвання, ствараць умовы для раўнапраўнага, свабоднага і камфортнага доступу карыстальніка да інфармацыйных рэсурсаў;

– захоўваць духоўныя каштоўнасці і спрыяць развіццю нацыянальнай культуры;

– паважаць чалавечую годнасць і прытрымлівацца агульначалавечых прынцыпаў маралі, плюралізму ідэй, прынцыпаў інтэлектуальнай і інфармацыйнай свабоды;

– прызнаваць і з павагай адносіцца да інтэлектуальнай уласнасці;

– забяспечваць аператыўнасць, паўнату і аб'ектыўнасць інфармацыі, якая падаецца карыстальніку;

– аддзяляць прафесійныя абавязкі ад уласных інтарэсаў, імкнуцца да таго, каб уласныя перакананні не перашкаджалі свабоднаму доступу карыстальніка да інфармацыі;

– абараняць права карыстальніка на канфідэнцыяльнасць звестак пра яго і яго інфармацыйныя запыты;

– імкнуцца да бездакорнага выканання сваіх прафесійных абавязкаў;

– ставіцца да карыстальнікаў бібліятэк з павагай і добразычлівасцю;

– лічыць сябе членамі прафесійнай супольнасці і ставіцца да калег па рабоце справядліва і з павагай, абараняць іх правы;

– абменьвацца ведамі і вопытам, садзейнічаць аўтарытэту сваёй прафесіі і клапаціцца пра яе высокі статус.

Рада Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі лічыць, што выкананне «Кодэкса прафесійнай этыкі бібліятэкара Беларусі» з'яўляецца маральным абавязацельствам і прафесійным абавязкам кожнага бібліятэкара і пастараецца забяспечыць падтрымку калегам, якія сутыкнуліся з праблемамі ў рэалізацыі выкладзеных прынцыпаў (*Бібліятэчны свет. – 2003. – № 1).*

Б. Духоўная культура беларускага народа знайшла сваё адлюстраванне ў фальклоры, песенным, харэаграфічным і музычдлтбным мастацтве. Значны ўклад у сусветную скарбніцу народнай мудрасці ўнёс беларускі фальклор – багаты, разнастайны, шматгранны і самабытны, які ствараўся на працягу нашай тысячагадовай гісторыі, але найбольшага росквіту ён дасягнуў у разглядаемы перыяд.

Мудрасць народа, яго працавітасць, жыццёвы і гаспадарчы вопыт паказаны ў вуснай народнай прозе, якая прадстаўлена шматлікімі жанрамі – гэта казкі, міфы, легенды, паданні, сказы,

апавяданні, бываліцы, прыказкі, прымаўкі, загадкі, анекдоты, жарты, гумарэскі і інш.

Вельмі багатая ў беларусаў і вусная народная паэзія, якая захавалася і дайшла да нашых дзён у асноўным у выглядзе народнай песні. Як пісаў выдатны збіральнік беларускай песні Рыгор Шырма, па народнай песні можна пазнаць цэлую нацыю, яе характар і душу. У гэтым сэнсе багацце беларускай народнай песні бязмернае: вяселле ці пахаванне, хрэсьбіны ці заручыны, кожнае свята ці абрад, кожная пара года – не абыходзяцца без сваіх адметных спеваў. Беларуская народная песня заўсёды ясная, пластычная, часцей засмучаная, чым рэзвая і гуллівая. З боку настрояў, мелодыі і рытмаў яна вельмі самабытная: у музычных адносінах адрозніваецца мяккасцю, цеплынёй, шчырасцю. Народныя песні падзяляюцца на абрадавыя і пазаабрадавыя – гістарычныя, антыпрыгонніцкія, сямейна-бытавыя і інш.

З народнай песняй цесна звязана народная музыка, якая ахоплівае ўсе бакі жыцця чалавека – абрадавыя дзействы, каляданаванне і шчадраванне, хаджэнне валачобнікаў на Вялікдзень, купальскія карагоды, якія заўсёды суправаджалі музыкі. Яны выкарыстоўвалі розныя тыпы музычных народных інструментаў – гуслі, цымбалы, ліру, дудку, мандаліну, трубу, гармонік і інш.

Народны танец, як і народная песня і музыка, адлюстроўваў жыццё, побыт і працоўную дзейнасць чалавека, увасабляў яго нацыянальны характар, але ўжо ў пластычнай, харэаграфічнай форме. Танцы ў беларусаў пераважна парнамасавыя – Лявоніха, Мікіта, Млынок, Жабка, Таўкачыкі і інш. Беларускі фальклор настолькі багаты, што спатрэбілася б не адна кніга, каб яго апісаць *(М. Саўко, М. Бобер).*

В. Быў самы ранак, час, калі пачынае сыходзіць з зямлі туман і з туману, паступова разгортваючы сваімі промнямі яго заслону, выходзіць сонца. Яно не грэе. Цьмянае сонцава кола кружыцца за туманавай заслонай над самымі балотамі і вільготнай мякаццю яго сцірае з сябе санлівасць. Туман радзее, а сонцаў круг усё чысцей, усё яскравей і рухавей. Пакуль сонца ў тумане, сабраная ў кроплі раса нерухома трымаецца на мураве і колер муравы мутнавата-зялёны. Птушкі не спяваюць яшчэ, а як бы пераклікаюцца адна з другой пасля ночы. Як толькі ўзнімецца ўгору абмытае росамі сонца, а туман пачне адплываць за асмялеўшым ветрам на ўсход, як бы згаварыўшыся, разам пачнуць свой ранішні спеў птушкі, і густалісты асіннік і бярэзнік заварушацца, гойдаючы тонкімі

верхавінкамі, падстаўляючы гнуткія свае галіны пад лёгкія і ўчэпістыя птушыныя ногі. Варухнецца мурава пад ветрам і заіскрыцца расой. Залочанымі пырскамі будзе ўзлятаць з-пад ног раса, збітая з муравы, а прымятая нагамі мурава будзе павольна падымацца насустрач сонцу (*П. Галавач*).

Г. «Мая мацер з Палесся. Палессе – ета туды, пад Тонеж. У яе сясцёр і братоў там багата було, мо дзесяцера. Меншы брат Ян зваўся. Во за лесніка з маладых год буў. То от шо з етым маім дзядзькам адзін год прыключылася. Пайшоў вон на Купалнага Йвана з ружжэм у лес, думаў, яку дзічыну ўбіць – мо кабана, мо лася, мо мядзведзя. Пайшоў рана, сонейка не ўставала. Ціхенька йдзе па лесу, звера цікуе. Вуйшаў к Сіверскаму балоту, йдзе паўз яго памалу. І на балоце, і ў лесе ціха. Ідзе-йдзе. Аж раптам шо-та ему зробілася. Хоча йці далей, да не можа, як бу дзеравянее. Нешча не пускае яго далей йці, на балота заварачае да цягне. Не хоча йці, баіцца, дрыжыкі бяруць, а йдзе. З купіны на купіну ступае, скача. Да ўсё хутчэй, як бу завод які ў ём стаў, усё далей на балота. Балота тэ вялікае. Пасярод яго возера е, пасярод возера – востраў з купін, на востраве – куст адзін кала вады рос. Вуйшаў дзядзька к таму возеру. Раненька шчэ було, як бу туман возера аблягаў. Бачыць вон цераз туман той востраў, а на востраве – русаўкі, з крыламі, без сарочак, голыя, косы русыя па пояс. Пабраліся ў круг да танцуюць з падскокамі. А адна сядзіць пад кустом кала самае вады, у воду глядзіца да косы расчэсае. Косы расчэсае да пазірае ў дзядзькаў бок. І здалося яму, што вана заўлякае яго, да сабе заве. Страхоцце на дзядзьку нашло, вубраўся вон з балота, а як – не помніць. Спужаўся моцна. Цяпер русавак там ніхто не бачыць. Ці то ваны е, да не паказваюцца людзям, ці то звяліся. Мабуць, звяліся» *(Тураўскі слоўнік).*

2. Прачытайце два тэксты на адну і тую ж тэму. Запішыце тэксты па-беларуску і падкрэсліце ў іх словы з рознай стылістычнай афарбоўкай – *кніжн.*, *размоўн.*, *праст.* У чым адметнасць мастацкага і дакладнага перакладу? З якога тэксту мы найбольш даведваемся пра такі звычай, як калядаванне? Ад якога тэксту чытач атрымлівае найбольшае эстэтычнае задавальненне?

А. Колядование р., Калядаванне б., Колядування у. – святочный обряд посещения домов группами участников (колядовщиков, колядников), которые поздравляли хозяев и исполняли колядные песни (см.), получая за это вознаграждение в виде продуктов или

денег. Обряд совершался поздним вечером (рождественское колядование) или ранним утром (новогоднее колядование) с целью обеспечения достатка и благополучия хозяев дома. Приблизившись к дому и получив от хозяев разрешение, колядовщики (см.) исполняли во дворе под окнами благопожелание (см.) или колядку, адресованную всей семье в целом, после чего им выносили «колядный дар» (хлебные изделия, продукты), они же произносили благодарственные формулы и шли к следующему дому (колядование обобщенного типа). В украинско-белорусской зоне более типичным было исполнение специальных колядных песен в адрес каждого члена семьи (колядование дифференцированного типа). Такой развернутый обряд обычно происходил в доме и сопровождался музыкой, танцами, совместным угощением. При отказе одарить или при плохом одаривании в адрес хозяев могли произноситься формулы угроз и проклятий. Наряду с исполнением колядок и благопожеланий разные формы К. могли сопровождаться магическими действиями («посевание» зерном, щелканье бичом, битье ветками и др.) или разыгрыванием драматизированных сценок фольклорного или религиозного характера (см. Маска, «Коза», Драма рождественская) *(К. Н. Кабашников).*

Б. Последний день перед Рождеством прошел. Зимняя ясная ночь наступила; глянули звезды; месяц величаво поднялся на небо посветить добрым людям и всему миру, чтобы всем было весело колядовать и славить Христа.

Колядовать у нас называется петь под окнами накануне Рождества песни, которые называются колядками. Тому, кто колядует, всегда кинет в мешок хозяин, или хозяйка, или кто останется дома колбасу, или хлеб, или медный грош, чем кто богат.

Морозило сильнее, чем с утра, но зато так было тихо, что скрип мороза под сапогами слышался за полверсты. Еще ни одна толпа парубков не показывалась под окнами хат; месяц один только заглядывал в них украдкою, как бы вызывая принаряжавшихся девушек выбежать скорее на скрипучий снег. Мороз как бы потеплел; толпы парубков и девушек показались с мешками; песни зазвенели, и под редкою хатою не толпились колядующие. Чудно блестит месяц! Трудно рассказать, как хорошо потолкаться в такую ночь между кучею хохочущих и поющих девушек и между парубками, готовыми на все шутки и выдумки, какие только может внушать смеющаяся ночь. Под плотным кожухом тепло; от мороза еще живее горят щеки, а на шалости сам лукавый подталкивает сзади. Шумнее раздавались на улице крики и песни. Толпы

толкавшегося народа были увеличены еще пришедшими из соседних деревень. Парубки шалили и бесились вволю.

Часто между колядками слышалась какая-нибудь веселая песня, которую тут же умел сложить кто-нибудь из молодых казаков. То вдруг один из толпы, вместо колядки, отпускал щедровку и ревел во все горло:

Щедрик, ведрик!
Дайте вареник!
Грудочку кашки!
Кильце ковбаски!

Хохот награждал затейника. Маленькие окна поднимались, и сухощавая рука старухи высовывалась из окошка с колбасою или с куском пирога. Парубки и девушки наперерыв подставляли мешки и ловили свою добычу. В одном месте парубки, зашедши со всех сторон, окружали толпу девушек: шум, крик; один бросал комом снега, другой вырывал мешок со всякой всячиной. В другом месте девушки ловили парубка, подставляли ему ногу, и он летел вместе с мешком стремглав на землю. Казалось, всю ночь напролет готовы были провеселиться. И ночь, как нарочно, так роскошно теплилась, и еще белее казался свет месяца от блеска снега! *(Н. Гоголь, Коляда).*

3. Прачытайце тэксты. Падрыхтуйцеся да пераказу па-беларуску аднаго з іх: запішыце план, складзіце перакладны слоўнік тэрмінаў (спачатку вузкаспецыяльных, затым агульназразумелых). Пры пераказе навуковага тэксту варта захаваць моўную адметнасць гэтага стылю – дакладнасць словаўжывання, складаныя сінтаксічныя канструкцыі, ужыванне аднародных членаў сказа і інш.

1. Приветствие р., вітанне (развітанне) б., вітання у. – словесная формула благопожелания при встрече (расставании), в которой идущим высказывается встречному свое доброе расположение, выраженное словами, имевшими некогда значение заклинания. В П. отражается шкала ценностей, признанных абсолютными (жизнь, здоровье, счастливое время, удача, успех и др.): «Добры дзень», «Добры вечар», «Здравствуйте», «Доброе утро», «Доброго здоровья», «Доброго ранку», «Добри вечір». В них также проявляются социальные отношения людей, их возрастная и социальная соподчиненность (младший приветствует старшего, подчиненный – руководителя, бедный проситель – богатого и т. п.;

субъекты одной социальной группы могут обходиться приветствиями: «Здоров!», «Вітаю!», «Маё вам шанаванне!», «Чалом вам!», «Чэсць!»). Ритуально-магическая функция П. особенно наглядно выступает в тех, которые обращены к работающему: «Бог в помощь», «Памажы, Божа», «Спары, Божа», «Бог поміч, памагайбі» (складывающему, насыпающему) и т. п., за которые адресат обязан благодарить.

П. вербальные часто сопровождались определенными жестами: поклонами, склонением головы, снятием головного убора, вскидыванием, пожатием рук и др. *(Л. М. Соловей).*

2. Развитию внелитургической музыки предшествовало рождение светского силлабического стихосложения, достигшего расцвета в барочной поэзии Симеона Полоцкого. Его вирши пользовались большой популярностью при дворе Алексея Михайловича. Выдающимся памятником культуры конца XVI в., где органично соединялась духовная поэзия и бытовая песня, является «Псалтырь рифмотворная», созданная Симеоном Полоцким и Василием Титовым.

Поэтический перевод древних библейских текстов, посвященный царю Федору Алексеевичу, был издан в 1680 г. без музыки, хотя Полоцкий рассчитывал на его музыкальное воплощение. Музыку к псалмам Титов написал несколько позднее, между 1682–1687 гг. Создавая ее, композитор отошел от своего привычного монументального хорового стиля. Музыкальный склад большей части псалмов отличается камерностью и простотой; строфы песен нередко представляют собой элементарное четырехактовое построение. Псалмы предназначены для трехголосного исполнения без сопровождения инструментов. Каждая песенная миниатюра (а всего их в соответствии с Псалтырью сто пятьдесят) обладает достаточно ярким характером и законченностью формы. Среди них псалмы, близкие народно-песенным жанрам (*Л. Рапацкая).*

3. Абраам Моль – французский ученый, директор Института социальной психологии Страсбургского университета, автор большого числа работ в области эстетики, социологии, лингвистики, теории информации и др. Его книга «Социодинамика культуры» вышла в свет в 1967 году во Франции, а затем была многократно переиздана и переведена на другие языки. Эта работа рассматривает динамику культуры в специфическом аспекте, в терминах теории информации. Следует иметь в виду, что для А. Моля культура – это, во-первых, исключительно духовное производство, а, во-вторых, рассматриваемая в контексте массовых

коммуникаций, она представлена как пространство сообщений. Это позволяет ученому использовать количественные методы, анализируя циклы культурного взаимодействия.

А. Моль выделяет четыре доктрины относительно роли средств массовой информации в современном обществе: демагогическую (средство реализации экономической рекламы), догматическую (регуляция политического, идеологического поведения людей), культуралистскую (непрерывное гуманитарное образование людей) и социодинамическую (регулирование культуры с помощью ценностей, ускоряющих или тормозящих культурную эволюцию) *(Н. Г. Багдасарьян).*

4. Главной сферой деятельности социального педагога является социум (сфера ближайшего окружения личности, сфера человеческих отношений). При этом приобретенной (особенно в современных условиях) является сфера отношений в семье и ее ближайшем окружении, по месту жительства. Именно сфера ближайшего окружения (микросреда) играет огромную роль в формировании культуры личности, причем не всегда позитивную. Социологи доказывают, что различные нравственные отклонения, социально-патологические крены чаще происходят в микросреде с низким уровнем культуры, ограниченностью духовных запросов.

Поэтому перед обществом стоит проблема формирования полноценной, многообразной, самоорганизующей культурной среды. Ведь «именно она является важнейшим фактором духовного становления и совершенствования личности, ее идеалов, интересов, потребностей», ее приобщения к миру культуры.

Культурная среда включает социально-культурные объекты, связанные с созданием и распространением культурных ценностей. Но главное, что ее характеризует, – отношение людей, материальные и культурно-бытовые условия повседневной жизни, духовно-нравственная атмосфера. Поэтому процесс формирования культурной среды – одно из главных направлений культурного обновления, без которого невозможно преодолеть действие социальных и психологических механизмов, разъединяющих общество.

В процессе постижения культуры, понимания ее основ, приобщения личности к духовным ценностям большую роль играет семья как микросреда, наиболее близкая человеку и дающая ему первые понятия о культуре. Правда, необходимо отметить, что семья может передавать по наследству, трансформировать не только позитивные, но и негативные образцы поведения.

В последнее время в связи с различными изменениями в нашем обществе наблюдается кризис семьи. Она подвергается разрушительному воздействию со стороны массовой культуры, обезличиванию, духовно вымирает. Одной из составных частей культуры семьи является культура досуга. Это очень важный элемент жизнедеятельности семьи, так как именно в свободное время человек имеет возможность заниматься любимым делом, развивать свои духовные и физические возможности, уделять внимание саморазвитию, общению с другими людьми и т.д. *(И. Вышинская).*

5. В начале XVII в. барокко вытесняется изящным и вычурным стилем Людовика XV – рококо. Родина рококо – Франция. Дальнейшее распространение он получает в дворцовых и парковых строениях карликовых государств Германии (павильон Цвингер в Дрездене, дворец Сан-Суси в Потсдаме). Растрелли использовал декоративные тенденции рококо в архитектуре.

Многое в этом стиле определяет причудливая форма раковины. Само слово «рококо» произошло от слова «рокайль» – мелкие камушки, раковины. Модным становится орнамент из стилизованных раковин. Рококо продолжает традиции барокко. Его характеризуют изысканные и причудливые мелкие формы и изощренно изысканный филигранный, сильно стилизованный орнамент. Рококо получил наибольшее распространение при оформлении интерьеров.

Во внутреннем оформлении зданий используются живописные панно, раковины, зеркала. Этим добивается иллюзия легкости, нематериальности стен, свободного пространства. Декор интерьера насыщенный, но уравновешенный. Чистые краски, пастельные тона сочетаются с белой и золотой отделкой.

Рококо – легкий, игривый стиль, создающий атмосферу праздности, непринужденного веселья, непритязательного развлечения. Для него характерны изящество, деликатность, прихотливая грациозность. Он выражал вкусы отчужденной от политики и гражданственности части аристократии и дворянства.

Для рококо характерны изящные произведения, эротические и мифические сюжеты, экзотика. Заимствуются мотивы китайского искусства. Получают распространение маленькие статуэтки из фарфора и терракоты, предназначенные в основном для украшения интерьера, роспись на фарфоре и тканях. Предметы, мебель в стиле рококо всевозможно украшены, вычурной формы. В эпоху рококо были модны напудренные парики, богато украшенные кружевами

шелковые платья светлых тонов с объемными юбками *(А. Чернокозов).*

6. Первые балеты возникли в средневековой Франции. Именно там из танцев с покачиваниями и притопами, подскоками и прыжками, называемых бранлями (бранли – от слова branle, т. е. качание, хоровод), со временем возникла французская хореография.

Профессионалы – хореографы средних веков своим мастерством подняли искусство исполнения танца на новую высоту. Их достижения явились тем фундаментом, на котором позднее сформировался классический академический балет. В то время, когда танец соединяется с музыкой и появляется в привычном для нас понимании, расцветают такие музыкально-танцевальные формы, как сюита, пастораль, интермедия.

В XVI веке был сделан большой шаг вперед в развитии техники танца. Фабрицио Карозо в 1581 году издал в Венеции книгу «Танцовщик», где описал танцы Венеции, технику их исполнения, основные танцевальные движения. Во Франции Туано Арбо тоже выпустил книгу под названием «Оркезография», в которой говорил о значении танца, о зависимости танца от музыки. Приход в балет профессионально обученных исполнителей способствовал дальнейшему развитию танца. Тринадцать академиков во главе с балетмейстером Шарлем Бошаном должны были развивать благородное искусство танца.

В XVII веке появился новый жанр – комедия-балет. Его основателем был Жан Батист Мольер, великий французский драматург, актер и режиссер. Он многое сделал для развития классического танца: ввел 5 позиций ног, разработал свою систему сценического танца.

В Англии XVII века театр тоже включал в свои спектакли бытовые танцы. Танцы, описанные в произведениях Шекспира, составляют антологию хореографических произведений Англии. В высших кругах танцуют павану, гальярду, куранту, вольту, джигу *(Т. Барышникова).*

7. В наши дни существует целый ряд определений музея, что в значительной степени объясняется сложностью и многоликостью феномена. XX век подарил человечеству новые типы музеев, пришло осознание того, что сохранять и экспонировать можно и нужно не только предметы, но и характерное для них окружение, различные фрагменты историко-культурной среды, виды человеческой деятельности. Появились музеи под открытым небом, в основе которых – не традиционная коллекция предметов, а

памятники архитектуры и народного быта, представленные в своем естественном природном окружении. Возникли и музеи, экспонирующие главным образом не подлинники, а их воспроизведения.

Еще одна причина многообразия существующих определений музея – развитие теоретического музееведения и различные исследовательские подходы специалистов, а также разнообразие целей и задач, ради которых создается дефиниция. В изданиях справочного характера музеи обычно трактуются как научно-исследовательские и культурно-просветительные учреждения, которые в соответствии со своими социальными функциями осуществляют комплектование, учет, хранение, изучение и популяризацию памятников истории, культуры, а также природных объектов.

В международной практике обычно используется определение, выработанное Международным советом музеев (ИКОМ) и включенное в его Устав в 1974 г. С учетом поправок, внесенных в последний вариант Устава в 1995 г., эта дефиниция звучит следующим образом: музей – это «постоянное некоммерческое учреждение, находящееся на службе общества и его развития и открытое для людей, оно приобретает, сохраняет, изучает, популяризует и экспонирует в образовательных, просветительных и развлекательных целях материальные свидетельства человека и окружающей его среды»[1].

8. Выдающимся деятелем в области музыкального театра второй половины XVII века был гетман Великого Княжества Литовского Михаил Казимир Огинский. Меценат, композитор и музыкант, Огинский был основателем Оперного театра в Слониме. В числе первых сценических площадок называются «Театр на шести колесах», передвигавшийся при помощи четырех пар волов, и плавающий театр на реке Щаре и канале «Порт Огинский», построенном также по инициативе гетмана. В этом театре «оперы и комедии играны были в году 1771». А. Андржеевский, посетивший Слоним в 1798 г., восхищался дворцом и «роскошным театром, в котором находился настоящий пруд и плыли настоящие корабли…»[2].

---

[1] **Цит. по: Хадсон К. Музеи не стоят на месте // Museum. 1998. № 197. С. 43.**

[2] Andrzejowski A. Ramoty starego Detiuka o Wołyniu. Wilno, 1921. T. I. C. 176.

Сцена была приспособлена для показов барочных спектаклей, оперных и балетных, для выхода сотен певцов и статистов, для различных сценических превращений.

Технические возможности этой слонимской сцены – «Нового дома оперы», где декорации, меняясь на глазах у зрителей, позволяли представлять их взорам не только «море», но и бьющие на сцене фонтаны, освещавшиеся бенгальскими огнями, – были поистине уникальны.

Однако ценителей музыки поражал не меньше, чем сцена, и репертуар. В «нотной камере» Слонимского театра оказались все лучшие произведения оперного искусства XVII века. Музыкальный инструментарий капеллы был одним из лучших в Западной Европе и славянских странах. Оркестр, созданный М. К. Огинским в Слониме, современники считали выдающимся и сравнивали с мангеймским – «камертоном Европы». Нельзя обойти также тот факт открытия им в 1777 г. слонимской балетной школы – «Департамента балетных детей» (преимущественно крестьянских).

Здесь уместно отметить принцип использования в массовых сценах оперных спектаклей наряду с мещанами – крестьян, а также демократический подход к составу зрителей (зал «Нового дома оперы» был рассчитан на 2 000 мест, а в Слониме тогда проживало всего 6 000 человек (*Черняк Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ. Минск, 2004. С. 20–21).

4. Запішыце. Вусна растлумачце значэнне тэрмінаў. Вызначце агульназразумелыя і вузкаспецыяльныя. З трыма тэрмінамі складзіце сказы ў навуковым стылі (пісьмова) і з трыма – у размоўным (вусна).

4.1. Інтанацыя, рэпетыцыя, брава, авацыя, бенефіс.

4.2. Рэпетыцыя, квартэт, гала-канцэрт, паланэз, накцюрн, сапрана, папуры, рэпертуар.

4.3. Менеджар, нерэнтабельны, прэзентацыя, кампетэнтнасць, камунікацыйны працэс, беспрацоўе.

4.4. Індывідуум, рэзанёр, стэрэатып, скептыцызм, канфлікт, сангвінік, перавыхаванне, апякун.

4.5. Экспанат, барока, паліваная кераміка, мальберт, ткацтва, архітэктура, арнамент, габелен, каларыстыка, вернісаж.

4.6. Рэферыраванне, дайджэст, каталог, брашура, тыраж, картатэка, рукапіс, картатэка персаналій, віньетка, архіварыус.

4.7. Балеро, трэнаж, балетмайстар, фуэтэ, апломб, рэверанс, гапак, піруэт, тур, авансцэна.

4.8. Матэрыяльная культура, верацяно, этнаграфічны, язычніцтва, экспазіцыя, кансістэнцыя.

4.9. Сцэнарый, сцэнаграфія, саундтрэк, рэжысура, флэш-моб, спектакль, абрад, канферансье, акцёр, сцэна, тэатральная прастора.

5. Дайце азначэнне моўных штампаў і паразважайце, з якой мэтай яны выкарыстоўваюцца ў справавых паперах. Падбярыце да назоўнікаў адпаведныя дзеясловы, утвараючы ўстойлівыя моўныя звароты, напрыклад: *апеляцыя – напісаць, падаць.*

Акт, анкета, падзяка, віза, справа, даклад, закон, аб’ява, водзыў, адносіны, подпіс, пастанова, справаздача, папярэджанне, праграма, распіска, пратакол, распараджэнне, рэзалюцыя, рэкамендацыя, рашэнне, даведка, рахунак, тэзісы, патрабаванне, характарыстыка, штраф, слова, вымова, загад, іск, прэмія, просьба.

6. Справавым паперам уласціва ўжыванне слоў з прамым значэннем (у тым ліку слоў-тэрмінаў, розных афіцыйных назваў, недвухсэнсоўных устойлівых выразаў, назваў асоб па пасадзе, паводле роду заняткаў і прафесіі і інш.), што забяспечвае юрыдычную дакладнасць дакументаў.

а) *вусна растлумачце значэнне слоў:*

абанемент, абанент, адрасант, адрасат, альтэрнатыва, ануляцыя, арэнда, асігнаванні, аўтэнтык, выстава-продаж, гарант, гарантыя, гранд, дагавор, дэ-факта, дэ-юрэ, контрагент, крэдыт, ліцэнзія, маркетынг, менеджмент, навацыя, паблісіці, прэйскурант, сертыфікат, статус, факсіміле, фальсіфікат, штамп, штат, штраф, эквівалент, юрыдычная асоба;

б) *запішыце прыведзеныя словы і словазлучэнні па-беларуску:*

писать по адресу, обращаться не по адресу, анализ спроса и потребления, аренда помещения, благодарственное письмо, вступить в брак, состоять в браке, бывший в употреблении, нанести визит, вид на жительство, признать виновным, в нерабочее время, глубокоуважаемый, годовщина, данные, действующий, доказательство, зачетка, зачетный, зачислить, личность, личный, лицо, удостоверить личность, наличный, нижеподписавшийся, основание (причина), рейтинг, реклама, рекламодатель, участник, участвовать, ходатайство, целесообразность, в целях выполнения, иметь целью, ценность, паспорт, свидетельство;

в) *растлумачце правапіс вялікай літары ў назвах дзяржаўных устаноў; з трыма назвамі складзіце сказы ў афіцыйна-справавым стылі:*

Міністэрства культуры, Галоўнае архіўнае ўпраўленне (Галоўархіў), Галоўнае ўпраўленне па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры, Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Рэспубліканскі выставачны цэнтр, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь.

6. Складзіце распіску і даручэнне, выкарыстоўваючы тэрміналагічную лексіку вашай спецыяльнасці.

7. Вам трэба паведаміць пра навагодні вечар: а) напішыце аб’яву ў справавым стылі; б) складзіце вясёлую аб’яву; в) паведаміце студэнтам сваёй групы; г) паведаміце свайму сябру (сяброўцы); д) напішыце запрашэнне на вечар выкладчыку; е) запрасіце выкладчыка вусна.

8. Напішыце аўтабіяграфію і падрыхтуйце вуснае паведамленне пра тое месца, дзе нарадзіліся, пра сваіх бацькоў, пра выбар прафесіі і г. д. Параўнайце пісьмовы і вусны тэксты, зрабіце вывады: да якога стылю іх трэба аднесці і чаму.

9. Кантамінацыя ўстойлівых выразаў – адна з самых распаўсюджаных памылак афіцыйна-справавых папер. Прачытайце словазлучэнні, выпраўце памылкі:

не адыгрываць значэння, не мець ролі;
адказваць на задачы, рашаць пытанні;
вырашаць канфлікты, урэгуляваць задачы;
прымаць усё залежнае, рабіць меры;
змяніць ход, пераламіць зыход;
даваць заўвагі, рабіць парады;
мець адбітак, насіць асаблівасць;
прымяняць меры, прыняць санкцыі;

развіваць справу, весці дзейнасць;
упісаць уклад, унесці старонку.

10. Прачытайце, паразважайце над памылкамі, запішыце правільна.

Выехаць з горада Мінск, пражываць у горадзе Віцебск, знаходзіцца на прыпынку плошчы Незалежнасці, працаваць у Маладзечна, пытанні ў адносінах культуры, курсы для перападрыхтоўкі, адзначыць аб гэтым, дасягнуць да ўзроўню, паглыбіць кола ведаў, насіць асаблівасць, арганізацыя па збору інфармацыі, прысутнічаць на ўручэнні ўзнагарод, абмеркаваць на кафедры.

11. Запішыце фраземы, вызначце, якую ацэнку яны выражаюць і ў якіх стылях мовы яны могуць выкарыстоўвацца.

Круціць носам, даць дзёру, галаву звесіць, ногі выкруціць, абух абухом, кішкі пераядаць; вырашаць лёс, удзельная вага, нанесці ўдар, давесці да ведама, прыняць удзел, апраўдаць давер’е; адзін на адзін, стрымаць слова, мець на ўвазе.

12. Напішыце сцэнарый аднаго з народна-абрадавых свят для правядзення адпаведнага мерапрыемства.

§ 17. Камунікатыўныя якасці маўлення і іх праяўленне ў функцыянальных стылях

1. Прачытайце тэксты, вызначце, да якога стылю яны адносяцца. Як камунікатыўныя якасці маўлення праяўляюцца ў кожным стылі, вызначце, ппраз якія сродкі яны рэалізуюцца ў кожным са стыляў ?

А. Як прыгожа мы называем усе свае дванаццаць месяцаў! Студзень, люты, сакавік, красавік, май-травень, чэрвень, ліпень, жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад, снежань. І як хораша яны адпавядаюць сваім назвам!

У студзені, вядома ж, сцюдзёна. Усюды снег, мяцеліцы. І маразы – самая ж зіма ўсё-ткі! І як ні апранайся – усё роўна холадна. А ў лютым маразы яшчэ больш люцеюць. І гэта зразумела: люты – апошні месяц зімы, а яна маразамі імкнецца зачапіцца за зямлю.

Але ж сакавік, першы месяц вясны, хочаш ці не хочаш, але прыходзіць, і абуджаны веснавы сок ужо вярэдзіць, хвалюе карані дрэў і раслін, якія ва ўтульнай зямлі цярпліва чакалі вясны. І карані пачынаюць ужо думаць пра вяршыні – настойліва пампуюць наверх, да кожнай пупышкі, жыццядайны сок.

А колькі нечаканых і ласкава-захопленых назваў напрыдумлялі сакавіку нашы прашчуры: ён і зімабор, ён і светазар, ён і кропельнік, веснавей, пазімнік, сонцалюб, сонцабой.

Красавік – сярэдзіна вясны. Ён – увесь з процілегласцей, кантрастаў. Месяц снегагону, вадалею, сокаруху. Яшчэ час ледзяшоў і ўжо першых нашых красак: упартага прабіснегу, ціхай сон-травы, вірлавокіх пралесак. І пушыстых, як кацяняткі, вярбовых коцікаў… Усё красуе, усё жыве! Красавік! Калі ў сакавіку наша вясна была яшчэ нясмелая, то ў красавіку яна ўжо ідзе на ўсю нагу: ёю пахне і вецер, і кветка падбелу, і нават песня жаўранка.

Май умайвае нашу зямлю. Гэта месяц травы. Нездарма ж яшчэ ў старажытнасці звалі яго траўнем!

І яшчэ гэта месяц зеляніны, месяц апранання: кожнае дрэва, кожны кусточак ён апранае ў зялёныя ўборы. Да таго ж гэта месяц колераў – у ім вельмі хораша суседнічаюць і добра адпавядаюць адно аднаму ўсе колеры вясёлкі. І месяц хрушчоў. І месяц дажджоў. Мы, земляробы, нават просім: «Нам два дожджыкі ў маі…».

Чэрвень – самы светлы, самы спякотны, самы звонкі ад салаўінага пошчаку месяц. І чырвоны, бо чэрвень гэта – ад пладоў і ягад, якія пачынаюць спець. У чэрвені ўсё пасеянае і непасеянае

пачынае імкліва расці і набірацца сіл. Цвітуць каліна, язмін, шыпшына, ядловец, белая акацыя, маліна, зацвітаюць чарніцы, брусніцы, буякі, журавіны, а на лугах – канюшына, ятрышнік, незабудкі, кмен, дзьмухавец… Лугі – суцэльныя дываны з кветак: адначасова квітнеюць амаль усе лугавыя краскі. Каласуе і зацвітае жыта, потым – пшаніца, а пасля, ужо ў канцы месяца, і яравыя.

Наступны наш месяц старажытныя рымляне называлі юлем – у гонар імператара Юлія Цэзара, які рэфармаваў каляндар. Дарэчы, гэтак яго і цяпер называюць нашы суседзі – рускія.

Мы ж свой сёмы месяц завём ліпенем. Бо ў ім якраз цвіце на Беларусі ліпа. Яе цвіценне рухомае – і квет, і пах ідзе па нашай зямлі з поўдня на поўнач з хуткасцю каля 50 кіламетраў у суткі.

І яшчэ свой ліпень мы называем макушкаю лета. Бо пры ім пачынаюць укарочвацца дні і робяцца даўжэйшымі ночы, а ў зялёных кронах з’яўляюцца першыя жоўтыя лісточкі.

Ліпень – вельмі спякотны месяц, і ў ім сама болей навальніц: рэдкі ліпеньскі дождж абыходзіцца без іх.

Калі красавік – гэта ўсмешка вясны, наша надзея, то жнівень – гэта пацалунак восені і спраўджванне тых, веснавых, надзей. Жнівень – значыць жніво.

Сеялі мы ў красавіку, садзілі ў маі і чакалі жніўня. Жнівень – наш бог. Мы цярпліва чакаем яго, бо ведаем: адно зерне стане жменяй зярнят!

Паветра духмянае, але яно ўжо насычана пахам сухіх траў – блізка восень. На таках – груды залацістага збожжа, на лугах – стагі сена, у садах – голле яблынь звісае ад пладоў аж да зямлі… Такі ён, наш жнівень.

А верасень – гэта ўжо восень. Прыйшоў верасень – утаймаваў прыроду. Кветак амаль няма. Толькі настойліва цвіце верас, па назве якога мы і назвалі дзявяты свой месяц.

23 верасня Сонца праходзіць праз кропку асенняга раўнадзенства – значыць, даўжыня дня і ночы, як і вясною, ужо аднолькавая. Толькі птушкі цяпер не прылятаюць да нас, а адлятаюць. У вырай. У цёмныя хмары збіраюцца берасцянкі. Невялікімі чародкамі ляцяць на поўдзень мухалоўкі ды сітаўкі. Касяком пралятаюць гусі, касым шнуром – лебедзі. Па адным – зязюлі, ястрабы, лелякі. А пад нагамі – першае апалае лісце: жоўтае, бурае, чырвонае, карычневае, аранжавае… Але ж сапраўдны лістапад пачынаецца менавіта ў лістападзе.

Перад гэтым яшчэ ў нас ёсць кастрычнік – месяц, які атрымаў назву ад кастрыцы, што застаецца ад лёну, які мы зараз у гэты час

даводзім да ладу – тром, трэплем. Кастрычнік – апошні месяц вегетацыі раслін. Месяц, калі імжыць нудны дождж, калі здараюцца замаразкі, а то і выпадае снег. Рыхтуюцца да зімы лясныя звяры. Назапашваюць харч птушкі. У рэках і азёрах у глыбокія месцы збіраецца рыба: акуні, плоткі, карпы, карасі, яршы.

А ўжо ў лістападзе вецер і дождж абтрасаюць, распранаюць усе нашы дрэвы – на іх, зусім голых, нават рэдкаму цяпер промню няма за што зачапіцца. Дождж змагаецца са снегам, цяпло – з холадам. Світае позна, цямнее рана. Як мы кажам: «У лістападзе досвітак з прыцемкам сярод дня сустракаюцца».

Усё. Цыкл, хоць наперадзе яшчэ застаўся адзін месяц года, ужо закончаны. Лісце – пад нагамі. Карэнне глыбока ўтачылася пад зямлю, паснула. Цяпер толькі застаецца чакаць снегу. І ён неўзабаве, як абрусам, накрывае ўсю зямлю.

Зіма… Снежань – першы месяц зімы. У гэты месяц звычайна выпадае снег. Снежань зноў апранае дрэвы. Але не ў зялёнае, а ў белае адзенне. І намятае да іх каранёў гурбы снегу. Навейвае сумёты па самыя стрэхі. І мы радуемся: «У снежні мароз і снег вышэй хаты – год будзе багаты». Дні ўвачавідкі карацеюць, і неўзабаве надыходзіць 21 снежня – дзень зімовага сонцастаяння, калі ноч робіцца самаю доўгаю, а дзень – самы кароткі *(паводле Янкі Сіпакова).*

Б. Пад уплывам ідэй гуманізму ў Статут 1529 г. былі ўпершыню ўнесены такія прагрэсіўныя нормы, як суверэннасць дзяржавы, адзінства права, яго свецкі характар, талерантнасць, добрыя адносіны да іншых этнасаў ВКЛ, прававое становішча розных саслоўяў і сацыяльных груп насельніцтва. Цікавасць выклікае правіла, якое некалькі абмяжоўвала самавольства магнатаў, згодна з якім асобы «як убогія, так і багатыя» павінны былі судзіцца па адных нормах, выкладзеных у Статуце.

Вялікі князь (у Статуце – гаспадар) абавязаўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, не дапускаць іншаземцаў на дзяржаўныя пасады ў ВКЛ, не даваць ім маёнткаў, зямель, не адбіраць у мясцовых феадалаў пасады і маёмасць без суда, захоўваць існуючыя законы і выдаваць новыя толькі з панамі раднымі.

Больш дакладным станавілася судаводства, абвяшчаўся прынцып публічнасці правасуддзя, роўнасці бакоў у судзе, права абвінавачанага на абарону з удзелам адваката.

Значная ўвага надавалася сямейна-шлюбнаму праву. Так, было пазначана абяцанне ад імя вялікага князя не выдаваць дзяўчат

замуж прымусова, а толькі з іх асабістай згоды, што было даволі прагрэсіўнай з'явай на той час.

Першы Статут ВКЛ мае важнае значэнне і як выдатны помнік культуры і мовы беларускага народа. У адрозненне ад Заходняй Еўропы, у якой карысталіся рымскім правам, выкладзеным на незразумелай многім лацінцы, ён быў даступны ўсім пісьменным людзям і даваў магчымасць вывучаць лексіку і стыль беларускай мовы, на якім быў напісаны, а таксама дзяржаўна-прававую тэрміналогію таго часу. Значэнне Статута 1529 г. і ў тым, што гэта быў першы ў Еўропе сістэматызаваны збор законаў, ён стаў трывалай асновай для развіцця далейшага беларускага заканадаўства *(Статут ВКЛ, пер. А. С. Шагуна).*

В. Жыў сабе год чатырыста назад у беларускім горадзе Рагачове небагаты, але добрага роду дваранін па прозвішчы Гервасій Выліваха[3].

Быў ён з калена Давойнаў, з клана – Мячоў, а якога герба – за даўнасцю год забылася. Усёй маёмасці яго было – замак-развалюха, некалькі коней веку мафусаілава, латы, ды меч, ды яшчэ шахматная дошка, але затое быў ён багаты сябрамі і неабдзелены жаночай увагай.

Сабою быў дзівосна гожы і пяшчотны, а паводзін – самых заганных. Хобаль, залётнік, піяка, задзіра, біток, бабздыр неса-мавіты. Не было на ўсёй зямлі беларускай падобнага яму. Ляхі такіх завуць – «завалідрога», а мы, людзі роду крывіцкага, «адарвірог», бо некалі, кажуць, такі ў самога Люцыпара рог сілком аддзерлі і зрабілі з яго келіх для пітва. Вады нальеш, і, сілаю самога рога, робіцца гарэлка. Я думаю – байкі гэта.

І сябры ў яго былі адпаведныя. Андрэй Гарбаты з Брачыславічаў, Кірык Балабан з Гультаёў, Галляш Вясна са Свінчуковічаў ды яшчэ Іра Францічак, за пераплёт на служэнне надзелены вёскай Мазурыкі, родам багемец, але п'янюга і бабскі ліслівец – на трох беларусаў.

Толькі ўсёй і працы ў іх было, што цягацца па корчмах і шынкарках ды па навакольных замках, калі гаспадара няма дома, піць віно, як Дняпро п'е Друць, ды дзярбаніць на лютнях і кімвалах багамерзкія песні.

Неяк жылі. Ставілі і бераглі дзяды і прадзеды мёд і віно – і выпіць яго за адно жыццё было цяжкавата нават Выліваху. У лясах была жывая закуска, касулі ды туры. На балотах свіязі,

[3] Выліваха – белая чапля.

кражныя чагронкі, гразавікі, сярухі, шылахвосці. У рэках судакі, калекі, або балабы, самы, сіклы ды міроны, падусты, выразубы, язі ды галаўні, ляшчы ды бялёзны, страдалы, гусцёркі, свінні вадзяныя, сцярлядкі ды шчупакі.

І з іншым неяк абыходзіліся. У той час Магілёў з Рагачовам нават у Маскву пастаўлялі гатовае адзенне. Краўцоў было – грэблю масці. Так што порты, чугі ды плашчы абыходзіліся танна.

Набяруць гарэлкі, паедуць у лугі, дзіка заб'юць, ды на лаўцах пякуць дзічыну, ды песні гарлаюць – от і ўсё іхняе набажэнства Пану Богу за тое, што даў ім жыццё.

Нораў у гэтай грамады быў Дняпровы – на вярсту пяцьсот сажаняў звіву, – так што ніколі не ведаеш, чаго ад іх чакаць.

Нап'юцца ды, конныя, з кручы ў Дняпро скачуць. Або купяць за тры шэлегі плыт, усцягнуць на яго майно ды бочкі з Божай слязою, захопяць усіх дзяўчат з Вясёлай Слабады дый сплывуць так аж да Лоева. А мужам гарадскім у гэты час хоць ваўком вый.

З Лоева вяртаюцца на конях, мечаных гетманскай клейнай. І кажуць па-рознаму. То – «падарылі», а то «купілі, плыт спрадаўшы». Ды яшчэ смяюцца бессаромна, зубы нахабныя прадаюць.

Два разы стараста накладаў непарушную пячатку на іхняе дабро, за нясплату пазычанага. Думаў – сыдуць і ціха стане ў месце. То адзін раз яны – з нявыкруткі – загналі бацьку Палавуса, што дзесяць год са сваёй гайнёю па наваколлі блукаў і якога стараста з войскам спаймаць не мог.

Загналі і забралі ў яго ўвесь скарб.

А другі раз яшчэ мудрэй прыдумалі. Біскуп Смарагд хадзіў па наваколлі, зачыняючы грэцкага абраду цэрквы, а дабро іхняе рабуючы. Ездзіў, пёс касароты, як Мамай: наперадзе сам з войскам, а за ім абоз нарабаваны.

То яны два вазы з футрамі, ваздухамі, залатымі дараносіцамі, ахвярнікамі, крыжамі святымі, дзе пацірамі і дзіскасамі ў яго адбілі ды павялі. Божую зрабілі справу, але не для славы Божай, а для мамоны сваёй. Так і не выкурылі іх з гнёздаў.

У багатых, але пацёртых уборах, светлавокія, заўсёды на падпітку. Вакол лірны гуд і дудны роў. На сёдлах – жанчыны. На плячах – сокалы. У сэрцах – няма Божага страху *(У. Караткевіч)*.

2. Прачытайце ўрыўкі тэкстаў, вызначце стыль, падстыль; прааналізуйце адзін з іх: назавіце маўленчыя адзінкі, якія ствараюць дакладнасць, лагічнасць, лаканічнасць, багацце, выразнасць прафесійнага маўлення.

А. Дрэва без каранёў не бывае. Ёсць свае карані і ў кожнага з нас. І ўваходзяць яны ў глыбіню стагоддзяў. Праўда, не заўсёды лёгка іх адшукаць, дакапацца да іх. Не ва ўсіх, далёка не ва ўсіх продкі чым-небудзь вызначаліся, праславіліся. Ды і хто яны такія, каб трапляць на старонкі летапісаў ці аналы гісторыі? У большасці гэта былі звычайныя, простыя людзі – асочвалі звяроў, лавілі рыбу, засявалі поле, даглядвалі худобу, гадавалі дзяцей, словам, жылі. Жылі ціха, малапрыкметна. Так і паміралі. Тады ж, у даўнія часы, заўважаліся і апісваліся куды больш важныя асобы і падзеі – князі, цары, іх паходы і бітвы, тое, што адбывалася ў палацах і замках. Калі ж прозвішча якога-небудзь дваровага служкі ці мужыка і трапляла ў летапісы ці аналы гісторыі, дык выпадкова, рэдка. Таму пра сваіх продкаў – хто яны, як жылі – мы можам меркаваць хіба па ўспамінах, апавяданнях бацькоў, дзядоў ды тых паданнях, што дайшлі з сівой мінуўшчыны. Нямала пра гэта могуць расказаць і помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, звычаі і абрады, апісанні мясцін, дзе наканавана было нарадзіцца і жыць і нам, і нашым продкам. Сёе-тое можна і дамаляваць, уявіць, а то і ўзнавіць, па абарваных нітачках, кавалачках звязаць у адно цэлае. Напрыклад, па рэштках лясоў і балот, што дзе-нідзе яшчэ захаваліся, можна сказаць, якія лясы і балоты былі ў нас калісьці, колькі рознай дзічыны – мядзведзяў, ласёў, зуброў, аленяў, коз, барсукоў, дзікоў, зайцаў, баброў; птушак – качак, цецерукоў, рабчыкаў, курапатак, бакасаў, чапляў, галубоў, дзятлаў, ды і ўсяго іншага, чаго і не назавеш, не пералічыш, там вадзілася, пладзілася. А колькі ў рэках, рэчках, азёрах, старыцах, выгарах было рыбы, колькі ў барах, дубняках, беразняках, на палянах, прагалах ды і ў нетрах – зарасніках, гушчарах, імхах, – расло ягад, грыбоў! З гэтага можна заключыць, што продкам нашым – вядома, калі яны не былі лежні, гультаі, абібокі, галадаць не даводзілася. Ды і зямля падкармлівала, радзіла. Асабліва як лес спаліш, пасееш што-небудзь на пажарышчы. Проса, ячмень, ярыцу, жыта, пшаніцу, грэчку, авёс, гарох… Выпасаў, травы таксама хапала. А ўвосень зямля аж жаўцела пад дубамі ад жалудоў, пад арэшнікам – ад арэхаў… Так што было і самім што есці, і чым карміць кароў, коней, свіней, авечак… Нашы продкі, мяркуючы па ўсім, што захавалася, дайшло да нас з мінулага, былі нядрэнныя і паляўнічыя, рыбакі, паляводы, жывёлаводы, садаводы і пчаляры. Мёд збіралі цэлымі бочкамі. І які мёд! Не той, што цяпер іншы раз у магазінах ці на рынку прадаюць і які пахне буракамі і цукрам, а сапраўдны, сабраны з усяго

разнатраўя багатых на меданосныя кветкі лясоў, балот, лугоў, палёў.

Адно пакаленне людзей прыходзіць, пражывае свае гады, пратупвае адмераныя невядома кім кіламетры і дарогі і адыходзіць. На змену яму нараджаецца новае пакаленне. І так бясконца, вечна… Адны прыходзяць, другія адыходзяць. Пажыў, зрабіў сваё – саступі, дай пажыць іншым… І не сушы галавы, не думай над тым, чаму гэта так, а не інакш…

Мудрасць жыцця якраз не ў тым, каб думаць пра тое, пра што не варта думаць, а дбаць пра надзённае, пра тое, без чаго жыць нельга, што зрабіць трэба сёння, заўтра (*Б.Сачанка).*

Б. *Жалейка* – уласна беларускае слова ад *жаль*. Назва дадзена па характары гуку, якім вызначаўся гэты духоўны інструмент. З 2-й паловы XIX ст. жалейка інтэнсіўна выцясняецца кларнетам (лацінскае «кларус» – ясны гук).

Гуслі – агульнаславянскае слова з праславянскага «гондслі», якое звязана з дзеясловам *гудзець*. Само слова *гудзець* у некаторых мовах захавала значэнне «іграць» (чэшскае «гудба» – музыка, рускае «гудошник»). Мяркуюць таксама, што слова паходзіць ад санскрыцкага кораня «гу», звязанага з паняццем гучання наогул. У рускай літаратуры слова «гуслі» сустракаецца з XI ст.; упамінаюцца гуслі і ў «Словах» К. Тураўскага (XII ст.).

У назве музычнага інструмента *саксафон* гучыць імя яго стваральніка – бельгійца А. Сакса. Другая састаўная частка – ад грэчаскага «фоне», якое азначае «гук».

Слова *барабан* паходзіць ад «балабан», «дарабан». Так у цюркскіх мовах называецца гэты музычны інструмент. А слова «дарабанчы» азначала таго, хто іграе на ім. Найбольш ранняе сведчанне існавання барабана на Беларусі адносіцца да XII ст. (шахматная фігурка ў выглядзе барабаншчыка з Ваўкавыска) *(І. Шпадарук).*

В. Штодзённая культура – сукупнасць норм, звычаяў, стэрэатыпаў паводзін, якімі кіруецца чалавек у сваёй штодзённай жыццядзейнасці. Уяўляе сабой культуру, якая не атрымала інстытуцыяльнага замацавання і выяўляецца ў агульназразумелых і агульнадаступных ведах, навыках, стэрэатыпах паводзін. Сфера штодзённай культуры ахоплівае нязначную частку свету (мікрасвет) і абмежавана сваім домам, вуліцай, раёнам, горадам, школай, міжасабовымі адносінамі і да т. п. Чалавек засвойвае яе з ранняга дзяцінства, у сям’і, у зносінах з сябрамі, сваякамі, праз навучанне і выхаванне ў школе, інстытуце, праз сродкі масавай

інфармацыі і інш. Праблемы штодзённай культуры даследавалі многія філосафы, сацыёлагі, гісторыкі, літаратуразнаўцы – У. Джэмс, Л. Вітгенштэйн, М. Вебер, М. Бахцін, А. Гурэвіч, Ю. Лотман і інш. (*Э. Дубянецкі*).

Г. У пачатку XII ст. у Балоньскай школе, ці ўніверсітэце, (Італія) ужо былі студэнты. Гэта слова паходзіць з лацінскага «студэнс» – старанна займацца, працаваць. Шлях студэнта (на першым этапе вучобы ён зваўся схалар) пачынаўся з запісу яго на падрыхтоўчы факультэт. Пасля чаго ён пераходзіў на адзін са «старэйшых» факультэтаў: багаслоўскі, медыцынскі або юрыдычны. Лекцыі пачыналіся з пяці гадзін раніцы і працягваліся чатыры гадзіны. Падручнікаў не было, лекцыі запісваліся. Самым стамляльным быў выпускны экзамен. На студэнта на працягу дня (з шасці гадзін раніцы да шасці вечара) «нападалі» не менш чым два дзясятка апанентаў. Пры гэтым сам студэнт не павінен быў ні адпачываць, ні есці, ні піць. Пасля здачы экзаменаў усё завяршалася «банкетам Арыстоцеля» *(І. Шпадарук).*

Д. Фрэска, тэхніка манументальнага жывапісу; размалёўка па свежым вільготным тынку фарбамі, якія разведзены на вадзе; твор, выкананы ў гэтай тэхніцы. Палітра фрэскавага жывапісу звычайна стрыманая, пры высыханні фарбы можа блякнуць. Тэхніка фрэскі вядома з 2-га тыс. да н. э. у эгейскім мастацтве, была адной з асноўных у антычным і візантыйскім мастацтве, краінах Заходняй Еўропы. Росквіту дасягнула ў XIII–XVII стст. у творчасці Джота, Мазачыа, Рафаэля, Мікеланджэла. Высокім мастацкім узроўнем вызначаюцца фрэскі майстроў XIV–XVII стст. Феафана Грэка, Андрэя Рублёва, Дыянісія. На Беларусі найбольш старажытныя фрэскі захаваліся ў інтэр'еры Полацкага Сафійскага сабора (XI ст.), Полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай царквы (XII ст.). Вядомы размалёўкі ў культавых будынках (напр., касцёл бернардзінцаў і езуітаў у Гродне, Варварынская царква ў Пінску і інш.). Да тэхнікі фрэскі звярталіся беларускія мастакі XX ст. (С. Рудзінскі, Б. Вішнеўскі, В. Барабанцаў, Г. Вашчанка і інш.) (*Э. Дубянецкі*).

Ж. «Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў» – адзін з асноўных спецыяльных курсаў, які садзейнічае паспяховаму вывучэнню амаль усіх дысцыплін бібліятэказнаўчага, бібліяграфазнаўчага і інфармацыйнага цыклаў, і таму абавязкова вывучаецца слухачамі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

«Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў» – гэта комплексны курс, у якім вывучаюцца тэарэтычныя і метадычныя

пытанні складання бібліяграфічнага запісу, індэксавання дакументаў, іх анатавання і рэферыравання, стварэння традыцыйных і машыначытальных бібліятэчных каталогаў.

За апошні перыяд па разглядаемым курсе з'явіўся шэраг нарматыўных дакументаў, у тым ліку новыя выпускі ББК і УДК, пэўная сістэма стандартаў, на аснове якіх на сучасным этапе ажыццяўляецца аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў. У першую чаргу трэба звярнуць увагу на фарміраванне бібліяграфічнага запісу дакументаў, у які ўнесены карэнныя змены ў сувязі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій і міжнародным абменам інфармацыяй. Так, методыка бібліяграфічнага апісання дакументаў падаецца ў адпаведнасці з ГОСТ 7.80 – 2000 «Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления», ГОСТ 7.82 – 2001 «Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления», ГОСТ 7.1 – 2003 «Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления» і іншымі існуючымі стандартамі. Працэсы сістэматызацыі і прадметызацыі разглядаюцца адпаведна стандарту ГОСТ 7.59 – 2003 «Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации», у якім вызначаны магчымасці выкарыстання сучасных класіфікацыйных і прадметызацыйных інфармацыйна-пошукавых моў. Змест і афармленне рэферата і анатацыі на дакумент вывучаюцца ў адпаведнасці з ГОСТ 7.9 – 95 «Реферат и аннотация. Общие требования» *(паводле Н. А. Ляйко, А. І. Фядорынай)*.

3. Харэаграфічнае мастацтва. Бальны танец – танец, які выконваецца парай ці большай колькасцю ўдзельнікаў на танцавальных вечарах, балях. Узнік у XV ст. у Італіі; у XVI–XVII стст. заканадаўцам моды была Францыя. Спачатку бальны танец не меў установленай формы, а вызначаўся ўзнёсла-арыстакратычным характарам. Тады папулярнымі бальнымі танцамі былі алеманда, бурэ, гавот, менуэт, сарабанда. У XVIII–XIX стст. узніклі і пашырыліся больш свабодныя бальныя танцы, сярод якіх галоп, канкан, контрданс, лендлер, мазурка, полька і інш. З сярэдзіны XIX ст. найбольшае пашырэнне атрымаў вальс, непарыўна звязаны з творчасцю бацькі і сына Штраусаў. У канцы XIX – пачатку XX ст. пад уплывам танцавальных традыцый розных краін амерыканскага кантынента ўзніклі блюз, румба, самба, танга, чарльстон і інш. Большасць сучасных бальных танцаў вызначаюцца імправізацыйнасцю, зменлівасцю танцавальнай моды. Многія

бальныя танцы другой паловы XX ст. маюць свабодную кампазіцыю (рок-н-рол, твіст, шэйк і інш.). Праводзяцца нацыянальныя і міжнародныя конкурсы на лепшае выкананне бальнага танца па спецыяльнай праграме. На Беларусі з XVII ст. былі вядомыя асобныя заходнееўрапейскія танцы (куранта, марэска, павана), якія выконваліся пры дварах магнатаў, у калегіумах. Зараз у нашай краіне дзейнічае мноства гурткоў, школ і студый бальных танцаў (*Э. С. Дубянецкі*).

І. Усе, хто бываў на Пастаўшчыне, пацвердзяць, што гэта край з харызмай. І не зразумееш, што надае яе. Можа, маляўнічая прырода, бо толькі азёр тут больш за сотню. Альбо багатая 600-гадовая гісторыя і вялікая колькасць цікавых помнікаў архітэктуры. Ці самі людзі, што шануюць традыцыі і цікавяцца мінуўшчынай свайго краю. А магчыма, усё гэта разам.

На ўзгорку на падмурку драўлянага францысканскага кляштара стаіць велічны касцёл Св. Антонія Падуанскага – візітоўка Паставаў. У Першую сусветную вайну ён быў значна пашкоджаны, і ў 1920-я гады вернікі яго аднавілі. А вось савецкую ўладу перажыць ён не здолеў. У маі 1949 года яго зачынілі. У храме на доўгія часы размясціўся філіял прамысловага прадпрыемства. Званы маўчалі роўна 40 гадоў, да мая 1989 года, калі касцёл нарэшце вярнулі католікам.

Касцёл у гонар Св. Яна Хрысціцеля – стары храм з вельмі багатай гісторыяй. Можа, на фота ён выглядае трохі панура, але месца гэтае вельмі цікавае. Гэта адзін з трох храмаў-крэпасцей у Беларусі (два іншыя – у Сынкавічах і Мураванцы), які дзейнічае ўжо больш за 400 гадоў і не зачыняўся нават у савецкія часы, што само па сабе ўжо цуд. Кажуць, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны тутэйшы ксёндз выратаваў ад фашыстаў нейкага партызана, які потым стаў партыйным функцыянерам і закінуў слоўца за храм.

Сцены касцёла амаль у два метры таўшчынёй, і як напамін аб падзеях Паўночнай вайны ў сценах можна бачыць гарматныя ядры. Праўда, іх туды ўмуравалі адмыслова.

Храм вядомы яшчэ і 400-гадовым цудатворным абразом Маці Божай, адной з карцін вядомага мастака другой паловы XIX стагоддзя Альфрэда Рамэра, і 100-гадовым арга́нам, на якім іграў знакаміты музыка Браніслаў Руткоўскі. Асаблівай увагі заслугоўвае энергічны і дапытлівы настаяцель Яцэк Хутман, які бясконца вывучае таямніцы храма, а нядаўна знайшоў пад алтарнай часткай касцёла яшчэ адно пахаванне, магчыма, нават фундатараў храма.

Пра палац Бішэўскіх у Лынтупах існуе прыгожая легенда. Малады ўладальнік Лынтупаў Юзаф падчас вучобы ў Парыжы закахаўся ў адну французскую актрысу і прапанаваў ёй руку і сэрца. А яна паабяцала, што выйдзе за яго замуж толькі тады, калі ён пабудуе для яе цудоўны палац, які адпавядае яе стаовішчу. Бішэўскі быў архітэктарам і сам заняўся праектаваннем дома. І ў выніку пабудаваў цудоўны дом з паркам, шырокімі алеямі і сажалкамі. Але дарэмна. Каварную прыгажуню ён не ўразіў, яна фыркнула і з'ехала назад у свой Парыж. А Юзаф так і застаўся халасцяком.

Калісьці галоўную плошчу Паставаў называлі Рынкавай, а цяпер яна завецца плошчай Леніна. Таму што цэнтральная і на ёй стаіць помнік правадыру пралетарыята. Дарэчы, помнік унікальны, бо самы малады сярод усіх беларускіх помнікаў Леніну.

Але адметнасць плошчы не толькі ў гэтым. Яна стала адной з першых ансамблевых забудоў на тэрыторыі Беларусі. Усе дамы на ёй узводзіліся не як прыйдзецца, а ў адзін час і па праекце аднаго архітэктара – італьянца Джузепэ дэ Сака. Дарэчы, галоўнага архітэктара ўсяго Вялікага Княства Літоўскага. З 22 будынкаў да нашых дзён захавалася толькі шэсць, аднак выглядае плошча вельмі цэласна і гарманічна. Характэрныя фігурныя фасады домікаў надаюць Паставам рысы еўрапейскага гарадка. У адным з іх – у доме аптэкара – пастаўчане ўжо 250 гадоў купляюць лекі. Калісьці ў ім жыў лекар, а потым, каб не парушаць традыцыі, там размясцілі аптэку *(з газеты)*.

К. Батлейка (ад Betleem – польская назва г. Віфлеем, дзе паводле біблейскага міфа нарадзіўся Ісус Хрыстос) – беларускі народны лялечны тэатр. Вядомы з XVI ст. Некаторае падабенства да беларускай батлейкі маюць украінскі вярцеп (найбольш пашыраны ў XVIII–XIX стст.) і польская шопка (вядомая з XV ст.). Паказы батлейкі звычайна адбываліся на Каляды; для гэтага выраблялі з дрэва спецыяльныя скрынкі, звычайна мелі выгляд хаткі ці царквы, з гарызантальнымі перагародкамі (сцэнамі-ярусамі). Лялькі-персанажы рабіліся з дрэва і каляровай тканіны. Паказы суправаджаліся словамі і музыкай, а батлеечнік агучваў персанажы-лялькі рознымі галасамі. Звычайна батлеечнае прадстаўленне складалася з дзвюх частак: рэлігійнай (кананічнай) і свецкай (народна-бытавой), прычым кананічны сюжэт разыгрываўся на верхнім ярусе, а свецкі – на ніжнім. Вельмі папулярнымі былі народныя інтэрмедыйныя сцэнкі з песнямі і танцамі, у якіх нярэдка ў гумарыстычнай і востраватырычнай форме высмейваліся

паводзіны нахабных, ілжывых, сквапных куцоў, шляхцічаў, паноў, карчмароў і да т. п. Асноўнымі кампанентамі батлеечных паказаў былі песня, танец, дыялог, маналог.

У канцы XIX – пачатку XX ст. асобныя сцэны батлейкі выконвалі жывыя акцёры (т. зв. «жывая батлейка»). З канца 1980-х гг. робяцца спробы адрадзіць паказы батлейкі на Каляды. З 1991 г. паказы батлейкі адбываюцца ў філіяле Літаратурнага музея імя М. Багдановіча, а прафесійны Дзяржаўны тэатр лялек і Тэатр-студыя кінаакцёра паставілі батлеечную п’есу «Цар-Ірад» (*паводле Э. Дубянецкага*).

IV. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

1. Прадмет, задачы і месца курса ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук.
2. Сувязь курса “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” з іншымі навукамі.
3. Беларуская мова сярод іншых моў свету.
4. Генезіс беларускай мовы, яе развіццё ў часе.
5. Рэформы правапісу беларускай мовы. Закон аб мовах.
6. Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры.
7. Храналагічныя пласты спрадвечнай беларускай лексікі.
8. Іншамоўная лексіка і паказчыкі яе запазычання.
9. Лексіка беларускай літаратурнай мовы паводле сферы ўжывання.
10. Сутнасць паняццяў “спецыяльная лексіка”, “тэрмін”, “тэрміналогія”. Устойлівыя выразы ў межах прафесійнага ўжывання.
11. Супастаўляльная характарыстыка тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі.
12. Асаблівасці беларускай фанетычнай сістэмы ва ўмовах білінгвізму.
13. Паняцце графікі. Беларускі алфавіт.
14. Арфаэпічныя нормы і прычыны іх парушэння.
15. Вымаўленне галосных і іх спалучэнняў.
16. Вымаўленне зычных і іх спалучэнняў.
17. Арфаграфічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прын- цыпы беларускага правапісу.
18. Напісанні беларускамоўнай прафесійнай лексікі паводле фанетычнага прынцыпу.
19. Перадача акання і якання ў беларускай мове.
20. Напісанне *ы, і* пасля прыставак.
21. Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах.
22. Напісанне галосных у складаных словах.
23. Правапіс прыстаўных галосных і зычных.
24. Правапіс *ў* (нескладовага).
25. Напісанне спалучэнняў зычных у корані і на стыку кораня і суфікса.
26. Правапіс прыставак на *з- (раз-, уз-, без-, цераз-).*
27. Правапіс *д-дз, т-ц.*
28. Падоўжаныя зычныя і іх правапіс.
29. Напісанне беларускамоўнай прафесійнай лексікі паводле марфалагічнага прынцыпу.
30. Правапіс звонкіх-глухіх, цвёрдых-мяккіх зычных, выбухных-афрыкат.
31. Напісанне беларускамоўнай прафесійнай лексікі разам, асобна і праз злучок.
32. Ужыванне вялікай літары пры размежаванні ўласных і агульных назваў, пры афармленні простай мовы і цытат.
33. Лексіка-граматычная характарыстыка назоўніка.

34. Нарматыўныя склонавыя формы назоўнікаў I скланення.

35. Нарматыўныя склонавыя формы назоўнікаў II і III скланення.

36. Нарматыўнае функцыянаванне рознаскланяльных назоўнікаў.

37. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў множнага ліку.

38. Скланенне і ўжыванне ўласных назоўнікаў.

39. Асаблівасці скланення і выкарыстання займеннікаў як слоў з “замяняльнай”, “указальнай” функцыяй.

40. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў і іх ужыванне.

41. Асаблівасці склонавых канчаткаў прыметнікаў.

42. Спецыфіка ўтварэння і функцыянавання розных формаў прыметніка.

43. Лексіка-граматычныя разрады лічэбнікаў, іх скланенне.

44. Асаблівасці спалучэння лічэбнікаў з назоўнікамі, дапасаванымі прыметнікамі і дзеепрыметнікамі.

45. Роля прыметніка і лічэбніка ў стварэнні тэрміналагічнай лексікі.

46. Нарматыўнае ўжыванне граматычных катэгорый і формаў дзеяслова.

47. Спецыфіка спражэння дзеясловаў; асаблівасці суфіксальнага афармлення.

48. Асаблівасці ўтварэння і перакладу дзеепрыметнікаў і дзеепрыметных зваротаў з рускай мовы на беларускую.

49. Спецыфіка ўтварэння і функцыянавання дзеепрыслоўяў.

50. Функцыянальна-стылістычная характарыстыка службовых часцін мовы.

51. Структура і спецыфіка беларускіх словазлучэнняў (параўнальна з рускай).

52. Паняцце функцыянальнага стылю і класіфікацыйныя фактары іх вылучэння.

53. Агульная характарыстыка кніжных і размоўнага стыляў.

54. Асноўныя прыметы і функцыі навуковага стылю.

55. Падстылі і жанры навуковага стылю.

56. Асноўныя прыметы і функцыі афіцыйна-справавога стылю.

57. Падстылі і жанры афіцыйна-справавога стылю.

58. Праблемы культуры маўлення ва ўмовах білінгвізму.

59. Камунікатыўныя якасці маўлення.

60. Вербальныя і невербальныя сродкі маўленчай дзейнасці і іх роля ў падрыхтоўцы да публічнага выступлення.

Тэставыя заданні для самакантролю

па курсе «Беларуская мова: прафесійная лексіка»

Тэст № 1

А1. Адзначце словы, у якіх літары Я, Ё, І, Е абазначаюць два гукі.

1) лінагравюра
2) канфігурацыя
3) з’явіўся
4) іх
5) сям’і
6) ёмісты
7) у здароўі
8) бібліёграф
9) Мальер
10) басня

А2. Адзначце словы, у якіх націск падае на першы склад.

1) завязка (драмы)
2) партэр
3) генезіс
4) хобі
5) стары
6) атлас (геаграфічны)
7) дарма (бясплатна)
8) седзячы
9) ласкавы
10) шэсцьдзясят

А3.Адзначце пары слоў, якія з’яўляюцца сінонімамі.

1) абрэвіятура – скарачэнне
2) ілюзорны – узорны
3) кампетэнтнасць – дасведчанасць
4) эканомны - ашчадны
5) адэкватны – раўназначны
6) абсурд – здарэнне
7) прэамбула – прадмова
8) канкурэнцыя – спаборніцтва
9) мінорны – вясёлы
10) дамінаваць – пераважаць

А4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Я.

1) жыцц...піс
2) с...нтэнцыя
3) плац...жы
4) б...спраўны
5) бен...фіс
6) ...сенін
7) В...ласкес
8) дз…вятка
9) тыс...чны
10) дз...сяты

А5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Е.

1) рады…акустычны
2) вас…мнаццаты
3) крыштал…кераміка
4) в…б-камера
5) в…лікасвецкі
6) рады…ахоўны
7) бізн…см…н
8) вал…алогія
9) в…лікадзяржаўны
10) у П…руна

А6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара А.

1) ч...цвер
2) н...вамодны
3) камп’ют...р
4) аўды...візуальны
5) капірайт…р
6) н...ватар
7) Ры…-Негра
8) ст...галосы
9) пр...цілеглы
10) мн..гаслойны

А7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Э.

1) бен...фіс
2) акард...он
3) с...рвіс
4) м...неджар
5) ц...рымонія
6) эф...кт
7) эн...ргічны
8) майст...р
9) сурв...тка
10) Г...ндэль

А8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара І.

1) дэз...нтэграцыя
2) мушк...цёр
3) без...ніцыятыўны
4) пр...нтар
5) арх...варыус
6) за…скрыцца
7) звыш...нтэнсіўны
8) пра...гравальнік
9) з...мправізаваць
10) Леанарда да Вінч...

А9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара О.

1) мн...гаўзроўневы
2) сл...ваформа
3) выканк...м
4) ф...ндасховішча
5) д...ўгачасны
6) мн...гагучны
7) р...знастылявы
8) ст...галосы
9) шт...гадовы
10) Д...бравольскі

А10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Ў.

1) Е...рабачанне
2) гука...спрымальнік
3) на...дачу
4) адкрытая ...смешка
5) бакала…р
6) эмацыянальна-...зрушаны
7) Алена ...ладзіміраўна
8) калёкві...м
9) філасо...скі
10) ва ...нісон

А11. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак.

1) бескультур...е
2) мен...шы
3) В...етнам
4) Цзянмын…скі
5) ледз...ве
6) дз...вюма
7) л...ю
8) фал...клор
9) канферанс...е
10) стан...це

А12. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара.

1) ...оперная арыя
2) кло...ун
3) аб...астрыць
4) на...аколле
5) ...узмахнуць
6) купіць ...льняную вопратку
7) павярнуцца ...мгненна
8) ...унікальныя здольнасці
9) на ...Украіне
10) На...уменка

А13. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) меца-сапрана
2) Ілья
3) безапаветны
4) баласны
5) разлавацца
6) сугуча
7) з радасцю
8) сюррэалізм
9) палымяны
10) апплікацыя

А14. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) комплексны
2) жаластны
3) па-братску
4) двухмесны
5) дапаздна
6) бязсмертны
7) казацкі
8) магістарскі
9) кантрастны
10) графскі

А15. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок.

1) (чым)небудзь
2) усё(такі)
3) (па)свойму
4) вышэй(сказаныя) словы
5) (кіна)(відэа)бізнэс
6) (віцэ)мэр
7) (паў)Віцебска
8) (джаз)аркестр
9) вакальна(сцэнічны)
10) усё(роўна)

А16. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) варыацыя
2) плагіят
3) Іанічаскае мора
4) радыо
5) сітуацыя
6) клавіятура
7) капрычыо
8) Фейербах
9) акардэён
10) харэаграфія

А17. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары.

1. (М,м)іншчына
2. (К,к)упалаўскія чытанні
3. (Б,б)агдановічавы санеты
4. (М,м)урчыны кацяняты
5. (М,м)ележаўская прэмія
6. (С,с)яброўскі гурток

7. (Д,д)ом народнай творчасці
8. часопіс “(М,м)аладосць”
9. (К,к)упалаўцы
10. (Б,б)ожы храм

А18. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.

1) *зерне* сцэнічнага вобраза
2) *губляць* думку
3) *выказаць* падзяку
4) *адмываць* душы
5) *разбітае* сэрца
6) *бляск* майстэрства
7) *намаляваць* карціну
8) *плесці* сурвэтку
9) *мова* харэаграфіі
10) *атрымаць* сусветную вядомасць

А19. Адзначце радкі, у якіх усе словы з’яўляюцца сінонімамі.

1) абавязак, адказнасць, павіннасць, задача
2) адгаворка, выверт, прычына, апраўданне, адмаўленне
3) адзінка, штука, паасобнік, экзэмпляр, адзінства
4) узор, прыклад, мадэль, стандарт
5) саюз, аб’яднанне, карпарацыя, таварыства
6) далікатны, тактоўны, ветлівы, ласкавы, асцярожны

А20. Адзначце заданні, у якіх адбываецца чаргаванне *г:з, к:ц, х:с* у формах слоў.

1) паехаць да (бабка)
2) узнагародзіць у (Прага)
3) удзельнічаць у (пастаноўка)
4) у вядомай (ткачыха)
5) на кожнай (старонка)
6) у нацыянальную (музыка)
7) у вашай (рэпліка)
8) у (мелодыка)
9) артысты (“Калыханка”)
10) дараваць (Абламейка Вераніка)

А21. Адзначце назоўнікі з канчаткамі –у, (- ю) у М. скл. або Р. скл.

1) зайграць на англійскім ражк...
2) у рэпертуар...
3) пры віртуоз...
4) на этап...
5) пры выканаўц...(м.р.)
6) на геро...
7) па адным крок...
8) адчуць дух час...
9) уручыць Мікала... Алесюк...
10) пры Іван...

А22. Адзначце назоўнікі з канчаткамі –а, (- я) у родным склоне.

1) імітаванне
2) інтэрнэт
3) фінал
4) канцэрт
5) эпізод
6) кірмаш
7) рух
8) памер
9) постмадэрнізм
10) бенефіс

А23. Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчана памылка.

1) рэпеціраваць дацямна
2) адкласці на паслязаўтра
3) правесці дзень у пустую
4) зрэдку наведваць бацькоў
5) навошта запытваць
6) надта цяжка
7) што год ездзіць на конкурс
8) зрабіць удвая лепей
9) рыхтавацца ў сур'ёз
10) усёроўна буду выступаць

А24. Адзначце словазлучэнні з правільным ужываннем дзеепрыметнікаў.

1) выступаючы артыст
2) выконваўшыеся нумары
3) намаляваны партрэт
4) адлюстраванныя факты
5) паслабеўшы голас
6) камп'ютарызаваныя класы
7) адкрытая выстава
8) ненадрукаваная п'еса
9) пацямнелыя фарбы
10) пераплеценыя кнігі

А25. Адзначце сказы з памылкай. Напішыце правільны варыянт ужывання формы слова.

1) Дзяцей лягчэй за ўсё збіраць у цэнтры пазашкольнай работы.
2) Каб зрабіць работу больш цікавейшай, можна прапанаваць дзецям гульню.
3) Навуковы кіраўнік параіў цябе ўдзельнічаць у студэнцкай канферэнцыі.
4) Ёсць экспанаты, якім сёння больш 100 гадоў.
5) Здабыткі нацыянальных культур – найвышэйшая каштоўнасць грамадства.

А26. Адзначце сказы са стылістычна-граматычнымі памылкамі.

1) Захоўваючы нацыянальныя традыцыі, здабыткі культуры і мовы, першасная роля тут належыць сям'і.
2) Ствараючы дзіцячы хор, трэба прытрымлівацца аднароднасці калектыву па ўзросце.
3) Абагуліўшы вынікі работы, супрацоўнікі творчай лабараторыі прыйшлі да пэўных вынікаў.
4) Мова не проста сукупнасць умоўных знакаў, забяспечваючых зносіны.
5) Страціўшы мову, карані нацыянальнай свядомасці былі падсечаны.

А27. Адзначце сказы з памылкай у дапасаванні або кіраванні.

1) Выбачайце нас, калі ласка, за такое нечаканае спазненне.
2) Пры Доме народнай творчасці працуюць дванаццаць клубных фарміраванняў.
3) У рэспубліцы працуе два дзесятка дзяржаўных тэатраў.
4) Шмат песень і казак складзены народам пра лён.
5) Некалі даўно давялося мне пагартаць гэты старажытны летапіс.

А28. Адзначце сказы з граматычнай памылкай.

1) Чытальны зал разлічаны на дваццаць два месцы.
2) У інтэрнаце па вечарам праводзяцца сустрэчы сяброў тэатра.
3) Душа чалавека мацнейшая за розум яго.
4) Мы з гонарам бярэм удзел у справаздачным канцэрце факультэта.
5) ЛіМ змясціла падборку вершаў маладых паэтаў.

А29. Вызначце стыль і тып тэксту.

Наш абавязак – шанаваць усё, што звязана з жыццём нашых продкаў, каб гэтак жа сама і нас шанавалі будучыя пакаленні. Яны наўрад ці нам даруюць, калі мы паступова не вернем людзям тыя былыя геаграфічныя назвы, у якіх так яскрава былі адлюстраваныя гісторыя і нялёгкае жыццё беларускага народа.

1) мастацкі, апавяданне
2) публіцыстычны, разважанне
3) навуковы, разважанне
4) гутарковы, апавяданне

Тэст № 2

Б1. Адзначце словы, у якіх ётавыя літары абазначаюць два гукі.

1) любоўю
2) радыё
3) вяселле
4) ёгурт
5) мелодыя
6) акварэллю
7) краіна
8) суб’ектыўна
9) кампетэнцыя
10) свята

Б2. Адзначце словы, у якіх націск падае на другі склад.

1) занятасць
2) наняты
3) вусы
4) дакумент
5) агент
6) фольга
7) феномен
8) мысленне
9) партэр
10) чутно

Б3. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца сінонімамі.

1) афіша – праграма
2) віртуальны – магчымы
3) віртуозны – мастацкі
4) ідэальны – узорны
5) рарытэт – рэдкасць
6) дыскусія – размова
7) інавацыя – новаўвядзенне
8) мажорны – вясёлы, бадзёры
9) інтуіцыя – адчуванне
10) соцыум – грамадства
11)

Б4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Я.

1) ув...рцюра
2) габ...лен
3) л...воніха
4) вы...віць
5) жыцц...дзейны
6) Н...свіж
7) в...лікодны
8) Л...віцкі
9) п...сняр
10) с...мюдзесяццю

Б5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Е.

1) рады…інтэрв'ю
2) ус…славянскі
3) вас…мнаццаты
4) В…лікабрытанія
5) бал…рына
6) рады…тэрапія
7) вол…выяўленне
8) камюнік…
9) інтэрн…т
10) рэзюм…

Б6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара А.

1) ф...таграфія
2) м...ватворчасць
3) ск...марох
4) барок...
5) в...семсот
6) амплу...
7) сал..марэзка
8) д...бранач
9) ш...сці
10) Ш...кспір

Б7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Э.

1) канц...пцыя
2) р...нтабельны
3) палан...з
4) макрам...
5) п...ндзаль
6) менеджм...нт
7) пач...сны
8) р...меснік
9) Гр...чанінаў
10) Р...несанс

Б8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара І.

1) арх...тэктоніка
2) па...менна
3) за...нтрыгаваць
4) контр...гра
5) су...снаванне
6) с...луэт
7) пра...гнараваць
8) спец...ялізацыя
9) пра...граваць
10) дэз…нфармацыя

Б9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара О.

1) з Шакун...м
2) Д...ўгарукі
3) еўрапе...ідны
4) ст...гадовы
5) сал...мапляценне
6) в..дамар...заўстойлівы
7) п...ліфункцыянальны
8) н...ваўведзены
9) пр...цістаянне
10) ф...натэка

Б10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Ў.

1) неда…камплектаваць
2) тры...мф
3) да ...нікальных вынікаў
4) Марыя ...льянаўна
5) выканалі ...верцюру
6) святочна-...рачысты
7) вонкавае ...прыгожанне
8) “Культура”...знавіла падпіску
9) А...ганістан
10) па...такт

Б11. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак.

1) з...яднанне
2) інтэрв...юер
3) нос...біт
4) чарл...стон
5) з...мест
6) вясёлен...кі
7) хтос...ці
8) чань-чун…скі
9) сазвон...вацца
10) бул...ён

Б12. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара.

1) ...астраслоў
2) прынцыпы ...урбанізму
3) ...уступ да оперы
4) адно ...мгненне
5) па...мчацца насустрач
6) тканіна ...рвецца
7) у ...Оршу
8) па...этаму
9) на...окал
10) за...узіць

Б13. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) массавасць
2) шасцю
3) пяццідзесяці
4) бесістэмны
5) гледдзячы на
6) расспад
7) пляменнік
8) рассаднік
9) Евангелле
10) панна

Б14. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) кампактны
2) маніфесны
3) Рэмбрандт
4) рэдкастная
5) акцэнтны
6) казахскі
7) па-мастацку
8) авангардыстскі
9) поздні
10) аматарства

Б15. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок.

1) (дзе)небудзь
2) як(бы)
3) (па)вашаму
4) ніжэй(падпісаныя)

5) (відэа)запіс
6) (гран)пры
7) (паў)Еўропы
8) (поп)музыка
9) праграмна(тэхнічныя) сродкі
10) дыск(жакей)

Б16. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) акіян
2) мініяцюра
3) Нью-Йорк
4) адажыа
5) Эфіопія
6) амплуа
7) ідэёлаг
8) канвейер
9) стэрэатып
10) віола

Б17. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары.

1) (Г,г)омельшчына
2) (М,м)ележаўская канферэнцыя
3) (Г,г)ілевічавы творы
4) (Ш,ш)арыкава міска
5) перад (К,к)алядамі
6) (Д,д)амоклаў меч
7) (В,в)іцебскі драматычны тэатр
8) (С,с)лабодская сярэдняя школа
9) (П,п)рафесар універсітэта
10) (М,м)іністэрства культуры РБ

Б18. Адзначце радкі, у якіх усе словы з'яўляюцца сінонімамі.

1) адлегласць, далеч, аддаленне, прамежак, дыстанцыя
2) адсталы, неадукаваны, абмежаваны, кансерватыўны, непісьменны
3) спіс, пералік, пералічэнне, рэестр, каталог
4) спрактыкаваны, вопытны, дасведчаны, кваліфікаваны
5) часам, падчас, парой, момантамі, рэдка, зрэдку, выпадкам
6) спыніць, стаяць, стрымаць, прыпыніць

Б19. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.

1) *ажывіць* скульптуру
2) *дзьме* вецер
3) *тонкія* рукі
4) *яркія* вобразы
5) *дух* творчасці
6) *сонца* нацыянальнай паэзіі
7) *стаіць* цішыня
8) *нямы* фільм
9) *мова* жывапісу
10) чалавек з *хворым* сэрцам

Б20. Адзначце заданні, у якіх адбываецца чаргаванне *г:з, к:ц, х:с* у формах слоў.

1) пашукаць у (картатэка)
2) гасцяваць у (сяброўка)
3) праблема ў неспакойнай (маторыка)
4) у інтынацыйнай (спецыфіка)
5) маляваць кветкі на (хустка)
6) атрымаць па (пяцёрка)
7) уручыць дыплом (Бадзейка Вольга)

8) вырабы з (саломка)
9) адмовіць ў (падтрымка)
10) у (эпоха) Адраджэння

Б21. Адзначце назоўнікі з канчаткамі –у, (- ю) у М. скл. або Р. скл.

1) у камерна-вакальным жанр...
2) удзельнічаць у спектакл...
3) у самадзейным гуртк…
4) пры арганізацыі дасуг...
5) пры кіраўнік... групы
6) на конкурс... песні
7) на удзельнік...
8) прачытаць аб кінагеро...
9) пры Алес...Звонак...
10) пры дзед…

Б22. Адзначце назоўнікі з канчаткамі –а, (- я) у родным склоне.

1) прагназаванне
2) квінтэт
3) рэфрэн
4) флейтыст-аматар
5) гукапіс
6) шум
7) фестываль
8) аркестр
9) абстракцыянізм
10) студэнт першага курс..

Б23. Адзначце словазлучэнні, у якіх дапушчана памылка.

1) залетась быў на канферэнцыі
2) дэкарацыі размясцілі з лева
3) па сярэдзіне сцэны паставілі ёлку
4) пад вечар адбылася дыскатэка
5) з нізу да верху былі прымацаваныя плакаты
6) канцэрт адбыўся якраз сёння
7) я ўпершыню спяваў на сцэне
8) на што ўсё гэта патрэбна?
9) я што дзень працаваў над сцэнарыем
10) артысты павярнуліся ў бок святла

Б24. Адзначце словазлучэнні з правільным ужываннем дзеепрыметнікаў.

1) абумоўленая сувязь
2) неабдымныя дрэвы
3) непапраўленыя тэксты
4) ажыўшыя вобразы
5) устаўлены сімвал
6) запрошаныя гледачы
7) узрастаючая роля
8) памаладзелы твар
9) расклеяная рэклама
10) адбыўшыеся гастролі

Б25. Адзначце сказы з памылкай. Напішыце правільны варыянт ужывання формы слова.

1) Веданне рэальных запатрабаванняў насельніцтва вызначаецца спецыялістамі галіны ў якасці самага найважнейшага арыенціру ў культурнай палітыцы.
2) Веданне асноўных арыенціраў насельніцтва ў сферы вольнага часу дазволіць больш дакладна будаваць жыццё клубнай установы.
3) Лягчэй усяго дапамагчы суседзям знайсці гледача, чым праводзіць канцэрт у непрыстасаваным для гэтага памяшканні.
4) Ф.Скарына – вядомейшы мысліцель-гуманіст XVI стагоддзя.
5) Разумовае развіццё дзевяцігадовых дзяцей вышэй, чым у першакласнікаў.

Б26. Адзначце сказы са стылістычна-граматычнымі памылкамі.

1) Існаванне клубаў абавязкова патрабуе пашырэння эканамічных крыніц, уключаючы камерцыйныя паслугі.
2) Атрыманыя ва ўніверсітэце веды дапамаглі нам распрацаваць праект сацыяльна-культурнай дзейнасці.
3) Функцыянуючы ў сферы вольнага часу, клубныя ўстановы прызначаны арганізоўваць яго.
4) Выходзячы на сцэну, вочы гледачоў спыніліся на юным спеваку.
5) Перакладаючы тэкст, іх гаворка гучала то па-англійску, то па-беларуску.

Б27. Адзначце сказы з памылкай у дапасаванні або кіраванні.

1) Выбачайце нас, калі ласка, за спазненне.
2) На спектаклі прысутныя насміхаліся над няўдалым выкананнем ролі.
3) У бібліятэцы ўніверсітэта працуе два каталогі.
4) Шмат студэнтаў удзельнічалі ў справаздачным канцэрце ўніверсітэта.
5) Некалі даўно давялося мне прысутнічаць на прэм'еры спектакля.

Б28. Адзначце сказы з граматычнай памылкай.

1) Уяві сябе, колькі новай інфармацыі можна знайсці ў Інтэрнэце!
2) Перад канцэртам музыканты рассаджваюцца па сваім месцам.
3) Душа чалавека мацнейшая за розум яго.
4) Часопіс “Маладосць” змясціла падборку вершаў маладых паэтаў.
5) Абодва (Насця і Алесь) здалі сесію на выдатна.

Б29. Вызначце стыль і тып тэксту.

Музычная культура Беларусі, як і кожнай іншай краіны, з’яўляецца надзвычай складаным і шматвектарным працэсам, а таксама шматаблічным феноменам, які можна вывучаць у самых розных аспектах. Падобна дыяментаваму крышталю, гэтая культура кожны раз па-новаму адкрываецца даследчыцкаму позірку.

1) мастацкі, апавяданне
2) навуковы, разважанне
3) мастацкі, апісанне
4) публіцыстычны, апісанне

Тэст № 3

В1. Адзначце словы, у якіх літары Я, Ё, І, Е абазначаюць два гукі.

1) звіць
2) сямёра
3) аб'яднаць
4) дыятоніка
5) экспазіцыя
6) ёсць
7) вёсны
8) якасць
9) сацыёлаг
10) падвоіць

В2. Адзначце словы, у якіх націск падае на апошні склад.

1) бялізна (нацельнае адзенне)
2) галіна (прамысловасці)
3) касцяны
4) крапіва
5) сярэдневяковы
6) трапяткі
7) ніцяны
8) жывучы (які)
9) адмаўляючы
10) дзеяч

В3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Я.

1) земл...ўласнік
2) с...ржант
3) н...воля
4) гені...льны
5) ве...нне
6) с...местр
7) с...зон
8) п...шчота
9) Н…волін
10) вас…мнаццаты

В4. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца сінонімамі.

1) сентэнцыя – мараль
2) скрупулёзны – прыблізны
3) семіяграфія – нотапісанне
4) эрудыцыя – пісьменнасць
5) эмпірычны – вопытны
6) сілуэт – цень
7) тэндэнцыйны – прадузяты
8) рэпрэзентатыўны–характэрны
9) сацыяльны – чалавечы
10) паліфонны – многагалосы

В5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Ё.

1) рады…драматургія
2) Міла …вавіч
3) аўтабі…графія
4) рады…нукліды
5) м…даварэнне
6) апафе…з
7) л…савызначальны
8) рады…актыўнасць
9) басты…н
10) л…гкадумны

В6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара А.

1) літ...ратура
2) вінчэст…р
3) лібрэт...
4) прафк…м
5) сл…ватворчасць
6) п...ліграфічны
7) п…стмадэрнізм
8) Більба…
9) п...ўдзень
10) вірту...льны

В7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Е.

1) інтэрн...т
2) с...белюб
3) с...кстэт
4) дз…сяты
5) р...пліка
6) эф..кт
7) св...цкі
8) м...нтальнасць
9) с...мнаццаць
10) Б...лінскі

В8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара І.

1) звыш…мклівы
2) па...мкнуцца
3) контр...дэя
4) пера...начыць
5) гіпер…нфляцыя
6) дажджы ...мжэлі
7) паліт...нфармацыя
8) маза...ка
9) суб...нспектар
10) без...ніцыятыўны

В9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара О.

1) лідарств..
2) ф…ндаздача
3) п...ліграф
4) кін…аматар
5) ідэ…лаг
6) іды…ма
7) ільн…прадзенне
8) капрычы…
9) н…ваўведзены
10) кін…індустрыя

В10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Ў.

1) ва …нікальных выданнях
2) па…шар'е
3) на …ніверсальным абсталяванні
4) газета «Звязда» …знагародзіла пераможцаў
5) мастакі-…мельцы
6) ва …ладзівастоку
7) а…тэнтычны
8) прэзіды…м
9) іна…гурацыя
10) но…-ха…

В11. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак.

1) кан...юнктура
2) шмат...ярусны
3) хрэс...біны
4) многаступен...чаты
5) тайван…скі
6) раз...бяр
7) бал...-маскарад
8) прамен...чык
9) песен...ка
10) хатын...скі

В12. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара.

1) ...острасатырычны
2) тканы ...льняны абрус
3) аб...астрыць праблему
4) па...мкнуцца наперад

5) без ...льгот
6) ...оперны тэатр
7) на...ушнікі
8) …олава
9) у …лжэнавуцы
10) …узлавы

В13. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) бяспрэчны
2) самааданы
3) аднайменны
4) пяцюдзесяццю
5) аддаліцца
6) саламяны
7) Ілля
8) Мекка
9) расказаць
10) меладрамма

В14. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) якасны
2) камплектны
3) кантэксны
4) студэнтскі
5) падуластны
6) картатэччык
7) перапішчык
8) шаснаццаць
9) Полаччына
10) агенства

В15. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок.

1) (даведачна)пошукавы
2) (верша)складанне
3) (кіна)афіша
4) (анты)навуковы
5) (паў)года
6) (мас)медыя
7) (амаль)што
8) зноў(такі)
9) (рэ)мінор
10) (пад)час

В16. Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.

1) віртуоз
2) фейерверк
3) ідыёма
4) арыя
5) імпрэсіанізм
6) кліентура
7) індывідуяльны
8) радыётэатр
9) прыарытэт
10) энтузіазм

В17. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары.

1) (М,м)інчанін
2) (К,к)упалавец
3) (Н,н)ародны паэт
4) плошча (Н,н)езалежнасці
5) народы (У,у)сходу
6) стыль (Р,р)энесанс
7) (Р,р)эалізм
8) (Б,б)агдановічаў “Вянок”
9) (Г,г)арэцкія чытанні
10)(М,м)іжнародны дзень дзіцяці

В18. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.

1) *музыкальны* слых
2) *струнны* інструмент
3) *тонкі* густ
4) *рука* дапамогі
5) *голас* народа
6) *дыхаць* паэзіяй
7) *чэрствыя* душы
8) аматар *рэдкіх* кніг
9) *кантраляваць* дзейнасць
10) маўленчы *апарат*

В24. Адзначце словазлучэнні з правільным ужываннем дзеепрыметнікаў.

1) гучачы інструмент	2) адпрацаваны сюжэт
3) выкананы нумар	4) узмацнеўшы голас
5) патрывожаная цішыня залы	6) інтэграваныя курсы
7) выдаваўшыеся кнігі	8) усталяваўшыеся адносіны
9) пасталелы акцёр	10)разгарнуўшыеся канфлікты

В25. Адзначце сказы з памылкай. Напішыце правільны варыянт ужывання формы слова (слоў).

1) Часцей усяго “Купала” выступае ў вобразе ідала.
2) Даволі значнае месца ў музычнай спадчыне М.К. Агінскага займаюць рамансы і песні.
3) Вогнішчы распальваюць на плытах, якія плывуць па рэкам і азёрам.
4) Найвялікшае значэнне мела хрышчэнне Беларусі ў канцы X ст.
5) Агонь і вада – гэта стыхіі-антаганісты, дыяметральна супрацьлеглыя па свайму зместу і функцыям.

В26. Адзначце сказы са стылістычна-граматычнымі памылкамі.

1) Рыхтуючы вялікую колькасць дакументаў, у нас хутка скончылася папера.
2) Найгалоўнейшай складанай часткай старажытнага свята Куста былі песні.
3) Улік, справаздачнасць і кантроль з’яўляецца часткай інфармацыйнага механізму менеджмету.
4) Беларусь літаральна пакрываецца квітучай сеткай музычных тэатраў.
5) Складаны гістарычны лёс і прыналежнасць да магнацкай культуры не спрыялі стварэнню музычных тэатраў у Беларусі.

В27. Адзначце сказы з памылкай у дапасаванні або кіраванні.

1) Кіраўніка дзякавалі за карысныя парады.
2) Аздабленне сцэнічных касцюмаў рабілася па майму ўзору.
3) Рэпетыцыя спектакля пачалася а шостай гадзіне.
4) Шмат новых выданняў выстаўлена на паліцах кнігарні.
5) Па старадаўнім звычаі вяселле пачыналася з заручынаў.

В28. Адзначце сказы з граматычнай памылкай.

1) Іншы раз абодва – дзяўчына Купалка і хлопец Купала – аб’ядноўваюцца разам у адной песні.
2) Тры цікавых аповесці выйшлі ў апошнім нумары часопіса «Маладосць».
3) Не гледзячы на позні час, удзельнікі сходу не разыходзіліся.
4) Вяселле адкрывала пачынальным вясельным танцам маці маладога або маладой з маленькай булачкай пад пахай.
5) Багата выглядалі ўборы свацця ў, блізкія паводле характару аздаблення да святочных дзявочых.

В29. Вызначце стыль і тып тэксту.

Здаўна селянін ставіўся да хлеба як да святыні. Хлеб -- усяму галава. Для селяніна ён – жыццё, галоўнае багацце. Нездарма хлеб услаўлены ў многіх народных песнях, нездарма яму прысвечана столькі прыказак, і зусім не выпадкова ўзнік звычай, адпаведна якому апошні сноп, упрыгожаны стужкамі, заставаўся “жыць” у авіне да наступнага ўраджаю, і ўсё жыццё селяніна, такім чынам, працякала “на вачах” гэтага арэчаўлёнага Бога.

1) мастацкі	2) навукова-папулярны
3) публіцыстычны	4) гутарковы

Адказы да тэставых заданняў

КАНТРАЛЮЕМАЯ САМАСТОЙНАЯ РАБОТА ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

	Назвы раздзелаў і тэм	Колькасць гадзін	Форма кантролю
Тэма 1.	Лексікаграфія. Віды энцыклапедычных і тыпы лінгвістычных слоўнікаў. Графіка, гісторыя яе станаўлення. Беларускі алфавіт.	1	Складанне тэрміналагічнага тлумачальнага слоўніка, тэставыя заданні

Літаратура

1. Беларуская мова: спецыяльная лексіка : вучэб.-метад. дапам. / А. М. Пісарэнка [і інш.] ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2016. – 286 с.

2. Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Л. М. Грыгор'ева [і інш.] ; пад агул. рэд. Л. М. Грыгор'евай. – 4-е выд., выпр. – Мінск: Выш. шк., 2011. – 622 с.

3. Багамолава. А. М. Стылістыка і культура беларускага маўлення ; вучэб. дапам. / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мн. : Выд-ва Граўцова, 2017. – 344 с.

ПРАМЕЖКАВЫ КАНТРОЛЬ ВЕДАЎ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

	Назвы раздзелаў і тэм	Форма прамежкавага кантролю
Тэма 1.	Арфаграфія	тэставыя заданні
Тэма 2	Камунікатыўныя якасці маўлення	напісанне эсэ

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Заг. кафедры
беларускай
і замежнай філалогіі
_____А. М. Пісарэнка
“__”_____202_ г.

ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ

для правядзення заліку
па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”

1. Генезіс беларускай мовы, яе развіццё ў часе. Беларуская мова сярод іншых моў свету.
2. Рэформы правапісу беларускай мовы. Закон аб мовах.
3. Праблемы культуры маўлення ва ўмовах білінгвізму. Камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, сцісласць, лагічнасць, чысціня, багацце, дарэчнасць, вобразнасць і выразнасць) і іх роля ў прафесійна арыентаваным маўленні.
4. Асаблівасці беларускай фанетычнай сістэмы ва ўмовах білінгвізму.
5. Паняцце графікі і гісторыя яе станаўлення. Беларускі алфавіт, асаблівасці графічнай сістэмы беларускай мовы.
6. Асаблівасці вымаўлення галосных, зычных гукаў.
7. Асаблівасці вымаўлення гукавых спалучэнняў (галосных і зычных).
8. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання.
9. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле сферы ўжывання.
10. Лексікаграфія. Характарыстыка лексікаграфічных крыніц.
11. Арфаграфія. Прынцыпы беларускага правапісу.
12. Напісанні галосных і іх спалучэнняў у прафесійнай лексіцы паводле фанетычнага прынцыпу.
13. Напісанні зычных у прафесійнай лексіцы паводле фанетычнага прынцыпу.
14. Напісанне прафесійнай лексікі паводле марфалагічнага прынцыпу.
15. Правапіс мяккага знака і апострафа ў спецыяльнай і агульнаўжывальнай лексіцы.
16. Напісанне спецыяльнай лексікі і лексікі афіцыйна-справавога маўлення разам, асобна і праз злучок.
17. Ужыванне вялікай літары пры размежаванні ўласных і агульных назваў, пры афармленні простай мовы і цытат.
18. Лексіка-граматычная характарыстыка назоўніка.
19. Нарматыўнае ўжыванне склонавых формаў назоўнікаў-тэрмінаў I і III скланенняў.
20. Нарматыўнае ўжыванне склонавых формаў назоўнікаў-тэрмінаў II скланення.

21. Нарматыўнае функцыянаванне рознаскланяльных назоўнікаў. Асаблівасці скланення назоўнікаў множнага ліку.
22. Скланенне ўласных назоўнікаў. Асаблівасці скланення прозвішчаў мужчынскага, жаночага і агульнага роду.
23. Лексіка-граматычная характарыстыка прыметніка.
24. Спецыфіка ўтварэння і функцыянавання ступеняў параўнання прыметніка і прыслоўя.
25. Асаблівасці скланення і выкарыстання займеннікаў як слоў з замяняльнай, указальнай функцыяй.
26. Лексіка-граматычная характарыстыка лічэбніка.
27. Нарматыўнае ўжыванне лексіка-граматычных разрадаў лічэбнікаў.
28. Нарматыўнае ўжыванне граматычных катэгорый і формаў дзеяслова прафесійнага маўлення.
29. Дзеепрыметнік як неспрагальная форма дзеяслова. Асаблівасці ўтварэння і функцыянавання дзеепрыметнікаў.
30. Дзеепрыслоўе як нязменная форма дзеяслова. Спецыфіка ўтварэня і ўжывання дзеепрыслоўяў.
31. Асаблівасці будовы беларускіх словазлучэнняў (параўнальна з рускай мовай).
32. Асноўныя маўленчыя прыметы навуковага стылю, яго жанры і функцыі.
33. Асноўныя маўленчыя рысы афіцыйна-справавога стылю, характарыстыка падстыляў і жанраў.

Разгледжана на пасяджэнні кафедры
беларускай
і замежнай філалогіі
пратакол № __ ад “ __” _____ 202_ г.

КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Балы	Паказчыкі адзнакі
0 (нуль) незалічана	Няма адказу
1 (адзін) незалічана	Студэнт называе толькі асобныя факты з вывучанага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме.
2 (два) незалічана	Студэнт перадае нязначную частку вучэбнага матэрыялу, скажае сэнс пры фармулёўцы правілаў і азначэнняў, бессістэмна і няўпэўнена расказвае матэрыял, не можа падмацаваць прыкладамі граматычныя правілы, адчувае значныя цяжкасці пры авалоданні практычнымі ўменнямі і навыкамі.
3 (тры) незалічана	Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае істотныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правілаў, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка, не ўмее абгрунтаваць свае разважанні, адчувае цяжкасць пры падборы прыкладаў і практычным выкарыстанні тэарэтычных ведаў, парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае.
4 (чатыры) залічана	Студэнт у асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правілаў, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; не ўмее дастаткова глыбока і доказна абгрунтаваць свае разважанні і прывесці неабходныя прыклады, адчувае цяжкасці пры практычным выкарыстанні тэарэтычных ведаў, выкладае матэрыял непаслядоўна, дапускае памылкі ў моўным афармленні. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае.
5	Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі

(пяць**)** залічана	памылкамі, тэарэтычныя звесткі падмацоўвае прыкладамі без дастаткова глыбокага іх абгрунтавання, адчувае цяжкасці пры практычным выкарыстанні тэарэтычных ведаў, дапускае памылкі ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго афармленні. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакаднасці, правільнасці, выразнасці.
6 (шэсць) залічана	Студэнт дастаткова поўна перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці прыклады–доказы, матэрыял выкладае паслядоўна, з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурных нормаў. Маўленне ў асноўным адпавядае лагічнасці, дакладнасці, правільнасці і выразнасці.
7 (сем) залічана	Студэнт дастаткова поўна валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць прыклады–доказы, пры выкарыстанні тэарэтычных ведаў на практыцы дапускае нязначныя памылкі, матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў.
8 (восем) залічана	Студэнт поўна валодае вучэбным матэрыялам і прымяняе яго ў знаёмай сітуацыі з неістотнымі памылкамі, якія выпраўляе самастойна, перадае матэрыял у лагічнай паслядоўнасці з захаваннем літаратурных нормаў. Маўленне ў асноўным адпавядае лагічнасці, дакладнасці, правільнасці і выразнасці.
9 (дзевяць) залічана	Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне моўных паняццяў, паказвае высокую ступень усвядомленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, ілюструе свой адказ неабходнымі прыкладамі–доказамі (як з падручніка, так і самастойна падабранымі), умее прымяняць тэарэтычныя веды пры вырашэнні практычных задач. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці,

	правільнасці і выразнасці.
10 (дзесяць) залічана	Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае поўнае яго разуменне, выяўляе высокую ступень усвядомленасці вывучанага , абгрунтавана і доказна выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры і іншых вучэбных дысцыплін, робіць самастойныя вывады і заключэнні, умее прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання, перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратурнай мовы, пазнавальную актыўнасць, творчыя адносіны да навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, чысціні, выразнасці.

ДЫЯГНОСТЫКА КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТА

Вуснае апытанне з’яўляецца адным са спосабаў праверкі ведаў, уменняў і навыкаў студэнта аб сістэме мовы і маўленні.

Вуснае звязнае выказванне паказвае ўзровень засваення студэнтам агульных палажэнняў, правіл, азначэнняў і ўменне прымяняць атрыманыя веды на практыцы, а таксама ўменне студэнтаў ствараць звязнае, лагічна паслядоўнае паведамленне на пэўную тэму.

Пры ацэнцы адказу студэнта ўлічваецца на наступнае:

1) ступень усвядомленасці вывучанага;
2) уменне прымяняць веды на практыцы;
3) моўнае афармленне адказу (захаванне літаратурных нормаў беларускай мовы);
4) лагічнасць, дакладнасць, паўната, выразнасць адказу.

V. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ВМК

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар
па вучэбнай рабоце БДУКМ
_____ С.Л. Шпарло
«___» _____ 2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /эвуч.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (прафесійная лексіка)

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях агульнай вышэйшай адукацыі, зацверджаных Першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 18.01.2023, 30.01.2023, 27.02.2023, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасцях універсітэта

СКЛАДАЛЬНІКІ:
А. М. Пісарэнка, прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
В. В. Шунейка, старшы выкладчык кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
В. У. Русак, загадчык кафедры беларускай філалогіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

А. А Жэлуновіч, загадчык кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
Кафедрай беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 28.06.23);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 7 ад 05.07.2023).

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Лінгвістычны модуль складаецца з вучэбных дысцыплін “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, “Замежная мова (агульнае валоданне)”, Замежная мова (спецлексіка). Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”.

Вучэбныя дысцыпліны лінгвістычнага модуля утвараюць сістэму вучэбных дысцыплін, накіраваных на фарміраванне і развіццё акадэмічных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый, якія забяспечваюць вырашэнне і выкананне навучальных, сацыяльных, прафесійных, асобасных задач і функцый.

У сферы культуры беларуская мова вывучацца не толькі як сродак прафесійных і сацыяльна-бытавых зносін, але і як сродак эстэтычнага выхавання асобы студэнта, складнік нацыянальнай беларускай культуры. Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», якая выкладаецца студэнтам усіх спецыяльнасцей універсітэтаў, мае тэарэтычна-практычны характар у адпаведнасці з прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» – гэта пераважна практычная вучэбная дысцыпліна, некаторыя раздзелы якой ўтрымліваюць веды экстралінгвістычнага характару і дапамагаюць паказаць багацце беларускай мовы, гісторыю яе развіцця, сучасны стан і шляхі фарміравання беларускай навуковай тэрміналогіі, усвядоміць месца сучаснай беларускай мовы сярод славянскіх і іншых моў свету, а таксама ролю роднай мовы ў станаўленні асобы і фарміраванні яе творчага патэнцыялу. Названая вучэбная дысцыпліна звязана з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Беларуская літаратура», «Стылістыка і культура маўлення», «Культура прафесійнага маўлення» «Маўленчае ўздзеянне ў СМІ і рэкламе» і інш.

Мэта вучэбнай дысцыпліны – падрыхтаваць не толькі пісьменнага спецыяліста ў галіне прафесійна арыентаванага навучання, а і інтэлігента як камунікатыўна развітую асобу, якая зможа на дастаткова высокім узроўні ўдасканальваць сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі. Гэта дапаможа будучаму работніку культуры наладжваць зносіны на роднай мове ў сучаснай сацыякультурнай прасторы, захоўваць нацыянальную спадчыну, праяўляць грамадзянскасць і патрыятызм, што ў сваю чаргу будзе спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Праграма вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» накіравана на сістэматызацыю і паглыбленне ведаў студэнтаў у галіне фанетыкі і арфаэпіі, правапісу і марфалогіі, лексікалогіі і лексікаграфіі, функцыянальнай стылістыкі і культуры маўлення; на фарміраванне навыкаў і ўменняў у розных відах маўленчай дзейнасці, на навучанне прыёмам самастойнай работы з моўным і маўленчым матэрыялам у штодзённай вучэбна-навуковай і будучай прафесійнай дзейнасці.

Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны:

– паглыбляць і замацоўваць тэарэтычныя веды па сучаснай беларускай літаратурнай мове з арыентацыяй на прафесійнае маўленне з улікам сучасных, тэарэтычных распрацовак і метадычнага вопыту;

– дыферэнцыявана ўводзіць у моўную практыку спецыяльныя лексемы і фраземы тэрміналагічнага характару;

– развіваць моўна-эстэтычны густ студэнтаў;

– выпрацоўваць у студэнтаў патрабавальнасць да чысціні і правільнасці маўлення ў сацыякультурнай і вучэбна-навуковай сферах дзейнасці;

– узбагачаць прафесійны слоўнікавы запас будучых спецыялістаў;

– навучыць карыстацца рознымі лексікаграфічнымі даведнікамі, у тым ліку галіновымі тэрміналагічнымі слоўнікамі;

– пашыраць моўную (вусную і пісьмовую) кампетэнцыю студэнтаў у вучэбна-прафесійнай, вучэбна-навуковай і сацыякультурнай сферах дзейнасці;

– навучыць кваліфікавана карыстацца сродкамі афіцыйна-справавога і навуковага стылю ў адпаведнасці з маўленчай сітуацыяй;

– далучаць да інтэлектуальнага жыцця грамадства, выхоўваць інтарэс і павагу да мастацкага слова як часткі духоўнай культуры беларускага народа.

Засваенне вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

УК-3. Ажыццяўляць камунікацыі на замежных і дзяржаўных мовах для вырашэння задач міжасобаснага і міжкультурнага ўзаемадзеяння;

УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” студэнты павінны ***ведаць:***

– асаблівасці фанетычнай сістэмы сучаснай беларускай мовы;

– асноўныя нормы беларускага літаратурнага вымаўлення ў тэрміналагічнай лексіцы;

– сучасныя нормы беларускага правапісу;

– асаблівасці формаўтварэння і формазмянення тэрмінаў;

умець:

– перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты;

– знаходзіць і выпраўляць недахопы і памылкі ў перакладзе тэкстаў па спецыяльнасці;

– самастойна ствараць розныя віды тэкстаў, у тым ліку навуковага;

***валодаць*:**

– арфаэпічнымі, арфаграфічнымі, марфалагічнымі, лексічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асноўнымі паняццямі і тэрмінамі спецыяльнай лексікі.

Аб’ект вывучэння вучэбнай дысцыпліны – сучасная беларуская літаратурная мова, унармаваная, апрацаваная майстрамі слова, яе паходжанне, развіццё, месца сярод іншых моў свету, законы, нормы, асаблівасці функцыянавання. Прадмет – адзінкі адпаведных раздзелаў лінгвістыкі (фанетыкі, арфаэпіі, графікі, арфаграфіі, граматыкі (марфалогіі), лексікалогіі, культуры маўлення і стылістыкі) у сферы прафесійнага маўлення.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага мовазнаўства і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных філалагічных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– метад актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

– тлумачальна-ілюстратыўныя тэхналогіі навучання;

– метад лінгвістычнага даследавання тэкстаў прафесійнай накіраванасці.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” адведзена усяго 90 гадзін, з якіх 34 г. аўдыторныя (практычныя заняткі).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны

Прадмет, задачы і змест вучэбнай дысцыпліны, яе месца ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук, узаемасувязь з іншымі філалагічнымі дысцыплінамі.

Беларуская мова – адна з форм нацыянальнай культуры беларусаў і яе функцыі ў грамадстве. Мова і соцыум. Моўная сфера і маўленчая сітуацыя, яе віды. Формы і нормы беларускай мовы.

Беларуская мова сярод іншых моў свету. Генезіс беларускай мовы. Асаблівасці функцыянавання беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI ст.: рэформы беларускай мовы (1933, 1957, 2008); Закон «Аб мовах у Беларускай ССР» (1990).

Раздзел I. Спецыфіка фанетыка-арфаэпічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы

Тэма 1. Фанетычнай сістэма беларускай мовы

Фанетычная сістэма і яе функцыянаванне.Сістэма вакалізму і кансанантызму беларускай мовы. Гукавыя значэнні літар.

Фанетычныя законы беларускай мовы: аканне, яканне, дзеканне, цеканне, узнікненне прыстаўных зычных і галосных гукаў, устаўных гукаў, падаўжэнне і падваенне, аглушэнне/азванчэнне зычных, асіміляцыйная мяккасць, асіміляцыя свісцячых-шыпячых гукаў, чаргаванні заднеязычных са свісцячымі, чаргаванні в-ў, л-ў, у-ў і інш.

Фанетычная транскрыпцыя як спосаб перадачы літаратурнага вымаўлення.

Тэма 2. Арфаэпічныя нормы беларускай мовы

Паняцце арфаэпічнай нормы. Асноўныя законы беларускага літаратурнага вымаўлення: вымаўленне галосных і іх спалучэнняў, вымаўленне зычных і іх спалучэнняў. Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення і іх прычыны. Валоданне арфаэпічнымі нормамі як паказчык культурамоўнага ўзроўню асобы і агульнай прафесійнай культуры спецыяліста.

Раздзел II. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы

Тэма 3. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывння

Лексікалогія як лінгвістычная дысцыпліна. Паняцце лексікі. Спрадвечна беларуская і запазычаная лексіка. Храналагічныя (агульнаславянскі, усходнеславянскі і ўласна беларускі) пласты спрадвечнай лексікі і іх лексіка-семантычныя групы. Моўныя запазычанні як вынік

культурнага, эканамічнага, тэрытарыяльнага і інш. узаемадзеяння. Запазычанні са славянсіх і неславянскіх моў, паказчыкі іншамоўнасці. Паняцце экзатызмаў і варварызмаў і іх роля ў мове.

Спецыфіка адлюстравання лексічнага складу беларускай мовы ў лексікаграфічных даведніках. Віды энцыклапедычных і тыпы лінгвістычных слоўнікаў. Тлумачальныя спецыяльныя слоўнікі як крыніца ўзбагачэння, удасканальвання і развіцця прафесійнай маўленчай кампетэнцыі.

Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага ўжытку. Спецыяльная лексіка як частка лексікі абмежаванага выкарыстання. Паняцце тэрміна (агульназразумелыя і вузкаспецыяльныя адзінкі) і тэрміналогіі. Супастаўляльная характарыстыка тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі. Віды і спосабы тэрмінаўтварэння: марфемны (суфіксальны: *канкурэнтаздольнасць, кіраўніцтва, лідарства, карыстальнік, чытальнасць, фальклярызацыя,* прэфіксальны: *суперэкслібрыс, падсерыя, падрубрыка*, прэфіксальна-суфіксальны: *падгалосак*), складанне: *бемоль-мажорны, танцзала, архівасховішча, кнігаабмен, навукова-метадычны, цацка-кніжка, летапіс*, складана-суфіксальны: *шматгаліновы, кнігазнаўства, кнігагандлёвы,* абрэвіяцыя: *БДУКМ, ПК, ЦБС, ТТД, УДК, РТБД,* лексіка-семантычны: *ключ (скрыпічны), назва (адзінка аб'ёму, загаловак), лісток (перыядычнае выданне на чатырох старонках)*, сінтаксічны: *аўдыявізуальны дакумент, трайны крок, гульнявая дзейнасць, апорны гук, фонд рэдкіх кніг, прэм'ера кнігі, скульптурная кампазіцыя, вакальная партыя,* спосаб запазычвання гатовых тэрмінаадзінак*: брашура, менеджмент, дайджэст, маркетынг, архіварыус, франтыспіс, балерына, прэм'ера, мальберт, ракако, сальфеджыа* і інш.

Раздзел ІІІ. Сістэма арфаграфічных норм у сферы прафесійнага маўлення

Тэма 4. Арфаграфія. Прынцыпы беларускай арфаграфіі

Прадмет, задачы і змест графікі. Беларускі алфавіт. Прынцыпы беларускай графікі. Суадносіны паміж літарамі і гукамі. Тры графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства.

Прадмет, задачы і змест арфаграфіі. Паняцце прынцыпу правапісу і арфаграмы як асноўных адзінак раздзела.

Прынцыпы і раздзелы беларускай арфаграфіі. Фанетычны і марфалагічны прынцыпы правапісу, традыцыйнае і дыферэнцыяванае напісанні.

Тэма 6. Фанетычны прынцыпу правапісу

Напісанні спецыяльнай лексікі славянскага і неславянскага паходжання паводле фанетычнага прынцыпу: правілы акання, якання; правапіс *ы, і, й* пасля прыставак; правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах; правапіс галосных у складаных словах; правапіс прыстаўных галосных,

правапіс прыстаўных зычных; правапіс *у-у нескладовага (ў)*; правапіс спалучэнняў зычных у корані і на стыку кораня і суфікса; правапіс прыставак на *з- (раз-, уз-, без-, цераз-)*; правапіс *д-дз', т-ц'*; правапіс падоўжаных зычных.

Тэма 7. Марфалагічны прынцыпу праваісу

Напісанне спецыяльнай лексікі славянскага і неславянскага паходжання паводле марфалагічнага прынцыпу: правапіс звонкіх-глухіх, у тым ліку прыставак на *д-/б- (аб-, ад-, над-, пад-* і інш.*);* правапіс цвёрдых-мяккіх зычных (правапіс мяккага знака і апострафа); правапіс шыпячых-свісцячых зычных; правапіс выбухных-афрыкат; напісанне прыназоўніка *без* і часціцы *не*.

Тэма 8. Ужыванне вялікай літары

Традыцыйныя і дыферэнцыяваныя напісанні пры ўжыванні вялікай літары.

Ужыванне вялікай літары пры размежаванні ўласных і агульных назваў: вялікая і малая літара ў назвах дзяржаўных органаў, устаноў і іншых арганізацый; у найменнях пасад і званняў; у назвах дзяржаўных і нацыянальных сімвалаў, рэліквій, дзяржаўных узнагарод, прэмій, грамат; у назвах дакументаў, іх зводаў, унікальных прадметаў, твораў культуры і мастацтва, а таксама ў назвах персанажаў; у назвах гістарычных падзей і знамянальных дат, перыядаў і эпох, святаў і інш.

Злітнае і паўзлітнае напісанне назоўнікаў, прыметнікаў, прыслоўяў і падобных да іх спалучэнняў.

Раздзел IV. Граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах білінгвізму

Тэма 8. Нарматыўнае ўжыванне назоўнікаў

Граматыка як раздзел мовазнаўства. Назоўнік як самастойная часціна мовы. Лексіка-граматычная характарыстыка назоўніка. Граматычныя катэгорыі назоўнікаў: род, лік, склон, скланенне. Вызначэнне граматычнай катэгорыі роду зменных і нязменных назоўнікаў (у тым ліку нескланяльных геаграфічных назваў). Вызначэнне роду ўласных зменных назоўнікаў, скланяльных і нескланяльных абрэвіятур. Несупадзенне роду і ліку аднакарэнных і рознакарэнных назоўніках у беларускай і рускай мовах. Варыянтныя родавыя формы. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі.

Тэма 9. Скланенне назоўнікаў-тэрмінаў

Нарматыўнае ўжыванне склонавых канчаткаў назоўнікаў-тэрмінаў I, II, III скланення, рознаскланяльных назоўнікаў, назоўнікаў у множным ліку, субстантываваных назоўнікаў. Асаблівасці скланення ўласных назоўнікаў у беларускай мове.

Прадуктыўнасць назоўнікаў-тэрмінаў у прафесійным маўленні: *экспрэс-інфармацыя, мікрарэфрэн, дэнамінацыя, форс-мажор, рэзюмэ,*

майстар-клас, маркетынг, супервокладка, рэкламадаўца, бібліятэказнаўства, пэндзаль, індыферэнтнасць, харэаграфія, іканаграфія, прэзентацыя, падгалосак, УДК, монаспектакль, відэатэка, рэфлексія, бібліяграфія, біг-бэнд, партрэтыст, перавыхаванне, уверцюра. Назоўнікі ў структуры іменных тэрміналагічных мадэляў: назоўнік+назоўнік у родным склоне без прыназоўніка *(фігура кадрылі, бланк падпіскі, пераменнасць функцый, тэорыя музыкі, інтэнсіўнасць гуку, м'ютэнт дыска, аддзел апрацоўкі, арэал распаўсюджвання, аддзел камплектавання, мастацтва прадстаўлення, ядро фонду);* назоўнік + назоўнік ва ўскосным склоне з прыназоўнікам *(разьба па дрэве, выданне для дзяцей, танец з прыпеўкамі, каляска для кніг, паказальнік да выдання, уверцюра для аркестра, індэксы па структуры).*

Тэма 10. Нарматыўнае ўжыванне прыметнікаў

Прыметнік як самасойная часціна мовы. Лексіка-граматычная характарыстыка прыметніка: якасныя, адносныя і прыналежныя; іх значэнне і ўтварэнне. Асаблівасці склонавых канчаткаў прыметнікаў і займеннікаў. Нарматыўнае ўжыванне кароткай формы прыналежных прыметнікаў.

Асаблівасці ўтварэння і ўжывання ступеняў параўнання якасных прыметнікаў і прыслоўяў у беларускай мове; суплетыўныя формы. Асаблівасці ўтварэння, функцыянавання і перакладу элятыўных форм прыметніка і прыслоўя.

Асаблівасці скланення і выкарыстання займеннікаў як слоў з замяняльнай, указальнай функцыяй.

Прыметнік у структуры іменных тэрміналагічных мадэляў: прыметнік + назоўнік *(аматарскі тэатр, дублетны экзэмпляр, вольны час, гукавы рад, музычна-харэаграфічнае мастацтва, генеральная рэпетыцыя, выканальніцкае мастацтва, каталожная картка, шасціструнная гітара, квартавы дыяпазон, духоўная музыка, праблемная сітуацыя, дапаможны паказальнік, секвентнае паўтарэнне, сцэнічнае відовішча, бібліятэчны фонд, рэабілітацыйны цэнтр, архітэктурны помнік, жартоўныя песні, аб'ёмны вобраз, мемарыяльны комплекс).*

Тэма 11. Нарматыўнае ўжыванне лічэбнікаў

Лічэбнік як самастойная часціна мовы. Лексіка-граматычная характарыстыка лічэбніка. Разрады лічэбнікаў паводле значэння (колькасныя: уласна колькасныя, дробавыя, зборныя; парадкавыя) і паводле структуры (простыя, складаныя, састаўныя). Скланенне розных разрадаў лічэбнікаў. Асаблівасці спалучэння розных разрадаў лічэбнікаў з іншымі часцінамі мовы (сінтаксічная сувязь зборных лічэбнікаў з назоўнікамі; формы прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, займеннікаў-прыметнікаў у колькасна-іменных словазлучэннях; спалучальнасць дробавых лічэбнікаў з назоўнікамі і інш.).

Лічэбнік у вучэбнай, навуковай і сацыякультурнай сферах маўлення. Роля лічэбніка ў стварэнні тэрміналагічнай лексікі і прафесійнага маўлення

(трое саксафаністаў, павялічанае трохгучча, праз паўтара інтэрвала, дзесяцічная індэксацыя, трохгучча, двухактавы, першакрыніца, чатырохгалоссе, дыпціх, другое творчае аб'яднанне, трыа-саната, шасціструнны музычны інструмент, чатыры чарговыя спектаклі, сем мастацкіх галерэй, шэсцьдзясят чацвёртая нота, эцюд для падвойных тэрцый).

Тэма 12. Нарматыўнае ўжыванне дзеяслова і яго форм

Дзеяслоў як самастойная часціна мовы. Семантыка-граматычная адметнасць дзеяслова. Граматычныя формы дзеяслова: інфінітыў, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе і спрагальныя формы. Асновы дзеяслова. Граматычныя катэгорыі дзеясловаў: пераходнасць-непераходнасць; зваротнасць; залежны і незалежны стан; закончанае і незакончанае трыванне; цяперашні, прошлы і будучы час; умоўны, загадны і абвесны лад, асоба. Спецыфіка спражэння: асаблівасці канчаткаў дзеясловаў I і II спражэння, адметнасць форм рознаспрагальных дзеясловаў. Спецыфіка формаўтварэння дзеясловаў у параўнанні з рускай мовай. Асаблівасці суфіксальнага афармлення спрагальных дзеяслоўных форм (ужыванне фармантаў –ірава-/-ва-, -ава-(-ява-)/-ва- і інш.).

Дзеепрыметнік як неспрагальная форма дзеяслова. Асаблівасці ўтварэння і перакладу дзеепрыметнікаў і дзеепрыметных зваротаў з рускай на беларускую мову *(цэнтралізаваная сістэма, распрацаваны сцэнарый, анатаваны каталог, адыграны спектакль, пратэрмінаваная кніга, устарэлая літаратура, узведзены палац культуры, закансерваваныя рэшткі помніка, аздобленая фрэскамі карцінная галерэя, асвятляльны люк, аб'яднаны бібліяграфічны запіс)*.

Дзеепрыслоўе як нязменная форма дзеяслова. Асаблівасці ўтварэння і функцыянавання дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў.

Спецыфіка выкарыстання розных дзеяслоўных форм у прафесійным маўленні *(стымуляваць супрацоўніцтва, размеркаваць рэсурсы, упрыгожыць разьбой, улічваць запыт, ствараць канкурэнцыю, захоўваць каларыт, перагледжваць эцюды, тыражыраваць выданне, апладзіраваць флейтысту, адыграць спектакль, распаўсюджваць новыя тэхнікі, развіваць гравюру на метале, перадаваць святлоценявую мадэліроўку прадметаў)*.

Асаблівасці будовы беларускіх словазлучэнняў і від сувязі-кіраванне (параўнальна з рускай): спалучэнні з дзеясловамі *жартаваць, смяяцца, рагатаць, здзекавацца, цешыцца, насміхацца, кпіць;* з дзеясловамі руху *ісці, ехаць, бегчы, ляцець, несціся,* а таксама з дзеясловамі волевыяўлення *паслаць, выправіць, адправіць;* з дзеясловамі думкі, пачуцця, маўлення *гаварыць, думаць, непакоіцца, клапаціцца, хвалявацца, маўчаць;* з дзеясловамі ветлівасці *дзякаваць, дараваць, прабачыць, выбачаць* і інш.

Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе. Абумоўленасць формы адзіночнага/множнага ліку выказніка ў залежнасці ад яго семантыкі і ад дзейніка, выражанага рознымі мадэлямі колькасна-іменных словазлучэнняў (*група студэнтаў сядзела, шасцёра спевакоў стаялі, музыкантаў з дваццаць*

увайшлі ў залу, пяць экспазіцый прывезена, выкладчык са студэнтамі маўчалі, большасць інструментаў ляжала і інш.*).*

Раздзел V. Функцыянальныя стылі мовы і камунікатыўныя якасці маўлення

Тэма 13.Спецыфіка афіцыйна-спрвавога і навуковага стыляў

Стылістыка і культура маўлення як самастойная лінгвістычная дысцыпліна і як частка вучэбнага курса «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Паняцце функцыянальнага стылю, падстылю, жанра. Дыферэнцыяцыя моўных стыляў. Агульная характарыстыка кніжных (афіцыйна-справавога, навуковага, публіцыстычнага, канфесійнага, мастацкага) і гутарковага стыляў. Асаблівасці мовы мастацкага стылю; мова мастацкай літаратуры як «захавальніца» нарматыўнасці літаратурнага маўлення.

Паняцце навуковага стылю, яго асноўныя функцыі і прыметы.

Уласна навуковы (акадэмічны), навучальны (вучэбна-навуковы), навукова-папулярны падстылі, іх жанры і кампазіцыйныя асаблівасці.

Лексіка-граматычныя асаблівасці навуковага стылю. Спецыфіка перакладу на беларускую мову навуковых тэкстаў.

Паняцце афіцыйна-справавога стылю, асноўныя функцыі і прыметы афіцыйна-справавога стылю.

Заканадаўчы (уласна заканадаўчы, або юрыдычны), дыпламатычны, адміністратыўна-канцылярскі (канцылярскі) падстылі, іх жанры.

Лексіка-граматычныя асаблівасці афіцыйна-справавога стылю. Маўленчыя штампы як сродак дакладнасці і недвухсэнсоўнасці спрвавога маўлення. Спецыфіка напісання справавых папер.

Праблемы культуры маўлення ва ўмовах білінгвізму. Агульная культура чалавека і прафесійна арыентаванае маўленне. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лаканічнасць, лагічнасць, чысціня, багацце, дарэчнасць, выразнасць і вобразнасць) і іх рэалізацыя ў функцыянальных стылях, у канкрэтных маўленчых сітуацыях.

Маўленчы этыкет і культура зносін у розных сферах маўлення. Шляхі пераадолення моўнай агрэсіі. Эўфемізмы і дысфемізмы і іх функцыя.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(Дзённая форма атрымання адукацыі)

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін	Колькасць гадзін КСР	Форма контролю ведаў
		практычныя заняткі		
1.	Уводзіны	2		вуснае апытанне
Раздзел I. Спецыфіка фанетыка-арфаэпічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы				
2.	Тэма 1. Фанетычная сістэма беларускай мовы	2		
3.	Тэма 2. Арфаэпічныя нормы беларускай мовы	2		вуснае апытанне
Раздзел II. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы				
4.	Тэма 3. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання	2		тэставыя заданні
Раздзел III. Сістэма арфаграфічных норм у сферы прафесійнага маўлення				
5.	Тэма 4. Арфаграфія. Прынцыпы беларускай арфаграфіі	2		
6.	Тэма 5. Фанетычны прынцып првапісу	2		
7.	Тэма 6. Марфалагічны прынцып правапісу	2		
8.	Тэма 7. Ужыванне вялікай літары	2	2	творчая работа
Раздзел IV. Граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах білінгвізму				
9.	Тэма 8. Нарматыўнае ўжыванне назоўнікаў	2		пераклад
10.	Тэма 9. Скланенне назоўнікаў-тэрмінаў	2		практыкаванні
11.	Тэма10. Нарматыўнае ўжыванне прыметнікаў	2		
12.	Тэма 11. Нарматыўнае ўжыванне лічэбнікаў	2		
13.	Тэма 12. Нарматыўнае ўжыванне дзеяслова і яго форм	2		
Раздзел V. Функцыянальныя стылі і камунікатыўныя якасці маўлення				
14.	Тэма 13. Спецыфіка афіцыйна-справавога і навуковага стыляў	2	4	Аналіз тэксту і творчая работа
	Усяго	**28**	**6**	

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(Завочная форма атрымання адукацыі)

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін
		практычыя заняткі
1.	Уводзіны	1
Раздзел І. Спецыфіка фанетыка-арфаэпічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы		
2.	Тэма 1. Фанетычная сістэма беларускай мовы	1
Раздзел ІІ. Сістэма арфаграфічных норм у сферы прафесійнага маўлення		
3.	Тэма 2. Фанетычны і марфалагічны прынцыпы правапісу	2
Раздзел ІІІ. Граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах білінгвізму		
4.	Сістэма часцін мовы ў прафесійным маўленні	4
	Усяго	**8**

Літаратура

Асноўная

4. Беларуская мова: спецыяльная лексіка : вучэб.-метад. дапам. / А. М. Пісарэнка [і інш.] ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2016. – 286 с.

Дадатковая

1. Азарка, В. У. Беларуская мова: спецыяльная лексіка / В. У. Азарка, А. С. Васілеўская, М. М. Круталевіч. – Мінск: ВВЦ БДПУ, 2004. – 207 с.

2. Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Л. А. Антанюк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.

3. Антанюк, Л. А. Беларуская мова: спецыяльная лексіка / Л. А. Антанюк, Б. А. Плотнікаў. – Мінск: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэсп. Беларусь, 2004. – 128 с.

4. Асіпчук, А. М. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: дапам. / А. М. Асіпчук, В. В. Маршэўская, А. С. Садоўская. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 271 с.

5. Асновы культуры маўлення і стылістыкі / пад рэд. У. В. Анічэнка. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 255 с.

6. Багамолава. А. М. Стылістыка і культура беларускага маўлення ; падручнік / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мінск : РІВШ, 2023. – 392 с.

7. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: дапам. / аўт.-склад.: В. В. Маршэўская, І. В. Піваварчык, А. С. Садоўская. – Гродна: ГрДУ, 2006. – 84 с.

8. Беларуская мова ў схемах і табліцах: дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў / склад. А. В. Ляўковіч. – Мазыр: Белый ветер, 2010. – 106, [2] с.

9. Беларуская мова: энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск: Беларус. энцыкл., 1994. – 655 с.

10. Жалуновіч, А. А. Прафесійная лексіка (тэставыя заданні для самакантролю па беларускай мове) / А. А. Жалуновіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2007. – 34 с.

11. Каляда, А. Беларускае літаратурнае вымаўленне: практыкум па дыкцыі і арфаэпіі / А. Каляда. – Мінск: Выш. шк., 2006. – 100 с.

12. Каўрус, А. Дакумент па-беларуску / А. Каўрус. – Мінск: Беларусь, 1994. – 159 с.

13. Куліковіч, У. І. Беларускі правапіс: правілы, заданні, кантрольныя работы / У. І. Куліковіч. – Мінск: Завігар, 1998. – 280 с.

14. Куліковіч, У. І. Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні. Тэсты. Слоўнік: вучэб. дапам. / У. І. Куліковіч. – Мінск: Новое знание, 2011. – 507 с.

15. Куліковіч, У. І. Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі:

вучэб. дапам. / У. І. Куліковіч. – Мінск: Новое знание, 2010. – 124 с.
16. Лепешаў, І. Я. Практыкум па беларускай мове / І. Я. Лепешаў, Г. М. Малажай, К. М. Панючыц. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 301 с.
17. Ляшчынская, В. А. Беларуская мова: тэрміналагічная лексіка : вучэб. дапам. / В. А. Ляшчынская. – Мінск: РІВШ БДУ, 2001. – 256 с.
18. Ляшчынская, В. А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка / В. А. Ляшчынская. – Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2003. – 243 с.
19. Пісарэнка, А. М. Функцыянальная стылістыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / А. М. Пісарэнка. – Мінск: БДУ культуры, 2003. – 62 с.
20. Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі : дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск : Аверсэв, 2010. – 191 с.
21. Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія / пад рэд. М. С. Яўневіча. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 288 с.
22. Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Л. М. Грыгор'ева [і інш.] ; пад агул. рэд. Л. М. Грыгор'евай. – 4-е выд., выпр. – Мінск: Выш. шк., 2011. – 622 с.
23. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Г. У. Арашонкава, А. М. Булыка, А. І. Падлужны ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Беларус. навука, 1999. – 173 с.
24. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Выш. шк., 1995. – 301 с.
25. Шакун, Л. М. Аб перыядызацыі гісторыі беларускай літаратурнай мовы / Л. М. Шакун // Карані роднай мовы. – Мінск: Выш. шк., 2001. – 86 с.
26. Шакун, Л. М. Словаўтварэнне: вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск: Выш. шк., 1978. – 128 с.

Слоўнікі

1. Арашонкава Г.У. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік / Г.У.Арашонкава, В.П. Лемцюгова.– Мн.: Выш. школа, 1991. – 303 с.
2. Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы / нац. акад. навук Беларусі [і інш.]; уклад.: В. П. Русак [і інш.]; рэдкал.: В. П. Русак, Ю. С. Гецэвіч, С. І. Лысы. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 757 с.
3. Беларускі арфаграфічны слоўнік - 3-е выд., выпр., нов. арфаграф. напіс. Уклад. Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандраценя ; пад рэд. А. А. Лукашанца. – Мн.: Белар. навука, 2012. – 695 с.
4. Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. / А.М.Булыка. – Мн.: Бел. Эн., 1999.
5. Гаўрош, Н.В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н.В.Гаўрош. – Мн.: Выш. школа, 1998. – 603 с.
6. Грабчыкаў, С.М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы / С.М.Грабчыкаў. – Мн.: Нар. асв., 1994. – 478 с.
7. Граматычны слоўнік назоўніка / Нац. акад. навук Беларусі, цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., філ. "Ін-т мовы і літ. імя Якуба

Коласа”; уклад. Г. У. Арашонкава [і інш.]; навук. рэд. В. П. Русак. – 2-е выд. дапрац., – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 1245 с.
8. *Клышка, М.К*. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К.Клышка. – Мн.: ПУП “Радыёла-плюс”, 2005. – 672 с.
9. *Лазоўскі, М.У.* Слоўнік антонімаў беларускай мовы / М.У.Лазоўскі. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 354 с.
10. *Лепешаў, І.Я.* Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2 т. / І.Я.Лепешаў. – Мн.: Бел Эн, 1993.
11. *Русско-белорусский словарь* : в 3 т. / под ред. А. А. Лукашанца. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – Т. 1. – 880 с. ; Т. 2. – 1087 с. ; Т. 3. – 960 с.
12. *Слоўнік цяжкасцяў беларускай мовы* / Б.А.Плотнікаў, В.П.Трайкоўская. – Мн.: Кніжны Дом, 2004. – 544 с.
13. *Старычонак, В.Д.* Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Д.Старычонак. – Мн.: Выш. школа, 1991. – 255 с.
14. *Сцяцко П.У.* Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У.Сцяцко, М.Ф.Гуліцкі, Л.А.Антанюк. – Мн.: Выш. школа, 1990. – 222 с.
15. *Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы* : больш за 65 000 слоў / Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа ; [уклад.: І. Л. Капылоў і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.
16. *Шкраба І.* Р. Крынічнае слова: беларускія прыказкі і прымаўкі / І.Шкраба, Р.Шкраба. – Мн.: Маст. літ., 1987. – 286 с.
17. *Шкраба І.Р.* Самабытнае слова: Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І.Р.Шкраба. – Мн.: Бел Эн, 1994. – 234 с.
18. *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*. – Т. 1-8. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979-1993.

ДЫЯГНОСТЫКА КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТА

Вуснае апытанне з’яўляецца адным са спосабаў праверкі ведаў, уменняў і навыкаў студэнта аб сістэме мовы і маўленні.

Вуснае звязнае выказванне дэманструе ўзровень засваення студэнтам агульных палажэнняў, правіл, азначэнняў і ўменне прымяняць атрыманыя веды на практыцы, а таксама ўменне студэнтаў ствараць звязнае, лагічна паслядоўнае паведамленне на пэўную тэму.

Пры ацэнцы адказу студэнта ўлічваецца наступнае:

1) ступень усвядомленасці вывучанага;

2) уменне прымяняць веды на практыцы;

3) моўнае афармленне адказу (захаванне літаратурных норм беларускай мовы);

4) лагічнасць, дакладнасць, доказнасць, паўната, правільнасць і выразнасць адказу.

Для дыягностыкі кампетэнцыі, выяўлення ўзроўню ведаў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах выкарыстоўваюцца тэсты, рознаўзроўневыя пісьмовыя заданні.

ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

